Г. А. Космач  У. С. Кошалеў  М. А. Краснова

# СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НАВЕЙШАГА ЧАСУ 1918—1945 гг.

Вучэбны дапаможнік для 10 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй Г. А. Космача

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск «Народная асвета» 2012

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

УДК 94(100)"1918/1945"(075.3=161.3)
ББК 63.3(0)я721
К71

Пераклад з рускай мовы
*Г. А. Космача, У. С. Кошалева, М. А. Красновай*

Рэцэнзенты:

аддзел усеагульнай гісторыі і міжнародных адносін дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык аддзела *М. К. Кошалеў*); настаўнік гісторыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя агульнаадукацыйная школа № 26 г. Мінска» *Г. А. Саўко*; доктар гістарычных навук, прафесар, рэктар установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна» *М. Э. Часноўскі*; дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін прыватнай установы адукацыі «Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці» *П. М. Гламбоцкі*

**Космач, Г. А.**
К71 Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918—1945 гг. : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / Г. А. Космач, У. С. Кошалеў, М. А. Краснова ; пад рэд. Г. А. Космача ; пер. з рус. мовы Г. А. Космача, У. С. Кошалева, М. А. Красновай. — Мінск : Нар. асвета, 2012. — 214 с. : іл.
ISBN 978-985-03-1914-2.

**УДК 94(100)"1918/1945"(075.3=161.3)**
**ББК 63.3(0)я721**

**ISBN 978-985-03-1914-2**

© Космач Г. А., Кошалеў У. С., Краснова М. А., 2012
© Космач Г. А., Кошалеў У. С., Краснова М. А., пераклад на беларускую мову, 2012
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2012

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# ЗМЕСТ

Ад аўтараў . . . . 4
§ 1. Уводзіны. Пачатак крызісу індустрыяльнага грамадства . . . . 5

**Раздзел I. КРАІНЫ ЕЎРОПЫ І ЗША Ў 1918—1939 гг.**

§ 2. Усталяванне асноў пасляваеннага свету . . . . 10
§ 3. Заходняя Еўропа ў 1918—1923 гг. . . . . 16
§ 4. Заходняя Еўропа і ЗША ў 1924—1929 гг. . . . . 24
§ 5. Сусветны эканамічны крызіс і краіны Заходняй Еўропы і ЗША ў 1929—1933 гг. . . . . 31
§ 6. Заходні свет напярэдадні Другой сусветнай вайны . . . . 38
§ 7. Міжнародныя адносіны ў 1930-я гг. . . . . 46
§ 8. Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы . . . . 52
§ 9. Навука і культура краін Заходняй Еўропы і ЗША ў міжваенны перыяд (1919—1939) . . . . 58
**Урок абагульнення** . . . . 66

**Раздзел II. ГІСТОРЫЯ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ: 1917—1939 гг.**

§ 10. Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне савецкай улады ў Расіі . . . . 67
§ 11—12. Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя . . . . 74
§ 13. Новая эканамічная палітыка. Утварэнне СССР . . . . 83
§ 14. Курс на пабудову сацыялізму ў СССР. Індустрыялізацыя і калектывізацыя . . . . 91
§ 15. Унутраная і знешняя палітыка СССР у 1930-я гг. . . . . 97
§ 16. Культурныя пераўтварэнні ў СССР . . . . 105
**Урок абагульнення** . . . . 111

**Раздзел III. КРАІНЫ УСХОДУ І ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ ПАМІЖ СУСВЕТНЫМІ ВОЙНАМІ**

§ 17. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё краін Усходу і Лацінскай Амерыкі . . . . 112
§ 18—19. Кітай . . . . 116
§ 20. Індыя . . . . 124
§ 21. Японія . . . . 131
§ 22. Мусульманскі свет . . . . 140
§ 23. Лацінская Амерыка . . . . 145
**Урок абагульнення** . . . . 151

**Раздзел IV. ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА. ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА**

§ 24. Пачатак Другой сусветнай вайны . . . . 152
§ 25. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны . . . . 160
§ 26. Карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў . . . . 169
§ 27. Барацьба з захопнікамі на акупіраванай тэрыторыі . . . . 176
§ 28. Савецкі тыл у час вайны . . . . 184
§ 29—30. Заключны этап Другой сусветнай вайны. Разгром фашысцкага блока (1944—1945) . . . . 193
**Урок абагульнення** . . . . 203
Храналагічная табліца . . . . 205
Гістарычны слоўнік . . . . 209
Спіс рэкамендуемай літаратуры . . . . 213

Правообладатель Народная асвета

## Ад аўтараў

Паважаныя дзесяцікласнікі! У гэтым годзе вы пачынаеце вывучэнне першага перыяду Навейшай гісторыі, які ахоплівае час пасля заканчэння Першай сусветнай вайны ў 1918 г. да разгрому фашысцкага блока ў Другой сусветнай вайне ў 1945 г. У гэты перыяд адбыліся падзеі, якія карэнным чынам змянілі аблічча свету і шмат у чым вызначылі тэндэнцыі сучаснага сусветнага развіцця.

Вучэбны дапаможнік складаецца з чатырох раздзелаў. Адкрываюць яго «Уводзіны», у якіх даецца агульнае ўяўленне пра асноўныя тэндэнцыі развіцця свету ў 1918—1945 гг. Яны дапамогуць вам убачыць цэласную карціну глабальнага напрамку развіцця свету ў гэты час. Кожны параграф пачынаецца рубрыкай «Успомніце». У ёй акцэнтавана ўвага на тых пытаннях, веданне якіх неабходна для лепшага разумення новага вучэбнага матэрыялу. Працуючы з тэкстам параграфа, звяртайцеся да ілюстрацый і карт, якія дапаўняюць, ажыўляюць і канкрэтызуюць яго змест. Матэрыял рубрыкі «Гістарычны партрэт» дазволіць вам пазнаёміцца з поглядамі і жыццёвымі лёсамі актыўных удзельнікаў гістарычных падзей. Асноўныя даты, імёны, паняцці вылучаны **тлустым** шрыфтам, другарадныя — *курсівам*. Тлумачэнне новых паняццяў дадзена непасрэдна ў параграфе. Разгорнутае тлумачэнне найбольш складаных паняццяў вы знойдзеце ў рубрыцы «Гістарычная даведка». Вывучэнне гісторыі немагчыма без аналізу гістарычных крыніц. Яны прадстаўлены ў рубрыцы «Гістарычны дакумент». Успаміны сведак, сучаснікаў падзей, прыведзеныя ў рубрыцы «Жывая гісторыя», дазволяць вам лепш зразумець людзей таго часу. Завяршаюць параграф пытанні і заданні. Заданні рубрыкі «Прапануем абмеркаваць» дазволяць вам правесці дыскусію, у якой вы зможаце выказаць свой пункт гледжання, пацвердзіць яго аргументамі. Кожны раздзел заканчваецца ўрокам абагульнення, які мае на мэце сістэматызаваць вывучаны вамі вучэбны матэрыял.

У канцы вучэбнага дапаможніка прадстаўлены гістарычны слоўнік, храналагічная табліца, якая змяшчае даты найбольш важных падзей сусветнай гісторыі 1918—1945 гг., і спіс літаратуры, да якой вы можаце звярнуцца для таго, каб больш глыбока вывучыць тэму, якая вас зацікавіла.

Жадаем поспехаў!

Правообладатель Народная асвета

## § 1. Уводзіны. Пачатак крызісу індустрыяльнага грамадства

**Успомніце:** Якія перыяды сусветнай гісторыі вы вывучалі ў папярэдніх класах? Якія прычыны прывялі да Першай сусветнай вайны?

XX стагоддзе складае асаблівую эпоху сусветнай гісторыі. Яно характарызуецца небывалым дынамізмам ва ўсіх сферах жыцця чалавека і грамадства. На вачах трох пакаленняў адбылася глабалізацыя сусветнай гісторыі. Працэс развіцця асобных цывілізацый і рэгіёнаў набываў усё больш агульныя рысы. Людзі ўпершыню па-сапраўднаму сталі ўсведамляць, у якім узаемазалежным і крохкім свеце яны жывуць. Стагоддзе трыумфу розуму і навукі адначасова было стагоддзем войнаў і рэвалюцый, падчас якіх не раз пад сумненне ставіліся самі паняцці прагрэсу, гуманізму, каштоўнасці чалавечага жыцця, што сведчыла аб крызісе індустрыяльнага грамадства.

**Паняцце «Навейшая гісторыя» і яе перыядызацыя.** «Навейшая гісторыя», ці «гісторыя Навейшага часу», як паняцце першапачаткова замацавалася ў марксісцкай літаратуры. Гэтае паняцце было цесна звязана з фармацыйнай канцэпцыяй і адлюстроўвала змену грамадска-эканамічных сістэм і барацьбу антаганістычных класаў, якая лічылася рухавіком грамадскага прагрэсу. Новы час тлумачыўся як эпоха трыумфу капіталістычнай фармацыі, распачатай Англійскай буржуазнай рэвалюцыяй XVII ст. Вылучэнне асобнага перыяду «Навейшая гісторыя» звязвалася з пераходам ад капіталістычнага грамадства да камунізму.

Пасля распаду СССР і краху сусветнай сістэмы сацыялізму паняцце «Навейшая гісторыя» страціла сваю ранейшую ідэалагічную накіраванасць, стала менш палітызаваным і больш нейтральным. У наш час яно выкарыстоўваецца вучонымі ў больш шырокім значэнні і ўсё часцей разглядаецца як пераход ад індустрыяльнага грамадства да постіндустрыяльнай інфармацыйнай эпохі. Гэты складаны і супярэчлівы працэс ахоплівае амаль усё XX ст. і пачатак XXI ст. Рубежнай падзеяй паміж Новай і Навейшай гісторыяй стала Першая сусветная вайна, якая прывяла заходнюю цывілізацыю да глыбокага крызісу і паскорыла непазбежны працэс яе мадэрнізацыі.

Гісторыю Навейшага часу можна падзяліць на два адносна самастойныя перыяды. Першы перыяд ахоплівае **1918—1945 гг.** Асноўны змест гэтага перыяду — уздым рэвалюцыйных рухаў у Еўропе і Азіі і барацьба галоўных мадэляў грамадскага развіцця — ліберальна-капіталістычнай, фашысцкай і савецкай. Вострыя супярэчнасці паміж імі выклікалі самую разбуральную ў гісторыі чалавецтва сусветную вайну 1939—1945 гг.



Правообладатель Народная асвета

Другі перыяд, пачынаючы з **1945 г.**, характарызуецца глабальным процістаяннем савецкай мадэлі рэальнага сацыялізму і заходняй мадэлі ліберальнага капіталізму, распадам біпалярнай сітстэмы светапарадку, узмацненнем тэндэнцыі да глабалізацыі і ўніфікацыі грамадскага развіцця.

**Краіны Захаду: асноўныя тэндэнцыі развіцця.** Першая палова XX ст. адзначана бурным індустрыяльным развіццём. Вырашальную ролю ў эканоміцы сталі адыгрываць новыя тэхналогіі і новая тэхніка. Паскарэнне тэмпаў развіцця свету шмат у чым было абумоўлена навуковым і тэхнічным «выбухам» канца XIX — пачатку XX ст. Вучоныя назвалі гэты час «другой прамысловай рэвалюцыяй», ці «рэвалюцыяй у прыродазнаўстве». Найбольш развітыя краіны свету (Англія, Францыя, ЗША, Германія), працягваючы мадэрнізацыю, уступілі ў этап **індустрыяльнага грамадства**. Нягледзячы на нацыянальныя адрозненні, у іх гістарычным развіцці можна вылучыць такія агульныя рысы, як перавага прамысловай прадукцыі ў агульным нацыянальным даходзе; фарміраванне развітой і адносна ўстойлівай палітычнай сістэмы; станаўленне грамадзянскай супольнасці з характэрнай для яго структурай арганізацый і грамадскіх рухаў, незалежных ад дзяржаўнага апарату; бесперапыннае павелічэнне долі гарадскіх жыхароў; адносна высокі ўзровень пісьменнасці насельніцтва.

Працэс мадэрнізацыі закрануў і Беларусь, якая ўваходзіла спачатку ў склад Расійскай імперыі, а затым Савецкага Саюза.

На мяжы XIX — XX стст. развітыя краіны свету ўступілі ў эпоху імперыялізму. Дзяржава паступова адыходзіла ад традыцыйнага неўмяшання ў эканоміку і станавілася актыўным удзельнікам і рэгулятарам эканамічных працэсаў. Актыўнай ролі дзяржавы спрыялі новыя міжнародныя эканамічныя сувязі, а таксама рост напружанасці ў свеце, тэндэнцыя да мілітарызацыі эканомікі, гонка ўзбраенняў. У XX ст. захавалася і нават узмацнілася нераўнамернасць развіцця асобных дзяржаў. Такія краіны, як ЗША, Германія ці Японія, дзе параўнальна нядаўна склаліся нацыянальныя дзяржавы, развіваліся хуткімі тэмпамі і імкнуліся да перадзелу даўно падзеленага свету.

**Першая сусветная вайна і яе наступствы.** Сусветная вайна 1914—1918 гг. стала рубежным перыядам сусветнай гісторыі Новага і Навейшага часу. Яна азнаменавала сабой драматычнае завяршэнне «доўгага» XIX ст., эпохі адноснага міру, і апавясціла пачатак таго, што ўвайшло ў гісторыю пад назвай «эпоха насілля».

Да 1914 г. Еўропа была палітычным і культурным цэнтрам свету, ядром ваеннай і фінансавай магутнасці. Гэтая параўнальна невялікая частка свету кіравала вялізнай каланіяльнай сістэмай. У еўрапейскай ідэалогіі квітнелі і развіваліся палітычны лібералізм і інстытуты парламентарызму. Капіталізм быў пераважнай эканамічнай сістэмай, а дэмакратыя, як здавалася, была «асуджана» на безумоўнае распаўсюджванне па ўсім свеце. І ўсё гэта неспадзявана абрушылася з пачаткам сусветнага канфлікту ў 1914 г.



Правообладатель Народная асвета

Ваяўнічы нацыяналізм і імперскія амбіцыі, гонка ўзбраенняў і сістэма саюзаў дзяржаў, якія процістаялі адзін аднаму, зрабілі сваю разбуральную справу. Рост міжнароднай напружанасці, які відавочна выявіўся ў пачатку стагоддзя, урэшце прывёў да сусветнай трагедыі. Ніхто з краін-удзельніц як быццам не жадаў усеагульнай вайны, але праўдай было тое, што ніхто не зрабіў усяго магчымага для прадухілення канфлікту. Забойства наследніка аўстра-венгерскага прастола Франца Фердынанда сербскім нацыяналістам стала падставай для вайны. Лічачы вінаватым кіраўніцтва Сербіі, Аўстра-Венгрыя абвясціла вайну свайму суседу. Калі гэта здарылася, у рух прыйшоў механізм сістэмы ваенных саюзаў, які паступова ўцягнуў у вайну вядучыя еўрапейскія дзяржавы.

Сусветны пажар 1914—1918 гг. меў наступствы, якія паўплывалі на будучыню. Пасля жахлівых нягод і яшчэ больш вялікіх страт людзі па праву спадзяваліся на лепшае і больш справядлівае ўладкаванне свету. Аднак неўзабаве іх ілюзіі былі развеяны. Хаця дзяржаўныя дзеячы саюзных краін-пераможцаў адстойвалі дэмакратычныя і гуманістычныя традыцыі заходняй цывілізацыі, яны часта кіраваліся ў дасягненні міру пачуццём помсты і вузкімі нацыяналістычнымі інтарэсамі.

На мірнай канферэнцыі, якая праходзіла ў Парыжы ў 1919 г., у перамовах удзельнічалі толькі пераможцы, у адрозненне ад Венскага кангрэса 1815 г., дзе было дазволена прысутнічаць пераможанай Францыі. У Вене ўсе праблемы пасляваеннага ўладкавання вырашаліся толькі еўрапейцамі, тады як у Парыжы былі прадстаўлены ЗША, Японія і іншыянееўрапейскія дзяржавы. У 1815 г. пераможцы былі паблажлівыя да французаў. У Парыжы пераможцы праводзілі жорсткую лінію ў дачыненні да пераможанай Германіі і яе саюзнікаў, пазбавіўшы іх значнай часткі тэрыторыі і матэрыяльных каштоўнасцей.

Дагэтуль прадметам дыскусій застаецца пытанне пра тое, наколькі справядліва абышліся ў Парыжы з пераможанай Германіяй і яе саюзнікамі. Афіцыйнай мэтай абедзвюх канферэнцый, і Парыжскай, і Венскай, было імкненне перакроіць граніцы Еўропы і ўсталяваць працяглы мір. У абодвух выпадках не было нейкага агульнага, загадзя выпрацаванага плана. Пра пасляваеннае ўладкаванне дамаўляліся лідары вялікіх дзяржаў. На Венскім кангрэсе былі прыняты рашэнні, якія забяспечылі Еўропе амаль стагоддзе адноснага ўсеагульнага міру. У Парыжы, наадварот, архітэктары новага сусветнага парадку не змаглі забяспечыць устойлівы мір. Падпісаныя дагаворы выклікалі крыўду і абурэнне, асабліва ў Германіі і Італіі, і спрыялі як эканамічнай дэпрэсіі 1930-х гг., так і выспяванню перадумоў новай сусветнай вайны. Ліга Нацый, ініцыяваная Парыжскай канферэнцыяй, не мела ні дастатковай сілы, ні падтрымкі для таго, каб забяспечыць мір і бяспеку ў неспакойныя 1920—1930-я гг.

Менавіта ў гэтыя гады еўрапейская дэмакратыя пачала барацьбу з фашысцкімі рэжымамі, якія выспелі ва ўлонні ўсё той жа заходняй цывілізацыі. Спачатку фа-



Правообладатель Народная асвета

шызм атрымаў перамогу ў Італіі. Але найбольш радыкальная разнавіднасць гэтай ідэалогіі — нацыянал-сацыялізм усталяваўся ў Германіі, насельніцтва якой, будучы зняважаным і абражаным артыкуламі Версальскага мірнага дагавора, даверыла сваю будучыню палітычнаму авантурысту А. Гітлеру. Другая сусветная вайна, распачатая як вайна імперыялістычная, стала найбольш яркім праяўленнем крызісу індустрыяльнага грамадства і ў цэлым заходняй цывілізацыі.

**Сусветны эканамічны крызіс.** Уладкаванне свету пасля Першай сусветнай вайны паставіла перад заходнімі дэмакратыямі шэраг складаных праблем, але ніводная з іх не была настолькі цяжкай, як Вялікая дэпрэсія, якая пачалася з крызісу на біржы Нью-Ёрка ў кастрычніку 1929 г. Гэта быў самы глыбокі і самы разбуральны па сваіх наступствах эканамічны крызіс у гісторыі капіталізму. Эканоміка была адкінута да ўзроўню пачатку XX ст.

Захад паспрабаваў некалькі варыянтаў выхаду з крызісу. ЗША рашуча адмовіліся ад эканамічнага лібералізму і пачалі праводзіць *новы курс*, адкрыўшы шлях дзяржаўнаму ўдзелу ў эканоміцы. Гэтым жа шляхам, хоць і не так паслядоўна, пайшла Вялікабрытанія. Францыя правяла цэлую серыю прагрэсіўных рэформ, але палітычная нестабільнасць перашкаджала эканамічнаму ўздыму. Вядучыя краіны Захаду з рознай хуткасцю і ў рознай ступені выйшлі з дэпрэсіі, аднак поўнае аднаўленне эканомікі так і не было дасягнута да Другой сусветнай вайны. У адрозненне ад фашысцкіх рэжымаў заходнім дэмакратыям удалося выйсці з крызісу з захаваннем інстытутаў грамадзянскай супольнасці і асноў існуючага ладу.

**Расія.** У стомленай ад вайны Расіі ў 1917 г. спачатку адбылася буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, а затым сацыялістычная. На руінах Расійскай імперыі быў створаны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР). Савецкая мадэль мадэрнізацыі стала варыянтам развіцця, альтэрнатыўным заходнім дэмакратыям і фашысцкім рэжымам. Ажыццёўленая за кошт унутраных рэсурсаў, індустрыялізацыя дазволіла Савецкаму Саюзу выйсці на адзін узровень з развітымі краінамі свету і выстаяць у самай кровапралітнай вайне супраць фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў.

Для Беларусі гэта быў перыяд нацыянальнага і культурнага ўздыму, афармлення і стварэння беларускай дзяржаўнасці. Да пачатку Другой сусветнай вайны Беларусь у складзе СССР ператварылася ў аграрна-індустрыяльную рэспубліку з высокай удзельнай вагой пісьменнага насельніцтва. Найважнейшай падзеяй стала ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г. Пасля нападзення фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз народ Беларусі прыняў актыўны ўдзел у барацьбе з нямецка-фашысцкім агрэсарам.

**За межамі еўрапейскага свету.** У першай палове XX ст. краіны Усходу і Лацінскай Амерыкі сталі арэнай дэмакратычных і нацыянальна-вызваленчых рэвалюцый і рухаў. Дэмакратычныя рэвалюцыі адбыліся ў Мексіцы, Кітаі і Турцыі, у выніку чаго ў гэтых краінах усталяваўся рэспубліканскі лад.



Правообладатель Народная асвета

У многіх калоніях і паўкалоніях еўрапейскіх краін, у прыватнасці ў Егіпце, Сірыі, Іраку, Індыі, разгарнуліся нацыянальна-вызваленчыя рухі. Аднак найбольшы ўздым вызваленчай барацьбы адбыўся пасля Другой сусветнай вайны. Яго вынікам стала вызваленне многіх народаў ад каланіяльнай залежнасці і наабыццё імі ўласнай дзяржаўнасці.

?

1. Які перыяд называюць «Навейшай гісторыяй»? Якая падзея стала рубежнай паміж Новай і Навейшай гісторыяй? Які асноўны змест гісторыі Навейшага часу?
2. Якія два асноўныя перыяды вылучаюць у гісторыі Навейшага часу? Дайце ім кароткую характарыстыку.
3. Якія асноўныя тэндэнцыі і агульныя рысы развіцця можна вылучыць у гісторыі краін Захаду ў першай палове XX ст.?
4. Якія характэрныя рысы індустрыяльнага грамадства? Чаму ў індустрыяльную эпоху дзяржавы ўвайшлі ў розны час і рухаліся з рознай хуткасцю? Якія наступствы гэта мела?
5. Чаму рашэнні, прынятыя на Парыжскай мірнай канферэнцыі, якая завяршыла Першую сусветную вайну, не здолелі забяспечыць мір і бяспеку і ў выніку прывялі да Другой сусветнай вайны?
6. Якія варыянты гістарычнага развіцця абазначыліся пасля Першай сусветнай вайны? Пакажыце гэта ў выглядзе схемы.
7. Чым характарызавалася развіццё краін Усходу і Лацінскай Амерыкі ў першай палове XX ст.?

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### З працы расійскага гісторыка А. І. Уткіна «Першая сусветная вайна»

Першая сусветная вайна з'яўляецца адной з ключавых падзей сусветнай гісторыі. Яна вызначыла сусветную эвалюцыю ўсяго наступнага часу. За чатыры гады адбылася сапраўдная рэвалюцыя ў эканоміцы, камунікацыях, нацыянальнай арганізацыі, у сацыяльнай сістэме свету. Першая сусветная вайна прыдала сучасную форму нацыянальнаму пытанню. Яна вывела на арэну грамадскага жыцця масы народа, якія фактычна не ўдзельнічалі раней у сусветнай гісторыі. Яна дала небывалы імпульс тэхнічнай рэвалюцыі. Яна пры гэтым адкрыла нябачаныя глыбіні гуманітарнага падзення, на якое аказаўся здольны чалавек насуперак усім дасягненням цывілізацыі. Яна фактычна разбурыла аптымістычную культуру Еўропы, змяла ўсе дасягненні стагоддзя паслянапалеонаўскага свету, зрабіла насілле легітымным сродкам вырашэння міжнародных спрэчак і інструментам сацыяльных перамен. Яна пакінула пасля сябе нябачанае азлабленне народа, якое выплюхнулася адчужэннем 20—30-х гадоў і крывавай драмай Другой сусветнай вайны.

*Якую ролю, на думку расійскага гісторыка, у гістарычным развіцці адыграла Першая сусветная вайна? Ці можна яе разглядаць як гуманітарную катастрофу? Якія наступствы яна мела?*



Правообладатель Народная асвета

# Раздзел I

# КРАІНЫ ЕЎРОПЫ І ЗША Ў 1918—1939 гг.

## § 2. Усталяванне асноў пасляваеннага свету

**Успомніце:** Якія супрацьлеглыя ваенна-палітычныя блокі ўдзельнічалі ў Першай сусветнай вайне? Якія дзяржавы ўваходзілі ў іх склад?

**Парыжская мірная канферэнцыя.** У Кампʼенскім лесе (Францыя) **11 лістапада 1918 г.** Германія падпісала перамір'е з Антантай, якое азнаменавала заканчэнне Першай сусветнай вайны. Паводле ўмоў пераміра Германія выводзіла войскі з усіх ненямецкіх тэрыторый, а таксама з левага берага Рэйна. На яго правым беразе стваралася нейтральная зона. Германія была абавязана паставіць пераможцам значную частку ваеннай маёмасці і вярнуць ваеннапалонных. Разам з тым у працівагу Савецкай Расіі нямецкія войскі заставаліся ў Прыбалтыцы і Украіне. Кампʼенскае пераміраʼе анулявала Брэсцкі мірны дагавор ад 3 сакавіка 1918 г. Ваеннае камандаванне Германіі, імкнучыся зняць з сябе адказнасць за паражэнне ў вайне, стала распаўсюджваць легенду аб «удары кінжалам у спіну» непераможнай нямецкай арміі з боку рэвалюцыйных сіл краіны.

Пасля заключэння Кампʼенскага пераміра пачалася падрыхтоўка да мірнай канферэнцыі, якая праходзіла ў вострай барацьбе ў лагеры пераможцаў. Найбольш жорсткую пазіцыю ў адносінах да Германіі займала Францыя, якая імкнулася ўсталяваць гегемонію ў Еўропе. Яна мела намер не толькі вярнуць Эльзас і Латарынгію, але і анексіраваць Саар і устанавіць граніцу з Германіяй па Рэйне. Кіраўнік французскага ўрада Ж. Клемансо імкнуўся максімальна аслабіць Германію. Гэта яму належаць словы аб тым, што «20 мільёнаў немцаў зʼяўляюцца лішнімі». Францыя разлічвала таксама стварыць на ўсход ад Германіі «санітарны кардон» дзяржаў, які супрацьстаяў бы як Савецкай Расіі, так і Германіі. Акрамя таго, Францыя прэтэндавала на частку нямецкіх калоній у Афрыцы і турэцкіх уладанняў на Блізкім Усходзе.

Англія імкнулася захаваць статус сусветнай дзяржавы і не дапусціць празмернага ўзмацнення Францыі і ЗША. Яна не была зацікаўлена ў расчляненні Германіі. Англія ў выніку вайны ператварылася з крэдытора ў даўжніка ЗША, у цэлым яе пазіцыі ў свеце аслаблі. Англія разлічвала таксама атрымаць значную долю нямецкіх калоній і ўмацаваць свой уплыў на Блізкім і Далёкім Усходзе.

ЗША ў выніку вайны ператварыліся ў вядучую дзяржаву свету ў галіне эканомікі і фінансаў. Яны пазычылі краінам Еўропы 10 млрд долараў і інвесціравалі



Правообладатель Народная асвета

туды каля 6,5 млрд долараў. Злучаныя Штаты былі зацікаўлены ў германскіх рэпарацыях, якія фактычна еўрапейскія дзяржавы аддавалі ім у лік сваіх пазык. Таму ЗША выступалі супраць значнага аслаблення Германіі. Яны таксама імкнуліся ўзмацніць свае пазіцыі на Далёкім Усходзе і ў зоне Ціхага акіяна. Выкарыстоўваючы сваю эканамічную перавагу і ваенна-марскі патэнцыял, ЗША прапанавалі прынцыпы «свабоды мораў» і «свабоды гандлю», зафіксаваныя ў амерыканскай праграме пасляваеннага ўладкавання свету («14 пунктаў» прэзідэнта В. Вільсана).

**18 студзеня 1919 г.** у Версалі распачалася **Парыжская мірная канферэнцыя**, якая працавала з перапынкамі да **21 студзеня 1920 г.** На ёй прысутнічалі прадстаўнікі 27 дзяржаў. Вырашальную ролю на канферэнцыі адыгрывала «вялікая тройка» — прэм'ер-міністры Англіі і Францыі **Д. Лойд Джордж**, **Ж. Клемансо** і прэзідэнт ЗША **В. Вільсан**. Адкрываючы канферэнцыю, прэзідэнт Францыі Р. Пуанкарэ нагадаў, што роўна 48 гадоў назад, 18 студзеня 1871 г., у Люстраной зале Версальскага палаца была абвешчана Германская імперыя, і прамовіў знакамітыя словы: «Народжаная ў несправядлівасці, яна скончыла сваё існаванне ў ганьбе».

Падчас напружанай барацьбы на канферэнцыі былі ўзгоднены ўмовы міру з Германіяй. **28 чэрвеня 1919 г.** Германія падпісала **Версальскі мірны дагавор**. Паводле дагавора Эльзас і Латарынгія вярталіся Францыі, акругі Эйпен, Мальмедзі і Марэнэ перадаваліся Бельгіі, Паўночны Шлезвіг — Даніі. Тэрыторыя Германіі па левым беразе Рэйна і па яго правым беразе шырынёй 50 км станавілася **дэмілітарызаванай зонай**. Тут забаранялася размяшчаць нямецкія войскі, праводзіць ваенныя манеўры і будаваць умацаванні. Германскія землі на захад ад Рэйна акупіраваліся саюзнымі арміямі на тэрмін ад 5 да 15 гадоў. Саарскі вугальны басейн пераходзіў ва ўласнасць Францыі, а Саарская вобласць на 15 гадоў адыходзіла пад кіраванне Лігі Нацый. Германія прызнавала незалежнасць Польшчы, Чэхаславакіі, Аўстрыі, Люксембурга. Да Польшчы адыходзіла значная частка Памераніі, Познані, Заходняй і Усходняй Прусіі, Верхняй Сілезіі. Данцыг (Гданьск) пе-


У. Орпен. Падпісанне Версальскага мірнага дагавора ў Люстраной зале Версальскага палаца. 28 чэрвеня 1919 г.



Правообладатель Народная асвета

раўтвараўся ў «вольны горад» пад кіраваннем Лігі Нацый. Такім чынам Усходняя Прусія аддзялялася ад Германіі «польскім калідорам». Мемель (Клайпеда) і прылеглыя раёны перадаваліся пад кантроль Лігі Нацый і ў 1923 г. былі ўключаны ў склад Літвы. Да Чэхаславакіі адыходзіла частка тэрыторыі Сілезіі. Эльба, Одэр, Нёман, Дунай і Кільскі канал аб'яўляліся адкрытымі для замежных краін. Версальскі мір пазбавіў Германію ўсіх калоній, якія былі падзелены ў выглядзе мандатаў (правоў на кіраванне) у асноўным паміж Францыяй, Англіяй, Бельгіяй, Партугаліяй і Японіяй.

Дагавор абмяжоўваў колькасць нямецкай арміі да 100 тыс. чалавек. Германіі забаранялася вытворчасць цяжкіх узбраенняў і будаўніцтва буйных баявых караблёў. Паводле дагавора Германія аб'яўлялася адзінай віноўніцай развязвання Першай сусветнай вайны. На гэтай падставе яна павінна была выплаціць велізарныя рэпарацыі на карысць пераможцаў. Пазней была ўстаноўлена сума ў 132 млрд марак.

Тэкст Версальскага мірнага дагавора, як і наступных дагавораў, пачынаўся са Статута **Лігі Нацый** — міжнароднай арганізацыі па падтрыманні міру. Ліга Нацый стала прыкрыццем новага перадзелу калоній пад выглядам атрымання краінамі-пераможцамі мандатаў на кіраванне былымі германскімі каланіяльнымі ўладаннямі.

**Мірныя дагаворы 1919—1923 гг. Вашынгтонская канферэнцыя.** У *верасні 1919 г.* быў падпісаны Сен-Жэрменскі мірны дагавор з *Аўстрыяй*. Паводле дагавора граніцы Аўстрыі былі вызначаны без уліку нацыянальных інтарэсаў суседніх дзяржаў. Аўстрыя перадавала Італіі Паўднёвы Ціроль, Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў атрымлівала частку Крайны і Карынціі. Букавіна адыходзіла да Румыніі. У склад Чэхаславакіі ўвайшлі Багемія і Маравія. Тэрыторыя Аўстрыі значна скарацілася. Дагавор пацвердзіў умовы Версальскага міру аб забароне аншлюсу (далучэння) Аўстрыі да Германіі. Паводле дагавора Аўстрыя абмяжоўвала свае ўзброеныя сілы і выплачвала рэпарацыі.



Вашынгтонская канферэнцыя. Лістапад 1921 — люты 1922 г.

У *лістападзе 1919 г.* у Нейі быў заключаны мірны дагавор з *Балгарыяй*. Яе тэрыторыя значна змяншалася на карысць Грэцыі, Румыніі і Югаславіі. Армія Балгарыі значна скарачалася, краіна выплачвала кантрыбуцыю.



Правообладатель Народная асвета

У *чэрвені 1920 г.* адбылося падпісанне Трыанонскага міру з *Венгрыяй*. Тэрыторыя Венгрыі памяншалася ў тры разы. Яна значна скарачала свае ўзброеныя сілы і несла цяжар рэпарацый.

У *жніўні 1920 г.* у Сеўры быў заключаны мір з *Турцыяй*. Сеўрскі мірны дагавор па сутнасці прадугледжваў падзел асноўных турэцкіх тэрыторый і ўсталяванне кантролю саюзнікаў над чарнаморскімі пралівамі. Аднак умовы Сеўрскага дагавора не былі рэалізаваны з прычыны перамогі нацыянальнай рэвалюцыі ў Турцыі. У выніку працы канферэнцыі ў Лазане ў *1923 г.* быў падпісаны *Лазанскі мірны дагавор*, які вызначыў пасляваенныя граніцы Турцыі і прызнаў яе незалежнасць.

З мэтай вырашэння спрэчных праблем на Далёкім Усходзе і ў Ціхім акіяне і абмежавання марскіх узбраенняў была склікана **Вашынгтонская канферэнцыя** дзевяці дзяржаў **(12 лістапада 1921 — 6 лютага 1922 г.)**. Галоўную ролю на ёй адыгрывалі ЗША, Вялікабрытанія і Японія. Савецкая Расія не была запрошана на канферэнцыю. У *снежні 1921 г.* на Вашынгтонскай канферэнцыі быў падпісаны *дагавор чатырох дзяржаў* (ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі і Японіі), які гарантаваў астраўныя ўладанні гэтых дзяржаў у басейне Ціхага акіяна. У *лютым 1922 г.* быў заключаны *дагавор пяці дзяржаў* аб абмежаванні марскіх узбраенняў. Згодна з ім паміж ЗША, Вялікабрытаніяй, Японіяй, Францыяй і Італіяй устанаўліваліся наступныя прапорцыі лінейнага флоту: 5 : 5 : 3 : 1,75 : 1,75. Гэтыя суадносіны былі на карысць ЗША, якія ўпершыню дабіліся прызнання парытэту ў цяжкіх марскіх узбраеннях з Англіяй. У лютым таго ж года *дагавор дзевяці дзяржаў* прызнаваў суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць Кітая. Японія была вымушана вярнуць яму правінцыю Шаньдун. Дагавор замацаваў *прынцыпы «адчыненых дзвярэй»* і *«роўных магчымасцей»* заходніх дзяржаў і Японіі ў Кітаі. Гэтыя прынцыпы ставілі ЗША ў больш выгаднае становішча, паколькі магутны амерыканскі капітал атрымаў доступ да кітайскага рынку.

**Супярэчнасці Версальска-Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін.** Комплекс мірных дагавораў, падпісаных у 1919—1923 гг., і новыя суадносіны сіл у свеце атрымалі назву **Версальска-Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін**. Асноўным яе недахопам і супярэчнасцю стала несправядлівае пераўладкаванне пасляваеннага свету і рабаўніцкія, цяжкія ўмовы мірных дагавораў для пераможаных краін. Версальскі мір утрымліваў зародак новых войнаў і канфліктаў, перш за ўсё ў Еўропе. Яго ўмовы асуджала абсалютная большасць насельніцтва пераможаных краін, асабліва Германіі. У немцаў узнік «версальскі комплекс» — непрынятие Версальскага дагавора як прыніжаючага нацыянальную годнасць і надзея на яго рэвізію ці наступны рэванш.

На *Генуэзскай канферэнцыі,* скліканай у *красавіку 1922 г.* для вырашэння эканамічных і фінансавых пытанняў, адбылося збліжэнне паміж Савецкай Ра-



Правообладатель Народная асвета



Прадстаўнікі савецкай і нямецкай дэлегацый ў Рапала. Красавік 1922 г.

сіяй і Германіяй, якія *16 красавіка* падпісалі *Рапальскі дагавор*. Ён абазначыў выхад абедзвюх краін з міжнароднай ізаляцыі і стаў адным з першых пагадненняў, якія азначалі ўскосную рэвізію Версальскай сістэмы міжнародных адносін. Згодна з дагаворам Германія і Савецкая Расія ўстанаўлівалі дыпламатычныя адносіны, узаемна адмаўляліся ад пакрыцця страт, прызнавалі прынцып найбольшага спрыяння ў эканамічных адносінах.

Рапальскі дагавор стаў першым узорам палітыкі мірнага суіснавання. Рапальская палітыка («дух Рапала») стала асновай савецка-германскіх адносін і плённага супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў у 1922—1932 гг.

?

1. Якія супярэчнасці адносна ўладкавання свету пасля Першай сусветнай вайны існавалі паміж дзяржавамі-пераможцамі?
2. Ахарактарызуйце асноўныя ўмовы мірных дагавораў, якія былі заключаны з пераможанымі краінамі. Дайце ацэнку мірных дагавораў, якія былі заключаны ў 1919—1923 гг.
3. З якой мэтай была склікана Вашынгтонская канферэнцыя? Якія яе асноўныя вынікі?
4. Калі і з якой мэтай была склікана Генуэзская канферэнцыя? Якое значэнне мела падпісанне Рапальскага дагавора для Германіі і СССР?
5. Што абумовіла слабасць Версальска-Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін? Чаму падпісанне Версальска-Вашынгтонскіх дамоўленасцей не ліквідавала магчымасці ўзнікнення новых войнаў і канфліктаў?
6. Нягледзячы на розныя ацэнкі асобы і дзейнасці В. Вільсана, ён прызнаны адной з ключавых фігур у гісторыі ЗША. Ці згодны вы з гэтай ацэнкай? Сваё меркаванне аргументуйце. Выкарыстайце дадатковыя крыніцы гістарычнай інфармацыі.

**Прапануем абмеркаваць.** Ці магчыма было стварэнне стабільнай сістэмы міжнародных адносін пасля Першай сусветнай вайны?

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Вудра Вільсан** (1856—1924), дзяржаўны і палітычны дзеяч ЗША. Доктар філасофіі, прафесар права, гісторык. У 1912—1920 гг. — 28-ы прэзідэнт ЗША ад дэмакратычнай партыі. Праводзіў сацыял-ліберальныя рэформы. Спрабаваў утрымаць краіну ад уступлення ў Першую сусветную вайну. Новы сусветны парадак бачыў заснаваным на розуме і ўзаемным супрацоўніцтве. 8 студзеня 1918 г. выступіў з прапановамі аб заканчэнні вайны, вядомымі



Правообладатель Народная асвета

як «14 пунктаў». Першыя пяць пунктаў уключалі адкрытую дыпламатыю, свабоду мараплаўства, роўнасць у міжнародным гандлі, скарачэнне ўзбраенняў, узгадненне каланіяльнай палітыкі. Наступныя восем пунктаў тычыліся перагляду граніц на аснове самавызначэння народаў. 14-ы пункт прадугледжваў утварэнне міжнароднай арганізацыі «ў мэтах стварэння ўзаемнай гарантыі палітычнай незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці як вялікіх, так і малых дзяржаў». Дамагаўся выканання гэтай праграмы на Версальскай мірнай канферэнцыі. Адмова кангрэса ЗША падтрымаць распрацаваную Вільсанам ідэю стварэння Лігі Нацый стала цяжкім ударам па яго прэстыжу. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру 1919 г.



**Жорж Клемансо** (1841—1929), французскі палітычны і дзяржаўны дзеяч. З'яўляўся прэм'ер-міністрам Францыі ў 1906—1909 гг. У гады Першай сусветнай вайны патрабаваў яе працягу да поўнага разгрому Германіі, не лічачыся ні з якімі ахвярамі. У лістападзе 1917 г. зноў стаў прэм'ер-міністрам Францыі і адначасова ваенным міністрам, спрабаваў усталяваць у краіне дыктатарскі рэжым. Адзін з галоўных арганізатараў ваеннай інтэрвенцыі ў Савецкую Расію, падтрымліваў белагвардзейскіх генералаў — А. В. Калчака і А. І. Дзянікіна. Адыграў вялікую ролю ў падаўленні Венгерскай савецкай рэспублікі. З'яўляўся старшынёй Парыжскай мірнай канферэнцыі, кіраўніком французскай дэлегацыі і адным з аўтараў Версальскага мірнага дагавора, дабіваўся ўсталявання ваенна-палітычнай гегемоніі Францыі ў Еўропе. Пацярпеўшы паражэнне на прэзідэнцкіх выбарах 1920 г., адышоў ад актыўнага палітычнага жыцця. Аўтар прац «Дэмасфен» (1925), «Бляск і ўбоства адной перамогі» (1930) і інш.



**Дэвід Лойд Джордж** (1863—1945), дзяржаўны дзеяч Вялікабрытаніі, адзін з буйнейшых лідараў ліберальнай партыі. У 1905—1908 гг. — міністр гандлю, а ў 1908—1915 гг. — міністр фінансаў. У час Першай сусветнай вайны выступаў за вядзенне барацьбы да рашучага паражэння Германіі. У 1916 г. стаў прэм'ер-міністрам кааліцыйнага ўрада. Адзін з галоўных удзельнікаў Парыжскай мірнай канферэнцыі і аўтараў Версальскага мірнага дагавора. З яго згоды і пры яго падтрымцы была распачата ўзброеная інтэрвенцыя Англіі ў Савецкую Расію. У 1922 г. пайшоў у адстаўку. Пасля прыходу да ўлады ў Германіі А. Гітлера (1933) выступаў у яго падтрымку, аднак хутка зразумеў сваю памылку. Падчас Другой сусветнай вайны пасля капітуляцыі Францыі стаў прыхільнікам заключэння міру паміж Англіяй і Германіяй, таму што лічыў Англію няздольнай весці вайну ў адзіночку.



Правообладатель Народная асвета

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

**Са звароту сенатара Г. Кэбата Лоджа-старэйшага ў кангрэсе ЗША**

*12 жніўня 1919 г.*

Незалежнасць Злучаных Штатаў даражэйшая, чым што-небудзь іншае, не толькі для нас, але і для ўсяго свету...

...Злучаныя Штаты з'яўляюцца самай вялікай надзеяй усяго свету, але, калі вы закуяце нашу краіну ў кайданы ў імя інтарэсаў іншых дзяржаў, калі вы ўблытаеце яе ў інтрыгі Еўропы, вы навечна разбурыце яе магутнасць і паставіце пад пагрозу само яе існаванне...

Нам кажуць, што мы «разаб'ём сэрца ўсяму чалавецтву», калі не прымем гэтай Лігі ў тым выглядзе, які нам прапануецца. Я баюся, што сэрцы значнай большасці чалавецтва будуць біцца моцна, упэўнена і без якіх-небудзь збояў, калі Ліга кане ў вечнасць...

...Нам трэба пазбягаць такога становішча, калі наша палітыка будзе займацца чужымі нам праблемамі або ўскладняцца разладамі паміж іншымі дзяржавамі. Нам не трэба, каб энергія нашай краіны вычэрпвалася, яе маральныя сілы паслабляліся бясконцым умяшаннем у кожную буйную або нязначную спрэчку, якая адбываецца ў свеце. Наш ідэал заключаецца ў тым, каб зрабіць сваю краіну больш моцнай і прыгожай, бо толькі такім шляхам, мы перакананы, яна можа прынесці найбольшую карысць міру ва ўсім свеце і дабрабыту чалавецтва.

*Супраць уступлення ў якую арганізацыю выступаў сенатар ЗША? Чаму ён лічыў, што Злучаным Штатам не трэба ўступаць у гэтую арганізацыю? Як кангрэсам ЗША было вырашана пытанне адносна ўдзелу краіны ў гэтай арганізацыі?*

# § 3. Заходняя Еўропа ў 1918—1923 гг.

**Успомніце:** Якія рашэнні адносна Германіі былі прыняты на Парыжскай мірнай канферэнцыі? У якой форме была ўстаноўлена ўлада рабочых і сялян у Расіі?

**Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі. Устанаўленне Веймарскай рэспублікі.** Паражэнне нямецкіх войскаў у 1918 г. паскорыла нарастанне рэвалюцыйнага крызісу ў Германіі. Вайна паставіла эканоміку краіны на мяжу катастрофы. Ахвярамі вайны сталі каля 1,8 млн забітых і 4,2 млн параненых немцаў. Эксплуатацыя народа дасягнула крайніх меж, абвастрылася харчовая праблема. Шматлікія феадальныя перажыткі, у тым ліку манархічны абсалютызм, юнкерскае землеўладанне, замаруджвалі развіццё вытворчых сіл. Манархія Гогенцолернаў, германскі мілітарызм, «прускі дух» стрымлівалі працэс дэмакратызацыі нямецкага грамадства. Восенню 1918 г. па Германіі пракацілася хваля забастовак і сялянскіх выступленняў.



Правообладатель Народная асвета

У гэтых умовах кайзер Вільгельм II і ваеннае камандаванне зрабілі спробу прадухіліць паражэнне Германіі ў вайне, падавіць рэвалюцыйны рух у краіне і заключыць «ганаровы мір» з Антантай.

У канцы кастрычніка 1918 г. быў адданы загад вывесці баявыя караблі з балтыйскіх партоў і разграміць англійскі флот. Але ў германскай арміі ўжо быў моцным рэвалюцыйны настрой. Гэты загад стаў зачэпкай для паўстання матросаў у Кілі. Яны разам з рабочымі стварылі Саветы і **3 лістапада 1918 г.** усталявалі сваю ўладу ў горадзе. Гэтая падзея стала пачаткам Лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі, у ходзе якой вылучаюць тры перыяды: першы перыяд завяршыўся перамогай рэвалюцыі і стварэннем новага ўрада — Савета народных упаўнаважаных (СНУ) — 9—10 лістапада 1918 г., другі перыяд працягваўся да студзеньскага паўстання 1919 г. у Берліне, трэці перыяд скончыўся паражэннем Баварскай савецкай рэспублікі ў пачатку мая 1919 г.

Устанаўленне ваеннай аховы на шэрагу прадпрыемстваў Берліна і арышты рэвалюцыйных стараст на некаторых заводах сталі зачэпкай для дэманстрацыі і паўстання ў сталіцы **9 лістапада 1918 г.** Рэйхсканцлер М. Бадэнскі вымушаны быў перадаць уладу кіраўніку СДПГ Ф. Эберту і абнародаваць намер Вільгельма II адрачыся ад прастола. Лідар СДПГ Ф. Шэйдэман аб'явіў Германію дэмакратычнай «Нямецкай рэспублікай», а спартакавец К. Лібкнехт — «Свабоднай сацыялістычнай рэспублікай». Манархія Гогенцолернаў перастала існаваць. **10 лістапада** быў створаны рэвалюцыйны ўрад — **Савет народных упаўнаважаных** (СНУ), які складаўся з прадстаўнікоў СДПГ і НСДПГ. Старшынямі СНУ сталі Ф. Эберт і Г. Гаазэ. Новы ўрад **11 лістапада 1918 г.** падпісаў перамір'е з краінамі Антанты. У гэты час СДПГ выступала за мірныя рэформы і не прымала ўзброенае паўстанне і ўстанаўленне дыктатуры пралетарыяту. НСДПГ дапускала ўсталяванне ўлады рабочага класа ў выпадку падтрымкі з боку большасці насельніцтва. СНУ правёў шэраг дэмакратычных рэформ. Усегерманскі з'езд саветаў, на якім дамінавала СДПГ, у снежні 1918 г. прыняў рашэнне аб скліканні Нацыянальнага сходу. Гэта вырашыла пытанне аб уладзе на карысць дэмакратычных сіл.

Левырадыкальныя сілы зрабілі спробу паглыбіць рэвалюцыю і ўстанавіць дыктатуру пралетарыяту. **30 снежня 1918 г.** на базе саюза «Спартак» была створана **Камуністычная партыя Германіі** (КПГ). Яна разам з НСДПГ узначаліла паўстанне берлінскіх рабочых 5—12 студзеня 1919 г. Ф. Эберт звярнуўся за дапамогай да арміі і рэакцыйных ваенізіраваных саюзаў. Паўстанне было жорстка падаўлена.

19 студзеня прайшлі выбары ў Нацыянальны сход. З буржуазных партый у выніку выбараў найбольш уплывовымі сталі каталіцкая партыя Цэнтр і леваліберальная Нямецкая дэмакратычная партыя (НДП). Праваліберальная Нямецкая народная партыя (ННП) і кансерватыўная Нямецкая нацыянальная народная пар-



Правообладатель Народная асвета

тыя (НННП), якія выступалі супраць рэвалюцыі і за аднаўленне манархіі, атрымалі невялікую падтрымку выбаршчыкаў. КПГ байкатавала парламенцкія выбары. Буржуазныя партыі змаглі не дапусціць узнікнення сацыялістычнага ўрада, і ў выніку да ўлады прыйшла веймарская кааліцыя — палітычны блок трох партый: СДПГ, Цэнтр і НДП. Нацыянальны сход абраў прэзідэнтам Германіі **Ф. Эберта**. У студзені — красавіку 1919 г. у Германіі ўзмацніўся рэвалюцыйны рух, у шэрагу гарадоў былі абвешчаны савецкія рэспублікі. Найбольш вядомай з іх стала **Баварская савецкая рэспубліка**, утвораная **13 красавіка 1919 г.** Урад Я. Левінэ (КПГ) правёў нацыяналізацыю банкаў, устанавіў рабочы кантроль на прадпрыемствах, стварыў Чырвоную гвардыю, абмежаваў правы буржуазіі, заявіў аб салідарнасці з Савецкай Расіяй. Контррэвалюцыйныя сілы ў пачатку *мая 1919 г.* падавілі савецкі рух у Баварыі. Такі ж лёс напаткаў і сакавіцкае паўстанне рабочых у Берліне і стачачны рух у Руры ў красавіку 1919 г. З ліквідацыяй Баварскай савецкай рэспублікі скончылася Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі. Яна насіла буржуазна-дэмакратычны характар, але ў некаторых рэгіёнах краіны (асабліва ў Баварыі) мела тэндэнцыю да перарастання ў сацыялістычную.

Асноўным вынікам рэвалюцыі стала ўстанаўленне ў Германіі новага рэжыму — веймарскай дэмакратыі. Нацыянальны сход, які адбыўся ў *Веймары* **31 ліпеня 1919 г.**, прыняў канстытуцыю краіны. Яна ўстанаўлівала прэзідэнцкую рэспубліку ў Германіі, паколькі прэзідэнту паводле Канстытуцыі былі аддадзены асноўныя паўнамоцтвы выканаўчай улады.



Рэвалюцыйныя падзеі ў Еўропе (1917—1920 гг.)

**Рэвалюцыйна-дэмакратычны ўздым у іншых краінах.** У канцы кастрычніка 1918 г. пачалася буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя ў Аўстра-Венгрыі. Падчас яе была звергнута манархія Габсбургаў. **12 лістапада 1918 г.** была абвешчана рэспубліка ў *Аўстрыі*. Урад правёў дэмакратычныя рэформы. У гэты час у краіне ўзнік моцны савецкі рух, 3 лістапада ўтварылася камуністычная партыя.

Адначасова з рэвалюцыяй у Аўстрыі **16 лістапада 1918 г.** была



Правообладатель Народная асвета

абвешчана рэспубліка ў *Венгрыі*. Вясной 1919 г. з прычыны пагрозы агрэсіі з боку Румыніі і Чэхаславакіі ўрад склаў свае паўнамоцтвы. **21 сакавіка** была ўтворана **Венгерская савецкая рэспубліка**. У яе ўрадзе кіруючая роля належала камуністам на чале з *Бела Кунам*. У краіне былі праведзены сацыялістычныя пераўтварэнні, створана Чырвоная армія. Яна заняла Славакію, дзе таксама ўзнікла савецкая рэспубліка. **1 жніўня 1919 г.** Венгерская савецкая рэспубліка была ліквідавана ў выніку наступлення контррэвалюцыйных сіл.

Пасляваенны крызіс капіталізму і рэвалюцыйны рух працягваліся і ў 1920—1923 гг. Буйныя паўстанні рабочых адбыліся ў сакавіку 1921 г. і восенню 1923 г. у Германіі. Найбольш востры рэвалюцыйны крызіс узнік у кастрычніку 1923 г. у Саксоніі і Цюрынгіі, ва ўрады якіх увайшлі камуністы. У падрыхтоўцы «нямецкага кастрычніка» актыўны ўдзел прымалі Камінтэрн і расійскія камуністы. Аднак рэвалюцыйны рух быў падаўлены з дапамогай рэйхсвера (арміі). Толькі ў Гамбургу ў кастрычніку 1923 г. камуністы на чале з Э. Тэльманам здолелі арганізаваць паўстанне рабочых, якое таксама было падаўлена.

**Утварэнне Камінтэрна і Рабочага сацыялістычнага інтэрнацыянала.** Рэвалюцыйны рух у краінах Заходняй Еўропы з'явіўся асновай для стварэння камуністычных партый, якія сталі ўплывовай сілай у рабочым руху. У 1918 г. камуністычныя партыі ўзніклі ў Германіі, Польшчы, Фінляндыі, Аўстрыі, Венгрыі і Нідэрландах. У **сакавіку 1919 г.** у Маскве на канферэнцыі камуністычных партый быў створаны **Камуністычны Інтэрнацыянал** (Камінтэрн) — адзіная партыя міжнароднага камуністычнага руху. Кампартыі і Камінтэрн узначалілі шэраг паўстанняў рабочых і рух салідарнасці з Савецкай Расіяй. Прызнаным лідарам Камінтэрна быў *У. І. Ленін*. Ён лічыў, што Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Расіі з'яўляецца пачаткам сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі, а ўстанаўленне дыктатуры пралетарыяту выступае неабходнай умовай пабудовы сацыялізму, нават калі большасць насельніцтва не падтрымлівае ўладу рабочага класа і камуністычнай партыі.




Рабочы, які разбівае молатам ланцугі, што аблытваюць зямны шар, — неафіцыйны сімвал Камуністычнага Інтэрнацыянала

У *лютым 1919 г.* аднавіў сваю дзейнасць *II Інтэрнацыянал*. Яго лідары не прымалі дыктатуру пралетарыяту і выступалі за



Правообладатель Народная асвета




У. І. Ленін у прэзідыуме кангрэса Камінтэрна ў Маскве. 1919 г.

мірнае пераўтварэнне капіталістычнага грамадства ў сацыялістычнае. У **1923 г.** ІІ Інтэрнацыянал быў пераўтвораны ў *Рабочы сацыялістычны інтэрнацыянал*, адным з лідараў якога з'яўляўся **К. Каўцкі**. Ён лічыў, што сацыялізм павінен стаць вынікам паступовага змянення капіталістычнага грамадства пад кіраўніцтвам рабочага класа і сацыялістычных партый. Прыхільнікі Каўцкага — сацыял-дэмакраты не прымалі ўзброенае паўстанне пралетарыяту, выступалі за парламенцкія і іншыя легальныя сродкі барацьбы. Сацыял-дэмакраты лічылі, што ў канчатковым выніку капіталістычнае грамадства шляхам мірных рэформ будзе пераўтворана ў сістэму **дэмакратычнага сацыялізму**, у якім захаваецца прыватная ўласнасць, аднак будзе прадугледжана нацыяналізацыя некаторых галін эканомікі і вядучая роля дзяржавы ў эканамічным жыцці. У палітычнай сферы захаваюцца шматпартыйнасць, дэмакратычныя каштоўнасці і традыцыі.

**Наступленне рэакцыйных сіл. Узнікненне фашызму.** Рэвалюцыйна-дэмакратычны ўздым, пагроза бальшавізацыі Еўропы выклікалі актывізацыю правых, рэакцыйных палітычных сіл. У Германіі ўзмацніліся мілітарысцкія і рэваншысцкія арганізацыі і партыі. Яны праводзілі палітычны тэрор у адносінах да лідараў рабочых і дэмакратычных партый. Былі забіты некаторыя дзяржаўныя дзеячы Веймарскай рэспублікі. У *сакавіку 1920 г.* манархісты і частка армейскіх колаў учынілі путч супраць Веймарскай рэспублікі і захапілі ўладу ў Берліне. Аднак створаны рэакцыйны ўрад *В. Капа* неўзабаве быў вымушаны скласці свае паўнамоцтвы ў сувязі з усеагульнай забастоўкай у Германіі. Капаўскі путч праваліўся.

У Францыі ў канцы 1919 г. да ўлады прыйшоў Нацыянальны блок — саюз правых сіл і партый, які праводзіў антыдэмакратычную палітыку. Асабліва выразна гэта выявілася ў 1922—1923 гг., калі ўрад Нацыянальнага блока ўзначаліў *Р. Пуанкарэ*. У Англіі кансерватыўна-ліберальны кабінет здолеў абмежаваць уплыў дэмакратычных сіл у краіне. У канцы 1922 г. да ўлады ў краіне прыйшлі кансерватары, якія сталі праводзіць жорсткую сацыяльную палітыку. У ЗША ў 1920 г. дэмакратычная партыя пацярпела паражэнне на выбарах і да ўлады прыйшлі рэспубліканцы. У краіне ўзмацніліся рэакцыйныя і расісцкія арганізацыі, якія праследавалі неграў.

Найбольш глыбокім праяўленнем крызісу заходняй цывілізацыі стала ўзнікненне фашысцкага руху ў Еўропе. Яго асноўнымі перадумовамі сталі эканамічны крызіс і збядненне народных мас у выніку Першай сусветнай вайны, страта бы-



Правообладатель Народная асвета

лых каштоўнасцей ліберальнага грамадства, распаўсюджванне ідэй аб вырашальнай ролі насілля, тэрору і войнаў у гісторыі, з'яўленне масавых рухаў праварадыкальнага толку, культу моцнай асобы (правадыра), крызіс кіруючых ліберальных партый, узнікненне тэорый нацыянальнага сацыялізму, узмацненне расісцкіх, рэваншысцкіх і нацыяналістычных ідэй. Фашысты патрабавалі ліквідаваць буржуазна-дэмакратычны лад, падавіць рэвалюцыйны рух, устанавіць аднапартыйную дыктатуру і стварыць таталітарную мадэль новага грамадства. Для прыцягнення мас на свой бок фашысты выкарыстоўвалі сацыялістычныя лозунгі і сцвярджалі, што яны імкнуцца пабудаваць нацыянальны сацыялізм. Для ўсіх фашысцкіх рухаў былі характэрны крайні расізм, антысемітызм, агрэсіўная знешнепалітычная праграма.

Першая фашысцкая арганізацыя пад назвай «Нямецкая рабочая партыя» ўзнікла ў Германіі, у Мюнхене, у *студзені 1919 г.* на чале з А. Дрэкслерам. З 1920 г. яна стала называцца *Нацыянал-сацыялістычнай нямецкай рабочай партыяй* (НСДАП). У сваёй праграме яна патрабавала адмены Версальскага дагавора, стварэння Вялікай Германіі (уключаючы Аўстрыю і іншыя землі, дзе жылі немцы), правядзення частковай канфіскацыі юнкерскага землеўладання, абмежавання буйнога капіталу, сацыяльнай абароны працоўных, высылкі іншаземцаў з Германіі, стварэння «нямецкай народнай супольнасці». Нацысты сцвярджалі, што немцы з'яўляюцца вышэйшай арыйскай нардычнай расай, закліканай панаваць у Еўропе і ва ўсім свеце. Прызнаным лідарам НСДАП стаў яфрэйтар і платны інфарматар баварскіх ваенных колаў А. Гітлер. У 1921 г. ён заняў пост старшыні НСДАП і стварыў штурмавыя атрады партыі (СА). Яны сталі рыхтаваць путч супраць Веймарскай рэспублікі. *8—9 лістапада 1923 г.* нацысты паспрабавалі здзейсніць «нацыянальную рэвалюцыю» ў Баварыі. Яна прайшла ў выглядзе так званага «піўнога путчу» ў Мюнхене і была падаўлена з дапамогай арміі і паліцыі.

У Італіі ў 1920 г. наступіла кульмінацыя рэвалюцыйнага крызісу. Многія прадпрыемствы былі захоплены рабочымі, узмацніўся савецкі рух. Ліберальныя сілы не здолелі дабіцца палітычнай стабілізацыі. У гэтых умовах сталі папулярнымі фашысцкія ідэі стварэння моцнай дзяржавы і Вялікай Італіі, якія прапагандаваў «Саюз барацьбы» («фашыа ды камбатымента») на чале з Б. Мусаліні. Ён узнік у сакавіку 1919 г. у Мілане. У лістападзе 1921 г. на аснове «Саюза барацьбы» была створана Нацыянальная фашысцкая партыя. У **кастрычніку 1922 г.** фашысты ажыццявілі



Б. Мусаліні з атрадам «чорнарубашачнікаў»



Правообладатель Народная асвета

«паход на Рым». Кароль Італіі вымушаны быў прызначыць **Б. Мусаліні** прэм'ер-міністрам і даручыў яму сфарміраваць урад. У краіне пачаўся перыяд фашысцкай дыктатуры.

1. Што прывяло да Лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі? Ахарактарызуйце яе асноўныя этапы. Якія палітычныя сілы прынялі ўдзел у рэвалюцыі? У чым заключаліся адрозненні ў іх поглядах на задачы рэвалюцыі?
2. Параўнайце рэвалюцыйныя выступленні ў Германіі і Аўстра-Венгрыі. Растлумачце, чаму рэвалюцыі ў Германіі і Аўстра-Венгрыі можна характарызаваць як буржуазна-дэмакратычныя.
3. Дзе ў Еўропе былі ўстаноўлены савецкія рэспублікі? Аб чым сведчыць спроба ўстанаўлення савецкіх рэспублік? Чаму яны былі ліквідаваны?
4. Дакажыце, што сацыял-дэмакратычны і камуністычны рухі сталі ўплывовай сілай у палітычным жыцці краін Захаду. У чым яны бачылі сваю галоўную мэту?
5. Чаму ў краінах Захаду ў 1919—1923 гг. актывізаваліся рэакцыйныя сілы? У чым гэта выявілася?
6. Дзе былі створаны фашысцкія партыі? Што паслужыла прычынамі іх стварэння? Якія ідэі ляжалі ў аснове фашысцкага руху?

**Прапануем абмеркаваць.** Пасля заканчэння Першай сусветнай вайны вызначыліся тры варыянты палітычнага развіцця краін Захаду: дэмакратычны, рэвалюцыйны і праварадыкальны. Якія фактары паўплывалі на выбар краінай таго ці іншага варыянту развіцця?

## ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

Група «Спартак» была ўтворана ў 1916 г. пры актыўным удзеле К. Лібкнехта і Р. Люксембург. З 1917 г. уваходзіла ў створаную ў тым жа годзе Незалежную сацыял-дэмакратычную партыю Германіі (НСДПГ), захоўваючы пры гэтым ідэйную і палітычную самастойнасць. 11 лістапада 1918 г. была пераўтворана ў Саюз «Спартак». 30 снежня 1918 г. на з'ездзе, скліканым Саюзам «Спартак», была створана Камуністычная партыя Германіі (КПГ), кіраўнікамі якой сталі К. Лібкнехт і Р. Люксембург. Цэнтральным органам КПГ з'яўлялася газета «Ротэ фанэ» («Чырвоны сцяг»). У пачатку студзеня 1919 г. КПГ разам з НСДПГ узняла паўстанне і спрабавала ўстанавіць кантроль над Берлінам і шэрагам іншых гарадоў. Урад падавіў паўстанне, а К. Лібкнехт і Р. Люксембург 15 студзеня былі забіты.

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Фрыдрых Эберт** (1871—1925), германскі палітычны і дзяржаўны дзеяч, адзін з лідараў германскай сацыял-дэмакратыі. У час Лістападаўскай рэвалюцыі заняў (9 лістапада) пасаду рэйхсканцлера; 10 лістапада стаў адным са старшынь урада — Савета народных упаўнаважаных. З лютага 1919 г. — прэзідэнт Германіі. Пры ім у краіне ўсталявалася Веймарская рэспубліка.



Правообладатель Народная асвета



**Карл Каўцкі** (1854—1938), адзін з лідараў і тэарэтыкаў германскай сацыял-дэмакратыі і II Інтэрнацыянала. У 1874 г., будучы студэнтам Венскага ўніверсітэта, далучыўся да сацыялістычнага руху. З канца 1870-х гг., і асабліва пасля знаёмства ў 1881 г. з К. Марксам і Ф. Энгельсам, пачаў пераходзіць на пазіцыі марксізму. У 1883—1917 гг. — рэдактар тэарэтычнага часопіса германскіх сацыял-дэмакратаў «Ное цайт» («Новы час»). Напісаў шэраг прац і артыкулаў, якія прапагандавалі марксісцкія ідэі. Кастрычніцкую рэвалюцыю ў Расіі сустрэў варожа. У час Лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі выступаў супраць ператварэння Саветаў у органы ўлады і ўсталявання сяброўскіх адносін з Савецкай Расіяй. Удзельнічаў у стварэнні НСДПГ.



**Беніта Мусаліні** (1883—1945), італьянскі палітычны дзеяч, фашысцкі дыктатар Італіі ў 1922—1943 гг. Палітычную кар'еру пачаў у сацыялістычнай партыі, з якой быў выключаны ў 1914 г. У сакавіку 1919 г. заснаваў фашысцкі «Саюз барацьбы» і ў 1921 г. узначаліў Нацыянальную фашысцкую партыю. Ажыццявіўшы «паход на Рым» у кастрычніку 1922 г., прыйшоў да ўлады ў краіне. Урад, якім ён кіраваў, увёў рэжым тэрору, праводзіў агрэсіўную знешнюю палітыку, сумесна з Германіяй развязаў Другую сусветную вайну. У 1945 г. быў захоплены партызанамі і пакараны смерцю.

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### З канстытуцыі Германскай дзяржавы

*Веймар, 11 жніўня 1919 г.*

Артыкул 1. Германская дзяржава — рэспубліка. Дзяржаўная ўлада зыходзіць ад народа.

Артыкул 2. Тэрыторыя дзяржавы складаецца з тэрыторый германскіх абласцей…

Артыкул 17. Народнае прадстаўніцтва павінна выбірацца на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога і тайнага выбарчага права ўсімі грамадзянамі Германскай дзяржавы…

Артыкул 20. Рэйхстаг складаецца з дэпутатаў германскага народа…

Артыкул 41. Прэзідэнт дзяржавы выбіраецца ўсім германскім народам…

Артыкул 48. Калі якая-небудзь вобласць не выконвае абавязкаў, якія ўскладзены на яе канстытуцыяй ці дзяржаўнымі законамі, то прэзідэнт дзяржавы можа прымусіць яе да гэтага з дапамогай узброенай сілы.



Правообладатель Народная асвета

Артыкул 52. Урад складаецца з рэйхсканцлера і дзяржаўных міністраў…

Артыкул 60. Для прадстаўніцтва германскіх абласцей у заканадаўстве і кіраванні дзяржавай ствараецца рэйхсрат…

Артыкул 109. Усе немцы роўныя перад законам…

Артыкул 114. Свабода асобы недатыкальная…

Артыкул 124. Усе немцы маюць права ўтвараць саюзы ці таварыствы…

Артыкул 125. Гарантуецца свабода і тайна выбараў…

Артыкул 135. Усе жыхары дзяржавы карыстаюцца поўнай свабодай веравызнання і сумлення…

*Якая форма праўлення ўсталёўвалася ў Германіі паводле канстытуцыі? Якія правы атрымаў народ Германіі? Якой станавілася Германія па форме дзяржаўнага ўладкавання? Якія органы дзяржаўнай улады былі створаны?*

## § 4. Заходняя Еўропа і ЗША ў 1924—1929 гг.

**Успомніце:** Якім было эканамічнае становішча вядучых краін Захаду пасля Першай сусветнай вайны? Што такое манаполія?

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё.** З канца 1923 г. у большасці краін Захаду пачаўся эканамічны ўздым, які працягваўся да 1929 г. Гэты час увайшоў у гісторыю як перыяд адноснай стабілізацыі індустрыяльнага грамадства (капіталізму). Да 1929 г. у асноўным быў дасягнуты, а ў шэрагу галін і перавышаны даваенны ўзровень эканомікі. Значна палепшылася сацыяльнае становішча асноўнай масы насельніцтва ў развітых краінах Захаду, асабліва ў ЗША. Прычынамі росту эканомікі сталі заканчэнне перыяду пасляваеннай разрухі і крызісу, спад рэвалюцыйнага руху і сацыяльных канфліктаў, новыя з'явы ў эканамічным і сацыяльным жыцці. Да іх адносіліся ў першую чаргу высокая канцэнтрацыя вытворчасці і капіталу, рацыяналізацыя эканомікі, укараненне ў вытворчасць новых дасягненняў навукі і тэхнікі, задавальненне «адкладзенага» ў гады Першай сусветнай вайны попыту насельніцтва на тавары, сацыяльнае партнёрства і патэрналізм — асаблівыя, «бацькоўскія» адносіны паміж прадпрымальнікамі і наёмнымі работнікамі.

У перыяд адноснай стабілізацыі капіталізму ў вядучых краінах Захаду ўзніклі ці ўмацаваліся буйныя манаполіі сусветнага значэння: Стальныя трэсты ў Германіі і ЗША, хімічны канцэрн «І. Г. Фарбэніндустры» (Германія) і англійскі Імперскі хімічны трэст, электратэхнічныя кампаніі «Джэнерал электрык» (ЗША) і «Усеагульная кампанія электрычнасці» (Германія), амерыканскія аўтамабільныя канцэрны «Форд» і «Джэнерал мотарс», нямецкі канцэрн «Даймлер-Бэнц» і інш. Для іх былі найбольш характэрны канцэнтрацыя і цэнтралізацыя вытворчасці і капіталу. Яны выкарыстоўвалі навейшыя тэхналогіі і распрацоўкі ў сферы рацыяналізацыі пра-



Правообладатель Народная асвета

цы і вытворчасці. Найбольш яркім прыкладам гэтага працэсу стала рацыяналізацыя вытворчай дзейнасці на аўтамабільных заводах **Г. Форда**. Ён шырока прымяніў канвеер, новы падзел працы, каб рэзка павялічыць выпуск аўтамабіляў «Форд». Была зроблена стаўка на стандартызацыю вытворчасці, масавы выпуск танных аўтамашын, павышэнне зарплаты, паляпшэнне ўмоў працы рабочых і сацыяльнае партнёрства. Форд увёў 8-гадзінны рабочы дзень і ў два разы павысіў заработную плату (з 2,5 да 5 долараў у дзень). Да 1927 г. было выраблена 10 млн аўтамабіляў знакамітай фордаўскай маркі «Мадэль Т». Кошт аднаго аўтамабіля складаў 290 долараў, што адпавядала $^{1}/_{10}$ часткі гадавога даходу сярэдняй амерыканскай сям'і. Гэта быў першы «народны аўтамабіль» у свеце. Тады ў ЗША стаў папулярным лозунг «Форд перамог Маркса». Да 1929 г. у ЗША мелася 26,5 млн аўтамашын — намнога больш, чым ва ўсіх астатніх краінах свету.



Серыйная вытворчасць аўтамабіляў на канвееры завода Г. Форда. 1920-я гг.

У 1924—1929 гг. *ЗША* сталі найбольш эканамічна развітой дзяржавай свету. Яны выраблялі 48 % сусветнай (без СССР) прамысловай прадукцыі, на 10 % больш, чым Англія, Францыя, Германія, Італія і Японія, разам узятыя. У ЗША найбольш хутка развіваліся навейшыя галіны эканомікі: электратэхнічная, хімічная, авіяцыйная, нафтавая прамысловасць, аўтамабілебудаванне, кінаіндустрыя, радыёпрамысловасць.

Краіны Заходняй Еўропы адставалі па тэмпах эканамічнага развіцця ад ЗША, аднак і яны дасягнулі высокага ўзроўню вытворчасці і паляпшэння сацыяльнага становішча народных мас. Па росце прамысловай вытворчасці (5 % у год) *Францыя* апярэджвала Англію і Германію. Канцэнтрацыя вытворчасці і капіталу, рацыяналізацыя вытворчых і працоўных адносін былі характэрны для найбуйнейшых манаполій Францыі — «Камітэ дэ Форж» (металургія), «Сен-Габэн» (хімічная прамысловасць) і інш. Але вядучую ролю ў эканоміцы краіны па-ранейшаму адыгрывалі французскія банкі. Прыбытак ад продажу каштоўных папер і капіталаўкладанняў у тры разы перавышаў прыбыткі ад прамысловасці, што сведчыла аб тым, што французскі капітал захаваў свой ліхвярскі характар. У 1920-я гг. значна палепшылася становішча рабочых і служачых, былі павялічаны зарплаты, уведзены дапамога па беспрацоўю, пенсіі для нізкааплатных рабочых і служачых, а таксама дапамога па хваробе, інваліднасці і цяжарнасці.



Правообладатель Народная асвета



У выніку інфляцыі ў Германіі банкноты згубілі каштоўнасць настолькі, што іх выкарыстоўвалі дзеці для сваіх гульняў. 1923 г.

У *Германіі* ў канцы 1923 г. назіралася самая высокая ў Еўропе інфляцыя, тады 1 долар каштаваў 4,2 більёна марак. Цана кілаграма хлеба дасягала 339 млрд марак. Толькі з дапамогай надзвычайных мер і крэдытаў заходніх краін фінансавая сістэма краіны ў пачатку 1924 г. была ў асноўным стабілізавана. Але яе эканоміка была абцяжарана выплатай рэпарацый і займаў, сельская гаспадарка знаходзілася на мяжы крызісу. Захоўвалася масавае беспрацоўе, частымі былі забастоўкі і іншыя сацыяльныя канфлікты.

*Англія* страціла свае вядучыя эканамічныя пазіцыі ў свеце. Аднак у цэлым англійская эканоміка развівалася даволі хуткімі тэмпамі. Адставалі ў сваім развіцці толькі «старыя галіны», асабліва вугледабываючая прамысловасць. Сацыяльнае становішча англійскіх працоўных значна палепшылася.

**Унутрыпалітычнае развіццё.** Найбольш характэрнымі з'явамі палітычнага жыцця краін Захаду ў 1924—1929 гг. стала дэмакратызацыя грамадскіх адносін, спад рэвалюцыйнага руху і ўстанаўленне адноснай палітычнай стабільнасці. У вядучых краінах Захаду ўмацавалася парламенцкая дэмакратыя, была ўдасканалена выбарчая сістэма, упершыню ў выбарчых кампаніях актыўны ўдзел прымалі жанчыны.

У *ЗША* захоўвалася традыцыйная двухпартыйная сістэма. У 1924—1929 гг. у краіне правілі рэспубліканцы. У 1924 г. да ўлады прыйшла адміністрацыя прэзідэнта К. Куліджа. Яна выступала за курс «цвёрдага індывідуалізму», г. зн. за развіццё рыначных адносін і супраць умяшальніцтва дзяржавы ў эканоміку. Рэспубліканцы заяўлялі аб тым, што надышла эра амерыканскага росквіту і амерыканскай выключнасці, час здзяйснення «амерыканскай мары». Яны праводзілі палітыку ў інтарэсах буйнога капіталу, разам з тым заахвочвалася развіццё дробнага і сярэдняга бізнесу. У палітычным жыцці краіны ўзрос уплыў рэакцыйных арганізацый і рэлігійнага фундаменталізму. У шэрагу штатаў было забаронена выкладанне эвалюцыйнай тэорыі Ч. Дарвіна, якое лічылася крымінальным злачынствам. У Дэйтане, штат Тэнэсі, у 1927 г. адбыўся вядомы на ўвесь свет «малпавы працэс». Малады школьны настаўнік Д. Скопс быў асуджаны за адданасць вучэнню Дарвіна. Кіруючыя колы імкнуліся падавіць альбо аслабіць рабочы і дэмакратычны рух. Сім-



Правообладатель Народная асвета

валам гэтага стаў шматгадовы працэс супраць рабочых — выхадцаў з Італіі Н. Сака і Б. Ванцэці. Нягледзячы на міжнародную кампанію супраць несправядлівага прыгавору, у жніўні 1927 г. яны былі пакараны смерцю на электрычным стуле. У лістападзе 1928 г. выбары ў кангрэс зноў выйгралі рэспубліканцы. Іх кандыдат у прэзідэнты Г. Гувер выкарыстоўваў прывабныя для выбаршчыкаў лозунгі: «Нашы словы — у нашых справах», «Курыца ў кожнай каструлі і аўтамабіль у кожным гаражы», «Бясконцы росквіт». У студзені 1929 г. Г. Гувер стаў чарговым прэзідэнтам ЗША.

У *Англіі* адбыліся змены ў двухпартыйным праўленні лібералаў і кансерватараў. У студзені 1924 г. упершыню ў гісторыі краіны быў сфарміраваны лейбарысцкі ўрад на чале з Р. Макдональдам. Аднак праўленне лейбарыстаў было нядоўгім, і ў канцы 1924 г. да ўлады прыйшлі кансерватары. Для дыскрэдытацыі лейбарыстаў яны выкарысталі так званае «пісьмо Камінтэрна», ці «пісьмо Зіноўева», у якім утрымліваўся план узброенага паўстання ў Англіі на чале з камуністамі. Пасля высветлілася, што пісьмо было фальшыўкай, аднак яно адыграла сваю ролю ў перамозе кансерватараў на выбарах. Але лейбарысцкая партыя не згубіла свайго ўплыву ў краіне і ў чэрвені 1929 г. зноў прыйшла да ўлады. Найбольш буйной сацыяльна-палітычнай падзеяй у Вялікабрытаніі стала ўсеагульная забастоўка рабочых у *маі 1926 г.* Забастоўка вымусіла кіруючыя колы пайсці на сацыяльнае партнёрства з рабочымі.

У *Францыі* ў 1924 г. да ўлады прыйшоў Левы блок, які складаўся з радыкалаў і сацыялістаў. Ён правёў некаторыя прагрэсіўныя рэформы, аднак пацярпеў паражэнне на выбарах 1926 г. Кааліцыйны ўрад сфарміравалі правыя партыі, якія прадстаўлялі палітычны блок «Нацыянальнае адзінства».

Характэрнай рысай палітычнага развіцця *Германіі* ў 1924—1929 гг. з'явілася ўзрастанне ролі правых палітычных партый. Зрух управа ў палітычным жыцці выявіўся ва ўваходжанні ў склад урада правакансерватыўнай Нямецкай нацыянальнай народнай партыі ў 1925 г. і 1927—1928 гг. і выбранні ў *красавіку 1925 г.* прэзідэнтам рэспублікі рэваншыста і мілітарыста **П. фон Гіндэнбурга**. Кіруючыя колы вялі актыўную барацьбу супраць рабочага і дэмакратычнага руху. Адным з яркіх праяўленняў гэтай барацьбы стаў рэферэндум па пытанні аб бязвыплатнай канфіскацыі маёмасці князёў у 1926 г. У ходзе падрыхтоўкі і правядзення рэферэндуму склаўся адзіны блок рабочых партый (СДПГ і КПГ) і дэмакратычных арганізацый. Больш за 36 % выбаршчыкаў прагаласавалі за гэты блок. У канцы 1920-х гг. абвастрыліся адносіны паміж сацыял-дэмакратамі і камуністамі. Гэтаму садзейнічалі памылковыя ўстаноўкі Камінтэрна аб тым, што рабоча-сялянскі ўрад з'яўляецца сінонімам дыктатуры пралетарыяту, а адзіны рабочы фронт варта арганізоўваць толькі «знізу», не ідучы на перамовы з кіраўніцтвам сацыял-дэмакратаў. Яшчэ большую шкоду адзінству рабочага класа нанесла тэорыя «сацыял-фашызму» і тактыка «клас супраць класа». Камінтэрн, ультралевыя гру-



Правообладатель Народная асвета

пы камуністаў прапанавалі лічыць сацыял-дэмакратыю часткай класа буржуазіі, а СДПГ — левым крылом фашызму (сацыял-фашызмам). Гэта аслабіла веймарскую дэмакратыю і ў канчатковым выніку садзейнічала прыходу да ўлады НСДАП.

У *Італіі* ў 1924—1925 гг. у выніку палітычнага крызісу, звязанага з забойствам сацыяліста Д. Матэоці, адбылося ўмацаванне фашысцкага рэжыму. Пасля крызісу серыя надзвычайных законаў і масавы тэрор супраць апазіцыі прывялі да канцэнтрацыі ўлады ў руках Б. Мусаліні і Вялікага фашысцкага савета.

У **лютым 1929 г.** паміж Італіяй і Ватыканам (на чале з Папам Рымскім) былі падпісаны *Латэранскія пагадненні*, у адпаведнасці з якімі Італія прызнала дзяржаву Ватыкан, размешчаную на тэрыторыі Рыма. Ватыкан, у сваю чаргу, прызнаў італьянскую фашысцкую дзяржаву. Састаўной часткай Латэранскіх пагадненняў з'яўляўся «Канкардат» (пагадненне), згодна з якім каталіцкая царква ў Італіі атрымала пераважны ўплыў у школе і сферы сямейна-шлюбнага заканадаўства.

**Міжнародныя адносіны.** Увод французскіх і бельгійскіх войскаў у Рурскую вобласць у пачатку 1923 г. з-за адмовы Германіі выконваць умовы выплаты рэпарацый прывёў да ўскладнення міжнародных адносін у Еўропе. У **1923 г. Рурскі крызіс** абвастрыў рэпарацыйную праблему і значна пагоршыў сацыяльна-эканамічнае становішча Германіі. Для таго каб зрабіць Германію плацежаздольнай і знайсці новыя шляхі вырашэння рэпарацыйнага пытання, Англія і ЗША дабіліся ў 1924 г. склікання Лонданскай канферэнцыі, на якой быў зацверджаны план па выплаце рэпарацый, распрацаваны пад кіраўніцтвам *Ч. Даўэса* (ЗША). Германія атрымала пазыку ў 800 млн залатых марак і гарантыі стабільнасці нямецкай валюты. Крыніцамі выплаты рэпарацый сталі дзяржаўны бюджэт, прыбыткі нямецкай чыгункі і прадпрыемстваў. З 1928 г. Германія павінна была выплачваць 2,5 млрд марак штогод. У цэлым план аказаўся выгадным для Германіі і ЗША. Германія з яго дапамогай аднаўляла эканоміку, а еўрапейскія дзяржавы за кошт рэпарацый выплачвалі свае ваенныя даўгі ЗША.

Працягам плана Даўэса ў палітычнай вобласці сталі Лакарнскія пагадненні. У **кастрычніку 1925 г.** у *Лакарна* адбылася канферэнцыя заходніх дзяржаў. Асноўным дагаворам, які яны падпісалі, стаў *Рэйнскі гарантыйны пакт*. Францыя і Бельгія абавязваліся захоўваць заходнія граніцы Германіі і статус Рэйнскай дэмілітарызаванай зоны. Англія і Італія гарантавалі ўмовы Рэйнскага пакта і іншых пагадненняў. Лакарнскія дагаворы азначалі прызнанне раўнапраўя Германіі з краінамі, якія перамаглі ў Першай сусветнай вайне. Вынікам Лакарна стала таксама ўступленне Германіі ў Лігу Нацый у **1926 г.** і прадстаўленне ёй месца пастаяннага члена ў Савеце Лігі. План Даўэса і Лакарнскія пагадненні азначалі аслабленне пазіцый Францыі ў Еўропе.



Правообладатель Народная асвета

У **жніўні 1929 г.** на канферэнцыі ў Гаазе быў прыняты новы рэпарацыйны план — *план Юнга* (ЗША). Згодна з планам для Германіі была ўстаноўлена новая сума рэпарацый у 113,9 млрд марак. Да 1989 г. Германія абавязвалася выплачваць 2 млрд марак штогод. Паводле плана Юнга замежны кантроль над фінансамі Германіі быў адменены.



Г. Штрэзeман, О. Чэмберлен і А. Брыян (злева направа) у час перагавораў у Лакарна. Кастрычнік 1925 г.

У 1925—1927 гг. у Лізе Нацый паміж еўрапейскімі дзяржавамі адбываліся перамовы па раззбраенні. У 1927 г. міністр замежных спраў Францыі А. Брыян прапанаваў дзяржсакратару ЗША Ф. Келагу заключыць дагавор аб адмове ад вайны як сродку нацыянальнай палітыкі. У **жніўні 1928 г.** у Парыжы адбылося падпісанне *пакта Брыяна — Келага*. Неўзабаве да яго далучыўся СССР. Пакт садзейнічаў стабілізацыі міжнародных адносін у свеце.

?

1. Ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае развіццё вядучых краін Захаду ў 1924—1929 гг. Якія фактары садзейнічалі росту эканомікі? Якая з краін Захаду развівалася найбольш хуткімі тэмпамі? Што гэтаму садзейнічала?
2. Якія працэсы характарызавалі ўнутрыпалітычнае развіццё краін Захаду ў 1924—1929 гг.? Што садзейнічала ўмацаванню Германіі на міжнароднай арэне ў гэты перыяд? Прывядзіце факты.
3. Як складваліся адносіны паміж сацыял-дэмакратамі і камуністамі ў канцы 1920-х гг.? Якую небяспеку неслі тэорыя «сацыял-фашызму» і тактыка «клас супраць класа», якія былі прапанаваны Камінтэрнам?
4. Параўнайце палітычнае і эканамічнае развіццё пераможаных краін і краін, якія перамаглі, у 1924—1929 гг. Ці можна прасачыць у іх падобныя працэсы?
5. Як вырашалася пытанне аб рэпарацыях Германіі? Чаму ў 1924—1929 гг. яно пераглядалася некалькі разоў?
6. 1920-я гг. увайшлі ў гісторыю міжнародных адносін як «эра пацыфізму». Прывядзіце факты, якія пацвярджаюць гэты вывад. Ці існавалі ў гэты час палітычныя сілы, якія выступалі супраць мірнага развіцця міжнародных адносін? Выкарыстайце дадатковыя крыніцы гістарычнай інфармацыі.

## ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**Рурскі крызіс.** Адмова ад дзяржаўнага рэгулявання і пераход да лібералізацыі рынкавых адносін, празмерныя сацыяльныя выдаткі вымусілі ўрад веймарскай кааліцыі стаць на шлях павелічэння падаткаў і дадатковай эмісіі каштоўных папер і грошай. Колькасць банкнотаў у абароце па-



Правообладатель Народная асвета

вялічылася з 46 млрд у 1919 г. да 92 млрд у 1920 г. У такіх умовах выкананне рэпарацыйных абавязацельстваў стала для ўрада адной з асноўных праблем.

У адказ на адмову Германіі выплачваць рэпарацыі і выконваць іншыя міжнародныя пагадненні французскія і бельгійскія войскі ў студзені 1923 г. пачалі акупацыю Рурскага басейна. У выніку было занята каля 7 % пасляваеннай тэрыторыі Германіі, дзе здабывалася 72 % вугалю і выраблялася больш за 50 % чыгуну і сталі. У Рурскай вобласці пачаліся масавыя акцыі грамадзянскага непадпарадкавання і больш за палову 12-мільённага насельніцтва цалкам перайшло на дзяржаўнае забеспячэнне. Гэта прывяло да далейшага абясцэньвання маркі і паставіла Германію на мяжу эканамічнай катастрофы.

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Генры Форд** (1863—1947), амерыканскі інжынер, прамысловец, вынаходнік, адзін з заснавальнікаў аўтамабільнай прамысловасці ЗША. Прайшоў шлях ад вучня механіка да ўладальніка найбуйнейшай у Амерыцы аўтамабільнай кампаніі «Форд мотар компані». На заводах, якія належалі яму, шырока ўкараняў стандартызацыю і ўвёў канвеерную зборку. Форд першым устанавіў на сваіх прадпрыемствах мінімальны ўзровень заработнай платы і 8-гадзінны працоўны дзень. Свае ўяўленні аб арганізацыі працы і вытворчасці выказаў у кнігах «Маё жыццё, мае дасягненні» (1922), «Сёння і заўтра» (1926), «Рух наперад» (1930).



**Паўль фон Гіндэнбург** (1847—1934), германскі ваенны і дзяржаўны дзеяч, генерал-фельдмаршал (1914). У ходзе Лістападаўскай рэвалюцыі выступаў супраць падпісання Версальскага дагавора і за падаўленне выступленняў рабочых. У 1925 г. быў выбраны прэзідэнтам Веймарскай рэспублікі. Падтрымліваў ваенна-манархічныя і фашысцкія арганізацыі, спрыяў адраджэнню германскага ваеннага патэнцыялу і аднаўленню ваеннай моцы Германіі. 30 студзеня 1933 г. перадаў уладу ў рукі фашыстаў, даручыўшы А. Гітлеру фарміраванне ўрада.

## ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

### З кнігі Г. Форда «Маё жыццё, мае дасягненні»

Першы поспех у зборцы заключаўся ў тым, што мы сталі дастаўляць работу да рабочых, а не наадварот. Цяпер мы прытрымліваемся двух... сур'ёз-



Правообладатель Народная асвета

ных агульных прынцыпаў пры ўсіх работах — прымушаць рабочага па магчымасці не рабіць ніколі больш аднаго кроку і ніколі не дапускаць, каб яму прыходзілася пры рабоце нахіляцца наперад або ў бакі…

Прыблізна 1 красавіка 1913 г. мы правялі наш першы дослед са зборачным працэсам... Доследы праводзяцца ў нас спачатку ў невялікім маштабе. Калі мы адкрываем лепшы працоўны метад, мы не разважаючы прыступаем… нават да грунтоўных змен, але мы павінны… цалкам пераканацца ў тым, што новы метад сапраўды найлепшы…

## § 5. Сусветны эканамічны крызіс і краіны Заходняй Еўропы і ЗША ў 1929—1933 гг.

**Успомніце:** Што такое эканамічны крызіс? Чым былі абумоўлены крызісы ў эканамічным развіцці краін Захаду ў мінулым?

**Пачатак крызісу. Асаблівасці яго праяўлення ў розных краінах.** У пятніцу, **25 кастрычніка 1929 г.**, адбыўся імклівы абвал акцый на нью-ёркскай фондавай біржы. Пачалося масавае банкруцтва банкаў, а затым і прадпрыемстваў. Неўзабаве фінансавы крызіс перарос у сусветны эканамічны крызіс, які меў катастрафічныя наступствы для эканомік многіх краін. Ён набыў глабальны характар не толькі па колькасці краін, але і па колькасці закранутых ім галін эканомікі. У найбольшай ступені пацярпелі прамысловасць, фінансавая сістэма і сельская гаспадарка. Масавы характар набылі беспрацоўе, збядненне і голад. Да пачатку 1932 г. у заходніх краінах цалкам беспрацоўных налічвалася больш за 26 млн чалавек. Агульнай прычынай крызісу стала перавытворчасць тавараў і цыклічнае развіццё капіталізму. Асноўнымі прычынамі крызісу сталі парушэнне традыцыйных сусветных гаспадарчых сувязей у гады Першай сусветнай вайны і пасля яе, эканамічны бум 1920-х гг., у выніку якога з'явілася шмат фінансавых пірамід, спекулятыўных фірм і арганізацый. Біржавыя спекуляцыі, прадастаўленне не забяспечаных рэальнымі таварамі крэдытаў набылі шырокі размах. Канцэнтрацыя вытворчасці і капіталу, панаванне манаполій у эканоміцы заходніх краін таксама сталі важнымі фактарамі ўзнікнення і паглыблення крызісу. Штучнае падтрыманне манаполіямі высокага ўзроўню цэн цягнула за сабой зніжэнне плацежаздольнасці насельніцтва.



Чарга ў бясплатныя сталовыя. Чыкага. 1929 г.



Правообладатель Народная асвета

У найбольшай ступені крызіс закрануў эканоміку ЗША і Германіі. У 1932 г., калі крызіс дасягнуў найбольшай глыбіні, спад прамысловай вытворчасці ў Германіі склаў 54 % ад узроўню 1928 г., а ў ЗША — 46 %. Цалкам беспрацоўнымі ў канцы 1932 г. у Германіі былі 6 млн чалавек, а ў ЗША — каля 17 млн. Рэальная заработная плата амерыканскіх рабочых знізілася на 35 %, у Германіі — на 50 %. Ва ўмовах крызісу Германія з 1932 г. перастала выплачваць рэпарацыі. У ЗША разарыліся 900 тыс. фермерскіх гаспадарак і 5,5 тыс. банкаў. Масавы голад, галеча і самазабойствы людзей сталі тыповымі праяўленнямі крызісу ў тыя гады.

Рэспубліканская адміністрацыя Г. Гувера ў ЗША зрабіла спробу спыніць крызіс шляхам размеркавання субсідый і пазык. Для гэтага была створана Рэканструктыўная фінансавая карпарацыя. Яна ўклала ў эканоміку 2 млрд доларaў, аднак гэта не прывяло да яе ажыўлення. Таксама безвынікова скончылася спроба створанага Федэральнага фермерскага ўпраўлення правесці масавую скупку сельскагаспадарчых тавараў, каб не дапусціць рэзкага зніжэння цэн. Дзяржаўныя субсідыі і пазыкі ма-




Сусветны эканамічны крызіс 1929—1933 гг. у вядучых капіталістычных краінах



Правообладатель Народная асвета

наполіям не апраўдалі сябе, на непасрэднае дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі адміністрацыя Гувера не пайшла.

У Англіі крызіс пачаўся пазней, чым у іншых краінах, і не меў такіх катастрафічных наступстваў, як у Германіі. Узровень вытворчасці ў Англіі знізіўся на 23 %, беспрацоўе ахапіла каля 3 млн чалавек. З дапамогай калоній (перш за ўсё Індыі) і Брытанскай Садружнасці нацый Англія здолела змякчыць наступствы эканамічнага крызісу. У Францыі крызіс працягваўся да 1936 г. і меў два кульмінацыйныя пункты: 1932 і 1935 гг., калі аб'ём прамысловай вытворчасці скараціўся на 44 %. У Італіі прамысловая вытворчасць паменшылася на 30 %, колькасць беспрацоўных перавысіла 1 млн чалавек.

**«Новы курс» у ЗША.** Масавае беспрацоўе і рух беспрацоўных, два нацыянальныя «галодныя паходы» на Вашынгтон, выступленне дзясяткаў тысяч ветэранаў вайны ў Вашынгтоне, якое было падаўлена ў чэрвені 1932 г. з дапамогай арміі, яшчэ больш абвастрылі сацыяльна-палітычную сітуацыю ў ЗША. У такіх умовах у лістападзе 1932 г. перамогу на прэзідэнцкіх выбарах атрымалі дэмакраты на чале з губернатарам штата Нью-Ёрк **Ф. Д. Рузвельтам**. Ён і яго каманда прапанавалі з мэтай выхаду краіны з крызісу хутка правесці ліберальныя рэформы, ці **«новы курс»**.

Тэарэтычнай асновай «новага курсу» стала эканамічнае вучэнне *Д. Кейнса* (Англія) і яго паслядоўнікаў. Прыхільнікі кейнсіянства выступалі за актыўнае дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі, а таксама попыту і прапановы тавараў і паслуг. Вялікую ўвагу яны надавалі павышэнню плацежаздольнасці грамадзян і паляпшэнню іх сацыяльнага становішча. Кейнсіянства з'яўлялася адной з форм буржуазнага рэфармізму і ідэалогіі неалібералізму.



Прэзідэнт Ф. Д. Рузвельт абвяшчае свой «новы курс»

Заняўшы пасаду прэзідэнта, Ф. Д. Рузвельт яшчэ да адкрыцця сесіі кангрэса ўвёў надзвычайнае становішча ў краіне і зачыніў усе банкі. 9 сакавіка кангрэс прыняў банкаўскі закон, паводле якога прэзідэнт адкрываў толькі «здаровыя» банкі, астатнія падвяргаліся рэарганізацыі ці закрыццю. Адміністрацыя Ф. Д. Рузвельта ўзяла на сябе рэфінансаванне даўгоў, адмовілася ад залатога стандарту долара і правяла яго *дэвальвацыю* — паніжэнне курсу долара. Быў устаноўлены дзяр-



Правообладатель Народная асвета

жаўны кантроль за банкаўскімі аперацыямі, былі пашыраны кантрольныя функцыі Федэральнай рэзервовай сістэмы. Гэтыя мерапрыемствы выратавалі ад поўнага краху фінансавую сістэму краіны. У чэрвені 1933 г. быў прыняты закон аб аднаўленні прамысловасці. У адпаведнасці з ім былі выпрацаваны «кодэксы сумленнай канкурэнцыі», якія зацвердзіў прэзідэнт. У кодэксах вызначаліся ўмовы і аб'ём вытворчасці, шляхі збыту тавараў, мінімальны ўзровень цэн. Гэтыя кодэксы прывялі да ўмацавання працэсу картэлявання ў прамысловасці. У кодэксах фіксаваліся таксама мінімальны ўзровень заработнай платы, працягласць рабочага тыдня, а таксама права рабочых на стварэнне прафсаюзаў і заключэнне калектыўных дагавораў. Кантроль за ажыццяўленнем кодэксаў ускладаўся на Нацыянальную адміністрацыю аднаўлення.

У маі 1933 г. закон аб рэгуляванні сельскай гаспадаркі прадпісваў перабудаваць працу аграрнага сектара эканомікі. Перш за ўсё скарачаліся пасяўныя плошчы зернавых культур і бавоўны. У фермераў было закуплена і знішчана каля 6 млн свіней, выліта вялізная колькасць малака і г. д. На дапамогу сельскай гаспадарцы было выдзелена 2 млрд долараў. Фермерам прадстаўляліся льготныя крэдыты. Адміністрацыя сельскай гаспадаркі кантралявала працэс аказання дапамогі амерыканскай вёсцы.

У сакавіку 1933 г. быў прыняты закон аб дапамозе беспрацоўным, у адпаведнасці з якім былі арганізаваны грамадскія работы, аказана вялікая дапамога беспрацоўным і іх сем'ям. Шырокавядомымі сталі грамадскія работы па рэканструкцыі даліны ракі Тэнэсі, дзе ўзвялі 20 плацін і шмат іншых аб'ектаў. На арганізацыю грамадскіх работ выдзелілі велізарную суму — 3,3 млрд долараў. Узровень беспрацоўя ў ЗША паступова стаў змяншацца. У далейшым у рамках «новага курсу» ўпершыню ў гісторыі ЗША былі прыняты федэральныя законы аб сацыяльным страхаванні і аб працоўных адносінах, якія замацоўвалі сацыяльныя заваёвы насельніцтва краіны. Прадстаўнікі правых рэакцыйных сіл у ЗША супраціўляліся «новаму курсу» Рузвельта і называлі яго марксістам і сацыялістам.

**Сацыяльна-палітычнае развіццё краін Заходняй Еўропы.** Самай характэрнай рысай унутрыпалітычнага жыцця краін Заходняй Еўропы сталі масавыя забастоўкі, сацыяльныя і палітычныя канфлікты, умацаванне рэакцыйных правых сіл і прыход нацыстаў да ўлады ў Германіі. Умацаваліся аўтарытарныя рэжымы ў шэрагу краін Еўропы і фашысцкі рэжым у Італіі. З іншага боку, узмацніліся сацыяльная незадаволенасць і ўплыў камуністаў, сацыял-дэмакратаў і іншых левых сіл.

Найбольш драматычная сацыяльна-палітычная барацьба разгарнулася ў Германіі, дзе ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу стаў хутка нарастаць уплыў НСДАП. У верасні 1930 г. на выбарах у рэйхстаг яна атрымала 18,3 % галасоў



Правообладатель Народная асвета

выбаршчыкаў. Правыя партыі сталі супрацоўнічаць з НСДАП у працэсе барацьбы супраць веймарскай дэмакратыі. Гэта прывяло да ўлады летам 1932 г. рэакцыйны кабінет Ф. Папена, які ажыццявіў дзяржаўны пераварот у Прусіі, адхіліўшы ад улады сацыял-дэмакратычны ўрад. Вынікам стаў працяг умацавання ўплыву нацыстаў, якія на выбарах у рэйхстаг у ліпені 1932 г. сабралі 13,7 млн галасоў выбаршчыкаў (37,4 %), іх фракцыя (230 дэпутатаў) стала самай буйной у парламенце. У лістападзе 1932 г. на пазачарговых выбарах у рэйхстаг НСДАП згубіла значную колькасць галасоў, але засталася самай буйной партыяй у парламенце. Новы кабінет на чале з генералам К. Шлейхерам не здолеў стабілізаваць сацыяльна-палітычную сітуацыю ў краіне. У гэтых умовах **30 студзеня 1933 г.** прэзідэнт П. фон Гіндэнбург назначыў рэйхсканцлерам Германіі фюрара НСДАП А. Гітлера. Нягледзячы на актыўную антыфашысцкую барацьбу КПГ на чале з **Э. Тэльманам** і супраціўленне з боку СДПГ і левых сіл, прадухіліць устанаўленне фашысцкай таталітарнай дыктатуры ў Германіі не атрымалася.

Галоўнымі прычынамі прыходу нацыстаў да ўлады сталі раскол рабочага класа, лёсавызначальныя памылкі КПГ і СДПГ у барацьбе супраць фашызму, крызіс і распад буржуазных партый, выбаршчыкі якіх перайшлі на бок НСДАП, цяжкія наступствы сусветнага эканамічнага крызісу, збяdненне народных мас, якім нацыянал-сацыялісты абяцалі хуткае вырашэнне сацыяльных праблем, падтрымка фашыстаў з боку буйнога капіталу, юнкерства, мілітарысцкіх колаў і чыноўніцтва. Асаблівую ролю ў прыходзе НСДАП да ўлады адыгралі такія фактары, як умелая сацыяльная і нацыянальная дэмагогія нацыстаў, умацаванне ўплыву НСДАП і ператварэнне яе ў важную палітычную сілу, культ фюрара А. Гітлера, які аказаўся таленавітым аратарам, «злым геніем» у палітычнай тактыцы і стратэгіі. Нацысты ўмела эксплуатавалі «версальскі комплекс» немцаў, выкарыстоўвалі ў сваіх інтарэсах расісцкія і рэваншысцкія настроі часткі германскага грамадства.

У 1929—1933 гг. у Італіі ўмацавалася фашысцкая дзяржава, было пашырана фашысцкае сацыяльнае заканадаўства. У Францыі і Англіі фашысцкі рух не атрымаў шырокай падтрымкі і моцнага ўплыву, як у Германіі і Італіі. Ён заставаўся раздробленым і не меў такіх харызматычных правадыроў, як А. Гітлер і Б. Мусаліні. У гэтых краінах захаваліся асновы буржуазна-дэмакратычнага ладу.

Такім чынам, у 1933 г. у Заходняй Еўропе і ЗША абазначыліся тры асноўныя варыянты пераадолення эканамічнага крызісу: буржуазна-рэфармісцкі, неаліберальны варыянт, які ажыццяўляўся ў ЗША («новы курс») і Вялікабрытаніі; таталітарны варыянт рэалізоўваўся ў фашысцкай Італіі і гітлераўскай Германіі; у Францыі, дзе крызіс зацягнуўся да 1936 г., абазначыўся сацыял-рэфармісцкі варыянт выхаду з крызісу, які прадугледжваў частковую нацыяналізацыю вытворчасці,



Правообладатель Народная асвета

планаванне эканомікі, правядзенне значных сацыяльных рэформ. Гэта выявілася ў дзейнасці ўрада Народнага фронту. Дадзены варыянт падтрымлівала і кіраўніцтва Рабочага сацыялістычнага інтэрнацыянала.

?

1. Якія прычыны прывялі да эканамічнага крызісу, які пачаўся ў 1929 г.? Чаму ён прыняў сусветны характар?
2. Якія былі асаблівасці праяўлення сусветнага эканамічнага крызісу ў розных краінах Захаду? Якія краіны пацярпелі ад крызісу найбольш моцна? Чаму?
3. Якія меры былі прапанаваны прэзідэнтам Ф. Д. Рузвельтам для выхаду ЗША з эканамічнага крызісу? Якая эканамічная тэорыя ляжала ў аснове сацыяльна-эканамічнай палітыкі Ф. Д. Рузвельта?
4. Якія шляхі выхаду з крызісу ажыццяўляліся ў краінах Захаду? Ці мелі яны агульныя рысы?
5. Якія былі асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-палітычнага развіцця краін Захаду ў гады сусветнага эканамічнага крызісу?
6. Якія прычыны садзейнічалі прыходу нацыстаў да ўлады ў Германіі?
7. Якія варыянты пераадолення эканамічнага крызісу абазначыліся ў ЗША і Заходняй Еўропе ў 1933 г.? У чым яны выявіліся?

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### З выступлення прэзідэнта ЗША Г. Гувера ў Нью-Ёрку

*22 кастрычніка 1928 г.*

Калі федэральны ўрад пачынае займацца бізнесам, урады штатаў зараз жа пазбаўляюцца права кантраляваць і абкладаць падаткамі гэты бізнес... Бізнес патрабуе цэнтралізацыі, самакіраванне патрабуе дэцэнтралізацыі. Для таго каб наш урад дасягнуў поспеху ў бізнесе, ён павінен фактычна стаць дэспатыяй, што неадкладна прывядзе да разбурэння самакіравання.

...Развіццё бізнесу залежыць ад канкурэнцыі. Новыя метады і новыя ідэі з'яўляюцца прадуктам праявы духу авантурызму, індывідуальнай ініцыятывы і індывідуальнай прадпрымальнасці. Без авантурызму не можа быць прагрэсу. Ні адзін урад не мае права спекуляваць і рызыкаваць грашыма падаткаплацельшчыкаў. Але яшчэ больш важна тое, што лідарства ў бізнесе павінна дасягацца шляхам развіцця здольнасцей і асабістых якасцей, што можа адбывацца толькі ў атмасферы свабоднай канкурэнцыі. Бюракратычны апарат ліквідуе канкурэнцыю. Бясспрэчна, што палітычны выбар з'яўляецца слабай асновай для выбару лідараў прадпрымальніцкай дзейнасці.

*Якія ідэі ляжалі ў аснове эканамічнай палітыкі адміністрацыі Г. Гувера? Чаму адміністрацыя Г. Гувера не здолела прадухіліць наступленне эканамічнага крызісу ў ЗША?*



Правообладатель Народная асвета

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Франклін Дэлана Рузвельт** (1882—1945), дзяржаўны і палітычны дзеяч ЗША. У 1913—1920 гг. у кабінеце В. Вільсана займаў пасаду памочніка міністра ваенна-марскіх сіл. У 1928 г. быў выбраны губернатарам штата Нью-Ёрк, дзе правёў шэраг рэформ, якія вызначылі наперад «новы курс». Змагаўся за захаванне прыродных рэсурсаў і рацыянальнае выкарыстанне зямельнага фонду, за дзяржаўны кантроль над камунальнымі службамі і прыняцце законаў аб сацыяльным забеспячэнні. Садзейнічаў ліквідацыі беспрацоўя і заявіў у заканадаўчым сходзе штата, што аказанне дапамогі беспрацоўным павінна разглядацца ўрадам не як дабрачыннасць, а як абавязак перад грамадствам. У 1932 г. стаў 32-м прэзідэнтам ЗША ад дэмакратычнай партыі. Выбіраўся на гэты пост чатыры разы — адзіны выпадак за ўсю гісторыю ЗША, калі прэзідэнт быў выбраны больш чым на два тэрміны ў парушэнне традыцыі, закладзенай Д. Вашынгтонам. У першыя 100 дзён пасля інаўгурацыі па патрабаванні Белага дома кангрэсам была прынята значная частка законапраектаў «новага курсу». Карыстаўся падтрымкай практычна ўсіх груп насельніцтва. У гады Другой сусветнай вайны выступіў адным з ініцыятараў стварэння і актыўным удзельнікам антыгітлераўскай кааліцыі.



**Эрнст Тэльман** (1886—1944), дзеяч германскага і міжнароднага рабочага руху. У важнейшых пытаннях класавай барацьбы падзяляў пазіцыю К. Лібкнехта і Р. Люксембург, актыўна ўдзельнічаў у Лістападаўскай рэвалюцыі 1918 г. у Германіі. Знаходзячыся ў складзе левага крыла Незалежнай сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (НСДПГ), выступаў за яе ўваходжанне ў Камінтэрн. Летам 1921 г. у якасці дэлегата 3-га кангрэса Камінтэрна ўпершыню наведаў Савецкую Расію. На яго велізарнае ўражанне зрабілі дасягненні Савецкай дзяржавы. Стаў гарачым прыхільнікам сяброўства з СССР. Адыгрываў кіруючую ролю ў Гамбургскім паўстанні (1923). У канцы 1925 г. быў выбраны старшынёй ЦК КПГ. У 1924—1933 гг. прадстаўляў КПГ у рэйхстагу. У 1925 і 1932 гг. вылучаўся на пасаду прэзідэнта краіны. Па яго ініцыятыве ў краіне быў арганізаваны рух, накіраваны на аб'яднанне ўсіх антыфашысцкіх сіл супраць устанаўлення фашысцкай дыктатуры. З 1933 г. — у падполлі. З сакавіка 1933 г. быў арыштаваны гестапаўцамі. Утрымліваўся ў берлінскай турме Маабіт, затым у турмах Гановера і Баўцэна. У жніўні 1944 г. быў дастаўлены ў канцлагер Бухенвальд і забіты па прамым загадзе А. Гітлера.



Правообладатель Народная асвета

## ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**Карпаратыўная сістэма ў Італіі.** У праграме Нацыянальнай фашысцкай партыі (лістапад 1921 г.) была пастаўлена задача стварыць новую эканамічную і сацыяльную сістэму ў Італіі пад назвай «карпаратывізм». Фармальна яе асновай сталі ідэі салідарнасці і сацыяльнай справядлівасці. Карпарацыя — гэта аб'яднанне прадпрымальнікаў, прафсаюзаў і прадстаўнікоў фашысцкай партыі, якое кіравала якой-небудзь галіной эканомікі. У 1934 г. у Італіі было створана 22 карпарацыі, якія ўзначальваў Нацыянальны савет карпарацый. Яны ўстанаўлівалі ўмовы аплаты працы, вытворчыя заданні, нормы працоўнай дысцыпліны, вызначалі сацыяльную палітыку. Фашысцкі карпаратывізм быў адной з форм дзяржаўнага рэгулявання эканамічнага і сацыяльнага жыцця краіны.

# § 6. Заходні свет напярэдадні Другой сусветнай вайны

**Успомніце:** У якіх заходнееўрапейскіх краінах і калі фашысты прыйшлі да ўлады? Якія прычыны гэтаму садзейнічалі?

**Зацвярджэнне фашысцкага рэжыму ў Германіі.** Кабінет міністраў, які 30 студзеня 1933 г. узначаліў *А. Гітлер*, з'яўляўся кааліцыйным, у ім пераважалі кансерватары-нацыяналісты. Імкнучыся атрымаць абсалютную ўладу, А. Гітлер дабіўся правядзення датэрміновых выбараў у рэйхстаг, якія былі прызначаны на 5 сакавіка. Каб падавіць апазіцыю, фашысты выкарысталі падпал рэйхстага 27 лютага. Яны абвінавацілі ў гэтым камуністаў. На наступны дзень быў выдадзены дэкрэт прэзідэнта аб абароне нямецкага народа і дзяржавы, які адмяніў свабоду сходаў, саюзаў, слова, друку і абмежаваў тайну перапіскі і недатыкальнасць прыватнай уласнасці. Асноўныя правы і свабоды грамадзян былі адменены. Фактычна была забаронена КПГ. Дэкрэт стаў заканадаўчай асновай распачатага тэрору нацыстаў супраць камуністаў і сацыял-дэмакратаў. Многія кіраўнікі КПГ і СДПГ былі арыштаваны. Штурмавым атрадам (СА) і ахоўным атрадам (СС) НСДАП быў нададзены статус дапаможнай паліцыі. У Германіі з'явіліся першыя буй-



Падпал рэйхстага. Люты 1933 г.



Правообладатель Народная асвета

ныя *канцэнтрацыйныя лагеры* — Дахау і Араніенбург.



Нацысты спальваюць кнігі

Нават ва ўмовах фашысцкага тэрору НСДАП на выбарах у рэйхстаг не здолела набраць абсалютнай большасці галасоў. За яе прагаласавалі 17,2 млн выбаршчыкаў (43,9 %). Аднак разам з дэпутатамі ад ННПП нацысты мелі большасць у рэйхстагу. Імкнучыся аслабіць КПГ і СДПГ, фашысты, парушаючы канстытуцыю, анулявалі дэпутацкія мандаты камуністаў і не дапусцілі на пасяджэнне рэйхстага многіх сацыял-дэмакратаў. Аказаўшы ціск на партыю Цэнтр, А. Гітлер дабіўся прыняцця рэйхстагам 23 сакавіка 1933 г. закона аб ліквідаванні гаротнага становішча народа і дзяржавы. Гэты закон, па сутнасці, замацаваў дзяржаўны пераварот, здзейснены фашыстамі ў перыяд з 27 лютага па 23 сакавіка 1933 г. Згодна з законам урад Гітлера атрымаў надзвычайныя паўнамоцтвы і права выдаваць заканадаўчыя акты. Пасля гэтага рэйхстаг ператварыўся ў безуладны орган, які стаў шырмай для фашысцкага рэжыму.

Прынятыя надзвычайныя законы паскорылі працэс фашызацыі Германіі, які атрымаў назву «ўніфікацыі» грамадска-палітычнага жыцця краіны. Галоўным зместам уніфікацыі стала зацвярджэнне аднапартыйнага панавання НСДАП, ліквідацыя веймарскага федэралізму і стварэнне цэнтралізаванай фашысцкай дзяржавы. У сакавіку 1933 г. былі распушчаны ўрады большасці нямецкіх зямель, іх правы былі абмежаваны. У красавіку нацысты ўвялі пасады імперскіх *штатгальтараў* (намеснікаў), якія атрымалі права кантраляваць і адхіляць ад улады зямельныя ўрады. Штатгальтарамі станавіліся, як правіла, *гаўляйтары* — кіраўнікі правінцыйных арганізацый НСДАП. У пачатку 1934 г. былі ліквідаваны ландтагі (парламенты) зямель.

Паралельна з ліквідацыяй аўтаноміі зямель ішоў працэс знішчэння прафсаюзаў і палітычных партый. У маі 1933 г. замест прафсаюзаў быў утвораны Нямецкі працоўны фронт, неўзабаве былі распушчаны фабзаўкамы, а замест іх на прадпрыемствах уведзены «саветы давераных». У 1935 г. з мэтай кантролю над рабочымі былі ўведзены «працоўныя кніжкі», пасля гэтага стала абавязковай працоўная павіннасць для дарослых немцаў. Летам 1933 г. былі, па сутнасці, ліквідаваны палітычныя партыі. У снежні 1933 г. закон «Аб забеспячэнні адзінства партыі і дзяржавы» зацвярджаў аднапартыйную дыктатуру НСДАП у Германіі і ператварэнне яе ў партыйную дзяржаву, якая мела таталітарны характар. Гэтаму садзейнічала кан-



Правообладатель Народная асвета

цэнтрацыя ўлады ў руках А. Гітлера. У чэрвені 1934 г. у «ноч доўгіх нажоў» А. Гітлер з дапамогай арміі і СС падавіў апазіцыю ўнутры партыі. Штурмавыя атрады (СА) НСДАП выступілі за паглыбленне нацыянальнай рэвалюцыі і выкананне «сацыялістычных» пунктаў праграмы нацыстаў. А. Гітлер рэзка асудзіў гэту палітыку. Лідар СА Э. Рэм і яго паплечнікі былі забіты, загінулі і многія іншыя праціўнікі рэжыму. У жніўні 1934 г. памёр прэзідэнт Германіі П. фон Гіндэнбург. Пасля гэтага А. Гітлер прысвоіў пажыццёва паўнамоцтвы прэзідэнта і афіцыйна стаў называцца «фюрарам і рэйхсканцлерам».

У эканамічнай галіне нацысты захавалі прыватную ўласнасць, але істотна абмежавалі рынкавыя адносіны і перайшлі да дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Была зменена сістэма кіравання эканомікай. На саслоўна-прадстаўнічай аснове былі створаны спецыяльныя органы галіновага і тэрытарыяльнага кіравання эканомікай. У 1933 г. было ўтворана Харчовае саслоўе, якое рэгулявала сельскую гаспадарку і праводзіла аграрную рэформу. Паводле закона аб спадчынных дварах жыхары нямецкай вёскі падзяляліся на дзве катэгорыі: сялян і сельскіх гаспадароў. Уласнікамі зямлі (да 125 га) маглі быць толькі немцы-арыйцы, якія былі абавязаны перадаваць спадчынныя двары старэйшым сынам. Для кіраўніцтва астатнімі галінамі эканомікі ўтваралася Арганізацыя прамысловай гаспадаркі, якая складалася з 7 імперскіх груп: прамысловасці, энергетыкі, рамяства, гандлю, транспарту, банкаўскай і страхавой справы. На месцах эканомікай кіравалі акруговыя і раённыя палаты, якія падпарадкоўваліся Імперскай эканамічнай палаце. У 1936 г. у Германіі быў прыняты 4-гадовы план развіцця эканомікі, галоўнай задачай якога стала развіццё ваеннай прамысловасці і падрыхтоўка Германіі да вайны.

**Расходы на ўзбраенне ў Германіі (1932—1943 гг.)**

| | 1932 г. | 1934 г. | 1936 г. | 1938 г. | 1940 г. | 1943 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| У млрд марак | 0,6 | 4,2 | 10,3 | 17,2 | 58,1 | 117,9 |
| % у адносінах да ўсіх расходаў | 8,2 | 39,3 | 59,2 | 61,0 | 78,0 | 81,0 |
| % у адносінах да мірнай прадукцыі | 1,1 | 5,0 | 11,2 | 15,7 | 40,0 | 70,0 |

Мілітарызацыя, прымусовая праца і выкарыстанне рабскай сілы зняволеных канцлагераў сталі характэрнай рысай фашысцкай мадэлі эканамічнага жыцця. Шляхам прыняцця надзвычайных эканамічных мер было значна скарочана беспрацоўе.



Правообладатель Народная асвета

**Беспрацоўе ў Германіі (1933—1939 гг.)**

| На 1 студзеня | Беспрацоўныя | На 1 студзеня | Беспрацоўныя |
|---|---|---|---|
| 1933 г. | 4 804 428 | 1937 г. | 912 312 |
| 1934 г. | 2 718 309 | 1938 г. | 429 461 |
| 1935 г. | 2 151 039 | 1939 г. | 119 915 |
| 1936 г. | 1 592 655 | 1939 г., ліпень | 38 379 |

Усе 12 гадоў гітлераўскай дыктатуры жорстка праследаваліся антыфашысцкія сілы. Асаблівую ўвагу нацысты надавалі ажыццяўленню сваёй расавай палітыкі. У верасні 1935 г. былі прыняты так званыя Нюрнбергскія законы. Паводле закона аб імперскім грамадзянстве яўрэяў пазбавілі ўсіх палітычных і грамадзянскіх правоў, а паводле закона аб абароне нямецкай крыві і нямецкага гонару яўрэям забаранялася браць шлюб і нават знаходзіцца ў сяброўскіх адносінах з немцамі-арыйцамі. Пасля забойства яўрэем нямецкага дыпламата ў Парыжы нацысты справакавалі ў ноч *з 8 на 9 лістапада 1938 г.* усегерманскі антыяўрэйскі пагром. Былі спалены і разгромлены яўрэйскія сінагогі, крамы, разрабаваны дамы яўрэяў, канфіскавана іх маёмасць, больш за 30 тыс. яўрэяў адпраўлены ў канцлагеры. Гэтая падзея атрымала назву *«хрустальная ноч»,* паколькі многія вуліцы былі засыпаны асколкамі шкла ад разбітых вітрын. Фашысты ў Германіі праводзілі супраць яўрэяў палітыку **генацыду** — праследавання і знішчэння народаў па расавых прыкметах. Састаўной часткай генацыду з'явілася арганізацыя яўрэйскіх **гета** — спецыяльна адведзеных для яўрэяў ізаляваных месцаў пражывання. Усе яўрэі абавязваліся насіць нашыты на адзенні спецыяльны знак — жоўтую шасціканцовую зорку Давіда.

**Народны фронт у Францыі.** У 1932 г. у Францыі да ўлады ізноў прыйшоў Левы блок на чале з радыкаламі. Рэакцыйныя сілы і фашысты ў 1933—1934 гг. разгарнулі актыўную барацьбу супраць камуністаў, сацыялістаў і дэмакратаў. Фашысцкі рух у Францыі прадстаўлялі тры буйнейшыя арганізацыі: «Баявыя крыжы», «Французскае дзеянне» і «Патрыятычная моладзь». Акрамя іх, існавалі дзясяткі іншых фашысцкіх і прафашысцкіх ліг і груп. 6 лютага 1934 г. каля 40 тыс. фашыстаў штурмавалі парламент з мэтай дзяржаўнага перавароту. Паліцыя адкрыла агонь, і фашысты адступілі. 17 чалавек было забіта, больш за 2 тыс. паранена. Урад радыкалаў быў вымушаны скласці свае паўнамоцтвы.

Ва ўмовах рэальнай пагрозы фашызму абазначылася збліжэнне паміж камуністамі, сацыялістамі і радыкаламі. ФКП на чале з М. Тарэзам і М. Кашэнам адмовілася ад левасектанцкіх установак Камінтэрна і стала на пазіцыі стварэння шырокага антыфашысцкага блока, які ўвайшоў у гісторыю пад назвай **Народны фронт**.



Правообладатель Народная асвета

У 1934—1935 гг. у Францыі адбыліся буйныя антыфашысцкія забастоўкі і дэманстрацыі, быў падпісаны пакт аб адзінстве дзеянняў паміж сацыялістамі і камуністамі. Для арганізацыі дэманстрацыі ў гадавіну ўзяцця Бастыліі 14 ліпеня 1935 г. быў створаны Нацыянальны камітэт Народнага фронту, куды ўвайшлі камуністы, сацыялісты і радыкалы. На парламенцкіх выбарах у **красавіку — маі 1936 г.** Народны фронт атрымаў перамогу. Урад Народнага фронту на чале з сацыялістам **Леонам Блюмам** ажыццявіў шэраг дэмакратычных пераўтварэнняў. Былі распушчаны і раззброены фашысцкія арганізацыі, праведзена нацыяналізацыя чыгункі і частковая нацыяналізацыя ваеннай прамысловасці, устаноўлены дзяржаўны кантроль над Французскім банкам, уведзены 8-гадзінны рабочы дзень і 5-дзённы рабочы тыдзень, пашыраны правы прафсаюзаў і сацыяльнае заканадаўства. У канцы 1930-х гг. абвастрыліся супярэчнасці ўнутры Народнага фронту, што прывяло да яго распаду.

**Народны фронт і грамадзянская вайна ў Іспаніі.** У пачатку 1930-х гг. у Іспанскай рэспубліцы (была абвешчана ў сакавіку 1931 г.) узмацніўся фашысцкі рух. У лютым 1934 г. фашысты аб'ядналіся ў адну партыю — Іспанскую фалангу і Нацыянал-сіндыкалісцкую хунту наступлення. Аснову яе ідэалогіі склалі ідэі італьянскага і германскага фашызму, а таксама палітычныя ўстаноўкі рэакцыйнай каталіцкай царквы і кансерватыўных сіл. У барацьбе супраць фашызму ў студзені 1936 г. быў падпісаны пакт аб стварэнні **Народнага фронту** ў складзе сацыялістаў, камуністаў, левацэнтрысцкіх рэспубліканскіх партый. На выбарах у картэсы ў **лютым 1936 г.** Народны фронт атрымаў упэўненую перамогу. Яго ўрад пачаў праводзіць глыбокія дэмакратычныя рэформы.

У барацьбе супраць Народнага фронту фашыстаў падтрымалі ваенныя колы. **17 ліпеня 1936 г.** генерал **Ф. Франка** ўзначаліў мяцеж супраць рэспублікі. У Іспаніі пачалася грамадзянская вайна, якая набыла міжнародны характар. Краіны Захаду ў адносінах да Іспаніі сталі праводзіць *палітыку «неў-*




Грамадзянская вайна ў Іспаніі (1936—1939 гг.)



Правообладатель Народная асвета



Англійскія, нямецкія, французскія добраахвотнікі, якія прыбылі на пункт фарміравання інтэрбрыгад у г. Альбасетэ (Іспанія). 1936 г.

*мяшальніцтва»*, нейтралітэту, якая была на карысць фашыстам. Выкарыстоўваючы бяздзейнасць заходніх краін і Лігі Нацый, Германія накіравала на дапамогу іспанскім фашыстам войскі колькасцю больш за 50 тыс., а Італія — больш за 200 тыс. чалавек. Антыфашыстаў сталі падтрымліваць СССР, Камінтэрн, прагрэсіўныя сілы ўсяго свету. У Іспанію накіроўваліся шматлікія антыфашысцкія добраахвотнікі, якія аб'ядноўваліся ў **інтэрнацыянальныя брыгады**.

Да красавіка 1937 г. адбылася кансалідацыя фашысцкіх сіл. Аб'яўлены генералісімусам Ф. Франка ўзначаліў фашысцкую партыю. Яму быў нададзены тытул *«каўдыльё»* — правадыра іспанскага фашызму. У сакавіку 1939 г. фашысты здолелі з дапамогай *«пятай калоны»* ўзяць Мадрыд. У краіне ўсталявалася фашысцкая дыктатура.

**Антыфашысцкі рух.** Прыход фашыстаў да ўлады ў Германіі, узмацненне фашысцкага руху ў Еўропе прымусілі кіраўніцтва Камінтэрна змяніць стратэгію і тактыку барацьбы супраць фашызму. У канцы 1933 г. Выканкам Камінтэрна выпрацаваў азначэнне паняцця «фашызм», пад якім разумелася «адкрытая тэрарыстычная дыктатура найбольш рэакцыйных, найбольш шавіністычных і найбольш імперыялістычных элементаў фінансавага капіталу». У гэтым азначэнні не былі ўлічаны іншыя якасныя характарыстыкі фашызму, такія як аднапартыйная дыктатура, адзіная афіцыйная ідэалогія, псеўдасацыялістычная праграма, расізм, масавая сацыяльная база. Але яно правільна вызначала дыктатарскую сутнасць фашысцкіх рэжымаў. Адзін з кіраўнікоў Камінтэрна, лідар балгарскіх камуністаў Г. Дзімітроў, а таксама кіраўніцтва ФКП выступілі супраць сектанцкай тактыкі камуністаў «клас супраць класа» і атаясамлення сацыял-дэмакратыі з левым крылом фашызму (сацыял-фашызм). Летам 1935 г. VII кангрэс Камінтэрна зацвердзіў новую стратэгію і тактыку камуністычнага руху з мэтай стварэння адзінага антыфашысцкага Народнага фронту і **адзінага нацыянальнага антыімперыялістычнага фронту**. Гэта садзейнічала згуртаванню антыфашысцкіх сіл у барацьбе з фашызмам як унутры асобных краін, так і ў міжнародным маштабе.

У 1930-х гг. найбольш актыўная антыфашысцкая барацьба адбывалася ў Аўстрыі. Яшчэ ў ліпені 1927 г. аўстрыйскія камуністы і сацыял-дэмакраты аказалі ўзброенае супраціўленне рэакцыйным фашысцкім сілам. Новае ўзброенае паўстанне супраць фашызму адбылося ў Вене ў лютым 1934 г. Асаблівасцю антыфашысцкай барацьбы ў Аўстрыі з'яўлялася тое, што яна вялася супраць двух відаў фашызму — аўстрафашызму і аўстрыйскага нацыянал-сацыялізму. Аўстрафашысты абапіраліся



Правообладатель Народная асвета

на падтрымку каталіцкай царквы і арыентаваліся на Італію. У ходзе ўнутранай барацьбы ў фашысцкім лагеры нацыянал-сацыялісты ў ліпені 1934 г. зрабілі спробу дзяржаўнага перавароту і забілі канцлера-аўстрафашыста *Э. Дольфуса*.

Антыфашысцкае супраціўленне ў Германіі ва ўмовах тэрору не набыло шырокага размаху. Разам з тым існавала некалькі буйных падпольных арганізацый і груп, сярод якіх вылучалася «Чырвоная капэла».

У Францыі ў 1932—1934 гг. узнік шырокі антываенны і антыфашысцкі рух, які стаў асновай для правядзення міжнародных антываенных і антыфашысцкіх кангрэсаў у Амстэрдаме і Парыжы (у зале Плееель). Пасля гэтага ў некаторых краінах Еўропы сталі ствараццa камітэты руху «Амстэрдам-Плееель». У Францыі гэты рух узначаліў Нацыянальны камітэт барацьбы супраць фашызму і вайны, у які ўвайшлі камуністы і прадстаўнікі дэмакратычных сіл (М. Кашэн, А. Барбюс, Р. Ралан і інш.).

?

1. У аснове нацысцкай ідэалогіі ляжала расісцкая тэорыя. Як гэта тэорыя праявілася ва ўнутранай палітыцы Германіі?
2. На аснове аналізу дзяржаўнага ладу Германіі, які склаўся ў 1933—1939 гг., вызначыце характэрныя рысы таталітарнага рэжыму.
3. У якіх заходнееўрапейскіх краінах стала магчымым аб'яднанне антыфашысцкіх сіл? Чаму? Якую форму прыняло аб'яднанне левых сіл у гэтых краінах?
4. Ахарактарызуйце грамадзянскую вайну ў Іспаніі. Чаму грамадзянская вайна ў Іспаніі набыла міжнародны характар?

## ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

### З успамінаў генерала арміі П. І. Батава «Першы бой з фашызмам»

Як і ўсе савецкія камандзіры, выхаваныя Камуністычнай партыяй у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму, я быў да глыбіні душы ўзрушаны падзеямі ў Іспаніі.

Сотні, тысячы рапартаў пісаліся ў тыя дні ў часцях і падраздзяленнях Чырвонай Арміі з просьбай паслаць добраахвотнікам у Іспанію, каб там, за далёкімі Пірэнеямі, стаць у баявыя шэрагі змагароў за справядлівую справу іспанскага народа, даць адпор ваяўнічаму фашызму.

...аднойчы мне паведамілі, што маё хадайніцтва задаволена і я залічаны ў групу ваенных саветнікаў. Мне было даверана ўдзельнічаць у барацьбе рэвалюцыйнай Іспаніі супраць цёмных сіл рэакцыі, змагацца з фашызмам у адным страі з лепшымі людзьмі свету, сапраўднымі рыцарамі міжнароднага пралетарскага руху...

Мяне шчыра ўзрадавалі намаганні іспанскіх камуністаў, якія рабілі ўсё магчымае для ўмацавання абароны Мадрыда. З глыбокім задавальненнем прыняў я прапанову выехаць у 1-ю брыгаду... і прыняць непасрэдны ўдзел у першым буйным контрнаступленні рэспубліканскіх войскаў, якое рыхтавалася.

...Брыгадзе па штату было прызначана мець 4000 чалавек, 51 кулямёт і 12 гармат, у наяўнасці ж было 3000 чалавек, 30 кулямётаў і 4 гарматы.



Правообладатель Народная асвета

Усю ноч на 28 кастрычніка і да паўдня мы з камандзірам брыгады і некаторымі афіцэрамі штаба вучылі байцоў карыстацца савецкімі станковымі і англійскімі ручнымі кулямётамі.

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Леон Блюм** (1872—1950), французскі палітычны і дзяржаўны дзеяч. Займаўся літаратурнай дзейнасцю, быў тэатральным і літаратурным крытыкам. У 1902 г. уступіў у Французскую сацыялістычную партыю. Выступіў супраць яе далучэння да Камінтэрна і з'явіўся адным з галоўных арганізатараў яе расколу. Палітычны курс Блюма быў у вядомай ступені супярэчлівым. Будучы праціўнікам камунізму і Савецкага Саюза, у 1934 г. пайшоў на адзінства дзеянняў з камуністамі. Узначальваў урады Народнага фронту, якія ажыццявілі шэраг значных сацыяльных рэформ. Падтрымліваў палітыку неўмяшання ў іспанскія справы і многія напрамкі палітыкі «супакойвання» Германіі, але выступіў супраць Мюнхенскага пагаднення. У гады вайны адмовіўся пакінуць краіну. Пры скліканні Нацыянальнага сходу ў Вішы быў адным з 80 дэпутатаў, якія галасавалі супраць прадастаўлення надзвычайных паўнамоцтваў маршалу А. Петэну. Утрымліваўся ў канцэнтрацыйным лагеры Бухенвальд. У маі 1945 г. быў вызвалены саюзнікамі. У канцы 1946 г. ненадоўга ўзначаліў дзяржаву і ўрад, быў таксама прадстаўніком Францыі ў ЮНЕСКА.



**Франсіска Баамондэ Франка** (1892—1975), дыктатар Іспаніі (1939—1975). У 1936 г. узначаліў ваенна-фашысцкі мяцеж супраць Іспанскай рэспублікі. Германія і Італія накіравалі Франка войскі і ўзбраенне, што шмат у чым абумовіла перамогу мяцежнікаў. У 1939 г. пасля падзення рэспублікі быў абвешчаны ваеннай хунтай пажыццёвым кіраўніком («каўдыльё») іспанскай дзяржавы. Адначасова заняў пасады правадыра Іспанскай фалангі, старшыні Савета Міністраў і галоўнакамандуючага ўсімі ўзброенымі сіламі. У Другой сусветнай вайне Іспанія засталася ў ліку дзяржаў, якія не ваявалі, хаця Франка не хаваў сваіх сімпатый і аказваў падтрымку лідарам дзяржаў «восі Берлін — Рым — Токіа».

## ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**Інтэрнацыянальныя брыгады** — баявыя злучэнні, якія змагаліся на баку Іспанскай рэспублікі ў перыяд грамадзянскай вайны (1936—1939). Складаліся з добраахвотнікаў — камуністаў, сацыялістаў і антыфашыстаў іншых палітычных напрамкаў, якія прыбылі ў Іспанію з 54 краін. Агульная колькасць інтэрбрыгадаўцаў складала каля 35 тыс. чалавек. Брыгады фарміраваліся ў



Правообладатель Народная асвета

асноўным па прынцыпе нацыянальнай прыналежнасці. Батальёны брыгад насілі імёны Гарыбальдзі, Тэльмана, Міцкевіча, Дамброўскага, Анры Барбюса, Лінкальна, Дзімітрова і іншых выдатных рэвалюцыянераў, удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху, дэмакратычных дзеячаў. Інтэрбрыгады ўдзельнічалі ў абароне Мадрыда і ў іншых буйнейшых баях. У іх складзе змагаліся італьянец Л. Лонга (Гала), паляк К. Свярчэўскі (Вальтэр), венгр Матэ Залка (Лукач), амерыканскі пісьменнік Э. Хемінгуэй і шмат іншых вядомых антыфашыстаў. У Іспаніі ваявала каля 3 тыс. савецкіх добраахвотнікаў. Сярод іх былі такія вядомыя савецкія военачальнікі, як Р. Я. Маліноўскі, К. А. Мерацкоў, П. І. Батаў, арганізатар партызанскага руху В. З. Корж, двойчы Герой Савецкага Саюза лётчык С. І. Грыцавец. У кастрычніку 1938 г. па рашэнні рэспубліканскага ўрада інтэрбрыгады былі эвакуіраваны.

**«Пятая калона».** Тэрмін «пятая калона» належыць іспанскаму генералу Э. Моле, які камандаваў войскам франкістаў падчас грамадзянскай вайны ў Іспаніі. Наступаючы на Мадрыд, ён перадаў па радыё ў пачатку кастрычніка 1936 г. зварот да насельніцтва іспанскай сталіцы, у якім заявіў, што, акрамя наяўных у яго распараджэнні чатырох вайсковых калон, ён мае пятую калону ў самім Мадрыдзе, якая ў вырашальны момант ударыць з тылу. «Пятай калонай» называюць варожую агентуру ўнутры краіны ці грамадскага руху, якая шляхам падрыўных дзеянняў знутры спрыяе перамозе варожых знешніх сіл.

## § 7. Міжнародныя адносіны ў 1930-я гг.

**Успомніце:** Калі і з якой мэтай была створана Ліга Нацый? Чаму ў Германіі ў 1920 — 1930-я гг. былі моцнымі рэваншысцкія настроі?

**Крызіс і крах Версальска-Вашынгтонскай сістэмы.** У пачатку 1930-х гг. у сувязі з сусветным эканамічным крызісам заходнія дзяржавы вымушаны былі пагадзіцца з адменай выплаты рэпарацый з боку Германіі, што з'яўлялася рэвізіяй умоў Версальскага мірнага дагавора. У *1932 г.* на канферэнцыі па раззбраенні ў *Жэневе* Германія дабілася прызнання прынцыпу «роўнасці ва ўзбраеннях», што адкрыла для яе магчымасць перагляду ваенных абмежаванняў Версаля.

З прыходам НСДАП да ўлады Германія ўзяла курс на поўны перагляд і ліквідацыю Версальскай сістэмы і пашырэнне ўласнай «жыццёвай прасторы» за кошт іншых краін. У **кастрычніку 1933 г.** фашысцкая Германія выйшла з Лігі Нацый. Яна стала павялічваць армію і рыхтавацца да правядзення агрэсіўных акцый у Еўропе. У *1935 г.* Германія ў выніку плебісцыту вярнула сабе Саарскую вобласць. Тады ж у Германіі была ўведзена ўсеагульная воінская павіннасць і праведзена рэфармаванне арміі — *вермахта*. Ваенна-марское пагадненне Германіі



Правообладатель Народная асвета

з Англіяй у *чэрвені 1935 г.* давала магчымасць фашыстам павялічыць магутнасць флоту. *7 сакавіка 1936 г.* вермахт заняў Рэйнскую дэмілітарызаваную зону. Такім чынам, у 1935—1936 гг. Германіі ўдалося па сутнасці дабіцца фактычнай адмены ўмоў Версальскага мірнага дагавора і стварыць у Еўропе першы *ачаг ваеннай небяспекі* і новай сусветнай вайны. Фашысцкая Італія таксама імкнулася рэалізаваць свае захопніцкія планы і *восенню 1935 г.* развязала агрэсію супраць Абісініі (Эфіопіі).

На Далёкім Усходзе Японія пачала рэалізацыю сваіх агрэсіўных планаў. У *1931—1932 гг.* яна акупіравала Маньчжурыю і стварыла там марыянетачную дзяржаву *Маньчжоў-Го*. У 1933 г. Японія выйшла з Лігі Нацый. Пасля гэтага яна пашырыла агрэсіўныя акцыі ў Кітаі і ў *ліпені 1937 г.* пачала буйнамаштабную вайну, захапіўшы Цэнтральны Кітай і іншыя рэгіёны краіны. Такім чынам, і ў Азіі ўзнік ачаг сусветнай вайны.

**Агрэсіўная палітыка фашысцкіх дзяржаў у 1936—1939 гг.** У гэтыя гады аформіўся ваенна-палітычны саюз трох асноўных агрэсіўных дзяржаў — Германіі, Італіі і Японіі. У *кастрычніку 1936 г.* адбылося падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Германіяй і Італіяй. Яны дамовіліся аб размежаванні сфер уплыву на Балканах і ў Дунайскім басейне, а таксама ўзгаднілі свае дзеянні ў вайне супраць Іспанскай рэспублікі. Германія прызнала захоп Эфіопіі Італіяй. **25 лістапада 1936 г.** *Германія* і *Японія* заключылі **Антыкамінтэрнаўскі пакт**. Яны абавязваліся весці сумесную барацьбу супраць Камінтэрна, а ў сакрэтным дадатку да пакта дамовіліся аб тым, што ў выпадку вайны аднаго з бакоў з СССР другі бок будзе ствараць спрыяльныя ўмовы для вядзення вайны. У **лістападзе 1937 г.** да пакта далучылася *Італія*. Палітычны саюз трох агрэсіўных дзяржаў атрымаў назву *«восі (трохвугольніка) Берлін — Рым — Токіа»*.

У лістападзе 1937 г. на сакрэтнай нарадзе з армейскім кіраўніцтвам А. Гітлер выклаў план агрэсіўных дзеянняў у Еўропе. Першымі ахвярамі Германіі павінны былі стаць Аўстрыя і Чэхаславакія. У лютым 1938 г. нацысты ўзмацнілі ціск на Аўстрыю, патрабуючы змяніць склад аўстрыйскага ўрада і паставіць на чале яго нацыянал-сацыяліста. Было таксама пастаўлена пытанне аб **аншлюсе**. Аўстрыйскія ўлады назначылі на 13 сакавіка рэферэндум па гэтай праблеме. Аднак **12 сакавіка 1938 г.** вермахт заняў Аўстрыю. А. Гітлера трыумфальна сустрэла насельніцтва Вены і Лінца. Было аб'яўлена аб аншлюсе (далучэнні) Аўстрыі да Германіі ў якасці правінцыі Остмарк. Новы рэйх (дзяржава)



Жыхары Вены вітаюць германскія войскі. 1938 г.



Правообладатель Народная асвета



Канферэнцыя ў Мюнхене. Верасень 1939 г.

атрымаў афіцыйную назву «Вялікая Германія». На рэферэндуме ў красавіку 1938 г. пад ціскам нацыстаў больш за 99 % аўстрыйцаў адобрылі аншлюс.

Наступным аб'ектам агрэсіўных памкненняў Германіі стала Чэхаславакія. Для яе расчлянення фашысты выкарысталі нацыяналістычны рух немцаў у Судэцкай вобласці. Ён дабіваўся аўтаноміі, а пасля і аддзялення Судэт ад Чэхаславакіі. Тэрытарыяльныя прэтэнзіі да Чэхаславакіі прад'явілі таксама Польшча і Венгрыя. Заходнія дзяржавы, асабліва Англія, у 1930-я гг. праводзілі **палітыку «супакойвання» агрэсара**, г. зн. пастаянна ішлі на ўступкі Германіі. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Н. Чэмберлен у 1938 г. неаднаразова наведваў Германію і сустракаўся з А. Гітлерам. Ён у прынцыпе згадзіўся з асноўнымі патрабаваннямі А. Гітлера ў адносінах да Чэхаславакіі. Францыя таксама саступіла ціску Германіі і згадзілася на скліканне міжнароднай канферэнцыі па Чэхаславакіі. Яна адбылася **29—30 верасня 1938 г.** у *Мюнхене*. А. Гітлер, Б. Мусаліні, Н. Чэмберлен і Э. Даладзье вырашылі лёс Чэхаславакіі. СССР у гэты час гатовы быў аказаць ваенную дапамогу Чэхаславакіі, але просьбы аб гэтым ад яе не паступіла. Паводле Мюнхенскага пагаднення Судэцкая вобласць была аднята ад Чэхаславакіі і далучана да Германіі. Польшча атрымала Цешынскую вобласць Чэхаславакіі. Страта Судэцкай вобласці мела катастрафічныя наступствы для Чэхаславакіі, паколькі яна была асноўным эканамічным раёнам краіны з багатымі прыроднымі рэсурсамі, развітой абароннай прамысловасцю і сістэмай ваенных умацаванняў.



Выступленне Н. Чэмберлена пасля вяртання з Мюнхена

Мюнхенскае пагадненне з'явілася кульмінацыяй палітыкі «супакойвання» заходніх дзяржаў і стала важнейшай падзеяй на шляху падрыхтоўкі і развязвання Другой сусветнай вайны. А. Гітлер здолеў шляхам пагроз і шантажу прымусіць Англію і Францыю пайсці на вялікія ўступкі і па сутнасці падмануць іх кіраўнікоў, якіх ён пагардліва называў «чарвякамі». Асабліва слепа верыў абяцанням А. Гітлера Н. Чэмберлен, які заявіў, прыехаўшы з Мюнхена ў Англію: «Сябры мае, я прывёз вам мір». Аднак больш празорлівы палітык



Правообладатель Народная асвета

У. Чэрчыль сказаў у парламенце: «Мы пацярпелі поўнае і сакрушальнае паражэнне». Мюнхенскае пагадненне стала для А. Гітлера толькі сродкам для поўнай ліквідацыі чэхаславацкай дзяржавы. *15 сакавіка 1939 г.* вермахт заняў Прагу. Частка Чэхаславакіі пад назвай «пратэктарат Багемія і Маравія» была далучана да Германіі. Славакія заставалася марыянетачнай дзяржавай, якая цалкам залежала ад Германіі. Толькі пасля гэтага заходнія дзяржавы сталі адыходзіць ад палітыкі «супакойвання» А. Гітлера. Але ён працягваў свае агрэсіўныя дзеянні ў Еўропе. *21 сакавіка 1939 г.* Германія запатрабавала ад Польшчы перадаць г. Данцыг і ліквідаваць «польскі калідор». 22 сакавіка вермахт уступіў у Клайпедскую (Мемельскую) вобласць Літвы. У красавіку Італія акупіравала Албанію. **22 мая 1939 г.** Германія і Італія заключылі дагавор аб узаемнай дапамозе, вядомы ў гісторыі як *«Стальны пакт»*. Бакі абавязваліся аказваць у выпадку вайны ўсебаковую ваенную і эканамічную дапамогу адзін аднаму. Германія саступіла Італіі Паўднёвы Ціроль.



Нямецкія войскі ўваходзяць у Прагу. 15 сакавіка 1939 г.

**Праблема стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Савецка-германскі дагавор аб ненападзенні.** Агрэсіўны курс фашысцкіх дзяржаў прымусіў частку палітычных колаў заходніх дзяржаў, асабліва Францыі, шукаць шляхі збліжэння з Савецкім Саюзам. У *лістападзе 1932 г.* паміж СССР і Францыяй быў заключаны дагавор аб ненападзенні. Ён утрымліваў абавязацельствы не ўмешвацца ва ўнутраныя справы адно аднаго і не ваяваць паміж сабой ні пры якіх абставінах. У 1933 г. па ініцыятыве Францыі пачаліся перагаворы аб заключэнні пагаднення аб узаемнай дапамозе паміж СССР і Францыяй. У гэтым жа годзе былі ўстаноўлены дыпламатычныя адносіны паміж СССР і ЗША, а таксама падпісана канвенцыя аб вызначэнні агрэсара паміж СССР і шэрагам еўрапейскіх краін.

Ведучы барацьбу за стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе, СССР прапанаваў Францыі заключыць дагавор аб узаемнай дапамозе з удзелам іншых еўрапейскіх дзяржаў. Быў выпрацаваны праект *Усходняга пакта*, які мог бы стварыць сістэму калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Аднак Германія, Польшча і некаторыя іншыя краіны адмовіліся ад удзелу ва Усходнім пакце.

Збліжэнне СССР і Францыі садзейнічала ўступленню Савецкага Саюза ў Лігу Нацый у **1934 г.** і падпісанню **2 мая 1935 г.** у Парыжы дагавора аб узаемнай дапамозе паміж СССР і Францыяй. У ім быў зафіксаваны намер бакоў дабівацца заключэння еўрапейскага пагаднення па пытаннях бяспекі. Услед за гэтым **16 мая 1935 г.**



Правообладатель Народная асвета

адбылося падпісанне дагавора аб узаемадапамозе паміж СССР і Чэхаславакіяй. У ім утрымлівалася агаворка аб тым, што СССР абавязваецца аказаць дапамогу Чэхаславакіі, калі Францыя таксама акажа ёй сваю падтрымку. Гэтыя дагаворы адыгралі сваю станоўчую ролю ў стрымліванні агрэсіі, аднак былі абясцэнены Мюнхенскім пагадненнем заходніх дзяржаў.

Падзеі вясной 1939 г. у Еўропе паказалі ўсю безгрунтоўнасць палітыкі «супакойвання» заходніх краін. Пасля гэтага Англія і Францыя паспрабавалі стварыць сістэму дагавораў, якія стрымлівалі б агрэсіўны курс Германіі і Італіі. Яны заявілі аб узаемным ваенным саюзе ў выпадку нападзення трэцяй дзяржавы, а таксама далі гарантыі абароны Галандыі, Швейцарыі і Бельгіі ў выпадку агрэсіі супраць іх. Неўзабаве такія ж гарантыі былі дадзены Польшчы, Румыніі, Грэцыі і Турцыі. Разам з тым у Лондане ў гэты час адбываліся сакрэтныя англа-германскія кантакты, падчас якіх была зроблена спроба дасягнуць кампрамісу паміж Англіяй і Германіяй. Аднак да рэальных вынікаў гэтыя кантакты не прывялі.

У гэтых умовах Савецкі Саюз праявіў гатоўнасць супрацоўнічаць з Англіяй і Францыяй у барацьбе супраць фашысцкай агрэсіі. СССР прапанаваў заключыць Траісты пакт аб узаемадапамозе паміж Савецкім Саюзам, Англіяй і Францыяй, падпісаць ваенную канвенцыю паміж краінамі і прадаставіць гарантыі незалежнасці ўсім дзяржавам, якія мяжуюць з СССР ад Балтыйскага да Чорнага мора. Заходнія дзяржавы пасля абмеркавання савецкіх прапаноў далі згоду на заключэнне Траістага пакта аб узаемадапамозе толькі ў канцы мая 1939 г. У ліпені 1939 г. СССР прапанаваў пачаць у Маскве перагаворы ваенных дэлегацый трох дзяржаў. Англія і Францыя зацягвалі накіраванне ваенных місій у Маскву, таму перагаворы пачаліся толькі 12 жніўня 1939 г. На іх высветлілася, што кіраўнік англійскай дэлегацыі не мае паўнамоцтваў падпісваць пагадненне з СССР. На перагаворах Савецкі Саюз настойваў на тым, каб Англія і  Францыя выставілі дастатковую колькасць узброеных сіл для адпору фашысцкай агрэсіі. Асабліва цяжкай аказалася праблема пропуску савецкіх войскаў праз тэрыторыю Польшчы і Румыніі, якія не згаджаліся на гэта.

З-за нявызначанасці пазіцыі Англіі і Францыі на перагаворах у Маскве СССР не выключаў магчымасці перагавораў з Германіяй. У чэрвені 1939 г. актывізаваліся савецка-германскія кантакты, якія мелі на мэце ўзнаўленне эканамічнага і палітычнага супрацоўніцтва СССР і Германіі. У жніўні гэтыя кантакты працягваліся, у выніку бакі прыйшлі да агульнай думкі аб неабходнасці падпісання паміж СССР і Германіяй эканамічнага пагаднення і пакта аб ненападзенні. Савецкі ўрад выказаў жаданне падпісаць таксама сакрэтны  пратакол аб размежаванні сфер уплыву паміж Германіяй і СССР. Пасля таго як І. Сталін і А. Гітлер абмяняліся асабістымі пасланнямі, у Маскву прыехаў міністр замежных спраў Германіі І. Рыбентроп. У той жа дзень, **23 жніўня 1939 г.**, былі падпісаны савецка-германскі дагавор аб



Правообладатель Народная асвета

ненападзенні, які ўвайшоў у гісторыю пад назвай *«пакт Молатава — Рыбентропа»*, і сакрэтны дадатковы пратакол да яго. Тэрмін дзеяння дагавора складаў 10 гадоў. Згодна з пратаколам у савецкую сферу інтарэсаў уваходзілі Фінляндыя, Эстонія, Латвія і Бесарабія. У Польшчы мяжа паміж савецкай і германскай сферамі інтарэсаў праходзіла па рэках Нараў — Вісла — Сан. Савецкі Саюз і Германія пачалі шырокамаштабнае гандлёвае супрацоўніцтва.

Ацэнка савецка-германскага дагавора да нашага часу застаецца цяжкай і складанай праблемай. На думку адных гісторыкаў, падпісанне дагавора было правільным крокам савецкага боку, паколькі СССР атрымаў гарантыю ненападзення і выйграў неабходны час для падрыхтоўкі краіны і арміі да супрацьстаяння агрэсіі. Іншыя вучоныя адзначаюць, што пакт Молатава — Рыбентропа развязаў Гітлеру рукі для агрэсіі на захад. Яны лічаць, што Германія ў 1939—1940 гг. не магла ваяваць на два фронты і не была падрыхтавана да вайны з СССР.

?

1. Дзе склаліся ачагі ваеннай небяспекі ў 1930-я гг.? Чым тлумачыцца іх з'яўленне? Складзіце сінхранічную табліцу «Ачагі ваеннай небяспекі».
2. Ахарактарызуйце палітыку «супакойвання» агрэсара па плане: якія краіны праводзілі; якія мэты імкнуліся дасягнуць; у чым праявілася; якія наступствы мела.
3. Апішыце працэс складвання блокаў агрэсіўных дзяржаў у 1930-х гг. Пабудуйце схему.
4. Што такое сістэма калектыўнай бяспекі? Якія меры былі прыняты з мэтай яе стварэння ў Еўропе? Чаму яна не была створана?
5. Што прымусіла кіраўніцтва СССР пайсці на пагадненне з Германіяй? Ці мог дагавор аб ненападзенні з Германіяй прадухіліць Другую сусветную вайну?

**Прапануем абмеркаваць.** Ліга Нацый была створана ў 1919 г. з мэтай развіцця супрацоўніцтва паміж народамі і прадухілення войнаў. Наколькі эфектыўнай аказалася яе дзейнасць і чаму?

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### З выступлення А. Гітлера

*Люты 1933 г.*

Ёмістасць рынкаў свету абмежаваная, а вытворчасць паўсюль залішняя. У асваенні новых зямель — адзіная магчымасць зноў скараціць войска беспрацоўных... Жыццёвая прастора для нямецкага народа занадта малая.

Будаўніцтва вермахта — найважнейшая перадумова для дасягнення мэты — заваявання палітычнай магутнасці... Як будзе выкарыстана палітычная магутнасць, калі мы набудзем яе?.. Магчыма заваяванне новых рынкаў збыту, магчымы — і, мабыць, гэта найлепш — захоп новай жыццёвай прасторы на Усходзе і яго бязлітасная германізацыя.

*У чым бачыў А. Гітлер асноўную знешнепалітычную мэту Германіі? Як ён меркаваў яе дасягнуць?*



Правообладатель Народная асвета

### З сакрэтнага дадатковага пратакола да дагавора аб ненападзенні, якi былi заключаны памiж СССР i Германiяй

*23 жнiўня 1939 г.*

Пры падпiсаннi дагавора аб ненападзеннi памiж Германiяй i Саюзам Савецкiх Сацыялiстычных Рэспублiк упаўнаважаныя абодвух бакоў, якiя нiжэй падпiсалiся, абмеркавалi ў строга канфiдэнцыйным парадку пытанне аб размежаваннi сфер узаемных iнтарэсаў ва Усходняй Еўропе. Гэта абмеркаванне прывяло да наступнага вынiку:

у выпадку тэрытарыяльна-палiтычнага пераўладкавання абласцей, якiя ўваходзяць у склад Прыбалтыйскiх дзяржаў (Фiнляндыя, Эстонiя, Латвiя, Лiтва), паўночная гранiца Лiтвы адначасова з'яўляецца мяжой сфер iнтарэсаў Германii i СССР. Пры гэтым iнтарэсы Лiтвы ў адносiнах да Вiленскай вобласцi прызнаюцца абодвума бакамi;

у выпадку тэрытарыяльна-палiтычнага пераўладкавання абласцей, якiя ўваходзяць у склад Польскай дзяржавы, мяжа сфер iнтарэсаў Германii i СССР будзе прыблiзна праходзiць па лiнii рэк Нараў, Вiсла i Сан...

Што датычыцца паўднёвага ўсходу Еўропы, з савецкага боку падкрэслiваецца цiкавасць СССР да Бесарабii...

*Што прадугледжваў сакрэтны дадатковы пратакол да дагавора аб ненападзеннi памiж СССР i Германiяй? Як былi размежаваны сферы ўплыву памiж СССР i Германiяй? Выкарыстайце карту.*

## § 8. Краiны Цэнтральнай i Паўднёва-Усходняй Еўропы

**Успомнiце:** Калi была ўтворана Аўстра-Венгерская iмперыя? Якiя народы яе насялялi? Цi iснавала суверэнная Польская дзяржава ў XIX — пачатку XX ст.?

**Утварэнне новых незалежных дзяржаў.** Нацыянальна-вызваленчы рух у Аўстра-Венгрыi ўзмацнiўся ў канцы Першай сусветнай вайны. Асаблiва ён быў характэрны для славянскiх народаў. У Парыжы i Празе ўзнiклi цэнтры нацыянальнага руху чэхаў i славакаў. У сувязi з паражэннем Аўстра-Венгрыi ў вайне Пражскi Нацыянальны камiтэт аб'явiў аб утварэннi незалежнай Чэхаславацкай дзяржавы. *14 лiстапада 1918 г.* у Празе адбылося пасяджэнне Нацыянальнага сходу. Ён абвясцiў Чэхаславакiю дэмакратычнай рэспублiкай. Прэзiдэнтам Чэхаславакii быў завочна выбраны дэмакрат **Т. Масарык**, якi знаходзiўся ў ЗША. У Чэхаславакii былi праведзены дэмакратычныя рэформы, прынята адна з самых дэмакратычных у Еўропе канстытуцый. Спачатку для палiтычнага жыцця краiны была характэрна перавага кааліцыi левых i цэнтрысцкiх сiл. У 1930-я гг. узрос уплыў правых сiл i сепаратысцкага руху судэцкiх немцаў, а таксама каталiцкай Народнай партыi ў Славакii. На палiтычнай арэне з'явiўся i чэшскi фашызм у асобе Нацыянальнага аб'яднання.



Правообладатель Народная асвета

Чэхаславакія валодала буйнымі прамысловымі цэнтрамі і з'яўлялася адной з найбольш эканамічна развітых краін Цэнтральнай Еўропы. У краіне была праведзена аграрная рэформа, якая абмежавала памешчыцкае землеўладанне і адкрыла шлях для развіцця фермерскіх гаспадарак.



Прыбыццё прэзідэнта Т. Масарыка ў Прагу. 1918 г.

У Чэхаславакіі пражывала некалькі народаў. «Чэхаславакі» лічыліся адзіным народам, на аснове якога павінна была ўзнікнуць чэхаславацкая нацыя. Немцы, венгры, палякі і русіны (жыхары Падкарпацкай Русі) атрымалі статус нацыянальных меншасцей. Чэхі імкнуліся да стварэння цэнтралізаванай унітарнай дзяржавы, але гэтаму працівіліся славакі і іншыя народы. У канцы 1930-х гг. нацыянальныя праблемы ў Чэхаславакіі рэзка абвастрыліся.

У сувязі з распадам Аўстра-Венгрыі ў канцы кастрычніка 1918 г. адбылася буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя ў *Венгрыі*. **21 сакавіка 1919 г.** была абвешчана **Венгерская савецкая рэспубліка**. Сацыял-дэмакраты і камуністы, аб'яднаўшыся ў Сацыялістычную партыю Венгрыі, правялі рэвалюцыйна-дэмакратычныя пераўтварэнні. Аднак савецкая ўлада ў Венгрыі была ліквідавана **1 жніўня 1919 г.** з дапамогай войскаў Румыніі і Чэхаславакіі. У лістападзе 1919 г. Будапешт быў заняты контррэвалюцыйнымі войскамі адмірала **М. Хорці**, які ў 1920 г. устанавіў сваю дыктатуру. Апорай аўтарытарнага рэжыму сталі нацыяналістычныя арганізацыі. У канцы 1930-х гг. у Венгрыі ўзмацніўся фашысцкі рух.

Аслабленне і распад Аўстра-Венгерскай імперыі паскорылі працэс узнікнення дзяржаўнасці паўднёваславянскіх народаў. 29 кастрычніка 1918 г. народнае веча ў Загрэбе абвясціла Дзяржаву славенцаў, харватаў і сербаў і яе аддзяленне ад імперыі. Пасля гэтага ўзмацнілася імкненне паўднёваславянскіх народаў да аб'яднання з Сербіяй. **1 снежня 1918 г.** прынц-рэгент Сербіі Аляксандр абвясціў *Каралеўства сербаў, харватаў, славенцаў* (КСХС), якое з *1929 г.* стала называцца *Югаславіяй*.

Паражэнне Германіі ў Першай сусветнай вайне паставіла на павестку дня ўтварэнне незалежнай польскай дзяржавы. Гэтаму садзейнічала як палітыка Антанты, так і прынцып нацыянальнага самавызначэння народаў, які высунулі бальшавікі ў Савецкай Расіі. **7 лістапада 1918 г.** у Любліне быў створаны Часовы народны ўрад *Рэспублікі Польшча*. Вырашальную ролю ў ім адыгрывалі прыхільнікі камандуючага Польскім Легіёнам **Ю. Пілсудскага**, які неўзабаве стаў «часовым начальнікам» дзяржавы. У Польшчы былі праведзены дэмакратычныя рэформы, а ў сакавіку



Правообладатель Народная асвета

1921 г. прынята канстытуцыя, якая ўстанавіла рэспубліканскі дэмакратычны лад. У 1919—1921 гг. ішла барацьба за вызначэнне ўсходніх і заходніх граніц Польшчы. Асабліва напружаныя адносіны ў сувязі з гэтым у Польшчы склаліся з Савецкай Расіяй, Германіяй, Літвой і Чэхаславакіяй.

Паражэнне Балгарыі ў Першай сусветнай вайне аслабіла кіруючы рэжым. Цар Фердынанд у пачатку кастрычніка 1918 г. адмовіўся ад прастола на карысць свайго сына Барыса. Неўзабаве ўрад узначалілі левыя сілы, сярод якіх вядучую ролю адыгрываў Балгарскі земляробчы народны саюз (БЗНС). Асновай яго ідэалогіі стала «сялянская дэмакратыя», заснаваная на працоўнай прыватнай уласнасці і ідэях роўнасці і сацыяльнай справядлівасці. Кааліцыйны ўрад, сфарміраваны кіраўніком БЗНС, у 1920—1922 гг. правёў шэраг дэмакратычных рэформ, у тым ліку абмежаваў правы манарха. Правыя сілы і ваенныя колы **8—9 чэрвеня 1923 г.** здзейснілі дзяржаўны пераварот і скінулі ўрад. Паўстанне сялян у яго абарону было падаўлена. Актыўным удзельнікам перавароту быў лідар нацыяналістычнай арганізацыі Народная змова А. Цанкаў.

**Аўтарытарныя дыктатуры.** У новых незалежных дзяржавах, за выключэннем Чэхаславакіі, у 1920—1930-я гг. усталяваліся **аўтарытарныя** рэжымы. Для іх былі характэрны: абмежаванне палітычных правоў і свабод грамадзян, падаўленне рэвалюцыйнага і дэмакратычнага руху, засілле нацыяналістычных, фашысцкіх і прафашысцкіх арганізацый і партый, культ правадыра-дыктатара, фармальнае захаванне парламенцкай і шматпартыйнай сістэмы.

Наступствам падаўлення чэрвеньскага паўстання 1923 г. у Балгарыі стала фарміраванне аўтарытарнага рэжыму на чале з царом Барысам і прэм'ерам А. Цанкавым. У верасні 1923 г. камуністы Балгарыі на чале з Г. Дзімітровым і В. Каларавым паднялі паўстанне з мэтай яго звяржэння. Вераснёўскае паўстанне падтрымалі Камінтэрн і СССР, аднак яно было жорстка падаўлена, загінула каля 5 тыс. камуністаў. У Балгарыі ўмацаваўся аўтарытарны рэжым улады.



Артылерыя Ю. Пілсудскага на Палацавай плошчы ў Варшаве ў час дзяржаўнага перавароту. Май 1926 г.

Палітычная нестабільнасць у Польшчы прывяла ў **маі 1926 г.** да дзяржаўнага перавароту, галоўнай апорай якога выступала армія. Армейскія часці, верныя Ю. Пілсудскаму, занялі Варшаву і скінулі ўрад. Была зменена канстытуцыя, Польшча ператваралася ў прэзідэнцкую рэспубліку. Рэальная ўлада знаходзілася ў руках Ю. Пілсудскага, які стаў генеральным інспектарам узброеных сіл. Сацыялісты і камуністы падтрымалі пераварот Ю. Пілсудскага. Аднак неўзабаве пілсудчыкі прыступілі да



Правообладатель Народная асвета

падаўлення рабочага і дэмакратычнага руху і ўстанавілі аўтарытарны *рэжым «санацыі»* — аздараўлення грамадска-палітычнага жыцця.

Зачэпкай да ўсталявання аўтарытарнага палітычнага рэжыму ў Югаславіі сталі трагічныя падзеі 20 чэрвеня 1928 г. на пасяджэнні скупшчыны. Сербскі дэпутат пачаў стральбу ў парламенце, забіў і параніў некалькі дэпутатаў, у тым ліку С. Радзіча — папулярнага палітыка і лідара Харвацкай сялянскай партыі. У сувязі з палітычнай нестабільнасцю ў краіне кароль Аляксандр 6 студзеня 1929 г. выдаў маніфест аб забароне дзейнасці ўсіх партый. Адначасова быў выдадзены закон, паводле якога аб'яўлялася спадчынная манархія, кароль атрымліваў выключнае права выдання законаў і фактычна сканцэнтраваў у сваіх руках асноўныя рычагі ўлады. Гэтыя заканадаўчыя акты, па сутнасці, азначалі дзяржаўны пераварот у краіне. У кастрычніку 1934 г. кароль Аляксандр і міністр замежных спраў Францыі Л. Барту, які выступаў за супрацоўніцтва з СССР, былі забіты ў Марсэлі.

Для Румыніі ў 1930-х гг. таксама была характэрна палітычная нестабільнасць, частая змена ўрадаў і актывізацыя фашысцкага руху. У 1938 г. кароль Караль II сфарміраваў пазапартыйны ўрад, адмяніў канстытуцыю, ліквідаваў партыі і прафсаюзы і стварыў прафашысцкую партыю «Фронт нацыянальнага адраджэння».

**Нарастанне знешнепалітычнай пагрозы ў 1930-я гг.** Палітыка «супакойвання» заходніх дзяржаў у адносінах да агрэсіўных краін у Еўропе мела антысавецкую накіраванасць і праводзілася перш за ўсё за кошт інтарэсаў і тэрыторый славянскіх дзяржаў. Чэхаславакія стала першай ахвярай агрэсіі з боку Германіі. У 1935 г. у Судэтах была створана Судэцка-нямецкая партыя на чале з настаўнікам фізкультуры К. Генлейнам. Партыя патрабавала прадастаўлення аўтаноміі судэцкім немцам. Нацысцкая прапаганда разгарнула шумную кампанію аб праследаванні ў Чэхаславакіі нацыянальных меншасцей, асабліва немцаў. У выніку А. Гітлер запатрабаваў перадаць Судэты Германіі. **30 верасня 1938 г**. Чэхаславакія вымушана была падпісаць Мюнхенскае пагадненне. Германія акупіравала Судэты, а Польшча — Цешынскую вобласць Чэхаславакіі. Пасля Мюнхенскага пагаднення і расчлянення краіны яна стала называцца «Чэха-Славакіяй», у якой стаў фарміравацца новы палітычны рэжым. Прэзідэнт Э. Бенеш склаў свае паўнамоцтвы і эмігрыраваў. Да ўлады прыйшлі правыя сілы, якія праводзілі прагерманскую знешнюю палітыку. У гэты час каталіцкая Народная партыя абвясціла аўтаномію Славакіі. 14 сакавіка 1939 г. у Берліне прэзідэнт Чэха-Славакіі Э. Гаха вымушаны быў пасля шматгадзіннага шантажу з боку А. Гітлера згадзіцца на ўвод нямецкіх войскаў у Прагу. Славакія аб'явіла незалежнасць. Вермахт 15 сакавіка заняў Чэхію, а венгерская армія — Падкарпацкую Русь. 16 сакавіка на акупіраванай немцамі тэрыторыі быў абвешчаны пратэктарат Багемія і Маравія.



Правообладатель Народная асвета

Польшча ў 1930-я гг. праводзіла палітыку балансавання і «роўнага аддалення» ад Германіі і СССР. У рамках гэтай палітыкі ў 1932 г. быў заключаны польска-савецкі дагавор аб ненападзенні і ў студзені 1934 г. падпісана польска-германская дэкларацыя аб ненападзенні тэрмінам на 10 гадоў. У другой палове 1930-х гг. Польшча праводзіла антысавецкі курс у знешняй палітыцы і падтрымлівала палітыку «супакойвання» агрэсара. У лістападзе 1938 г. Германія высунула тэрытарыяльныя прэтэнзіі ў адносінах да Польшчы: перадаць Германіі Данцыг і пабудаваць шасэйную дарогу і чыгунку праз «польскі калідор» ва Усходнюю Прусію. Польшча неаднаразова адхіляла гэтыя патрабаванні. 28 красавіка 1939 г. Германія дэнансавала дэкларацыю аб ненападзенні 1934 г. і пачала непасрэдную падрыхтоўку да вайны супраць Польшчы. Польскія кіруючыя колы праявілі палітычную недальнабачнасць падчас англа-франка-савецкіх перагавораў вясной — летам 1939 г., не пагадзіўшыся прапусціць часці Чырвонай Арміі праз сваю тэрыторыю ў выпадку нямецкай агрэсіі.

?

1. Якія новыя незалежныя дзяржавы сфарміраваліся ў Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропе ў выніку распаду Аўстра-Венгрыі? У чым заключаліся праблемы гэтых дзяржаў? Якая з іх была адной з галоўных?
2. Чым характарызуецца аўтарытарны палітычны рэжым? У чым заключаюцца яго адрозненні ад таталітарнага палітычнага рэжыму?
3. Чаму ў краінах Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы ў 1930-х гг. склаліся аўтарытарныя палітычныя рэжымы? Якая славянская краіна развівалася ў гэты час па дэмакратычным шляху?
4. Якія славянскія краіны ў 1930-я гг. сталі аб'ектамі агрэсіўнай знешняй палітыкі нацысцкай Германіі? Чым гэта тлумачыцца? Ахарактарызуйце палітыку заходніх краін у дачыненні да гэтых краін. Як складваліся адносіны славянскіх краін з СССР? Як склаўся лёс гэтых дзяржаў у 1930-я гг.?

**Прапануем абмеркаваць.** Якую ролю ў развязванні Другой сусветнай вайны адыграла пазіцыя Чэхаславакіі і Польшчы ў адносінах да Савецкага Саюза?

ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### З Дэкрэта Савета Народных Камісараў РСФСР

*29 жніўня 1918 г.*

Артыкул 3. Усе дагаворы і акты, заключаныя ўрадам былой Расійскай імперыі з урадамі каралеўства Прускага і Аўстра-Венгерскай імперыі, якія тычацца падзелаў Польшчы, з прычыны іх супярэчнасці прынцыпу самавызначэння нацый і рэвалюцыйнай правасвядомасці рускага народа, які прызнаў за польскім народам неад'емнае права на самастойнасць і адзінства, адмяняюцца дадзеным дэкрэтам беспаваротна.

*Якое значэнне для адраджэння польскай дзяржавы мела прыняцце гэтага дэкрэта?*



Правообладатель Народная асвета



**Міклаш Хорці** (1868—1957), рэгент Венгрыі (1920—1944). У студзені 1918 г. быў прызначаны галоўнакамандуючым ваенна-марскімі сіламі Аўстра-Венгрыі. 1 сакавіка 1920 г. парламент абвясціў яго рэгентам. На працягу шэрага гадоў амаль не прымаў удзелу ва ўнутрыпалітычным жыцці краіны. Аднак у 1930-я гг., ва ўмовах абвастрэння міжнароднай абстаноўкі, вымушаны быў вярнуцца на палітычную арэну. Імкнуўся стрымліваць ціск Германіі і захоўваць добразычлівыя адносіны з Захадам. Застаючыся на крайне кансерватыўных пазіцыях, Хорці паступова стаў лідарам шырокага неафіцыйнага фронту розных палітычных сіл — ад крайніх кансерватараў да сацыял-дэмакратаў — у барацьбе супраць правых радыкалаў. У 1941 г. Венгрыя ўступіла ў вайну супраць СССР на баку Германіі. У верасні 1944 г. савецкія войскі ўвайшлі на тэрыторыю Венгрыі. Пасля неаднаразовых спроб сепаратных перагавораў з Захадам накіраваў у Маскву місію для вядзення перагавораў аб перамір'і. Немцы неадкладна прымусілі яго пайсці ў адстаўку і інтэрніравалі ў Германію. Вызвалены саюзнікамі ў 1945 г.



**Юзэф Пілсудскі** (1867—1935), польскі дзяржаўны дзеяч. У час Першай сусветнай вайны сфарміраваў асобны Польскі Легіён, які змагаўся на баку Аўстра-Венгрыі. Завяршальны этап вайны Пілсудскі правёў у нямецкай турме. Вярнуўшыся восенню 1918 г. у Варшаву, быў прызначаны «часовым начальнікам» дзяржавы і галоўнакамандуючым узброеных сіл Польшчы. У 1919 г. першы ўстаноўчы парламент зацвердзіў Пілсудскага кіраўніком дзяржавы. Бязлітасна распраўляўся з рэвалюцыйным рухам, уцягнуў Польшчу ў антысавецкую інтэрвенцыю, адыграў значную ролю ў арганізацыі нападу Польшчы на Савецкую Расію (1920). У маі 1926 г. здзейсніў ваенны пераварот, усталяваў у Польшчы «санацыйны» рэжым і да самай смерці быў фактычным дыктатарам Польшчы. Заключыў польска-германскае пагадненне аб ненападзенні 1934 г.



**Томаш Масарык** (1850—1937), чэхаславацкі дзяржаўны і палітычны дзеяч, філосаф. Змагаўся за аўтаномію Чэхіі ў складзе Аўстра-Венгрыі. Наведваў Расію, сустракаўся з Л. М. Талстым. Заснаваў у Парыжы Чэшскі (затым Чэхаславацкі) нацыянальны савет, які арыентаваўся ў пытанні стварэння самастойнай чэхаславацкай дзяржавы на Антанту. Кастрычніцкую рэвалюцыю ў Расіі сустрэў варожа і праводзіў антысавецкі курс. Быў адным з арганізатараў



Правообладатель Народная асвета

контррэвалюцыйнага антысавецкага мяцяжу Чэхаславацкага корпуса (1918), падтрымліваў тэрарыстычныя групы эсэраў. У 1918 г. пасля падзення Аўстра-Венгерскай імперыі, будучы ў ЗША, быў завочна выбраны першым прэзідэнтам Чэхаславацкай рэспублікі. З'яўляўся палітычным і духоўным лідарам незалежнай Чэхаславакіі (меў паўафіцыйную мянушку «бацюшка»), увасабленнем барацьбы за незалежнасць і стварэнне новай дзяржавы. Пры ім былі адноўлены дыпламатычныя адносіны Чэхаславакіі з СССР (1934) і заключана пагадненне аб узаемадапамозе (1935).

## § 9. Навука і культура краін Заходняй Еўропы і ЗША ў міжваенны перыяд (1919—1939)

**Успомніце:** Што ляжыць у аснове развіцця індустрыяльнай цывілізацыі? Які ўплыў на светапогляд людзей аказала Першая сусветная вайна?

**Прыродазнаўчыя навукі і навукова-тэхнічны прагрэс.** Пасля Першай сусветнай вайны працягвалася рэвалюцыя ў прыродазнаўстве, дапоўненая шэрагам значных навукова-тэхнічных дасягненняў. Канчаткова зацвердзілася новая карціна светабудовы і развіцця Сусвету. Вялікую ролю ў гэтым адыгралі навуковыя працы нямецкага фізіка **А. Эйнштэйна**, у якіх была абгрунтавана *тэорыя адноснасці*.

З вучэннем А. Эйнштэйна ўзгаднялася квантавая тэорыя святла, якую развіваў нямецкі фізік *М. Планк*. Ён даказаў, што святло і энергія вылучаюцца не суцэльным патокам, а асобнымі порцыямі — квантамі. У 1919—1939 гг. паспяхова развівалася адна з навейшых галін сучаснай фізікі — квантавая механіка. У гэты ж час у асобны напрамак аформілася атамная фізіка. Былі адкрыты новыя элементарныя часціцы, у прыватнасці нейтрон, а таксама штучная радыеактыўнасць. У 1938 г. нямецкія вучоныя адкрылі ланцуговую рэакцыю дзялення ядзер урана, якая суправаджалася выдзяленнем вялікай колькасці энергіі. Чалавецтва аказалася перад складанай праблемай выкарыстання атамнай энергіі.

Дасягненні ў галіне хіміі прывялі не толькі да адкрыцця новых хімічных элементаў, але і да імклівага росту хімічнай прамысловасці. Яна стала выраблять шмат штучных матэрыялаў — нейлон, капрон, штучныя бензін і каўчук, сінтэтычныя смолы і інш.

У біялогіі атрымала развіццё новая галіна — генетыка, якая вывучала законы спадчыннасці і зменлівасці арганізмаў. Яна адыграла вялікую ролю ў медыцыне і сельскай гаспадарцы. Важнае практычнае значэнне мела адкрыццё вітамінаў, гармонаў і дасягненні ў галіне вірусалогіі. Гэтыя дасягненні стварылі аснову для ўзнікнення мікрабіялагічнай прамысловасці. Развіццё біялагічнай навукі аказала ўплыў на сумежныя галіны навукі — хімію і медыцыну. Для



Правообладатель Народная асвета

жыцця людзей першачарговую важнасць мела адкрыццё пеніцыліну брытанскім вучоным *А. Флемінгам*, стварэнне новых лякарстваў (аспірын, стрэптаміцын і інш.), вынаходніцтва новых метадаў дыягностыкі захворванняў і г. д.



А. Флемінг у лабараторыі

Вялікі ўплыў на многія галіны навукі і культуры аказала тэорыя і практыка псіхааналізу, заснавальнікам якога стаў аўстрыйскі псіхіятр *З. Фрэйд*. Ён паказаў, што псіхіка чалавека складаецца з трох асноўных узроўняў: «звыш-Я» (культурныя і каштоўнасныя ўстаноўкі чалавека, якія вызначаюць яго паводзіны ў грамадстве), «Я» (індывідуальная псіхіка чалавека) і «Яно» (неўсведамляемая аснова псіхікі ў выглядзе інстынктаў і схільнасцей). На думку З. Фрэйда, менавіта неўсведамляемая сфера псіхікі адыгрывае вырашальную ролю ў жыцці людзей.

Поспехі навукі і тэхнікі прывялі да змянення тэхналагічнай асновы вытворчасці і ўзнікнення новых галін. У гэты час у развітых краінах рэзка павялічылася вытворчасць электраэнергіі, шырокі маштаб набыло будаўніцтва цеплавых і гідраэлектрастанцый. Многія з іх з'яўляліся сімваламі навукова-тэхнічнага прагрэсу. Напрыклад, у 1936 г. у ЗША распачала працу буйнейшая ў той час ГЭС на рацэ Каларада з вышынёй плаціны 222 м. Да канца 1930-х гг. значная частка галін эканомікі развітых краін была электрыфікавана. Шырокае распаўсюджанне атрымалі грамадзянская авіяцыя, тэлеграф, радыёвяшчанне. У 1927 г. была заснавана знакамітая брытанская радыёкарпарацыя Бі-бі-сі.

Навука і тэхніка змянілі штодзённае жыццё людзей. З'явіліся асабістыя аўтамабілі ў заможных і сярэдніх слаёў насельніцтва, многія рабочыя сталі ездзіць на матацыклах і веласіпедах. Стала прымяняцца новая бытавая тэхніка — халадзільнікі, пыласосы, пральныя машыны, а таксама тэлефоны і грамафоны.

**Грамадскія навукі.** Пасля Першай сусветнай вайны з новай сілай разгарэліся спрэчкі паміж матэрыялістамі, якія сцвярджалі, што асновай свету з'яўляюцца драбнейшыя матэрыяльныя часціцы (атам, электрон), і ідэалістамі, якія лічылі, што жыццё Сусвету вызначаюць Бог і духоўныя фактары.

У цэлым у грамадскіх навуках вялікі ўплыў набылі *ірацыяналістычныя* (заснаваныя не на розуме, а на інстынктах і эмоцыях) плыні грамадскай думкі. З ірацыяналістычных пазіцый крызіс заходняга грамадства пасля вайны адлюстраваў у сваіх працах нямецкі філосаф **О. Шпэнглер**. Яго 2-томная праца выйшла пад



Правообладатель Народная асвета

красамоўнай назвай «Заняпад Еўропы». У ёй вучоны выказаў думку аб заняпадзе заходняй цывілізацыі ў адпаведнасці з законам змены стадый у развіцці культур. О. Шпэнглер абгрунтаваў таксама тэорыю «прускага сацыялізму», заснаванага на прынцыпах калектывізму, салідарнасці, ваеннага брацтва і мілітарызму. У 1920—1930-я гг. сталі папулярнымі ідэі нямецкага філосафа *Ф. Ніцшэ* (памёр у 1900 г.) аб крызісе капіталізму, сучаснай культуры і рэлігіі. Ніцшэ лічыў, што асновай жыцця з'яўляюцца воля да ўлады і інстынкты чалавека. Грамадствам павінны кіраваць людзі, якія маюць якасці «звышчалавека», — эліта і фюрар (правадыр). Ідэі О. Шпэнглера і Ф. Ніцшэ шырока выкарыстоўвалі ў прапагандысцкіх мэтах германскія фашысты для абгрунтавання сваёй злачыннай дзейнасці.

Да ірацыянальнага напрамку грамадскай думкі адносілася *бергсоніянства*, заснавальнікам якога стаў французскі філосаф *А. Бергсон*. Ён выступіў з крытыкай розуму і рацыяналізму і сцвярджаў, што асновай жыцця з'яўляецца не розум, а інтуіцыя. Вялікае значэнне ён надаваў творчаму духу і «жыццёваму парыву» ў народаў і асобе. Блізкай філасофскай плынню да бергсоніянства з'яўляўся *экзістэнцыялізм* — філасофія існавання. Яго прадстаўнікі нямецкія філосафы *М. Хайдэгер, К. Ясперс*, французскія мысліцелі і літаратары *Ж.-П. Сартр, А. Камю* і інш. у цэнтр сваіх даследаванняў паставілі сэнс чалавечага існавання. Яны лічылі, што лёс кожнага чалавека трагічны і няшчасны перад непазбежнай смерцю і рознымі пакутамі. Адзінай каштоўнасцю ў жыцці людзей з'яўляюцца, на іх думку, паводзіны чалавека ў «памежных сітуацыях» — перад пагрозай смерці, хваробы, розных цяжкасцей ці ў сітуацыі жыццёвага выбару. Толькі тады чалавек можа рэалізаваць сваю свабоду, калі выбера патрэбны шлях у жыцці. Некаторыя экзістэнцыялісты надавалі вялікае значэнне выкананню абавязка чалавека, следаванню прынцыпам свабоды і справядлівасці. У цэлым яны лічылі жыццё бессэнсоўным, а чалавека — вельмі няшчаснай і адзінокай істотай.

У гістарычнай навуцы 1919—1939 гг. з'явіліся наватарскія школы і напрамкі. Сярод іх вылучалася *«школа Аналаў»* французскіх гісторыкаў на чале з *М. Блокам* і *Л. Феўрам*. Яны прапанавалі ідэю напісання глабальнай гісторыі чалавецтва, дзе б разглядаліся галоўным чынам не асобныя падзеі і факты, не палітычная гісторыя, а працяглыя сацыяльна-эканамічныя працэсы і паўсядзённае жыццё людзей. Англійскі гісторык *А. Д. Тойнбі* даследаваў сусветную гісторыю як гісторыю асобных лакальных цывілізацый.

**Мастацкая культура.** Крызіс заходняй цывілізацыі ў гады Першай сусветнай вайны і пасля яе знайшоў сваё адлюстраванне ў літаратуры і выяўленчым мастацтве. Пісьменнікі так званага «згубленага пакалення» ў сваіх творах адлюстроўвалі лёс і пачуцці людзей, якім давялося перажыць жахі сусветнай вайны. Амерыканскі пісьменнік *Э. Хемінгуэй* («Бывай, зброя!») і нямецкі пісьменнік *Э. Рэ-*



Правообладатель Народная асвета

*марк* («На заходнім фронце без перамен») найбольш ярка паказалі жорсткасць і бессэнсоўнасць войнаў і насілля. Ім яны супрацьпаставілі гуманістычныя каштоўнасці. Гуманізм быў уласцівы таксама і раманам біяграфічнай серыі *А. Маруа.* Крытычны рэалізм у гэты час з'яўляўся ўплывовым літаратурным напрамкам, які выступаў у выглядзе псіхалагічнага і інтэлектуальнага рэалізму. Вылучаліся творы, якія паказвалі шырокую панараму грамадскага жыцця праз апісанне гісторыі некалькіх пакаленняў адной сям'і, напрыклад «Сага аб Фарсайтах» *Д. Голсуарсі* (Англія), «Будэнброкі» *Т. Мана* (Германія) і інш. *Т. Драйзер* у «Амерыканскай трагедыі» адлюстраваў сацыяльныя і расавыя канфлікты ў ЗША.

Многія пісьменнікі Захаду актыўна змагаліся супраць фашызму і ў той ці іншай ступені падтрымлівалі Савецкі Саюз ці сімпатызавалі яму. Да іх адносіліся перш за ўсё французскія пісьменнікі *Р. Ралан* і *А. Барбюс*, нямецкія пісьменнікі *Т. і Г. Ман, С. Цвэйг, Л. Фейхтвангер* і інш.

Для мастацкай культуры Захаду гэтага часу былі характэрны мадэрнісцкія плыні. **Мадэрнізм** — гэта ўмоўнае абазначэнне нерэалістычных напрамкаў у культуры першай паловы XX ст. Мадэрністы развівалі наватарскія формы мастацкай творчасці. Састаўной часткай мадэрнізму з'яўляўся *авангардызм*, які цалкам парываў з традыцыйным мастацтвам і ставіў задачу зрабіць шокавае ўражанне на публіку нетрадыцыйнымі творамі ці паводзінамі іх стваральнікаў.

Да твораў літаратурнага авангарда адносіліся вядомыя раманы «Уліс» *Д. Джойса* (Англія), «Замак», «Працэс» *Ф. Кафкі* (Аўстрыя), «У пошуках згубленага часу» *М. Пруста* (Францыя). Мадэрнізм і авангардызм найбольш ярка праявіліся ў выяўленчым мастацтве. Скандальную вядомасць набылі *дадаісты*, якія ўпершыню ў мастацтве выкарыстал тэхніку калажу і стварэння абсурдных твораў. Дадаізм падкрэсліваў бессэнсоўнасць каштоўнасцей буржуазнага грамадства. Падсвядомую сферу псіхікі чалавека, яго сноў, мар і ўяўленняў адлюстроўвалі сюррэалісты. *Сюррэалізм* (звышрэалізм) у гэты час прадстаўлялі два самыя вядомыя мастакі XX стагоддзя — *П. Пікасо* і *С. Далі.* У своеасаблівай форме яны адлюстроўвалі і трагічныя пачуцці людзей ва ўмовах канфліктаў і войнаў. С. Далі напісаў карціны «Прадчуванне грамадзянскай вайны» і «Восеньскае канібальства», у якіх у алегарычнай форме адлюстраваў падзеі



С. Далі. «Прадчуванне грамадзянскай вайны». 1936 г.



Правообладатель Народная асвета



П. Пікасо. «Герніка». 1937 г.

грамадзянскай вайны ў Іспаніі. Вялікі грамадскі рэзананс атрымала карціна «Герніка» французскага мастака (іспанца па паходжанні) П. Пікасо. Гэта палатно стала гнеўным водгукам мастака на варварскую бамбардзіроўку фашысцкай авіяцыяй невялікага гарадка Герніка ў Іспаніі.

У 1920—1930-я гг. якасна змяніўся кінематограф. У 1927 г. на экраны выйшаў першы гукавы фільм «Спявак джаза». У прыгарадзе Лос-Анджэлеса (ЗША) быў створаны знакаміты цэнтр кінаіндустрыі *Галівуд*, які на-




Будынак «Баўхаўза» ў Дэсау. 1926. Архітэктар В. Гропіус



Эмпайр-стэйт-білдзінг. 1931 г.



Правообладатель Народная асвета



Ч. Чаплін у вобразе бадзягі Чарлі

ладзіў масавы выпуск фільмаў. З'явіліся першыя сусветна вядомыя зоркі кіно — **Ч. Чаплін**, *М. Дзітрых, М. Пікфард, Д. Фербенкс, Ж. Габен* і інш. Многія з іх выступалі ў абарону дэмакратыі і змагаліся супраць фашызму.

У архітэктуры таксама з'явілася новая плынь — **канструктывізм** (*функцыяналізм*). Адным з творчых і навуковых цэнтраў новай архітэктуры і дызайну ў 1920-я гг. стаў **«Баўхаўз»**, заснавальнікам якога быў нямецкі архітэктар і пачынальнік функцыяналізму *В. Гропіус*. Вядомым архітэктарам-канструктывістам быў *Ш. Э. Ле Карбюзье* (Францыя). Яны стваралі будынкі на аснове сучаснай тэхнікі са шкла і бетону без упрыгожанняў і скульптур. Гэта дало магчымасць узводзіць высотныя будынкі — *небаскробы*. У 1931 г. у Нью-Ёрку завяршылася будаўніцтва небаскроба «Эмпайр-стэйт-білдзінг» вышынёй 381 м.

?

1. Якія навуковыя адкрыцці і дасягненні былі зроблены ў 1919—1939 гг.? Як яны паўплывалі на ўяўленні людзей аб навакольным свеце? Якую ролю ў гэтым адыграла Першая сусветная вайна?
2. Якія напрамкі грамадскага развіцця з'явіліся ў першай палове XX ст.? У чым заключалася іх адрозненне ад марксісцкай тэорыі развіцця грамадства?
3. Чаму ў першай палове XX в. былі шырока распаўсюджаны даследаванні ў галіне псіхалогіі чалавека? Што новае яны ўнеслі ва ўяўленні аб чалавеку і яго сацыяльных паводзінах?
4. Якія характэрныя рысы мадэрнізму як мастацкага напрамку ў культуры? Чым вы можаце растлумачыць багацце мадэрнісцкіх напрамкаў у мастацтве? Што адрознівае мадэрнізм ад папярэдніх напрамкаў і стыляў у мастацтве? Якое ўражанне выклікаюць у вас творы мадэрнізму?
5. Чым характарызуецца архітэктура канструктывізму? Сфармулюйце яе асноўныя прынцыпы. Якія фактары паўплывалі на яе з'яўленне? Як вы лічыце, ці выкарыстоўваюцца ідэі архітэктуры канструктывізму ў цяперашні час?
6. Які новы від мастацтва атрымаў шырокае развіццё ў 1920—1930-я гг.? Назавіце імёны яго найбольш яркіх прадстаўнікоў. Чым вы можаце растлумачыць папулярнасць гэтага віду мастацтва?

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Альберт Эйнштэйн** (1879—1955), фізік, стваральнік тэорыі адноснасці і адзін са стваральнікаў квантавай тэорыі і статыстычнай фізікі. З 1914 г. жыў у Берліне, дзе быў дырэктарам фізічнага інстытута і прафесарам Берлінскага універсітэта. У 1933 г. быў вымушаны пакінуць Германію і пераехаць у ЗША. Пасля ў знак пратэсту супраць фашызму адмовіўся ад германскага падданства, выйшаў са складу Прускай ака-



Правообладатель Народная асвета

дэміі навук. Яго ідэі сталі галоўнай састаўной часткай сучаснай тэорыі Сусвету, якая дынамічна і бесперапынна пашыраецца. Гэта тэорыя дазваляла растлумачыць шырокае кола з'яў. Эйнштэйн рашуча выступаў супраць фашызму, вайны, прымянення ядзернай зброі. У 1940 г. напісаў пісьмо прэзідэнту ЗША пра небяспеку з'яўлення ядзернай зброі ў фашысцкай Германіі, што стымулявала ядзерныя даследаванні ў ЗША. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі (1921) за адкрыццё законаў фотаэфекту і працы ў галіне тэарэтычнай фізікі.



**Освальд Шпэнглер** (1880—1936), нямецкі філосаф і культуролаг. Вывучаў філасофію, гісторыю, матэматыку і мастацтва ў Мюнхенскім і Берлінскім універсітэтах. Працаваў настаўнікам у Гамбургу, выкладаў матэматыку ў Мюнхенскім універсітэце. У 1920-я гг. выступаў як публіцыст кансерватыўна-нацыяналістычнага напрамку, у 1933 г. адхіліў прапанову нацыстаў аб супрацоўніцтве. Многія ідэі Шпэнглера былі ўспрыняты нацыстамі, але калі ён у 1933 г. адмовіўся ад супрацоўніцтва з уладай, яго імя было забаронена згадваць у друку. Стаў вядомым пасля сенсацыйнага поспеху сваёй галоўнай працы «Скон Еўропы» (1918—1922). Сярод іншых значных прац Шпэнглера — «Чалавек і тэхніка» (1931), «Гады рашэнняў» (1933), у якіх ён апісаў складанае — палітычнае і духоўнае становішча Германіі пасля Першай сусветнай вайны.



**Чарлз Спенсер Чаплін** (1889—1977), кінаакцёр, кінарэжысёр, сцэнарыст, прадзюсар. Нарадзіўся ў Лондане, з 1913 г. — у ЗША. З 1895 г. (згодна з іншымі звесткамі з 1897 г.) выступаў у мюзік-холе і тэатры пантамімы. У 1914 г. самастойна зняў свой першы фільм, у якім выступіў у якасці акцёра, рэжысёра і сцэнарыста. Герой, які стаў яго «візітнай карткай», упершыню з'явіўся ў фільме «Бадзяга» (1915). Для гледачоў, асабліва ў эпоху Вялікай дэпрэсіі, яго «маленькі чалавек» — бадзяга Чарлі — быў сімвалам фізічнай і духоўнай стойкасці. Лепшымі фільмамі Чапліна з'яўляюцца «Залатая ліхаманка» (1925), «Цырк» (1928), «Агні вялікага горада» (1931), «Новыя часы» (1936). Творчым дасягненнем Чапліна стаў бліскучы антыфашысцкі сатырычны фільм «Вялікі дыктатар» (1940), пасля выхаду якога Гітлер назваў Чапліна яўрэем і ворагам № 1 Вялікай Германіі. З 1953 г. жыў у Еўропе. Пра яго творчасць зняты біяграфічны фільм «Чарлі» (1992). Быў удастоены Спецыяльнай прэміі «Оскар» (1928, 1972) і Залатой прэміі на Міжнародным кінафестывалі ў Венецыі (1972) за творчасць.



Правообладатель Народная асвета

## ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**Баўхаўз** — вышэйшая школа будаўніцтва і мастацкага канструявання, навучальная ўстанова і архітэктурна-мастацкае аб’яднанне, якое існавала ў Германіі з 1919 па 1933 г. Школа была заснавана архітэктарам В. Гропіусам у Веймары. Кіраўнікі школы распрацоўвалі эстэтыку функцыяналізму, прынцыпы сучаснага формаўтварэння ў архітэктуры і дызайне, арганізацыі бытавога асяроддзя сродкамі пластычных мастацтваў. Заснавальнікі школы бачылі сваёй мэтай задавальненне масавых патрэб насельніцтва і імкнуліся зрабіць прамысловыя тавары прыгожымі, даступнымі па цане і максімальна зручнымі. Выкладчыцкую і творча-эксперыментальную работу ў школе вялі буйныя архітэктары-функцыяналісты (В. Гропіус, Х. Меер, Л. Міс ван дэр Роэ), піянеры сучаснага дызайну (І. Ітэн, Л. Махой-Надзь), а таксама некаторыя мастакі-авангардысты (П. Клее, В. В. Кандзінскі, Л. Файнінгер, О. Шлемер).



Правообладатель Народная асвета

## УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ

1. Вывучыце асноўныя перыяды ў гісторыі краін Захаду 1919—1939 гг. Чым характарызуецца кожны з іх?

2. Апішыце працэс фарміравання Версальска-Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін. Чаму яна не змагла прадухіліць новай сусветнай вайны?

3. У 1920—1930-я гг. найбольш уплывовымі палітычнымі сіламі ў краінах Захаду былі сацыял-дэмакраты і камуністы. Прасачыце эвалюцыю іх узаемаадносін у гэты перыяд. Які ўплыў на гістарычнае развіццё краін Захаду аказалі іх узаемаадносіны? Назавіце імёны найбольш вядомых прадстаўнікоў сацыял-дэмакратыі і камуністаў. Ахарактарызуйце погляды і дзейнасць аднаго з іх (па вашым выбары), дайце ацэнку яго дзейнасці.

4. Вызначыце характэрныя рысы таталітарнага палітычнага рэжыму. Чаму Італія і Германія сталі радзімай фашызму? Параўнайце італьянскі фашызм і германскі нацызм. Якія агульныя рысы яны маюць, чым адрозніваюцца? Правядзіце дыскусію на тэму «Фашызм і грамадства».

5. Вызначыце характэрныя рысы аўтарытарнага палітычнага рэжыму. У якіх краінах Захаду і чаму ў 1920—1930-я гг. усталяваліся аўтарытарныя палітычныя рэжымы?

6. Растлумачце значэнне паняцця «Народны фронт». У якіх краінах Захаду ў 1919—1939 гг. да ўлады прыйшлі ўрады Народнага фронту? Які іх гістарычны лёс?

7. У 1930-я гг. у свеце пачынаюць складвацца ачагі ваеннай небяспекі. Дзе яны ўзніклі? Чаму заходнія краіны і Ліга Нацый не здолелі прадухіліць іх узнікненне і стварыць сістэму калектыўнай бяспекі? Дайце ацэнку палітыкі заходніх краін у гэты перыяд.

8. Складзіце храналагічную табліцу «На шляху да сусветнай вайны: 1933—1939 гг.».

9. Якія навуковыя адкрыцці і тэхнічныя дасягненні ў 1919—1939-х гг. садзейнічалі развіццю культуры, яе дэмакратызацыі і стандартызацыі? Апішыце побыт сярэдняй заходнееўрапейскай або амерыканскай сям'і 1930-х гг.

10. Якія фактары аказалі ўплыў на развіццё мастацтва ў 1920—1930-х гг.? Вызначыце асноўныя тэндэнцыі развіцця мастацтва. Арганізуйце выстаўку рэпрадукцый твораў мастацтва, створаных у гэты перыяд. Які з іх зрабіў на вас найбольшае ўражанне? Растлумачце чаму.

Правообладатель Народная асвета

**Раздзел II**

# ГІСТОРЫЯ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ: 1917—1939 гг.

## § 10. Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне савецкай улады ў Расіі

**Успомніце:** Якія нявырашаныя праблемы канца XIX — пачатку XX ст. перашкаджалі мадэрнізацыі Расіі? Якія асноўныя вынікі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у Расіі? Чаму ўнутрыпалітычную сітуацыю ў краіне да кастрычніка 1917 г. можна характарызаваць як агульнанацыянальны крызіс?

Першая сусветная вайна стала рубежным перыядам у расійскай гісторыі. Эканамічная і палітычная сістэма самадзяржаўя не вытрымала выпрабавання на трываласць, сутыкнуўшыся з наймагутнейшай індустрыяльнай дзяржавай Еўропы — Германіяй. Агульнанацыянальны крызіс, выкліканы вайной, завяршыўся падзеннем самадзяржаўя і ўстанаўленнем савецкай улады, якая ажыццявіла да пачатку Другой сусветнай вайны індустрыяльную мадэрнізацыю краіны, пачатую яшчэ ў канцы XIX ст.

**Курс бальшавікоў на ўзброенае паўстанне.** Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. перад Расіяй адкрываліся два магчымыя варыянты развіцця падзей: рэфарматарскі і радыкальны. Рэфарматарскі варыянт у найбольшай ступені ўвасабляў Часовы ўрад. Праваднікамі і ўдзельнікамі радыкальнага варыянта маглі стаць як правыя (манархісты), так і левыя сілы (бальшавікі, левыя эсэры).

Палітычная сітуацыя, якая склалася ў краіне, у цэлым была спрыяльнай для Часовага ўрада. Пасля падзення царскага рэжыму спынілі існаванне праваманархічныя і чарнасоценныя арганізацыі. Пад уплывам рэвалюцыйных падзей прыкметна палявелі і самі лібералы. Кадэты, напрыклад, адмовіліся ад канстытуцыйнай манархіі на карысць устанаўлення дэмакратычнай парламенцкай рэспублікі і набылі вялікі аўтарытэт. Партыі эсэраў і меншавікоў заявілі пра падтрымку Часовага ўрада. Гэтыя дзве найбольш магутныя і ўплывовыя палітычныя сілы выступілі за працяг вайны, якая цяпер, на іх думку, павінна абараняць рэвалюцыйныя заваёвы. Нават кіраўніцтва бальшавікоў, якое знаходзілася ў эміграцыі, «умоўна» падтрымала Часовы ўрад.

Аднак Часовы ўрад дзейнічаў нерашуча і часта непаслядоўна, з аглядкай на яшчэ адну ўладу — Петраградскі Савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў (Петрасавет). Ён не мог у поўнай меры распараджацца ўзброенымі сіламі, бо згодна з загадам Петрасавета № 1 ад 1 сакавіка 1917 г. афіцэры пазбаўляліся рэальнага камандавання, якое пераходзіла да выбарных салдацкіх камітэтаў. Але самае га-



Правообладатель Народная асвета

лоўнае — Часовы ўрад так і не здолеў знайсці сацыяльнай апоры сярод салдат і рабочых у сталіцы. Ён, па сутнасці, праігнараваў найбольш вострыя пытанні, якія былі пастаўлены паўстанцамі ў лютаўскія дні. Не было вырашана пытанне аб 8-гадзінным працоўным дні, урад нічога не зрабіў для спынення вайны і вырашэння аграрнага пытання. Сітуацыя рэзка змянілася пасля прыезду з эміграцыі кіраўніцтва бальшавіцкай партыі на чале з **У. І. Леніным**. Ад «умоўнай падтрымкі» Часовага ўрада бальшавікі перайшлі да безумоўнай барацьбы за ўладу. Ленін быў першым расійскім палітыкам, які заявіў, што рэвалюцыя не завершана і што неабходна ўзяць уладу з рук буржуазіі і перадаць яе ў рукі рабочых і сялян. Яго палітычная праграма выгадна адрознівалася ад усяго таго, што прапаноўвалі іншыя партыі ці рабіў Часовы ўрад. Яна адлюстроўвала надзеі і чаканні самых шырокіх пластоў насельніцтва: «рэвалюцыйны выхад з вайны» (заключэнне міру без анексій і кантрыбуцый), адмова ад любой падтрымкі Часовага ўрада і перадача ўсёй улады ў рукі Саветаў, увядзенне рабочага кантролю над вытворчасцю і размеркаваннем, бязвыплатная перадача памешчыцкай зямлі сялянам, рэалізацыя права нацый на самавызначэнне.

Часовы ўрад між тым уступіў у паласу зацяжных палітычных крызісаў. Найбольш востры з іх адбыўся *4 ліпеня 1917 г.* На вуліцы Петраграда выйшлі да 500 тыс. чалавек з патрабаваннем адстаўкі ўрада, у склад якога ў той час ужо ўваходзілі эсэры і меншавікі. У. І. Ленін заклікаў сваіх прыхільнікаў да ўзяцця ўлады пад лозунгамі «Далоў вайну!», «Уся ўлада Саветам!». Але дэманстрацыя была расстраляна. З дапамогай казакоў улада здолела разагнаць узброенае шэсце салдат тылавых часцей, якія баяліся адпраўкі на фронт. Партыя бальшавікоў была фактычна пастаўлена па-за законам. Ленін, абвінавачаны ў здрадзе Радзіме як нямецкі шпіён, вымушаны быў хавацца. Пасля гэтага бальшавікі адкрыта абвясцілі пра пачатак падрыхтоўкі да ўзброенага паўстання.

Аднак Часовы ўрад на чале з *А. Ф. Керанскім* і ў гэтай сітуацыі праявіў поўную бездапаможнасць і, па сутнасці, аказаўся не ў стане кіраваць велізарнай краінай. Навісла рэальная пагроза спаўзання Расіі ў бездань безуладдзя і анархіі. Каб не дапусціць гэтага, Вярхоўны галоўнакамандуючы генерал *Л. Г. Карнілаў* прыняў рашэнне ўстанавіць у краіне ваенны рэжым. У *жніўні 1917 г.* ён рушыў войскі да Петраграда. Напалоханы Керанскі звярнуўся за падтрымкай да ўсіх левых сіл. У адказ бальшавікі прыступілі да стварэння *Чырвонай гвардыі* (атрадаў узброеных рабочых) і ўзмацнілі агітацыю ў арміі. У выніку праварадыкальны варыянт развіцця падзей не адбыўся. Войскі Карнілава былі раззброены, а сам ён арыштаваны. Так стаў магчымы леварадыкальны варыянт развіцця падзей.

**Перамога паўстання бальшавікоў у Петраградзе.** Бальшавіцкая партыя да кастрычніка 1917 г. ужо з'яўлялася рэальнай і самай аўтарытэтнай сілай у Петраградзе. Яна абапіралася на Петрасавет, Чырвоную гвардыю, балтыйскіх маракоў і ла-



Правообладатель Народная асвета

тышскіх стралкоў. Ленін лічыў, што склалася ўнікальная сітуацыя, калі бальшавікі, абапіраючыся на рэальную сілу, могуць узяць уладу ў свае рукі. А. Ф. Керанскі не кантраляваў ні сталіцу, ні фронт, ні тыл. Ленін асабіста распрацаваў план і падрыхтоўку ўзброенага захопу ўлады. Ідэю ж мірнага прыходу да ўлады праз Устаноўчы сход ён лічыў небяспечнай і недапушчальнай. І, як аказалася, меў поўную рацыю для гэтага: бальшавікі так і не атрымалі большасці на выбарах ва Устаноўчы сход, якія адбыліся ўжо пасля іх прыходу да ўлады. Узброенае паўстанне было прымеркавана да адкрыцця II Усерасійскага з'езда Саветаў 25 кастрычніка, ад імя якога бальшавікі разлічвалі абвясціць новую ўладу. Увечары 24 кастрычніка Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) прыступіў да ажыццяўлення плана бальшавікоў.



Крэйсер «Аўрора» халастым стрэлам у 21 г 40 мін 25 кастрычніка 1917 г. абвясціў аб пачатку штурму Зімняга палаца

Часовы ўрад ведаў пра падрыхтоўку выступлення, аднак меры, прынятыя для яго прадухілення, аказаліся недастатковымі. Да ранку **25 кастрычніка** (**7 лістапада** па новым стылі) практычна без усякага супраціўлення бальшавікі ўзялі пад свой кантроль найважнейшыя стратэгічныя аб'екты сталіцы — вакзалы, масты, тэлеграф, электрастанцыю. Вечарам 25 кастрычніка на *II Усерасійскім з'ездзе Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў* стала вядома пра пачатак штурму Зімняга палаца, дзе знаходзіўся Часовы ўрад. Дэпутаты ад правага крыла партыі эсэраў і меншавікоў абвінавацілі бальшавікоў у «путчы» і пакінулі пасяджэнне. Бальшавікі і левыя эсэры, якія засталіся ў зале, абвясцілі Расію Рэспублікай Саветаў.



Отъ Военно-Революціоннаго Комитета при Петроградскомъ Совѣтѣ Рабочихъ и Солдатскихъ Депутатовъ.

Къ Гражданамъ Россіи.

Временное Правительство низложено. Государственная власть перешла въ руки органа Петроградскаго Совѣта Рабочихъ и Солдатскихъ Депутатовъ Военно-Революціоннаго Комитета, стоящаго во главѣ Петроградскаго пролетаріата и гарнизона.

Дѣло, за которое боролся народъ: немедленное предложеніе демократическаго мира, отмѣна помѣщичьей собственности на землю, рабочій контроль надъ производствомъ, созданіе Совѣтскаго Правительства — это дѣло обезпечено.

ДА ЗДРАВСТВУЕТЪ РЕВОЛЮЦІЯ РАБОЧИХЪ, СОЛДАТЪ И КРЕСТЬЯНЪ!

Военно-Революціонный Комитетъ при Петроградскомъ Совѣтѣ Рабочихъ и Солдатскихъ Депутатовъ.

25 октября 1917 г. 10 ч. утр.

Зварот ВРК «Да грамадзян Расіі» аб звяржэнні Часовага ўрада

На пасяджэнні 26 кастрычніка, пасля ўзяцця Зімняга палаца і арышту Часовага ўрада, былі прыняты першыя дэкрэты новай улады. *«Дэкрэт аб міры»* за-



Правообладатель Народная асвета


Декларація правъ трудящагося и эксплуатируемаго народа

Тэкст «Дэкларацыі», напісаны У. І. Леніным

клікаў урады і народы ваюючых краін заключыць мір без анексій і кантрыбуцый. *«Дэкрэт аб зямлі»* прадугледжваў адмену прыватнай уласнасці на зямлю і яе нацыяналізацыю. Быў сфарміраваны новы часовы ўрад — *Савет Народных Камісараў* (СНК) на чале з У. І. Леніным. *Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт* (УЦВК) — вышэйшы заканадаўчы орган Саветаў і савецкай улады ўзначаліў бальшавік Л. Б. Каменеў. «Дэкларацыя правоў народаў Расіі», апублікаваная 2 лістапада, абвяшчала роўнасць і суверэнітэт народаў Расіі, іх права на самавызначэнне аж да ўтварэння самастойных дзяржаў, адмену нацыянальных і рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў. Такім чынам, новая ўлада дала адказ на тыя пытанні, якія былі ў цэнтры ўвагі палітычнага жыцця на працягу ўсяго 1917 г.

Па аналогіі з Францыяй Лютаўскую і Кастрычніцкую рэвалюцыі можна назваць Вялікай Расійскай рэвалюцыяй. Самі бальшавікі першыя 20 гадоў называлі свае дзеянні ў кастрычніку 1917 г. «кастрычніцкім пераваротам». І толькі з 1937 г. — Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыяй. Кастрычнік 1917 г., безумоўна, паклаў пачатак радыкальнай, сацыялістычнай перабудове расійскага грамадства. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. стала адной з найважнейшых падзей сусветнай гісторыі пачатку XX стагоддзя.

**Устанаўленне савецкай улады ў рэгіёнах Расіі.** Пасля стварэння СНК і УЦВК пачаўся працэс устанаўлення бальшавіцкай улады на месцах, які доўжыўся да лютага 1918 г. З 97 буйных гарадоў мірным гэты працэс быў у 79 выпадках.

Ленін лічыў, што для ўсталявання ўлады бальшавікоў ва ўсёй краіне неабходна перамога ў двух галоўных гарадах — Петраградзе і Маскве. Гэтага было дастаткова, каб «пацягнуць за сабой усю Расію». Аднак у адрозненне ад Петраграда ў Маскве бальшавікі сутыкнуліся з упартым супраціўленнем. Тут устанаўленне савецкай улады суправаджалася жорсткімі баямі, вялікай колькасцю ахвяр і завяршылася толькі 3 лістапада.

У лістападзе ўлада Саветаў была ўстаноўлена ва Украіне, Беларусі, Прыбалтыцы і горадзе Баку. У снежні 1917 г. бальшавіцкі ўрад прызнаў незалежнасць Поль-



Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

шчы і Фінляндыі. Перыяд ад кастрычніка 1917 да лютага 1918 г. увайшоў у гісторыю пад назвай «трыумфальнага шэсця савецкай улады». Першыя выступленні антыбальшавіцкіх сіл былі адбіты рэвалюцыйнымі войскамі ў пачатку 1918 г. Дзеянні Добраахвотніцкай арміі, сфарміраванай на Доне з афіцэраў царскага войска і казацкіх вярхоў, не знайшлі масавай падтрымкі насельніцтва.

У той жа час выбары ва Устаноўчы сход, якія адбыліся ў лістападзе 1917 г., паказалі, што 76 % выбаршчыкаў не падтрымліваюць бальшавікоў. Большасць месцаў атрымалі эсэры, меншавікі і кадэты. У адказ на гэта бальшавікі ў пачатку студзеня 1918 г. разагналі Устаноўчы сход, забаранілі партыю кадэтаў і выданне апазіцыйных газет.

Паўнамоцтвы Устаноўчага сходу ўзяў на сябе III Усерасійскі з'езд Саветаў (10—18 студзеня 1918 г.). З'езд прыняў *«Дэкларацыю правоў працоўнага і эксплуатуемага народа»*, у аснову якой былі пакладзены рашэнні першых дэкрэтаў савецкай улады. Вышэйшым заканадаўчым органам аб'яўляўся з'езд Саветаў, а паміж з'ездамі — УЦВК. Старшынёй УЦВК быў выбраны **Я. М. Свярдлоў**, а кіраўніком цяпер ужо пастаяннага ўрада — У. І. Ленін. З'езд абвясціў Расію Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікай (РСФСР) — дзяржавай дыктатуры пралетарыяту і найбяднейшага сялянства. Першая Савецкая Канстытуцыя — Канстытуцыя РСФСР была прынята ў ліпені 1918 г., часткай якой стала «Дэкларацыя правоў працоўнага і эксплуатуемага народа».

Для «барацьбы з контррэвалюцыяй і сабатажам» у снежні 1917 г. была створана Усерасійская надзвычайная камісія (УНК), узначаленая *Ф. Э. Дзяржынскім*. УНК мела неабмежаваныя паўнамоцтвы і адыграла велізарную ролю ва ўстанаўленні савецкай улады. У студзені 1918 г. пачала фарміравацца Чырвоная Армія на добраахвотнай аснове і па класавым прынцыпе. У рэгіёнах распускаліся гарадскія думы і земствы і ўся паўната улады пераходзіла ў рукі Саветаў. Важнай асаблівасцю фарміравання новай улады з'яўлялася тое, што ў яе аснове ляжала партыйнае кіраўніцтва, якое ажыццяўлялася бальшавікамі. Любое рашэнне бальшавіцкага партыйнага органа пры неабходнасці магло прымацца як рашэнне Савета. Так пачалося зрошчванне партыйнага і савецкага дзяржаўнага апарату ў цэнтры і на месцах.

**Брэсцкі мір.** Адным з найбольш вострых пытанняў, якія стаялі перад савецкай уладай, было пытанне аб выхадзе Савецкай Расіі з Першай сусветнай вайны. Першыя перагаворы з нямецкім камандаваннем у Брэст-Літоўску сарваў Л. Д. Троцкі, які адхіліў патрабаванні германскага боку. Скарыстаўшыся гэтым, германскія войскі пачалі наступленне па ўсёй лініі фронту і занялі Мінск, Полацк, Оршу, Талін і іншыя тэрыторыі. **3 сакавіка 1918 г.** (па новым стылі) савецкая дэлегацыя ў новым складзе падпісала ў Брэсце мірны дагавор з Германіяй на яшчэ больш цяжкіх умовах. Ад Расіі адрываліся Літва, Латвія, частка Беларусі. Украіна



Правообладатель Народная асвета

і Фінляндыя прызнаваліся самастойнымі дзяржавамі. Савецкая Расія абавязалася перадаць Германіі караблі Чарнаморскага флоту і выплаціць ёй вялікую грашовую кантрыбуцыю.

Брэсцкі мір быў адным з самых зневажальных за ўсю гісторыю Расіі. І хоць бальшавікі атрымалі кароткачасовую перадышку ад вайны з Германіяй, негатыўныя наступствы Брэсцкага міру не прымусілі сябе доўга чакаць. Пасля заканчэння Першай сусветнай вайны Расія пазбавілася ўсіх пераваг дзяржавы-пераможцы. Вяртанне з франтоў велізарнай масы людзей, якія прывыклі ваяваць, спрыяла распальванню Грамадзянскай вайны. У адказ на падпісанне сепаратнага міру Савет Антанты прыняў рашэнне аб інтэрвенцыі ў Расію. Замест вайны з аслабленай Германіяй бальшавіцкаму ўраду прыйшлося ваяваць з 19 дзяржавамі Антанты.

?

1. Якія найбольш важныя пытанні стаялі перад Расіяй вясной — восенню 1917 г.? Ахарактарызуйце пазіцыю, якую займаў па гэтых пытаннях Часовы ўрад. Як бачылі рашэнне гэтых пытанняў бальшавікі?
2. Чым было выклікана рашэнне Л. Г. Карнілава ўстанавіць у Расіі ваенны рэжым? Якія былі наступствы «карнілаўскага мяцяжу»?
3. Апішыце працэс захопу ўлады бальшавікамі ў Расіі. Якія пераўтварэнні правялі бальшавікі, калі прыйшлі да ўлады? Чаму яны змаглі ўзяць уладу ў кастрычніку 1917 г.?
4. Якая дзяржава была абвешчана ў Расіі ў выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі? Якія дзяржаўныя органы ўлады былі створаны бальшавікамі?
5. Калі быў заключаны Брэсцкі мір? Пералічыце яго ўмовы. Вызначыце значэнне Брэсцкага міру для далейшага ходу падзей у Расіі.

**Прапануем абмеркаваць.** Выступаючы на пасяджэнні Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г., Ленін сказаў: «Таварышы! Рабочая і сялянская рэвалюцыя, пра неабходнасць якой увесь час казалі бальшавікі, адбылася». Наколькі, на ваш погляд, была непазбежнай Кастрычніцкая рэвалюцыя?

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### Зварот II Усерасійскага з'езда Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў

*25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г.*

РАБОЧЫМ, САЛДАТАМ І СЯЛЯНАМ!

...Абапіраючыся на волю велізарнай большасці рабочых, салдат і сялян, абапіраючыся на пераможнае паўстанне рабочых і гарнізона, якое здзейснілася ў Петраградзе, з'езд бярэ ўладу ў свае рукі.

Часовы ўрад звергнуты. Большасць членаў Часовага ўрада ўжо арыштавана.

Савецкая ўлада прапануе неадкладны дэмакратычны мір усім народам і неадкладнае перамір'е на ўсіх франтах. Яна забяспечыць бязвыплатную перадачу памешчыцкіх, удзельных і манастырскіх зямель у распараджэнне ся-



Правообладатель Народная асвета

лянскіх камітэтаў, абароніць правы салдата, правёўшы поўную дэмакратызацыю арміі, установіць рабочы кантроль над вытворчасцю, забяспечыць своечасовае скліканне Устаноўчага сходу, паклапоціцца аб дастаўцы хлеба ў гарады і прадметаў першай неабходнасці ў вёску, забяспечыць усім нацыям, якія насяляюць Расію, сапраўднае права на самавызначэнне.

З'езд пастанаўляе: уся ўлада на месцах пераходзіць да Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, якія і павінны забяспечыць сапраўдны рэвалюцыйны парадак...

Няхай жыве рэвалюцыя!

*Пра што інфармуе II Усерасійскі з'езд рабочых, салдат і сялян Расіі? Да чаго заклікае? Якая праграма першачарговых дзеянняў савецкай улады намечана ў звароце?*

### З работы брытанскага гісторыка Э. Кара «Руская рэвалюцыя ад Леніна да Сталіна. 1917—1929»

Руская рэвалюцыя 1917 года была паваротным пунктам у гісторыі чалавецтва, і цалкам верагодна, што гісторыкі будучыні назавуць яе найвялікшай падзеяй XX стагоддзя. Гісторыкі яшчэ вельмі доўга будуць спрачацца і рэзка разыходзіцца ў ацэнках яе... Адны будуць праслаўляць рускую рэвалюцыю як гістарычную вяху ў вызваленні чалавецтва ад прыгнёту, другія — праклінаць як злачынства і катастрофу.

*Ці згодны вы з ацэнкай брытанскім гісторыкам Кастрычніцкай рэвалюцыі як найвялікшай падзеі XX ст.? Падбярыце ацэнкі сучаснікаў падзей Кастрычніка 1917 г. і гісторыкаў аб Кастрычніцкай рэвалюцыі. Чаму яе ацэнкі гэтак неадназначныя?*

## ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

### З кнігі амерыканскага пісьменніка Д. Рыда «Дзесяць дзён, якія ўзрушылі свет»

Мы ўвайшлі ў вялікую залу пасяджэння, прадзіраючыся праз бурлівы натоўп, збіты ў кучу каля дзвярэй. Асветленыя велізарнымі белымі люстрамі, на лавах і крэслах, у праходах, на падаконніках, нават на краі ўзвышэння для прэзідыума, сядзелі прадстаўнікі працоўных і салдат усёй Расіі. То ў трывожнай цішыні, то ў дзікім шуме чакалі яны званка старшыні. Памяшканне не ацяплялася, але ў ім было горача ад выпарэнняў нямытых чалавечых цел. Непрыемны сіні тытунёвы дым падымаўся ўверх і вісеў у цяжкім паветры... Дэлегат ад Абухоўскага завода, анархіст Пятроўскі пасадзіў мяне побач з сабой. Брудны і няголены, ён ледзь трымаўся на нагах ад бяссонніцы: ён працаваў у Ваенна-рэвалюцыйным камітэце трое сутак без перапынку.



Правообладатель Народная асвета

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Уладзімір Ільіч Ленін** (сапр. прозвішча — Ульянаў) (1870—1924), савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, рэвалюцыянер. Адзін з арганізатараў марксісцкага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа» (1895). У 1903 г. на II з'ездзе Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП), якая была абвешчана ў 1898 г., узначаліў бальшавіцкую фракцыю. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў узброенага паўстання ў Петраградзе ў кастрычніку 1917 г. Першы старшыня савецкага ўрада — Савета Народных Камісараў. Ініцыятар стварэння Камуністычнага Інтэрнацыянала (Камінтэрна) (1919). Выпрацаваў асновы эканамічнай і культурнай палітыкі новай улады, сфармуляваў прынцыпы аб'яднання савецкіх рэспублік у складзе СССР. Аказаў вялікі ўплыў на ход сусветнай гісторыі XX ст.



**Якаў Міхайлавіч Свярдлоў** (1885—1919), савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч. Член РСДРП з 1901 г., бальшавік з 1903 г. Да 1917 г. займаўся рэвалюцыйнай дзейнасцю. Неаднаразова арыштоўваўся і прыгаворваўся да ўтрымання ў турме і ссылкі, дзе займаўся самаадукацыяй. Па прапанове Леніна быў прызначаны старшынёй УЦВК Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Ажыццявіў асноўную работу па стварэнні органаў савецкай улады «ў цэнтры і на месцах». Ад імя УЦВК адкрыў першае пасяджэнне Устаноўчага сходу 5 студзеня 1918 г., абвясціў «Дэкларацыю правоў працоўнага і эксплуатуемага народа», быў старшынёй камісіі па выпрацоўцы Канстытуцыі РСФСР.

## § 11—12. Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя

**Успомніце:** З якой мэтай партыя бальшавікоў пайшла на заключэнне Брэсцкага міру? Якія краіны былі саюзнікамі Расіі ў гады Першай сусветнай вайны?

Многія гісторыкі лічаць, што Грамадзянская вайна ў Расіі пачалася адразу ж пасля захопу ўлады бальшавікамі ў кастрычніку 1917 г. і скончылася разгромам «белай» арміі на Далёкім Усходзе восенню 1922 г. На працягу гэтага часу розныя сацыяльныя класы і групоўкі ўзброенымі метадамі вырашалі супярэчнасці, якія ўзнікалі паміж імі.

**Асноўныя прычыны і этапы Грамадзянскай вайны.** Асноўнымі прычынамі Грамадзянскай вайны былі: неадпаведнасць высакародных мэт пераўтварэння грамадства і радыкальных метадаў іх дасягнення, адмова ад кампрамісаў і стварэнне кааліцыйнага ўрада, разгон Устаноўчага сходу, ліквідацыя таварна-грашовых адносін,



Правообладатель Народная асвета

устанаўленне дыктатуры пралетарыяту, палітыка заходніх дзяржаў, зацікаўленых у аслабленні Расіі.

Грамадзянская вайна ў Расіі прайшла ў некалькі этапаў. На *першым этапе* (кастрычнік 1917 — май 1918 г.) вайна насіла ачаговы характар. *Другі этап* (чэрвень 1918 — чэрвень 1919 г.) характарызаваўся нарастаннем вайны летам — восенню 1918 г. і бязлітаснай барацьбой рэгулярных «чырвоных» і «белых» армій у снежні 1918 — чэрвені 1919 г. На *трэцім этапе* (ліпень 1919 — лістапад 1920 г.) адбываецца ваенны разгром «белых» армій. І на *чацвёртым этапе* (снежань 1920—1922 г.) завяршаецца ліквідацыя ачагоў Грамадзянскай вайны на Далёкім Усходзе, у Сярэдняй Азіі і Закаўказзі.

**Асноўныя сілы і ўдзельнікі Грамадзянскай вайны.** Дзвюма асноўнымі сіламі Грамадзянскай вайны былі «чырвоныя» і «белыя».

«Чырвоныя» былі прадстаўлены бальшавікамі і іх прыхільнікамі — большай часткай пралетарыяту, найбяднейшага сялянства і нязначнай часткай інтэлігенцыі. Выступалі яны пад лозунгам барацьбы за ліквідацыю буржуазных парадкаў, устанаўленне ўлады рабочых і сялян у форме саветаў, будаўніцтва сацыялізму і камунізму.

«Белыя» аб’ядноўвалі ўсе антыбальшавіцкія сілы — буржуазію, афіцэрства, заможнае сялянства, казацтва, а таксама частку найбяднейшых рабочых і сялян, якія пацярпелі ад савецкай улады. «Белыя» ставілі сваёй асноўнай мэтай звяржэнне ўлады бальшавікоў, аднаўленне расійскай дзяржаўнасці, буржуазна-дэмакратычных свабод і ліберальнай эканомікі.

Акрамя таго, удзельнікамі Грамадзянскай вайны былі інтэрвенты — арміі краін Антанты, якія ўварваліся ў Расію, нацыяналістычныя партыі і рухі, што дамагаліся незалежнасці нярускіх тэрыторый Расійскай імперыі і стварэння нацыянальных дзяржаў (Азербайджан, Арменія, Грузія), розныя ваенна-палітычныя сілы (анархісты, махноўцы, «зялёныя», басмачы і г. д.) і проста бандыцкія фарміраванні.

**Ваенныя дзеянні на франтах Грамадзянскай вайны.** Захапіўшы ўладу ў Петраградзе, бальшавікі пачалі ўсталёўваць яе на месцах. Да лютага 1918 г. гэты працэс меў адносна мірны характар. Аднак ачагі антысавецкага супраціўлення, галоўным чынам на Доне, Кубані, Паўднёвым Урале, сведчылі пра непрыманне новай улады значнай часткай расійскага насельніцтва.

У пачатку 1918 г. становішча бальшавікоў стала пагаршацца ў сувязі з наступленнем германскіх войскаў. Савецкае кіраўніцтва, як ужо адзначалася, было вымушана пайсці на падпісанне Брэсцкага мірнага дагавора. Страціўшы велізарныя тэрыторыі з насельніцтвам больш за 50 млн чалавек, яно тым не менш атрымала часовую перадышку.

У сакавіку — ліпені 1918 г. бальшавікі прынялі рашучыя меры па ўмацаванні свайго рэжыму — увялі харчовую дыктатуру, устанавілі аднапартыйную сі-



Правообладатель Народная асвета

стэму, нацыяналізавалі ўсю прамысловасць, расстралялі цара і яго сям'ю. Усе гэтыя меры выклікалі супраціўленне нязгодных з палітыкай бальшавікоў і прывялі да таго, што Грамадзянская вайна стала больш бязлітаснай. Тэрыторыя, якую кантралявалі бальшавікі, скарацілася да раёнаў Масквы, Петраграда і вузкай паласы ўздоўж Волгі.

Летам 1918 г. Савецкая Расія апынулася ў шчыльным акружэнні варожых франтоў. З усходу наступала белагвардзейская армія адмірала Калчака, з поўдня — Добраахвотніцкая армія генерала Дзянікіна, з захаду на Петраград ішлі войскі генерала Юдзеніча. У Сібіры папоўнілі шэрагі контррэвалюцыі палонныя салдаты аўстра-венгерскай арміі (белачэхі), якія паднялі мяцеж супраць савецкай улады. У некалькіх месцах — з боку Белага, Балтыйскага, Чорнага мораў, Ціхага акіяна, Каўказа і Сярэдняй Азіі высадзіліся войскі інтэрвентаў, галоўным чынам Англіі, Францыі, ЗША і Японіі.

Такім чынам, бязлітасная барацьба «чырвоных» і «белых» армій суправаджалася ваеннай інтэрвенцыяй. Лёс Савецкай Расіі, а не толькі рэвалюцыі, вісеў літаральна на валаску.

У верасні 1918 — снежні 1919 г. Грамадзянская вайна дасягнула свайго піка. Савецкая Расія была абвешчана адзіным ваенным лагерам. Замах на жыццё У. І. Леніна даў падставу для пачатку «чырвонага тэрору» — палітыкі татальнага знішчэння ўсіх ворагаў бальшавізму. З другой паловы 1918 па 1921 г. у Савецкай рэспубліцы быў уведзены рэжым кіравання эканомікай ваеннымі метадамі — **палітыка «ваеннага камунізму»**. Пад ёю падразумявалася сістэма надзвычайных мер па мабілізацыі ўсіх рэсурсаў краіны, неабходных для перамогі ў Грамадзянскай вайне. Найважнейшымі элементамі гэтай палітыкі былі: ліквідацыя прыватнай уласнасці, згортванне таварна-грашовых адносін і нацыяналізацыя прамысловасці, уключаючы дробныя і сярэднія прадпрыемствы, устанаўленне ўраўняльнай дзяржаўна-размеркавальнай сістэмы, выплата заработнай платы натуральнымі прадуктамі, наладжванне прамога тавараабмену паміж горадам і вёскай. Адначасова на тылавыя работы было мабілізавана ўсё насельніцтва ва ўзросце ад 16 да 60 гадоў. Па прапанове Л. Д. Троцкага пачалі фарміравацца працоўныя арміі. Уводзілася прымусовае бясплатнае адабранне ў сялян прадуктаў на патрэбы фронту — **харчразвёрстка**. Харчразвёрстку ажыццяўлялі спецыяльныя карныя органы — харчатрады, створаныя замест **камбедаў** (камітэтаў беднаты).



Харчразвёрстка ў вёсцы



Правообладатель Народная асвета




Грамадзянская вайна і інтэрвенцыя ў Расіі (1917—1922 гг.)

Ганенням падверглася Руская Праваслаўная Царква (РПЦ). Яе служак арыштоўвалі, адпраўлялі на прымусовыя работы. Многія царкоўныя храмы і манастыры былі закрыты, а іх маёмасць канфіскавана «для патрэб рэвалюцыйнага народа».

У палітычнай сферы «ваенны камунізм» характарызаваўся панаваннем аднапартыйнай сістэмы, укараненнем каманда-адміністрацыйных метадаў кіравання і жорсткім праследаваннем іншадумцаў аж да ўвядзення «чырвонага тэрору». У духоўнай сферы ўсталёўваліся марксізм у якасці пануючай ідэалогіі і мараль, якая апраўдвала любыя дзеянні ў інтарэсах рэвалюцыі. У выніку ўсе гэтыя жорсткія меры дасягнулі сваёй мэты.



Правообладатель Народная асвета



Парад часцей Чырвонай Арміі. Харкаў. 1920 г.

У лістападзе 1918 г. камандуючы Чарнаморскім флотам адмірал **А. В. Калчак** быў абвешчаны Вярхоўным правіцелем Расіі, стаўшы, такім чынам, галоўным лідарам «белага» руху. Яму ўдалося ўзнавіць баяздольную «белую» армію, у саюзе з якой ваявалі Чэхаславацкі корпус і інтэрвенты. У Омску, часовай сталіцы Расіі, дзейнічаў белагвардзейскі ўрад. Пад кантролем А. В. Калчака знаходзілася велізарная тэрыторыя ад Уладзівастока да Урала.

Вясной 1919 г. магутная белагвардзейская армія Калчака пачала наступленне супраць Савецкай рэспублікі, імкнучыся захапіць Паволжа. Вайна «чырвоных» з калчакаўскімі войскамі стала галоўным тэатрам ваенных дзеянняў да восені 1919 г. Гэта быў самы крытычны перыяд для Рэспублікі Саветаў.

Абарону Савецкай рэспублікі ўзначалілі Савет Народных Камісараў на чале з У. І. Леніным і Рэўваенсавет рэспублікі, які быў створаны ў 1918 г. на чале з **Л. Д. Троцкім**. Утвараліся чатыры франты з жорстка арганізаваным камандаваннем і выразнай структурай кіравання. Уводзілася прымусовая мабілізацыя ў Чырвоную Армію ўсяго маладога мужчынскага насельніцтва, у выніку чаго яе колькасць узрасла з 50 тыс. да 2 млн чалавек. Вялікую тлумачальную работу ў войсках праводзілі камісары. Важным фактарам умацавання Чырвонай Арміі было ўвядзенне надзвычай жорсткай дысцыпліны (расстрэл за дэзерцірства і марадзёрства ці невыкананне загаду, забарона ўжываць спіртное).

УНК на чале з Ф. Э. Дзяржынскім надзялялася надзвычайнымі паўнамоцтвамі. Чэкісты выяўлялі праціўнікаў бальшавікоў і сабатажнікаў. Смяротная кара і іншыя пакаранні выносіліся наспех, без суда і следства так званымі «тройкамі», якія знаходзіліся пад кантролем карных органаў бальшавікоў. Такі спрошчаны парадак судаводства атрымаў назву «рэвалюцыйнай законнасці».

Прынятыя надзвычайныя меры дазволілі бальшавікам спыніць наступленне белагвардзейскіх войскаў і выратаваць Рэспубліку Саветаў ад поўнага разгрому.

Восенню 1919 г. Чырвоная Армія пад камандаваннем **М. В. Фрунзэ** пачала нечаканае для Калчака магутнае контрнаступленне на Усходнім фронце. Велізарныя тэрыторыі — Прыуралле, Урал, Заходняя Сібір, якія кантраляваліся Калчаком, былі заняты «чырвонымі» на працягу 4 месяцаў. У баях супраць войскаў Калчака асабліва вызначылася дывізія пад камандаваннем В. І. Чапаева — легендарнага героя Грамадзянскай вайны. У снежні 1919 г. «чырвоныя» ўзялі сталіцу Калчака — Омск.



Правообладатель Народная асвета

Вярхоўны правіцель Расіі быў узяты ў палон і расстраляны ў 1920 г., а яго армія канчаткова разгромлена.

Прычынамі поспеху «чырвоных» у разгроме Калчака былі: масіраваны і магутны характар контрнаступлення; негатоўнасць арміі Калчака да абароны; тактыка «выпаленай зямлі», што праводзілася «чырвонымі» па ініцыятыве Л. Д. Троцкага і М. М. Тухачэўскага пры адступленні і стала адной з прычын дрэннага харчовага забеспячэння калчакаўцаў, якія пачалі галадаць у спустошаных гарадах Паволжа; адмова мірнага насельніцтва, якое стамілася ад вайны, падтрымліваць белагвардзейцаў: «чырвоныя прыйшлі — рабуюць, белыя прыйшлі — рабуюць». Велізарны ўклад у разгром арміі Калчака ўнёс М. В. Фрунзэ, які праявіў у ходзе ваенных дзеянняў несумненны палкаводчы талент.



В. І. Чапаеў

Разгром Калчака быў галоўнай перамогай Чырвонай Арміі. Пасля гэтага ў ходзе Грамадзянскай вайны наступіў пералом.

**Разгром армій Дзянікіна, Юдзеніча і Урангеля.** Вясной — восенню 1920 г. была разгромлена армія Дзянікіна на поўдні і армія Юдзеніча на паўночным захадзе Расіі.

Апошні бастыён арганізаванага супраціўлення «белых» на чале з генералам П. М. Урангелем захоўваўся ў Крыме. У *канцы 1920 г.* войскі Паўднёвага фронту пад камандаваннем Фрунзэ здзейснілі ўплаў, па пояс у вадзе, гераічны пераход праз шматкіламетровы *заліў Сіваш* і ўдарылі ў тыл войскаў Урангеля. Наступленне «чырвоных» было настолькі нечаканым, што «белыя» практычна не аказалі арганізаванага супраціўлення. Крым быў узяты з мінімальнымі стратамі войскаў Чырвонай Арміі. Вялікую ролю ў разгроме войскаў Дзянікіна і Урангеля адыграла Першая конная армія С. М. Будзённага.




Атрад камсамольцаў-добраахвотнікаў перад адпраўкай на фронт. 1920 г.

Арганізаванае супраціўленне «белых» было зламана. У дадзеных умовах дзяржавы-інтэрвенты прынялі рашэнне аб эвакуацыі сваіх войскаў. У выніку на большай частцы тэрыторыі Расіі была ўстаноўлена ўлада бальшавікоў.

**Завяршальны этап Грамадзянскай вайны** характарызаваўся ўстанаўленнем савецкай улады на былых ускраінах Расійскай імперыі: у Закаўказзі, Сярэдняй Азіі, на Далёкім Усходзе. У Польшчы, аднак, савецкую



Правообладатель Народная асвета

ўладу ўстанавіць не атрымалася. Савецка-польская вайна 1920—1921 гг. скончылася паражэннем Чырвонай Арміі.

З выхадам Чырвонай Арміі да Ціхага акіяна і ўзяццем Уладзівастока ў лістападзе 1922 г. Грамадзянская вайна ў Расіі скончылася.

**Асноўныя прычыны перамогі «чырвоных».** Перамога «чырвоных» у Грамадзянскай вайне была забяспечана за кошт таго, што палітыку бальшавікоў падтрымалі рабочыя і шматмільённая маса найбяднейшых сялян. У адрозненне ад Часовага ўрада Савет Народных Камісараў адразу прыступіў да практычнага вырашэння ўсіх асноўных задач, пра якія да гэтага ішлі адны толькі размовы.

Перамозе бальшавікоў садзейнічала адсутнасць агульнага камандавання ў «белых». «Белы» рух у сацыяльных і ідэйных адносінах быў стракатым і разнародным. Ён так і не здолеў высунуць палітычную праграму, якая б карысталася масавай падтрымкай насельніцтва. Вельмі паказальнай з'яўлялася пазіцыя адмірала А. В. Калчака, Вярхоўнага правіцеля Расіі, які год і два месяцы кантраляваў Сібір і першапачаткова карыстаўся тут падтрымкай значнай часткі сялянства. «Ніякіх рашуча палітычных мэт у мяне няма, — заяўляў ён з гонарам, — ні з якімі палітычнымі партыямі я не пайду, не буду імкнуцца да аднаўлення чаго-небудзь старога, а буду старацца ствараць армію рэгулярнага тыпу, бо лічу, што толькі такая армія можа атрымліваць перамогі». З падобнай устаноўкай немагчыма было прэтэндаваць на ролю «выратавальніка Расіі». Адсутнасць яснай і прывабнай праграмы асуджала справу Калчака і яго самога на гібель.

Бальшавікоў падтрымалі нацыянальныя ўскраіны, а таксама рабочы рух і кампартыі іншых краін.

Грамадзянская вайна каштавала Расіі велізарных ахвяр. На франтах вайны, у час «белага» і «чырвонага» тэрору, ад голаду і масавых эпідэмій краіна страціла ад 8 да 13 млн чалавек. Агульныя страты з 1914 г. склалі 25 млн чалавек. Каля 2 млн чалавек былі вымушаны эмігрыраваць. Сярод іх шматлікія прадстаўнікі інтэлектуальнай эліты. Незаменныя духоўныя і маральныя страты мелі глыбокія сацыяльныя і культурныя наступствы для будучай гісторыі савецкай краіны.

?

1. Сфармулюйце азначэнне паняцця «Грамадзянская вайна». Якія былі асаблівасці Грамадзянскай вайны ў Расіі? Чаму краіны Антанты, якія былі саюзнікамі Расіі ў Першай сусветнай вайне, арганізавалі ваенную інтэрвенцыю супраць яе?
2. Якія былі прычыны Грамадзянскай вайны ў Расіі? Ахарактарызуйце асноўныя палітычныя сілы, якія прымалі ўдзел у Грамадзянскай вайне, іх асноўныя мэты. Назавіце найбольш вядомых прадстаўнікоў «белага» і «чырвонага» руху.
3. Якія асноўныя этапы вылучаюць у ходзе Грамадзянскай вайны? Дайце ім кароткую характарыстыку.
4. Якія меры былі прыняты бальшавікамі з мэтай арганізацыі абароны Савецкай рэспублікі?
5. Якія прычыны абумовілі перамогу «чырвоных» у Грамадзянскай вайне? Якія фактары вызначылі паражэнне «белага» руху?



Правообладатель Народная асвета

6. Якая эканамічная палітыка праводзілася бальшавікамі ў гады Грамадзянскай вайны? Назавіце яе асноўныя элементы.
7. Якія былі наступствы Грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі для Расіі?

**Прапануем абмеркаваць.** У гады Грамадзянскай вайны ў Расіі былі разбіты сілы «белых» і інтэрвентаў, падаўлены антыбальшавіцкія выступленні сялян. «Чырвоныя» адстаялі дзяржаўны суверэнітэт Савецкай Расіі. Ці можна гаварыць аб пераможцах у Грамадзянскай вайне? Якія ўрокі Грамадзянскай вайны?

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### З Дэкрэта СНК

*15 студзеня 1918 г.*

Старая армія служыла зброяй класавага прыгнёту працоўных буржуазіяй. З пераходам улады да працоўных і эксплуатуемых класаў паўстала неабходнасць стварэння новай арміі, якая стане апорай савецкай улады ў цяперашні час, фундаментам для замены пастаяннай арміі ўсенародным узбраеннем у найбліжэйшы час і паслужыць падтрымкай для будучай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Еўропе.

З прычыны гэтага Савет Народных Камісараў пастанаўляе: арганізаваць новую армію пад назвай «Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія», на наступных асновах:

1) Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія ствараецца з найбольш свядомых і арганізаваных элементаў працоўных мас.

2) Доступ у яе рады адкрыты для ўсіх грамадзян Расійскай Рэспублікі, не маладзейшых за 18 гадоў...

### З Пастановы УЦВК

*29 мая 1918 г.*

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт лічыць, што пераход ад добраахвотніцкай арміі да ўсеагульнай мабілізацыі рабочых і бяднейшых сялян настойліва дыктуецца ўсім становішчам краіны, як для барацьбы за хлеб, так і для адбіцця нахабнай, на глебе голаду, контррэвалюцыі, як унутранай, так і знешняй.

Неабходна неадкладна перайсці да прымусовага набору аднаго або некалькіх узростаў...

### З Дэкларацыі Добраахвотніцкай арміі

*14 красавіка 1918 г.*

1. Добраахвотніцкая армія змагаецца за выратаванне Расіі шляхам:
а) стварэння моцнай дысцыплінаванай і патрыятычнай арміі;
б) бязлітаснай барацьбы з бальшавікамі;
в) устанаўлення ў краіне адзінства і прававога парадку.



Правообладатель Народная асвета

2. Імкнучыся да сумеснай работы з усімі рускімі людзьмі, якія дзяржаўна мысляць, Добраахвотніцкая армія не можа прыняць партыйнай афарбоўкі.

3. Пытанні аб формах дзяржаўнага ладу з'яўляюцца наступнымі этапамі...

4. Ніякіх зносін ні з немцамі, ні з бальшавікамі. Адзіна прымальныя ўмовы: адыход з меж Расіі першых і раззбраенне і здача другіх.

5. Пажадана прыцягненне ўзброеных сіл славян на аснове гістарычных спадзяванняў, якія не парушаюць адзінства і цэласнасці Рускай дзяржавы, і на пачатках, вызначаных у 1914 годзе рускім Вярхоўным Галоўнакамандуючым.

*Параўнайце шляхі фарміравання і мэты армій «чырвоных» і «белых». Вызначыце на аснове дакументаў баяздольнасць «чырвонай» і «белай» армій. Свой адказ аргументуйце.*

## ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**Камбеды** — камітэты беднаты, створаныя дэкрэтамі УЦВК «Аб арганізацыі і забеспячэнні вясковай беднаты» ад 11 чэрвеня 1918 г. і Саўнаркама ад 6 жніўня 1918 г. На месцах ствараліся валасныя і сельскія камітэты беднаты. Выбіраць і быць выбранымі ў іх маглі вясковыя жыхары, «за выключэннем яўных кулакоў і багацеяў». Да лістапада 1918 г. у 33 губернях Еўрапейскай Расіі і Беларусі было створана 122 тыс. камбедаў. Мэтай іх дзейнасці было размеркаванне хлеба, прадметаў першай неабходнасці і сельскагаспадарчых прылад і аказанне садзейнічання мясцовым харчовым органам у адабранні хлебных лішкаў у заможных сялян. Акрамя таго, яны займаліся пытаннямі гаспадарчага жыцця вёскі, праводзілі мабілізацыю і набор добраахвотнікаў у Чырвоную Армію, вялі культурна-асветніцкую работу, удзельнічалі ў перадзеле сялянскіх, у тым ліку надзельных, зямель, адбіралі ў кулакоў лішкі зямлі звыш мясцовай ураўняльнай нормы, а таксама пераразмяркоўвалі памешчыцкія землі і інвентар там, дзе яны патрапілі ў рукі кулакоў.

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Аляксандр Васільевіч Калчак** (1874—1920), расійскі ваенны дзеяч, вучоны. Удзельнік палярных экспедыцый 1900—1903 і 1908—1911 гг. Удзельнік руска-японскай (1904—1905) і Першай сусветнай войнаў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі — адзін з лідараў «белага» руху. Устанавіў у Сібіры ваенную дыктатуру і прыняў тытул «Вярхоўнага правіцеля Усерасійскага ўрада» у Омску (лістапад 1918 — снежань 1919 г.). Узімку 1918 — летам 1919 г. арганізаваў наступленне сваёй арміі для захопу Масквы і



Правообладатель Народная асвета

звяржэння Савецкага ўрада, але пацярпеў паражэнне. Уцёк з Омска ў Іркуцк. Расстраляны па прыгаворы Іркуцкага ВРК, які быў санкцыянаваны бальшавіцкім цэнтрам у Маскве.



**Леў Давыдавіч Троцкі** (сапр. прозвішча — Бранштэйн) (1879—1940), савецкі палітычны і дзяржаўны дзеяч. Вітаў Лютаўскую рэвалюцыю 1917 г. як пачатак сусветнай рэвалюцыі. Сваімі радыкальнымі выступленнямі заваяваў папулярнасць сярод рабочых і салдат. У кастрычніку 1917 г. ініцыяваў стварэнне Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта для абароны Петраграда ад контррэвалюцыйных сіл. Узначаліў падрыхтоўку Кастрычніцкага паўстання бальшавікоў; разам з У. І. Леніным быў яго фактычным кіраўніком, арганізаваў абарону Петраграда ад войскаў генерала П. М. Краснова. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі займаў пасады наркама замежных спраў, наркама па ваенных і марскіх справах, старшыні Рэўваенсавета, з'яўляўся членам Палітбюро ЦК РКП (б) і членам Выканкама Камінтэрна. У ходзе ўнутрыпартыйнай барацьбы ў 1927 г. быў выключаны з партыі і высланы з СССР, а ў 1932 г. пазбаўлены савецкага грамадзянства. Знаходзячыся ў эміграцыі, працягваў актыўную палітычную дзейнасць. Быў забіты ў Мексіцы агентам НКУС.



**Міхаіл Васільевіч Фрунзэ** (1885—1925), савецкі дзяржаўны і ваенны дзеяч. Член РСДРП з 1904 г. Актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага руху ў Расіі. У гады Грамадзянскай вайны правёў паспяховыя аперацыі супраць галоўных войскаў адмірала А. В. Калчака, П. М. Урангеля, разграміў Паўстанцкую армію Н. І. Махно. Займаў пасады наркама па ваенных і марскіх справах, начальніка штаба Чырвонай Арміі, намесніка і старшыні Рэўваенсавета. Пад яго кіраўніцтвам праводзілася ваенная рэформа 1924—1925 гг., падчас якой была скарочана колькасць арміі, уведзены прынцып адзінаначалля, рэарганізаваны ваенны апарат і палітычнае кіраванне Чырвонай Арміі. Аўтар шэрага ваенна-тэарэтычных прац.

## § 13. Новая эканамічная палітыка. Утварэнне СССР

**Успомніце:** Чаму ў гады Грамадзянскай вайны ў Расіі была ўведзена палітыка «ваеннага камунізму»? Што яна прадугледжвала? Які прынцып аб'яднання савецкіх рэспублік быў закладзены ў першай Канстытуцыі СССР?

Найважнейшым вынікам Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі стала з'яўленне на палітычнай карце свету новай дзяржавы — Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР). У ім быў пабудаваны «дзяржаўны сацыялізм» і ажыц-



Правообладатель Народная асвета

цёўлена небывалымі да гэтага тэмпамі мадэрнізацыя эканомікі, грамадства і дзяржавы. «Дзяржаўны сацыялізм» савецкага тыпу з'явіўся іншай, альтэрнатыўнай капіталізму мадэллю індустрыяльнага развіцця грамадства.

**Эканамічны і палітычны крызіс у краіне.** У 1921 г. Савецкая дзяржава перажывала найвастрэйшы эканамічны і палітычны крызіс. Краіна ляжала ў руінах, прамысловая вытворчасць скарацілася ў 7 разоў у параўнанні з даваенным 1913 г., вытворчасць сталі знізілася да ўзроўню часоў Пятра I. У Савецкай рэспубліцы пачаўся страшэнны голад, узраслі беспрацоўе і злачыннасць, рабочыя ўцякалі з гарадоў, сяляне браліся за зброю.

У канцы лютага 1921 г. паўсталі рабочыя Петраграда, затым сяляне ў Тамбоўскай і Варонежскай губернях, у Заходняй Сібіры, Сярэднім Паволжы, на Доне і Кубані. Але асабліва небяспечным для новай улады было паўстанне матросаў і салдат Кранштацкай крэпасці ў *сакавіку 1921 г.* Рабочыя і сяляне, матросы і салдаты — усе патрабавалі адмены харчразвёрсткі, дазволу свабоднага гандлю, ліквідацыі манаполіі бальшавіцкай партыі на ўладу. Страты Чырвонай Арміі і спецыяльных фарміраванняў УНК пры падаўленні антыбальшавіцкіх паўстанняў у гэты перыяд склалі амаль 150 тыс. чалавек.

Калі ў Паволжы ў 1921 г. здарыўся страшэнны голад, Руская Праваслаўная Царква стварыла царкоўны камітэт дапамогі галадаючым і заклікала кіраўнікоў хрысціянскіх цэркваў аказаць ім дапамогу. У адказ на гэтую акцыю Саўнаркам прыняў дэкрэт аб канфіскацыі царкоўнай маёмасці на карысць галадаючых. У час адабрання царкоўных каштоўнасцей адбыліся шматлікія сутыкненні вернікаў з прадстаўнікамі ўлады. Савецкі ўрад выкарыстаў гэтыя падзеі для нанясення чарговага ўдару па царкве. Ленін лічыў, што «чым большую колькасць прадстаўнікоў рэакцыйнага духавенства і рэакцыйнай буржуазіі атрымаецца з гэтай нагоды расстраляць, тым лепш». У 1922 г. шэраг буйных кіраўнікоў царквы быў абвінавачаны ў контррэвалюцыйнай дзейнасці і прысуджаны да смяротнага пакарання. Быў арыштаваны і адпраўлены ў турму патрыярх Ціхан.

**Сутнасць і значэнне новай эканамічнай палітыкі.** Найвастрэйшы сацыяльна-эканамічны і палітычны крызіс пачатку 1920-х гг. прымусіў бальшавіцкае кіраўніцтва адмовіцца ад палітыкі «ваеннага камунізму» і перайсці да новага курсу, які атрымаў назву **новай эканамічнай палітыкі (нэп)**. Адным з ініцыятараў нэпа быў **М. І. Бухарын**.

Сутнасць нэпа заключалася ў частковым аднаўленні рынкавай эканомікі, у яе развіцці на аснове эканамічнай зацікаўленасці і гаспадарчага разліку. Стратэгічнай мэтай нэпа з'яўлялася пабудова сацыялізму. Бальшавіцкае кіраўніцтва абвясціла курс на ўмацаванне саюза рабочага класа і сялянства. З дапамогай нэпа бальшавікі разлічвалі выйсці з крызісу, прайсці праз небяспечны перыяд, а потым адмовіцца ад гэтай палітыкі. Такім чынам, новая эканамічная палітыка была вымушанай мерай. Бальшавікі, якія лічылі прыватную ўласнасць сваім лютым ворагам, з самага



Правообладатель Народная асвета

пачатку асуджалі нэп на правал. Ленін разумеў непазбежную супярэчнасць і небяспечнасць развіцця краіны на шляху нэпа. Таму савецкае кіраўніцтва лічыла неабходным захаванне ў руках пралетарскай дзяржавы «камандных вышынь» у эканоміцы, знешнім гандлі і ідэалогіі. Пераход да новай эканамічнай палітыкі дэклараваў X з’езд РКП(б) у **сакавіку 1921 г.**



Прыватныя магазіны ў гады нэпа

Першым крокам нэпа стала замена харчразвёрсткі ў вёсцы фіксаваным **харчовым падаткам (харчпадаткам)**. Пастаўкі па харчпадатку былі прыкладна ў 2 разы ніжэйшыя, чым па харчразвёрстцы. Лішкамі сваёй працы селянін мог распараджацца па сваім меркаванні. У краіне адмяняліся картачная сістэма і ўраўняльнае размеркаванне, працоўныя арміі і працоўная павіннасць, паступова ўкараняўся грашовы абарот. Дазваляліся рынкавыя адносіны, невялікія прыватныя прадпрыемствы, наём рабочай сілы, свабода гандлю, прыцягненне замежнага капіталу. Пры гэтым дзяржава захоўвала свае пазіцыі ў банкаўскай сферы, на буйных і часткова на сярэдніх прадпрыемствах.

**Уздым народнай гаспадаркі.** Нэп стымуляваў прыватную ініцыятыву і садзейнічаў ажыўленню эканомікі. Вынікі прамысловага развіцця былі вельмі паспяховымі. Да 1926 г. СССР дасягнуў узроўню 1913 г. у большасці галін вытворчасці. Спажыванне харчовых прадуктаў перавысіла ўзровень 1913 г., а збор збожжавых у 1925 г. перавысіў на 20 % сярэднегадавыя паказчыкі 1909—1913 гг. Паспяхова ажыццяўляўся **Дзяржаўны план па электрыфікацыі Расіі (ГОЭЛРО)**, які быў прыняты ў 1920 г.



Прырост прамысловай прадукцыі (%)

Важнае значэнне мела грашовая рэформа. Яна дазваляла рабіць накапленні і захоўваць зберажэнні насельніцтва. Савецкі залаты чырвонец, які выпускаўся з 1923 г., стаў цвёрдай канвертыруемай валютай і каштаваў на сусветным рынку каля 6 долараў ЗША. Новую эканамічную палітыку бальшавікоў у вёсцы адлюстраваў новы Зямельны кодэкс (1922 г.), паводле якога сялянам дазваляліся выхад з абшчыны, арэнда і наёмная праца.

Народная асвета



Правообладатель Народная асвета




Першыя савецкія грузавыя аўтамабілі АМО-Ф15. 1924 г.




Залаты чырвонец. 1923 г.

Нэп дапамог аднавіць народную гаспадарку, наладзіць вытворчасць і гандаль, выжыць краіне ў найцяжэйшы эканамічны перыяд. Аднак гэтыя поспехі былі адноснымі, паколькі вядучыя краіны свету да гэтага часу пайшлі далёка наперад у сваім развіцці. Перад Савецкай дзяржавай аб'ектыўна стаяла задача індустрыялізацыі краіны. Неабходна было стварыць магутную эканоміку, якая б дазволіла вытрымаць міжнародную ізаляцыю і даць адпор агрэсіі любога праціўніка. У другой палове 1920-х гг. пачалося выцясненне дзяржавай прыватнага капіталу і згортванне новай эканамічнай палітыкі.

**Пераадоленне палітычнай ізаляцыі на міжнароднай арэне.** Галоўная задача савецкай знешняй палітыкі ў 1920-х гг. заключалася ў тым, каб забяспечыць міжнароднае прызнанне новай улады і стварыць спрыяльныя мірныя ўмовы для ўнутраных пераўтварэнняў.

Рэалізацыя гэтага курсу была надзвычай складанай і цяжкай справай, таму што рэальная знешняя палітыка Савецкай дзяржавы будавалася з улікам не толькі нацыянальных, але і ідэалагічных прыярытэтаў. Савецкі ўрад выдаткоўваў значныя сродкі з дзяржаўнага бюджэту на падтрымку рэвалюцыйнага руху ва ўсім свеце, нягледзячы на тое, што дзейнасць Камуністычнага Інтэрнацыяналу ў гэты перыяд сур'ёзна перашкаджала нармалізацыі адносін з іншымі дзяржавамі. Акрамя таго, савецкі ўрад адмовіўся выплачваць даўгі царскай Расіі і Часовага ўрада, а таксама кампенсаваць замежным інвестарам іх страты ад праведзенай у Расіі нацыяналізацыі. Усё гэта рабіла немагчымым прызнанне Савецкай Расіі з боку вядучых заходніх дзяржаў.

У канцы 1920 — пачатку 1921 г. Савецкі ўрад падпісаў мірныя дагаворы з Фінляндыяй, Эстоніяй, Латвіяй, Літвой, Польшчай.

Па меры таго як Савецкая дзяржава стабілізавала свае палітычныя структуры, краіны, якія спрабавалі першапачаткова яе байкатаваць, уступілі ў перагаворы



Правообладатель Народная асвета

з мэтай устанаўлення звычайных дыпламатычных і гандлёвых адносін. Прарывам стаў Рапальскі дагавор з Германіяй, падпісаны ў красавіку 1922 г.

**Утварэнне СССР і яго прызнанне.** У гады нэпа вырашалася найбольш актуальнае для Расіі нацыянальнае пытанне. У аснове палітыкі бальшавікоў у гэтым пытанні першапачаткова была ідэя нацыянальнага самавызначэння прыгнечаных народаў, іх права самім вырашаць свой далейшы лёс. Зыходзячы з канцэпцыі сусветнай пралетарскай рэвалюцыі, савецкая ўлада праяўляла гатоўнасць падтрымліваць рэвалюцыйныя і нацыянальна-вызваленчыя рухі ў замежных краінах. З гэтай мэтай у Маскве быў створаны Камінтэрн, які атрымаў указанне ўсяляк дапамагаць




Утварэнне СССР



Правообладатель Народная асвета

прасавецкім палітычным сілам на Захадзе. Аднак рэвалюцыйныя выступленні ў Заходняй Еўропе пацярпелі няўдачу.

Акрамя Расіі, савецкая ўлада ўсталявалася толькі ва Украіне, Беларусі і Закаўказзі. У гады Грамадзянскай вайны склаўся ваенна-палітычны саюз гэтых трох савецкіх рэспублік з Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікай (РСФСР).

Гістарычныя, эканамічныя і палітычныя перадумовы падштурхоўвалі бальшавікоў да адраджэння адзінай дзяржавы на тэрыторыі былой Расійскай імперыі. Цэнтрам аб'яднання стала РСФСР. Пасля падпісання ў 1920 і 1921 гг. мірных дагавораў з Фінляндыяй, Польшчай і прыбалтыйскімі дзяржавамі паўстала пытанне аб наданні новай формы саюзніцкім адносінам паміж Савецкай Расіяй і савецкімі рэспублікамі, якія тады існавалі.

Народны камісар па справах нацыянальнасцей **І. В. Сталін** прапанаваў уключыць усе чатыры савецкія рэспублікі ў склад РСФСР. Згодна з планам Сталіна РСФСР павінна была застацца адзінай і непадзельнай дзяржавай. У яе рамках усім народам, якія жадалі, дазвалялася ствараць аўтаноміі (*план «аўтанамізацыі»*).

Ленінскі *план федэрацыі* прадугледжваў спачатку атрыманне ўсімі народамі, якія жадалі, незалежнасці і дзяржаўнасці і толькі потым аб'яднанне з РСФСР у раўнапраўнай федэрацыі. У. І. Ленін дамагаўся аб'яднання ўсіх рэспублік на роўных правах у адзіную краіну. У выніку **30 снежня 1922 г.** на тэрыторыі былой Расійскай імперыі быў абвешчаны **Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.** Стварэнне СССР прывяло да ўмацавання ваеннай магутнасці Савецкай дзяржавы і садзейнічала эканамічнаму развіццю нацыянальных ускраін.

У склад СССР увайшлі РСФСР, Украінская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (УССР), Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР), Закаўказская Савецкая Федэратыўная Сацыялістычная Рэспубліка (ЗСФСР — федэрацыя Грузіі, Арменіі, Азербайджана). Насуперак ідэі Леніна СССР па сваёй сутнасці з'яўляўся цэнтралізаванай дзяржавай. Першыя саюзныя рэспублікі знаходзіліся пад поўным кантролем бальшавікоў і РСФСР.



Падпісанне Дагавора аб утварэнні СССР. 30 снежня 1922 г. З карціны С. Дудніка

Першая Канстытуцыя СССР, прынятая ў **1924 г.**, практычна скапіравала структуру ўлады, якая існавала ў РСФСР. Вышэйшым органам улады станавіўся *Усесаюзны з'езд саветаў*, а яго пастаян-



Правообладатель Народная асвета

на дзеючым рабочым органам — *Усесаюзны Цэнтральны Выканаўчы Камітэт* (УЦВК), які складаўся з *Саюзнага Савета* і *Савета Нацыянальнасцей*. Вышэйшым выканаўчым органам з'яўляўся *Савет Народных Камісараў* (Саўнаркам) — урад СССР. Гэтую сістэму органаў дзяржаўнай улады запазычылі канстытуцыі ўсіх саюзных рэспублік.

У 1924 г. пачалося дыпламатычнае прызнанне СССР з боку шэрага еўрапейскіх дзяржаў. З буйных еўрапейскіх краін першай СССР прызнала Вялікабрытанія ў пачатку 1924 г. Апошняй вядучай дзяржавай, якая прызнала СССР у 1933 г., былі ЗША.



Першы герб СССР. 1924 г.

?

1. Якія былі прычыны замены палітыкі «ваеннага камунізму» новай эканамічнай палітыкай?
2. Пералічыце мерапрыемствы, якія былі праведзены ў ходзе нэпа, у галіне: а) сельскай гаспадаркі; б) прамысловасці; в) фінансаў; г) гандлю.
3. Якімі былі вынікі правядзення новай эканамічнай палітыкі? Чым была выклікана адмова ад нэпа?
4. Якія былі першыя крокі савецкай улады ў галіне нацыянальных адносін?
5. Якія былі перадумовы ўтварэння СССР: ідэалагічныя, палітычныя, эканамічныя?
6. На аснове ніжэйпрыведзеных фактаў вызначыце асноўныя этапы аб'яднання савецкіх рэспублік:
   а) прыняцце дэкрэта «Аб аб'яднанні савецкіх рэспублік Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Беларусі для барацьбы з сусветным імперыялізмам» (1919);
   б ) у УЦВК РСФСР уведзены прадстаўнікі Украіны, Беларусі, закаўказскіх рэспублік;
   в) заключэнне ў 1920—1921 гг. гаспадарчых дагавораў і пагадненняў РСФСР з Украінай, Беларуссю, Азербайджанам, Арменіяй, Грузіяй, распрацоўка плана ГОЭЛРО і стварэнне Федэральнага камітэта па зямельных справах (1921), які рэгуляваў пытанні ў гэтых савецкіх рэспубліках;
   г) дэлегацыя РСФСР прадстаўляла савецкія рэспублікі на міжнароднай канферэнцыі ў Генуі (1922).
7. Якія планы стварэння адзінай дзяржавы існавалі сярод партыйнага кіраўніцтва РКП(б)? У чым іх прынцыповае адрозненне?

**Прапануем абмеркаваць.** Некаторыя гісторыкі разглядаюць нэп як ідэальную мадэль «сацыялістычнай рынкавай эканомікі», другія лічаць, што ў нэпа не было якіх-небудзь перспектыў для развіцця ў будучыні. А як лічыце вы?

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### З Канстытуцыі (Асноўнага Закона) СССР

*31 января 1924 г.*

Артыкул 4. За кожнай з саюзных рэспублік захоўваецца права свабоднага выхаду з Саюза…

Артыкул 6. Тэрыторыя саюзных рэспублік не можа быць зменена без іх згоды…



Правообладатель Народная асвета

Народная асвета

Артыкул 8. Вярхоўным органам улады… з'яўляецца з'езд Саветаў, а ў перыяд паміж з'ездамі Саветаў — Цэнтральны Выканаўчы Камітэт…, які складаецца з Саюзнага Савета і Савета Нацыянальнасцей.

Артыкул 14. З'езд Саветаў… выбірае Саюзны Савет з прадстаўнікоў саюзных рэспублік, прапарцыянальна насельніцтву кожнай...

Артыкул 15. Савет Нацыянальнасцей утварае з прадстаўнікоў саюзных і аўтаномных савецкіх сацыялістычных рэспублік — па 5 прадстаўнікоў ад кожнай і з прадстаўнікоў аўтаномных абласцей РСФСР — па адным прадстаўніку ад кожнай.

Артыкул 29. Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта … у перыяд паміж сесіямі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта… з'яўляецца вышэйшым заканадаўчым, выканаўчым і распарадчым органам...

Артыкул 37. Савет Народных Камісараў… з'яўляецца выканаўчым і распарадчым органам...

Артыкул 43. У мэтах зацвярджэння рэвалюцыйнай законнасці… утвараецца Вярхоўны Суд.

Артыкул 61. У мэтах аб'яднання рэвалюцыйных намаганняў саюзных рэспублік па барацьбе з палітычнай і эканамічнай контррэвалюцыяй, шпіянажам і бандытызмам утвараецца… Аб'яднанае Дзяржаўнае Палітычнае Упраўленне (АДПУ)…

*Назавіце органы дзяржаўнай улады, зацверджаныя Канстытуцыяй. Якія артыкулы Канстытуцыі адкрывалі магчымасць для праявы ў будучыні ўнітарных тэндэнцый і парушэння правоў чалавека? Якое значэнне мела ўтварэнне СССР?*

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Мікалай Іванавіч Бухарын** (1888—1938), савецкі палітычны і дзяржаўны дзеяч, публіцыст. Бальшавік з 1906 г. Удзельнік рэвалюцый 1905—1907 і Кастрычніцкай 1917 г. Галоўны ідэолаг новай эканамічнай палітыкі. У 1918—1929 гг. — галоўны рэдактар газеты «Правда». У 1919—1929 гг. — член Выканкама Камінтэрна. У канцы 1920-х гг. выступаў супраць сталінскай палітыкі калектывізацыі і фарсіраванай індустрыялізацыі. У сваім «Завяшчанні» Ленін пісаў: «Бухарын не толькі самы каштоўны і буйны тэарэтык партыі, ён таксама законна лічыцца любімцам усёй партыі, але яго тэарэтычныя погляды з вельмі вялікім сумненнем могуць быць аднесены да цалкам марксісцкіх». У 1934—1937 гг. — рэдактар газеты «Известия». Удзельнічаў у напісанні і рэдагаванні Канстытуцыі СССР 1936 г. Быў арыштаваны і расстраляны ў сакавіку 1938 г. Пасмяротна рэабілітаваны ў 1988 г.



Правообладатель Народная асвета



**Іосіф Вісарыёнавіч Сталін** (сапр. прозвішча — Джугашвілі) (1878—1953), савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч. Герой Сацыялістычнай Працы (1939), Герой Савецкага Саюза (1945), Маршал Савецкага Саюза (1943), Генералісімус Савецкага Саюза (1945). Бальшавік з 1903 г. У 1917—1922 гг. — наркам па справах нацыянальнасцей. У 1922—1953 гг. — генеральны сакратар ЦК партыі. У ходзе падрыхтоўкі краіны да новай сусветнай вайны, якая набліжалася, ажыццявіў фарсіраваную індустрыялізацыю і гвалтоўную калектывізацыю. З канца 1930-х гг. праводзіў знешнюю палітыку, накіраваную на змякчэнне адносін з фашысцкай Германіяй. Гэтая палітыка не выратавала СССР ад вайны з Германіяй. У гады Другой сусветнай вайны пайшоў на стварэнне антыгітлераўскай кааліцыі з Англіяй і ЗША.

### ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**Дзяржаўны план электрыфікацыі Расіі (ГОЭЛРО)** — адзіны дзяржаўны перспектыўны план развіцця народнай гаспадаркі Савецкай рэспублікі на аснове электрыфікацыі краіны, распрацаваны па заданні і пад кіраўніцтвам У. І. Леніна. Быў зацверджаны ў 1921 г. Да распрацоўкі плана было прыцягнута звыш 200 дзеячаў навукі і тэхнікі. План ГОЭЛРО, разлічаны на 10—15 гадоў, рэалізаваў ленінскія ідэі электрыфікацыі ўсёй краіны і стварэння буйной індустрыі. У галіне электраэнергетычнай гаспадаркі складаўся з праграмы А, разлічанай на аднаўленне і рэканструкцыю даваеннай электраэнергетыкі, і праграмы Б, якая прадугледжвала будаўніцтва 30 раённых электрычных станцый агульнай магутнасцю 1750 тыс. кВт. Прамысловая прадукцыя павінна была ўзрасці на 80—100 % у параўнанні з узроўнем 1913 г. Прадугледжваўся хуткі рост прадукцыйнасці працы на аснове электрыфікацыі і механізацыі ўсіх вытворчых працэсаў і карэнных змен умоў працы. Па асноўных паказчыках быў выкананы да 1931 г.

## § 14. Курс на пабудову сацыялізму ў СССР. Індустрыялізацыя і калектывізацыя

**Успомніце:** З якой мэтай у СССР праводзілася новая эканамічная палітыка? Чаму яна была згорнута? Якое было эканамічнае становішча СССР да канца 1920-х гг.?

Савецкае партыйнае кіраўніцтва на чале з І. В. Сталіным, адмовіўшыся ад нэпа, перайшло да палітыкі індустрыялізацыі, а потым і калектывізацыі краіны.

**Індустрыялізацыя.** Індустрыялізацыя патрабавала вялікіх сродкаў і накапленняў. Прыхільнікі нэпа ў кіраўніцтве партыі і дзяржавы прапанавалі рабіць неабходныя накапленні крок за крокам, павольна і паступова будаваць сацыялізм, вы-



Правообладатель Народная асвета




Наркам цяжкай прамысловасці СССР Р. К. Арджанікідзе аглядае 100-тысячную аўтамашыну, выпушчаную «ГАЗам». 1935 г.

карыстоўваючы найперш эканамічныя рычагі. Праціўнікі нэпа на чале са Сталіным, абвінавачваючы сваіх апанентаў у абароне прыватнай уласнасці і буржуазных элементаў, сцвярджалі, што нэп не можа даць тых сродкаў, якія неабходны для паскоранай індустрыялізацыі. Перамог пункт гледжання Сталіна, які паставіў задачу ў кароткі тэрмін стварыць магутную індустрыяльную базу, абапіраючыся на ўласныя сілы. У дадзеных гістарычных умовах гэтую задачу можна было вырашыць толькі за кошт узмацнення ціску на сялянства. Падчас суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі, распачатай у канцы 1929 г., быў створаны механізм пераразмеркавання сродкаў на патрэбы індустрыялізацыі.

Пачатак ёй быў пакладзены *першым пяцігадовым* планам *1928/29—1932/33 гг.*, які распачаў эру савецкай планавай эканомікі. Асноўнай мэтай пяцігодкі стала ператварэнне СССР з аграрнай краіны ў вядучую прамысловую і ваенную дзяржаву свету. Велізарныя рэсурсы накіроўваліся на развіццё цяжкай прамысловасці, укладваліся ў здабычу вугалю і вытворчасць жалеза, сталі, чыгуначнага абсталявання, станкоў. Былі пабудаваны 1500 буйных прамысловых прадпрыемстваў. Індустрыяльную аснову і гонар савецкай эканомікі склалі такія гіганты першай пяцігодкі, як Днепрагэс, Сталінградскі, Чалябінскі і Харкаўскі трактарныя заводы, Магнітагорскі і Кузнецкі металургічныя камбінаты, аўтазаводы ў Маскве і Ніжнім Ноўгарадзе. У гады першай пяцігодкі быў закладзены падмурак савецкай цяжкай індустрыі.

Галоўным вынікам другой пяцігодкі *(1933—1937)* стаў бурны рост прамысловай вытворчасці. СССР выйшаў на другое месца ў свеце пасля ЗША па вытворчасці прамысловай прадукцыі.

Галоўнай мэтай трэцяй пяцігодкі, распачатай у *1938 г.*, было будаўніцтва прадпрыемстваў ваенна-прамысловага комплексу і выпуск ваеннай прадукцыі — самалётаў, танкаў, іншых відаў узбраення. Выкананне трэцяй пяцігодкі было перапынена вераломным нападзеннем фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў на СССР. Нягледзячы на гэта, на працягу першых трох пяцігодак Савецкі Саюз дабіўся ўражлівых вынікаў і ўвайшоў у лік чатырох самых развітых краін свету (разам з ЗША, Германіяй і Вялікабрытаніяй). У 1929—1941 гг. былі закладзены асновы аднаго з наймацнейшых у свеце ваенна-прамысловых комплексаў, створаны магутны эка-



Правообладатель Народная асвета

намічны патэнцыял для будучай перамогі над фашысцкай Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне.

Аднак такі імклівы індустрыяльны рывок у рэкордна кароткія тэрміны быў дасягнуты дарагой цаной — пераважна за кошт заняпаду сельскай гаспадаркі і лёгкай прамысловасці, вельмі нізкага ўзроўню жыцця пераважнай большасці савецкіх грамадзян.


А. Р. Стаханаў за працай

Важнейшай задачай савецкіх пяцігодак было дасягненне максімальнай эфектыўнасці працы на зноў пабудаваных прадпрыемствах. Гэтая задача вырашалася шляхам выкарыстання пазаэканамічных метадаў заахвочвання. Адным з такіх метадаў стаў *стаханаўскі рух*, распачаты ў СССР у 1935 г. Пачынальнікам руху лічыцца данецкі шахцёр **А. Р. Стаханаў**, які здабыў за адну працоўную змену вугалю ў 14,7 раза больш за дзённую норму. Фактычна гэта быў вынік працы цэлай брыгады з некалькіх чалавек, пададзены як вынік працоўнага подзвігу аднаго толькі Стаханава і шырока асветлены ва ўсіх савецкіх газетах. Услед за Стаханавым з'явіліся шматлікія іншыя перадавікі, якія за суткі выконвалі да 20 і больш норм і спаборнічалі адзін з адным. Так узнік стаханаўскі рух, які стаў магутным стымулам ударнай працы. Многія рабочыя самааддана працавалі, жадаючы быць падобнымі на папулярнага ў той час Стаханава і стаханаўцаў. Адначасова выкарыстоўваліся і іншыя формы пазаэканамічнага стымулявання — сацыялістычнае спаборніцтва, пераходны Чырвоны сцяг і г. д.

Разам з гэтым вялікую ролю ў падтрыманні якасці працы і дысцыпліны адыгрывалі адміністрацыйна-карныя метады. У пачатку 1930-х гг. была ўведзена крымінальная адказнасць за выпуск недабраякаснай прадукцыі і спазненне на працу.



Ордэн Леніна



Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга



Правообладатель Народная асвета

**Калектывізацыя.** Абавязковай умовай паскоранага прамысловага развіцця стала калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Харчовае забеспячэнне працэсу індустрыялізацыі не магло быць дасягнута на аснове дробнай саматужнай сельскагаспадарчай вытворчасці «вольных» сялян, якія клапоцяцца выключна аб сваіх інтарэсах. Яго магло забяспечыць толькі паслухмянае і кантраляванае дзяржавай сялянства. Прымаючы рашэнне пра суцэльную калектывізацыю сялян, савецкае партыйнае кіраўніцтва імкнулася таксама да ўмацавання сваёй улады шляхам знішчэння праслойкі сельскіх капіталістаў (кулакоў), якая нараджалася, і наогул рынкавых адносін у вёсцы.

Да пачатку калектывізацыі ў 1929 г. сацыяльны склад сельскага насельніцтва быў наступным:

| Сацыяльныя групы | у % | Сацыяльнае становішча |
|---|---|---|
| Кулакі | 5 | заможныя прадпрымальныя сяляне, сельская буржуазія; выкарыстоўвалі наёмную працу і атрымлівалі прыбытак |
| Сяляне-серадdirectives | 60 | дробныя і сярэднія гаспадары; працавалі самастойна, выкарыстоўвалі наёмную працу ў невялікіх аб'ёмах |
| Сяляне-беднякі | 35 | не вялі сваёй гаспадаркі, працавалі па найме ў кулакоў і ў серадняков, вялі жабрацкае існаванне |

Аб'яднанне ўсіх сялян у калгасы і саўгасы было не планамерным і добраахвотным, а неадкладным і прымусовым. Сем'і заможных сялян і нават серадняков раскулачваліся і высяляліся ва ўсходнія і паўночныя раёны краіны. Ад гэтай палітыкі пацярпелі мільёны людзей. Скарацілася пагалоўе жывёлы, пачаўся масавы зыход сельскага насельніцтва ў гарады, дзе патрабавалася працоўная сіла. 35 млн калгаснікаў, якія засталіся ў вёсцы, вымушаны былі забяспечваць тыя ж паказчыкі сельскагаспадарчай вытворчасці, якіх раней дасягалі 55 млн сялян-аднаасобнікаў. Такім чынам, індустрыяльны скачок быў ажыццёўлены шмат у чым за кошт сялян, цалкам залежных ад дзяржавы. Менавіта ў гэтым заключаўся асноўны гістарычны вынік калектывізацыі.

У 1929—1931 гг. амаль усе сяляне на большай частцы тэрыторыі СССР былі аб'яднаны ў *калектыўныя гаспадаркі (калгасы)* і *савецкія гаспадаркі (саўгасы)*. Зямля і сродкі вытворчасці сялян пераходзілі ва ўласнасць калгасаў ці саўгасаў. Аднаасобным кіраўніком калектыўнай гаспадаркі з'яўляўся старшыня калгаса, якога выбіралі калгаснікі, але папярэдне ўхвалялі партыйныя органы. Сяляне былі абавязаны працаваць па ўказанні кіраўніцтва калгаса, а калгас абавязваўся забяспечыць сялянам мінімальна гарантаваны пражытачны ўзровень жыцця. Калгасы выконвалі планы абавязковых паставак прадукцыі дзяржаве, якія ў большасці



Правообладатель Народная асвета

выпадкаў былі завышанымі. Кулакі і сераднякі або ўступалі ў калгасы нараўне з усімі, або падвяргаліся крымінальнаму праследаванню па розных прычынах. У 1929—1932 гг. было рэпрэсіравана каля 370 тыс. кулакоў і сераднякоў.

У 1932 г. у СССР былі ўведзены агульнаграмадзянскія пашпарты. Аднак сялянам яны не выдаваліся. А без пашпарта нельга было паехаць у горад, уладкавацца на працу, пачаць вучыцца. Гэта азначала, што селянін практычна не мог выйсці з калгаса.



Плакат « Ідзі, таварыш, да нас у калгас!». 1930 г.

**Змяненне сацыяльнага аблічча савецкага грамадства.** Курс на пабудову сацыялістычнага грамадства ў СССР радыкальна змяніў яго сацыяльную структуру і аблічча. Да сярэдзіны 1930-х гг. у краіне канчаткова склалася новая партыйна-дзяржаўная эліта, якая дзейнічала ад імя рабочых і сялян. Менавіта гэтая невялікая група людзей (усяго 2—3 тыс. чалавек), якая непасрэдна ўдзельнічала ў прыняцці найважнейшых рашэнняў сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця СССР і саюзных рэспублік, складала вяршыню сацыяльнай піраміды савецкага грамадства.

Ранейшая сацыяльная эліта расійскага грамадства (памешчыкі, арыстакраты, буйныя прадпрымальнікі) была знішчана ў першыя гады савецкай улады. Толькі нешматлікія яе прадстаўнікі здолелі збегчы за граніцу. У канцы 1920-х гг. спыніла сваё існаванне і нэпманаўская буржуазія.

Імклівая індустрыялізацыя краіны садзейнічала росту колькасці рабочага класа: з 9 млн у 1928 г. да 23 млн у 1940 г. Калектывізацыя і голад пачатку 1930-х гг. прывялі да скарачэння сялянскага насельніцтва. У той жа час вырасла колькасць гарадскога насельніцтва (з 29 млн да 63 млн чалавек). Важную частку насельніцтва стала складаць інтэлігенцыя, колькасць якой значна павялічылася да 1940 г., а таксама ваеннаслужачыя і работнікі органаў дзяржаўнай бяспекі.

Вялікім сацыяльным дасягненнем стала ліквідацыя да 1930 г. беспрацоўя. Аднак матэрыяльны ўзровень жыцця савецкіх людзей заставаўся вельмі нізкім. Да 1935 г. забеспячэнне насельніцтва прадуктамі харчавання ажыццяўлялася па картачках. Дзіцячая смяротнасць была высокай. Сфера абслугоўвання яўна ўступала ўзроўню дарэвалюцыйных часоў. З-за перасялення ў гарады мільёнаў сельскіх жыхароў забяспечанасць гарадскога насельніцтва жыллём заставалася ніжэйшай, чым да 1913 г.

Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці і бытавую неўладкаванасць, большасць людзей верыла афіцыйнай прапагандзе і ў надзеі на лепшую будучыню актыўна і самаадданa ўдзельнічала ў сацыялістычных пераўтварэннях.



Правообладатель Народная асвета

1. Якія праблемы ў эканоміцы стаялі перад Савецкай дзяржавай у пачатку 1920-х гг. ? Ці мог Савецкі Саюз разлічваць на дапамогу замежных дзяржаў?
2. Якія пункты гледжання на правядзенне індустрыялізацыі існавалі сярод савецкага кіраўніцтва? Чый пункт гледжання перамог? Якія былі прыярытэтныя напрамкі індустрыялізацыі ў СССР? Якія яе вынікі?
3. Чаму ў гады першых пяцігодак быў папулярны лозунг «Пяцігодку — у чатыры гады!»? Якія формы пазаэканамічнага стымулявання працаўнікоў выкарыстоўваліся ў СССР?
4. Чым была выклікана неабходнасць правядзення калектывізацыі сельскай гаспадаркі? Як яна ажыццяўлялася? Якія былі вынікі і наступствы калектывізацыі?
5. Якія сацыяльныя наступствы мелі індустрыялізацыя і калектывізацыя ў СССР?

**Прапануем абмеркаваць.** Феномен першых пяцігодак у СССР заключаецца ў супярэчнасці паміж стваральнай працай людзей, якія свядома будавалі сацыялізм, і ўсталяваннем камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання. Чаму савецкія людзі праяўлялі нябачаны працоўны энтузіязм і з разуменнем ставіліся да мер дзяржаўнага прымусу да працы?

## ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

### З успамінаў адной з заснавальніц жаночых трактарных брыгад П. М. Ангелінай

Трыццаць шосты год быў на зыходзе. Больш за 100 дзяўчат, прайшоўшы вывучку ў «трактарным інстытуце», сталі кваліфікаванымі трактарысткамі, брыгадзірамі, механікамі. Была падрыхтавана, выкавана, сцэментавана новая калгасная сіла... На маё імя прыходзілі сотні пісем. Мне пісалі дзяўчыны з Алтая, калгасніцы з Сібіры, Арменіі, Грузіі, Казахстана...

У сакавіку трыццаць сёмага года ў Маскве адбылася Усесаюзная нарада трактарыстак і брыгадзіраў жаночых трактарных брыгад. На гэтай нарадзе мы з гонарам падвялі вынікі працы жаночых трактарных брыгад: 55 брыгад выпрацавалі на трактар каля 1000 гектараў і 300 брыгад — па 790 гектараў. Гэта ў той час, калі сярэдняя выпрацоўка па Савецкім Саюзе складала на трактар 463 гектары... Трыццаць восьмы год прынёс нам новыя вытворчыя поспехі. На кожны трактар мы выпрацавалі 2700 гектараў і зэканомілі па 1500 кілаграмаў гаручага.

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Аляксей Рыгоравіч Стаханаў** (1906—1977), шахцёр, перадавік вытворчасці. Герой Сацыялістычнай Працы (1970). У 1927 г. пачаў працаваць на шахце «Цэнтральная — Ірміна» ў Данбасе. У ноч з 30 на 31 жніўня 1935 г. устанавіў рэкорд, здабыўшы за змену 102 т вугалю, што адпавядала 14 нормам. Такой высокай прадукцыйнасці працы Стаханаў дасягнуў дзякуючы авалоданню тэхнікай і падзелу працы забойшчыка і крапільшчыка. Гэта дазволіла яму аднаму зрабіць адбойку вугалю ў некалькіх уступах.



Правообладатель Народная асвета

19 верасня 1935 г. Стаханаў устанавіў новы рэкорд, здабыўшы 227 т вугалю за змену. Працоўны подзвіг Стаханова сустрэў гарачы водгук у Данбасе, а затым па ўсёй краіне. Быў узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

## § 15. Унутраная і знешняя палітыка СССР у 1930-я гг.

**Успомніце:** Якая была асноўная мэта знешняй палітыкі СССР у 1920-я гг.? У чым заключалася значэнне Рапальскага дагавора для Савецкай Расіі?

У другой палове 1920-х — 1930-я гг. склалася асобая мадэль палітычнага ладу СССР. Вялікі ўплыў на яе фарміраванне аказвалі фактары аб'ектыўнага і суб'ектыўнага характару. Да іх адносіліся шматвяковая традыцыя моцнай цэнтралізаванай улады ў Расійскай дзяржаве, адсутнасць асноў дэмакратыі, варожае стаўленне да Савецкай дзяржавы многіх краін свету, асаблівасці ідэалогіі і самой арганізацыі партыі бальшавікоў.

**Асноўныя рысы савецкай палітычнай сістэмы.** Эканамічную аснову савецкай палітычнай сістэмы складалі поўнае падпарадкаванне працаўніка-вытворцы дзяржаве, дзяржаўнае рэгуляванне і пазаэканамічны прымус да працы, забарона забастовак, мілітарызацыя эканомікі і працы.

Палітычнай асновай савецкай палітычнай сістэмы з'яўляліся такія элементы, як панаванне аднапартыйнай сістэмы, зрошчванне партыйнага і дзяржаўнага апарату, знішчэнне палітычных апанентаў, стварэнне магутных рэпрэсіўных структур. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі партыйны апарат РКП(б) — УКП(б) хутка стаў партыйна-дзяржаўным. Гэта азначала, што на асноўныя пасады ў дзяржаве былі прызначаны прадстаўнікі РКП(б). Ніводны орган савецкай улады не мог прымаць рашэнні без санкцыі партыйных камітэтаў. Для ўзмацнення кантролю над рознымі пластамі грамадства ствараліся масавыя грамадскія арганізацыі, якімі таксама кіравалі партыйныя функцыянеры. Такім чынам, партыя бальшавікоў з палітычнай ператварылася ў кіраўніцкую.

Важную ролю ў палітычнай сістэме, якая склалася, адыгрывала асоба правадыра. Першапачаткова ім быў У. І. Ленін, а затым І. В. Сталін, які перамог у жорсткай унутрыпартыйнай барацьбе над сваімі канкурэнтамі.

У першай палове 1920-х гг. Сталіна характарызавала абсалютная лаяльнасць да Леніна, высокі прафесіяналізм у выкананні паўсядзённай арганізацыйнай работы. У 1922 г. ён быў высунуты на новую, чыста адміністрацыйную (не палітычную) пасаду ў партыі — Генеральнага сакратара. Паступова Сталін ператварыў гэту пасаду ў цэнтр улады ў краіне. Тым не менш пасля смерці У. І. Леніна ён не лічыўся галоўным прэтэндэнтам на вышэйшую ўладу ў партыі і дзяржаве сярод знакамітых паплечнікаў правадыра. Тройку асноўных кандыдатаў на спадчыну Леніна складалі



Правообладатель Народная асвета

Л. Д. Троцкі, Р. Я. Зіноўеў і М. І. Бухарын. Аднак супраць Троцкага выступілі ўсе вярхі УКП(б), у тым ліку такія непрымірымыя сапернікі, як Зіноўеў, Сталін, Бухарын. Большасць членаў партыі баяліся яго радыкалізму, жорсткасці, імкнення кіраваць мірным жыццём ваеннымі метадамі.

У выніку Троцкі быў адхілены ад кіраўніцтва Чырвонай Арміяй і страціў свой былы ўплыў. Але і Зіноўеў, кіраўнік Петраградскай партыйнай арганізацыі, наўрад ці мог разлічваць на поспех. Супраць яго аб'ядналася тая частка партапарату, якую ўзначальвалі галоўны рэдактар «Праўды» Бухарын і Генеральны сакратар партыі Сталін. Яны лічылі недапушчальнымі «паўбуржуазныя хістанні» Зіноўева, і ён быў зняты са сваёй уплывовай пасады.

Апошнім небяспечным канкурэнтам Сталіна заставаўся Бухарын. Вырашальная сутычка паміж імі за ўладу адбылася ў 1927—1929 гг. Галоўны ідэолаг і «любімец партыі», Бухарын меў амаль непрыступнае для нападаў становішча. Але і ў яго знайшлося слабае месца. Бухарын і яго група атаясамліваліся з нэпам, які ў 1928—1929 гг. выклікаў усё большую незадаволенасць у партыі. Скарыстаўшыся гэтай акалічнасцю і наяўнасцю ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, Сталін умела перанёс асабістую барацьбу з Бухарыным за ўладу ў рэчышча спрэчак з нагоды эканамічнага развіцця краіны. Яму ўдалося пераканаць партыю ў неабходнасці адмовіцца ад нэпа і пачаць індустрыялізацыю і калектывізацыю. У 1929 г. бухарынская групоўка была адхілена ад улады. Ключавыя пасады занялі старыя паплечнікі рэвалюцыйнай пары В. М. Молатаў, К. Я. Варашылаў, Л. М. Каганові́ч, Р. К. Арджанікідзе, у далейшым маладыя вылучэнцы Сталіна — Г. М. Маленкоў, Л. П. Берыя, М. С. Хрушчоў, С. М. Кіраў.

На *XVII з'ездзе УКП(б)*, які адбыўся ў *студзені — лютым 1934 г.*, значная частка дэлегатаў прагаласавала супраць Сталіна пры выбарах у ЦК партыі. Новым Генеральным сакратаром павінен быў стаць **С. М. Кіраў** — кіраўнік партыйнай арганізацыі Ленінграда. Аднак ён адмовіўся ад гэтай пасады на карысць Сталіна. Пасля гэтай падзеі партыйныя з'езды перасталі рэгулярна праводзіцца.



У прэзідыуме XVII з'езда УКП(б). Масква. 1934 г.

У снежні 1934 г. адбылося загадкавае забойства С. М. Кірава, якое Сталін выкарыстаў для разгортвання ў краіне *палітычных рэпрэсій*. Рэпрэсіі праводзіліся і раней, але ў другой палове 1930-х гг. яны набылі паўсюдны характар. Сталінскае кіраўніцтва асцерагалася, што ў выпадку вайны ў СССР можа ўзнікнуць «пятая калона» з ліку



Правообладатель Народная асвета

асоб, незадаволеных бальшавіцкай уладай. Таму былі прыняты папераджальныя меры па ліквідацыі рэальных і патэнцыяльна магчымых апанентаў. Па абвінавачванні ў палітычных злачынствах толькі ў 1937—1938 гг. былі арыштаваны каля 2 млн чалавек, з якіх амаль 800 тыс. пакараны смерцю. Былі асуджаны і расстраляны як ворагі народа нядаўнія сапернікі Сталіна ў барацьбе за ўладу — Зіноўеў, Каменеў, Бухарын і інш., рэпрэсіраваны большасць дэлегатаў «бунтарскага» XVII з'езда УКП(б), а таксама фізічна знішчаны такія знакамітыя военачальнікі, як М. М. Тухачэўскі, В. К. Блюхер, А. І. Ягораў, І. П. Убарэвіч, І. Э. Якір і інш. У 1940 г. у Мексіцы быў забіты Л. Д. Троцкі.



Агульны сход рабочых завода «Дынама» патрабуе расстрэлу ўдзельнікаў «трацкісцка-зіноўеўскай банды». Масква. 1936 г.

Да канца 1930-х гг. у краіне канчаткова склаўся **культ асобы** І. В. Сталіна. Сістэма культу ўключала ў сябе стварэнне вобраза Сталіна як звышасобы і ўзвядзенне яго ў ранг найвялікшых мысліцеляў нароўні з К. Марксам, Ф. Энгельсам і У. І. Леніным, усямернае ўсхваленне Сталіна і праследаванне любога іншадумства, паўсюднае адлюстраванне Сталіна ў выглядзе шматлікіх помнікаў, бюстаў, партрэтаў. Адначасова ствараўся маштабны культ асобы У. І. Леніна.

Духоўнае жыццё ў СССР у 1930-я гг. характарызавалася ўстанаўленнем дзяржаўнага кантролю над сродкамі масавай інфармацыі, літаратурай і мастацтвам, праследаваннем царквы і насаджэннем атэізму, стварэннем спецыяльных ідэалагічных арганізацый і ўстаноў з мэтай растлумачэння афіцыйнай ідэалогіі, барацьбой з іншадумствам.




Плакат «Капітан Краіны Саветаў вядзе нас ад перамогі да перамогі». 1933 г.

Палітычная сістэма, створаная партыяй бальшавікоў, стала важным інструментам паскоранай сацыялістычнай мадэрнізацыі і пабудовы індустрыяльнай базы, без якіх шматнацыянальная Савецкая дзяржава не змагла б вытрымаць сутыкнення з ваеннай машынай фашысцкай Германіі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**5 снежня 1936 г.** была прынята новая Канстытуцыя СССР, якая атрымала назву «сталінская». Усе грама-



Правообладатель Народная асвета




Савецкія сацыялістычныя рэспублікі, утвораныя ў 1924—1936 гг.

дзяне СССР надзяляліся роўнымі правамі, дэклараваліся асноватворныя правы і свабоды чалавека, пры гэтым абвяшчаліся дыктатура пралетарыята і ўлада Саветаў. Важныя змены адбыліся ў сістэме дзяржаўнай улады. Замест Усесаюзнага з'езда Саветаў і УЦВК ствараўся *Вярхоўны Савет СССР*, які выбіралі шляхам прамых і роўных выбараў. У якасці вышэйшага выканаўчага органа ўлады па-ранейшаму захоўваўся Саўнаркам. Канстытуцыя замацавала стварэнне пяці сярэднеазіяцкіх савецкіх рэспублік — Казахскай ССР, Кіргізскай ССР, Узбекскай ССР, Таджыкскай ССР, Туркменскай ССР, якія раней былі аўтаноміямі РСФСР. У выніку колькасць саюзных рэспублік павялічылася да 11. Амаль усе народы СССР атрымлівалі фармальна права на дзяржаўнасць рознага ўзроўню (саюзная рэспубліка, аўтаномная акруга і інш.). У Сібіры штучна ствaралася яўрэйская аўтаномная вобласць, хаця большасць яўрэяў пражывала за яе межамі.

**Знешняя палітыка СССР у 1930-я гг.** Развіццё падзей у свеце ў 1930-х гг. сур'ёзна пагражала бяспецы СССР. Ва Усходняй Азіі Японія, акупіраваўшы Маньчжурыю ў 1931 — пачатку 1932 г., справакавала рост напружанасці ў адносінах паміж дзвюма дзяржавамі. У *1938 г.* японскія войскі ўварваліся на тэрыторыю СССР у раёне *возера Хасан*. Падчас жорсткай трохдзённай бітвы Чырвоная Армія адкінула японцаў за межы тэрыторыі краіны. Аднак Японія працягвала выпрабоўваць граніцы СССР на трываласць. У выніку дробныя сутыкненні з японцамі перараслі ў новы сур'ёзны ваенны канфлікт на тэрыторыі Манголіі. Пасля нападзення Японіі на Мангольскую Народную Рэспубліку ў *1939 г.* Чырвоная Армія, у адпаведнасці з дагаворам аб узаемнай абароне паміж СССР і МНР, уступіла ў баі з японскім агрэсарам. Падчас чатырохмесячнай вайны ў раёне *ракі Халхін-Гол* японцы страцілі забітымі і параненымі каля 50 тыс. чалавек і спынілі ваенныя дзеянні. Такім чынам, Савецкі Саюз прадэманстраваў гатоўнасць абараніць сябе. У *красавіку 1941 г.* у Маскве быў падпісаны *савецка-японскі пакт аб ненападзенні*, які



Правообладатель Народная асвета

шмат у чым прадухіліў нападзенне Японіі на СССР пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Прыход нацыстаў да ўлады ў Германіі ў 1933 г. спарадзіў яшчэ адну сур'ёзную пагрозу для СССР. З гэтага часу савецкае кіраўніцтва пачало шукаць саюзнікаў па антыфашысцкай барацьбе сярод іншых еўрапейскіх дзяржаў, маючы на ўвазе перш за ўсё Францыю і Вялікабрытанію. У *1934 г.* СССР уступіў у Лігу Нацый. Народны камісар па замежных справах **М. М. Літвінаў** неаднаразова заклікаў членаў гэтай міжнароднай арганізацыі прыняць меры для забеспячэння калектыўнай бяспекі супраць магчымай агрэсіі фашысцкіх дзяржаў. СССР таксама заахвочваў стварэнне ў асобных краінах аб'яднаных народных франтоў, у рамках якіх камуністы, сацыялісты і цэнтрысцкія палітычныя сілы супрацоўнічалі ў барацьбе супраць фашысцкіх рухаў. У Францыі, напрыклад, удалося спыніць прасоўванне фашыстаў да ўлады і нават стварыць у 1936 г. урад Народнага фронту.

Летам 1938 г. узнік сур'ёзны палітычны крызіс, калі Германія запатрабавала ў Чэхаславакіі ўступкі Судэцкай вобласці. СССР прапанаваў Чэхаславакіі падтрымку і заклікаў Францыю і Вялікабрытанію зрабіць тое ж самае. Замест гэтага французскі і брытанскі ўрады, якія прытрымліваліся палітыкі «супакойвання», паверылі запэўніванням Гітлера ў тым, што Судэты будуць апошнім неабходным яму тэрытарыяльным набыццём. Вынікам стала Мюнхенскае пагадненне ад 30 верасня 1938 г., якое забяспечыла перадачу Судэцкай вобласці Германіі. У сакавіку 1939 г. немцы акупіравалі сталіцу Чэхаславакіі Прагу і стварылі саюзніцкую дзяржаву ў Славакіі. У выніку няпэўная і эгаістычная палітыка вядучых еўрапейскіх дзяржаў прымусіла І. В. Сталіна ў адзіночку вырашаць праблему бяспекі Савецкай дзяржавы.

Пасля акупацыі Чэхаславакіі ў Еўропе ўзнікла сур'ёзная пагроза агрэсіі з боку Германіі. Савецкі ўрад не выключаў магчымасці пагаднення нямецкага боку з Англіяй і Францыяй супраць СССР. У гэтай няпростай сітуацыі вясной 1939 г. Сталін меў намер заключыць саюз з Англіяй і Францыяй на выпадак нямецкай агрэсіі ў Еўропе.

Аднак было відавочна, што англа-французская дыпламатыя канчаткова не адмовілася ад палітыкі «супакойвання». Аб гэтым выразна сведчыў той факт, што на адказныя перамовы ваенных місій Англіі, Францыі і СССР, якія праходзілі летам 1939 г. з мэтай стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі, у Маскву прыбылі другарадныя брытанскія і французскія чыноўнікі. Яны не валодалі неабходнымі паўнамоцтвамі для заключэння адпаведнага пагаднення. Між тым Гітлер, які ў той час ужо прыняў рашэнне аб пачатку вайны супраць Польшчы, настойліва прапаноўваў Сталіну заключыць пакт аб ненападзенні. Германскае кіраўніцтва дало зразумець, што ў выпадку адмаўлення ад дагавора яно гатова дамовіцца з Англіяй аб магчымых сумесных дзеяннях супраць Савецкага Саюза. Такім чынам, палітыка «супакойвання» заходнееўрапейскіх краін падштурхоўвала Сталіна да падпісання дагавора з



Правообладатель Народная асвета

Германіяй. Гітлер перамог Францыю і Вялікабрытанію ў іх уласнай дыпламатычнай гульні. Ён прапанаваў Сталіну падзяліць Польшчу і астатнюю Усходнюю Еўропу паміж Германіяй і СССР.

**23 жніўня 1939 г.** міністр замежных спраў Германіі *І. фон Рыбентроп* і наркам замежных спраў СССР **В. М. Молатаў** падпісалі ў Маскве дагавор аб ненападзенні паміж СССР і Германіяй і сакрэтны дадатковы пратакол да яго. Бакі дамаўляліся не дапусціць ваеннага сутыкнення паміж Германіяй і СССР і размяжоўвалі «сферы дзяржаўных інтарэсаў». Пасля таго як 1 верасня 1939 г. Германія напала на Польшчу і пачалася Другая сусветная вайна паміж Германіяй і заходнімі дзяржавамі, Рыбентроп і Молатаў падпісалі **28 верасня 1939 г.** Дагавор аб граніцы і дружбе і новыя сакрэтныя пратаколы, якія ўдакладнялі «сферы інтарэсаў» дзвюх краін.

Савецкае кіраўніцтва, якое не сумнявалася ў будучым ваенным сутыкненні з гітлераўскай Германіяй, атрымала перадышку, якую імкнулася з максімальнай выгадай выкарыстаць для падрыхтоўкі да вайны. У выніку заходнееўрапейскія краіны самі сталі першай ахвярай сваёй палітыкі «супакойвання» і заахвочвання фашысцкага агрэсара ва ўсходнім напрамку.

?

1. Ахарактарызуйце палітычную сістэму, якая склалася ў СССР у 1930-х гг. Якія суб'ектыўныя фактары паўплывалі на яе фарміраванне?
2. Якую ролю ў палітычнай сістэме Савецкага Саюза адыгрывала партыя бальшавікоў? Як адбывалася зрошчванне партыйнага і дзяржаўнага апарату?
3. Якімі метадамі Сталін ажыццяўляў барацьбу з палітычнымі апанентамі ў партыі? Дайце ацэнку гэтым метадам. Якія фактары прадвызначылі паражэнне ўсіх унутрыпартыйных апазіцый?
4. Чым тлумачыцца правядзенне палітычных рэпрэсій у Савецкім Саюзе ў 1930-х гг.? Якія яны мелі наступствы?
5. Чаму ўзнікла неабходнасць прыняцця новай Канстытуцыі СССР? Якія супярэчнасці ў развіцці савецкага грамадства знайшлі ў ёй адлюстраванне?
6. Ахарактарызуйце міжнароднае становішча СССР у 1930-я гг. Вызначыце асноўныя напрамкі знешняй палітыкі СССР у гэтыя гады.
7. Складзіце храналагічную табліцу развіцця міжнародных адносін у 1930-я гг.

**Прапануем абмеркаваць**. Савецка-германскі дагавор аб ненападзенні 23 жніўня 1939 г. да гэтага часу не мае адназначнай ацэнкі і выклікае спрэчкі. Дзеянні савецкага кіраўніцтва ацэньваюцца як вераломны крок, які даў Гітлеру магчымасць развязаць Другую сусветную вайну. Ці быў у Савецкага Саюза іншы выхад у сітуацыі, якая склалася?

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ

**Сяргей Міронавіч Кіраў** (сапр. прозвішча — Кострыкаў) (1886—1934), савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч. Член партыі бальшавікоў з 1904 г. Удзельнік Кастрычніцкага ўзброенага паўстання ў Петраградзе (1917) і Гра-



Правообладатель Народная асвета



мадзянскай вайны. У 1920 г. узначальваў савецкую дэлегацыю ў г. Рыга па заключэнні мірнага дагавора з Польшчай. Адзін з заснавальнікаў ЗСФСР (1922). Ва ўмовах барацьбы з трацкісцка-зіноўеўскай апазіцыяй быў накіраваны ў Ленінград і ў лютым 1926 г. выбраны першым сакратаром Ленінградскага губкама (з 1927 г. абкама) УКП(б). Вёў актыўную прынцыповую барацьбу за адзінства партыі, супраць розных антыпартыйных груповак (трацкістаў, зіноўеўцаў, бухарынцаў і інш.). З 1930 г. — член Палітбюро ЦК УКП(б), з 1934 г. — сакратар і член Аргбюро ЦК УКП(б); член Прэзідыума ЦВК СССР. Карыстаўся велізарным аўтарытэтам і любоўю савецкіх людзей. 1 снежня 1934 г. быў забіты тэрарыстам у Смольным.



**Максім Максімавіч Літвінаў** (сапр. прозвішча і імя — Валах Макс) (1876—1951), савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч, дыпламат. Бальшавік з 1903 г. У 1918 г. быў прызначаны дыпламатычным прадстаўніком РСФСР у Вялікабрытаніі, але брытанскі ўрад не прызнаў яго паўнамоцтваў і затрымаў як заложніка. Быў намеснікам кіраўніка савецкай дэлегацыі Г. В. Чычэрына на Генуэзскай канферэнцыі (1922), затым кіраўніком дэлегацыі на Гаагскай канферэнцыі, старшынёй міжнароднай канферэнцыі па раззбраенні ў Маскве, кіраўніком дэлегацыі ў Падрыхтоўчай камісіі да канферэнцыі па раззбраенні ў Жэневе. У 1930—1939 гг. наркам замежных спраў СССР; садзейнічаў устанаўленню дыпламатычных адносін з ЗША, прыёму СССР у Лігу Нацый, у якой прадстаўляў СССР у 1934—1938 гг. Гібка праводзіў савецкую знешнюю палітыку. У 1941—1943 гг. — намеснік наркама замежных спраў, адначасова пасол СССР у ЗША. Удзельнік Маскоўскай канферэнцыі міністраў замежных спраў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі (1943). Аўтар шэрага прац па пытаннях знешняй палітыкі СССР.



**Вячаслаў Міхайлавіч Молатаў** (сапр. прозвішча — Скрабін) (1890—1986), савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч. Бальшавік з 1906 г. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. У 1920-я гг. актыўна падтрымаў І. В. Сталіна ў барацьбе супраць Л. Д. Троцкага, Р. Я. Зіноўева, Л. Б. Каменева. У 1930 г. быў прызначаны на пасаду Старшыні СНК, кіраваў стварэннем савецкай прамысловасці. У 1939 г., застаючыся кіраўніком урада, стаў наркамам замежных спраў і падпісаў савецка-германскі дагавор аб ненападзенні («пакт Молатава — Рыбентропа» ) разам з сакрэтнымі пратаколамі аб падзеле сфер уплыву ва Усходняй Еўропе і Прыбалтыцы. У маі 1941 г. стаў намеснікам Старшыні СНК Сталіна, увайшоў у якасці яго намесніка ў



Правообладатель Народная асвета

Дзяржаўны Камітэт Абароны. Герой Сацыялістычнай Працы (1943). Удзельнічаў у рабоце Тэгеранскай (1943), Крымскай (Ялцінскай) і Патсдамскай (1945) канферэнцый.

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### З Канстытуцыі (Асноўнага Закона) СССР

*5 снежня 1936 г.*

Артыкул 1. Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік ёсць сацыялістычная дзяржава рабочых і сялян.

Артыкул 2. Палітычную аснову СССР складаюць Саветы дэпутатаў працоўных, якія выраслі і ўмацаваліся ў выніку звяржэння ўлады памешчыкаў і капіталістаў і заваявання дыктатуры пралетарыяту.

Артыкул 4. Эканамічную аснову СССР складаюць сацыялістычная сістэма гаспадаркі і сацыялістычная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці…

Артыкул 12. Праца ў СССР з'яўляецца абавязкам і справай гонару кожнага здольнага да працы грамадзяніна па прынцыпе: «Хто не працуе, той не есць». У СССР ажыццяўляецца прынцып сацыялізму: «Ад кожнага па яго здольнасці, кожнаму — па яго працы».

Артыкул 32. Заканадаўчая ўлада ў СССР ажыццяўляецца выключна Вярхоўным Саветам СССР.

Артыкул 33. Вярхоўны Савет СССР складаецца з дзвюх палат: Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей.

Артыкул 48. Вярхоўны Савет СССР выбірае на сумесным пасяджэнні абедзвюх палат Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР.

Артыкул 126. …найбольш актыўныя і свядомыя грамадзяне з шэрагаў рабочага класа, працоўных сялян і працоўнай інтэлігенцыі добраахвотна аб’ядноўваюцца ва Усесаюзную Камуністычную партыю (бальшавікоў), якая з’яўляецца перадавым атрадам працоўных у іх барацьбе за пабудову камуністычнага грамадства і прадстаўляе кіраўнічае ядро ўсіх арганізацый працоўных, як грамадскіх, так і дзяржаўных.

Артыкул 134. Выбары дэпутатаў... ажыццяўляюцца выбаршчыкамі на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

*Як Канстытуцыя 1936 г. вызначала характар СССР як дзяржавы? Якія змены адбыліся ў сістэме органаў дзяржаўнай улады ў параўнанні з Канстытуцыяй 1924 г.? Якая роля ў сістэме кіравання дзяржавай згодна з Канстытуцыяй адводзілася УКП(б )?*



Правообладатель Народная асвета

# § 16. Культурныя пераўтварэнні ў СССР

**Успомніце:** Якая сістэма адукацыі існавала ў Расіі да Кастрычніцкай рэвалюцыі? Які перыяд у развіцці культуры Расіі атрымаў назву «сярэбраны век»?

Развіццё савецкай культуры насіла супярэчлівы характар. З аднаго боку, аб'ектыўна патрабавалася павысіць пісьменнасць насельніцтва, развіваць новыя і прыярытэтныя напрамкі фундаментальнай навукі, рыхтаваць кадры навукова-тэхнічнай інтэлігенцыі ў адпаведнасці з задачамі будаўніцтва індустрыяльнага грамадства. З другога боку, савецкая ўлада ставіла сабе за найважнейшую мэту ўмацоўваць свой ідэалагічны ўплыў у грамадстве, актыўна выкарыстоўваючы для гэтага магчымасці літаратуры, мастацтва, грамадскіх навук. Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. падзялілі навуковую і творчую інтэлігенцыю на тых, хто адмовіўся супрацоўнічаць з савецкай уладай і пакінуў Радзіму, і тых, хто, прыняўшы рэвалюцыю, удзельнічаў у стварэнні новай культуры. Культурныя пераўтварэнні, якія былі звязаны з ліквідацыяй непісьменнасці, стварэннем новай савецкай школы, падрыхтоўкай кадраў «народнай інтэлігенцыі», развіццём навукі, літаратуры, мастацтва пад кантролем партыі бальшавікоў і на аснове марксісцка-ленінскай ідэалогіі, атрымалі назву **«культурная рэвалюцыя»**.

**Ліквідацыя масавай непісьменнасці і фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі.** Савецкая дзяржава надавала вялікую ўвагу пытанням адукацыі. Яшчэ ў гады Грамадзянскай вайны пачалася работа па ліквідацыі непісьменнасці. У 1923 г. было створана таварыства «Далоў непісьменнасць», у кіраўніцтва якога ўваходзілі кіраўнік заканадаўчай улады **М. І. Калінін**, наркам асветы **А. В. Луначарскі** і інш. Па ўсёй краіне былі адкрыты тысячы школ і пунктаў па навучанні грамаце. Чытанню, ліку, пісьму навучалі як дзяцей, так і дарослых. Барацьба за ліквідацыю непісьменнасці дала ўражлівы вынік. Да 1939 г. 80 % насельніцтва СССР умелі чытаць, пісаць і лічыць.

Рэарганізацыя сістэмы народнай адукацыі пачалася ў верасні 1918 г. Адмянялася плата за навучанне, была арганізавана працоўная школа, якая складалася з дзвюх ступеней з тэрмінам навучання адпаведна 5 гадоў і 4 гады. Важную ролю ў падрыхтоўцы рабоча-сялянскай моладзі да навучання ў ВНУ адыгралі *рабочыя факультэты (рабфакі)*. Першы рабфак быў адкрыты яшчэ ў 1919 г. Гэта прывяло да змены сацыяльнага складу студэнцтва і спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Да 1930 г. была ўведзена ўсеагульная абавязковая пачатковая адукацыя.



Сяляне абучаюцца пісьменнасці

У цэлым савецкая сістэма адукацыі афармілася да сярэдзіны 1930-х гг. Яна ўключала пачатковую, агульную сярэд-



Правообладатель Народная асвета

нюю, сярэднюю спецыяльную і вышэйшую школы. У 1933—1937 гг. у гарадах і рабочых пасёлках быў здзейснены пераход да ўсеагульнай сямігадовай адукацыі. Навучанне праводзілася на аснове строгай дысцыпліны і раскладу заняткаў. У школе вывучаліся гісторыя краіны, гуманітарныя і прыродазнаўчыя дысцыпліны. Ідэалагічнае кіраўніцтва сістэмай адукацыі ажыццяўлялі вопытныя партыйныя і камсамольскія работнікі.

Правядзенне індустрыялізацыі патрабавала павелічэння адукаваных спецыялістаў на вытворчасці. Таму ў 1933—1937 гг. для павышэння адукацыйнага ўзроўню рабочых была створана сістэма рабочых школ і прафесійных курсаў.

У СССР адкрываліся тэхнічныя і сельскагаспадарчыя вышэйшыя навучальныя ўстановы (ВНУ). У параўнанні з 1913 г. сетка ВНУ ў краіне вырасла больш чым у 8 разоў і склала 817 універсітэтаў і інстытутаў. Колькасць спецыялістаў у СССР узрасла з 1,5 млн чалавек у 1917 г. да 20 млн у 1941 г.

**Навуковыя адкрыцці.** Дзяржава выдаткоўвала велізарныя сродкі на развіццё навуковых даследаванняў, асабліва ў фундаментальных галінах ведаў. У выніку важныя адкрыцці былі зроблены ў даследаванні атамнага ядра (акадэмік *А. Ф. Іофэ*), распрацоўцы тэорыі касмічных палётаў (*К. Э. Цыялкоўскі*), тэорыі рэактыўнага руху (*Ф. А. Цандэр*). Вялікі ўклад у вывучэнне Паўночнага марскога шляху ўнеслі *О. Ю.* Шміт і *І. Д. Папанін*. Сусветнае прызнанне атрымалі працы выдатных вучоных *І. П.* Паўлава ў галіне фізіялогіі, *М. І. Вавілава* па генетыцы, *У. І. Вернадскага* ў тэорыі біясферы. Працы *М. Я. Жукоўскага* ў галіне гідра- і аэрадынамікі ляглі ў аснову самалётабудавання. Пры яго актыўным удзеле быў створаны Цэнтральны аэрагідрадынамічны інстытут (*ЦАГІ*). Прарыў савецкіх спецыялістаў у справе авіябудавання і ракетабудавання быў звязаны з імёнамі *А. М. Тупалева* і *С. П. Каралёва*.

У той жа час многія вучоныя, якія не жадалі мірыцца з новым палітычным рэжымам, пакінулі краіну ў гады Грамадзянскай вайны. Сярод іх былі выдатныя вучоныя-гуманітарыі П. А. Сарокін, М. А. Бярдзяеў, М. А. Лоскі і інш. Многія з тых, хто застаўся, былі рэпрэсіраваны (А. Ф. Лосеў, П. А. Фларэнскі і інш.).

**Асаблівасці развіцця літаратуры і мастацтва.** З сярэдзіны 1930-х гг. пачынаецца новы этап у развіцці мастацкай культуры. Афіцыйным і адзіным мастацкім прынцыпам становіцца прынцып **сацыялістычнага рэалізму**. Ён прадугледжваў стварэнне твораў, якія раскрываюць змест сацыялістычнага будаўніцтва і разглядаюць навакольны свет праз прызму барацьбы за сацыялізм.

У літаратуры 1930-х гг. нароўні з імёнамі, якія былі вядомы да 1917 г. (*М. Горкі, А. М. Талстой* і інш.), з'явіліся новыя імёны — *М. А. Шолахава* («Ціхі Дон»), *М. Шагінян* («Гідрацэнтраль»), *В. Катаева* («Час, наперад!»), пісьменнікаў-сатырыкаў *І. Ільфа* і *Я. Пятрова* («Дванаццаць крэслаў», «Залатое цяля»). Сфарміравалася савецкая дзіцячая літаратура (*С. Маршак, К. І. Чукоўскі, А. П. Гайдар, Б. Жыткоў* і інш.).

Для выяўленчага мастацтва былі характэрны парадны жывапіс і карціны, пры-



Правообладатель Народная асвета

свечаныя Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайне, будаўніцтву сацыялізму (*С. Герасімаў, К. Пятроў-Водкін, А. Дэйнэка, М. Грэкаў, Б. Іагансон*).

У гэтым жа напрамку развіваўся і кінематограф, якому надавалася асаблівая ўвага. Галоўнымі тэмамі кіно былі жыццё савецкіх людзей і іх удзел у рэвалюцыйных падзеях («Кастрычнік» *С. Эйзенштэйна*, «Ленін у Кастрычніку» і «Ленін у 1918 г.» *М. Рома*), Грамадзянскай вайне («Мы з Кранштата» *Я. Дзыгана*, «Чапаеў» *С.* і *Г. Васільевых*), індустрыялізацыі і калектывізацыі («Сямёра смелых» і «Камсамольск» *С. А. Герасімава*). Многія члены ЦК УКП(б), у тым ліку Сталін, асабіста праглядалі фільмы і былі іх цэнзарамі.



В. І. Мухіна «Рабочы і калгасніца». Павільён СССР на Міжнароднай выставе ў Парыжы. 1937 г.

Нямала мастацкіх твораў так і не дайшлі да чытача і гледача (некаторыя раманы М. А. Булгакава і А. П. Платонава, карціны П. М. Філонава, К. С. Малевіча і інш.).

**Сацыялістычная дзяржава і царква.** Расія да 1917 г. была выключна рэлігійнай краінай. Рэлігія і царква аказвалі вялікі ўплыў на самыя шырокія пласты насельніцтва. Гэта стала адной з прычын жорсткага ціску бальшавікоў на Рускую Праваслаўную Царкву. Барацьбу з рэлігіяй яны разглядалі як частку свайго асветніцкага абавязку, а ў асобе царквы бачылі свайго «ідэалагічнага канкурэнта», які перашкаджаў распаўсюджванню атэізму.

З першых дзён савецкай улады дзяржава актыўна ўмешвалася ва ўнутраныя справы ўсіх рэлігійных канфесій. Былі прыняты рашэнні аб канфіскацыі маёмасці духоўных семінарый і акадэмій, непрызнанні царкоўнага шлюбу, спыненні ўсіх відаў датацый свяшчэннікам. *23 студзеня 1918 г.* быў выдадзены дэкрэт аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы. Тым самым царква пазбавілася сваёй былой ролі ў сістэме адукацыі.

Канстытуцыя РСФСР 1918 г. пазбавіла духавенства, манахаў і манашак права голасу як «непрацоўных элементаў». Праваслаўныя свяшчэннікі і вернікі былі адной з найбольш значных катэгорый грамадзян, якія падвергліся ганенням і рэпрэсіям. **Патрыярх Ціхан** спрабаваў крытыкаваць новую ўладу. Гэта прывяло толькі да таго, што ўпершыню ў гісторыі царквы яе кіраўнік быў аддадзены пад суд.

У гэтай антырэлігійнай «бітве за розум» бальшавікі часткова атрымалі поспех сярод моладзі, але зламаць пасіўнае супраціўленне царквы ім доўга не ўдавалася. У канцы 1920-х гг. духоўны і маральны аўтарытэт рэлігійных канфесій сярод насельніцтва быў яшчэ даволі высокі. У перыяд калектывізацыі, якая суправаджалася



Правообладатель Народная асвета

сялянскімі хваляваннямі, пачаўся новы віток рэпрэсій у адносінах да духавенства і адбывалася масавае зачыненне цэркваў. Асноўным арганізатарам антыцаркоўнай палітыкі было кіраўніцтва УКП(б), рашэнні якога праводзіліся ў жыццё з дапамогай органаў бяспекі.

II з'езд Саюза ваяўнічых бязбожнікаў (СВБ), які адбыўся ў чэрвені 1929 г., прыняў рашэнне правесці наступную пяцігодку як «бязбожную». У першы год планавалася зачыніць усе духоўныя школы, у другі — ажыццявіць масавае зачыненне храмаў і забараніць выданне рэлігійнай літаратуры, у трэці — выслаць усіх служак культу за мяжу, у чацвёрты — зачыніць апошнія храмы ўсіх канфесій, у пяты — замацаваць дасягнутыя поспехі. СВБ наіўна меркаваў, што да 1 мая 1937 г. «імя бога павінна быць забыта па ўсёй тэрыторыі СССР».

У 1937 г. былі скасаваны цэнтральная і мясцовыя Камісіі па культавых пытаннях пры Прэзідыуме ЦВК СССР. Адзінай дзяржаўнай структурай, якая займалася справамі РПЦ, стаў спецыяльны аддзел НКУС, які аднёс «царкоўнікаў» да «антысавецкіх элементаў». Пачаліся масавыя арышты і расстрэлы свяшчэннікаў. Савецкая ўлада змяніла сваю пазіцыю ў адносінах да царквы толькі пасля таго, як РПЦ у гады Вялікай Айчыннай вайны заклікала да абароны Айчыны.

?

1. Растлумачце значэнне паняцця «культурная рэвалюцыя». Чым была выклікана неабходнасць яе правядзення ў СССР? Вызначыце станоўчыя і адмоўныя бакі культурных пераўтварэнняў, праведзеных у Савецкай дзяржаве.
2. Якія меры былі прыняты савецкай уладай з мэтай ліквідацыі масавай непісьменнасці? Як вырашалася задача падрыхтоўкі кадраў для патрэб індустрыялізацыі? Дакажыце, што да канца 1930-х гг. СССР стаў высокаадукаванай краінай.
3. Як Савецкая дзяржава ставілася да развіцця навукі? Чаму асабліваму кантролю падвергліся гуманітарныя навукі? Чым былі выкліканы рэпрэсіі супраць дзеячаў культуры?
4. У чым выявілася адзяржаўленне навукі, адукацыі і мастацтва ў гады сацыялістычнага будаўніцтва? Якую ролю ў савецкім грамадстве адыгрывала марксісцка-ленінская ідэалогія?
5. У чым сутнасць прынцыпу сацыялістычнага рэалізму? Чаму савецкіх пісьменнікаў, якія адлюстроўвалі негатыўныя бакі жыцця савецкага грамадства, абвінавачвалі ў ачарненні, адыходзе ад рэчаіснасці і не дапускалі публікацыі іх твораў?
6. Складзіце абагульняючую табліцу «Дасягненні культуры ў СССР у 1920—1930-х гг.». Выкарыстайце дадатковую літаратуру.

| | |
|---|---|
| Літаратура | |
| Жывапіс | |
| Скульптура | |
| Архітэктура | |
| Музыка | |
| Тэатр | |
| Кінематограф | |



Правообладатель Народная асвета

7. Якую палітыку ў адносінах да царквы праводзіла Савецкая дзяржава? Якія наступствы для царквы і ў цэлым для грамадства мела гэта палітыка? Дайце ацэнку палітыцы дзяржавы ў адносінах да царквы і рэлігіі?

**Прапануем абмеркаваць.** 1920-я гг. у галіне літаратуры і мастацтва ў СССР характарызаваліся разнастайнасцю мастацкіх і літаратурных аб'яднанняў і стыляў. Чаму да сярэдзіны 1930-х гг. яны практычна спынілі існаванне?

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Міхаіл Іванавіч Калінін (**1875—1946), савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч, Герой Сацыялістычнай Працы (1944). Член РСДРП з 1898 г. Удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (1917). У 1919 г. быў выбраны старшынёй УЦВК. Пры гэтым выбранні Л. Д. Троцкі ўпершыню назваў Калініна «ўсесаюзным старастам». У гады Грамадзянскай вайны вёў агітацыйна-прапагандысцкую работу, узначальваў агітцягнік «Кастрычніцкая рэвалюцыя», які здзейсніў 12 рэйсаў амаль па ўсіх франтах. У снежні 1922 г. стаў старшынёй ЦВК СССР. Са студзеня 1938 па сакавік 1946 г. з'яўляўся старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Выступаў у падтрымку лініі І. В. Сталіна і фактычна санкцыянаваў рэпрэсіі 1930-х гг. Напісаў шэраг прац па розных пытаннях сацыялістычнага будаўніцтва, камуністычнага выхавання, пытаннях літаратуры і мастацтва, у якіх прапагандаваў ідэі марксізму-ленінізму.



**Анатоль Васільевіч Луначарскі** (1875—1933), рускі савецкі пісьменнік, дзяржаўны і палітычны дзеяч, перакладчык, публіцыст, крытык, мастацтвазнавец. Акадэмік АН СССР (1930). У Цюрыху вывучаў прыродазнаўчыя навукі і эканоміку; у Парыжы — эстэтыку, мастацтвазнаўства і літаратуру. Бальшавік з 1903 г. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі. Атрымаў міжнародную вядомасць у 1908 г. за сачыненне «Рэлігія і сацыялізм», дзе абвяшчаў, што «сацыялістычнае вучэнне ёсць сапраўдная рэлігія чалавецтва». У Італіі ў 1910—1911 гг. арганізоўваў школы па сістэме італьянскага педагога Марыі Мантэсоры. З'яўляўся народным камісарам асветы РСФСР і СССР (1917—1929). Адыграў важную ролю ў прыцягненні дасавецкай інтэлігенцыі на бок бальшавікоў, адстойваў неабходнасць захавання гістарычнай і культурнай спадчыны Расіі. Арганізаваў савецкую сістэму адукацыі, укараняючы прагрэсіўнае навучанне, і аказаў дзейсны ўплыў на савецкую літаратуру, падтрымліваючы авангардыстаў. Яго радыкальныя эксперыменты ў галіне адукацыі выклікалі шырокі водгук як у СССР, так і за яго межамі. Заняпад дысцыпліны ў школах выклікаў незадаволенасць Сталіна, які адправіў Луначарскага ў адстаўку.



Правообладатель Народная асвета



**Патрыярх Ціхан** (Васіль Іванавіч Белавін) (1865—1925), епіскап Рускай Праваслаўнай Царквы, Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі (1917—1925 ). У 1897 г. яму быў нададзены сан епіскапа, у 1905 г. — архіепіскапа, у 1917 г. — мітрапаліта. На Усерасійскім Памесным саборы (1917—1918), які прыняў рашэнне аб аднаўленні патрыярхіі ў Расіі, мітрапаліт Ціхан быў выбраны патрыярхам. Неаднаразова звяртаўся да вышэйшых улад СССР з просьбамі аб спыненні ганенняў на царкву і вернікаў. У 1921 г. разгарнуў кіпучую дзейнасць па выратаванні галадаючых, звярнуўся за садзейнічаннем да жыхароў рэгіёнаў краіны, якія не зведалі голаду, а таксама да сусветнай грамадскасці. Па яго прапанове быў утвораны Усерасійскі царкоўны камітэт дапамогі галадаючым. З мая 1922 па чэрвень 1923 г. знаходзіўся пад арыштам. У 1988 г. Архірэйскі сабор Рускай Праваслаўнай Царквы прылічыў патрыярха Ціхана да ліку святых.

## ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

**З кнігі рускага філосафа М. А. Бярдзяева «Самапазнанне. Вопыт філасофскай аўтабіяграфіі»**

Высылалася за граніцу цэлая група пісьменнікаў, вучоных, грамадскіх дзеячаў, якіх прызналі безнадзейнымі ў сэнсе пераварочвання ў камуністычную веру. Гэта была вельмі дзіўная мера, якая потым ужо не паўтаралася. Я быў высланы са сваёй радзімы не па палітычных, а па ідэалагічных прычынах. Калі мне сказалі, што мяне высылаюць, у мяне зрабілася туга. Я не хацеў эмігрыраваць, і ў мяне было адштурхванне ад эміграцыі, з якой я не хацеў зліцца. Але разам з тым было пачуццё, што я патраплю ў больш свабодны свет і змагу дыхаць больш свабодным паветрам. Я не думаў, што выгнанне маё прадоўжыцца 25 гадоў.



Правообладатель Народная асвета

## УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ

1. Вылучыце этапы ў гісторыі Савецкай дзяржавы 1917—1939 гг. Чым характарызуецца кожны з іх?

2. Апішыце працэс устанаўлення ўлады Саветаў у Расіі. Чаму бальшавікі здолелі захапіць уладу?

3. Чаму ў Расіі выбухнула Грамадзянская вайна? Якія асноўныя палітычныя сілы прымалі ў ёй удзел? Хто з іх перамог? Чаму? Якімі былі наступствы Грамадзянскай вайны?

4. Якая эканамічная палітыка праводзілася ў Савецкай дзяржаве на розных этапах у 1919—1939 гг.? Укажыце: мэты і час правядзення палітыкі; мерапрыемствы, якія ажыццяўляліся ў ходзе правядзення палітыкі; асноўныя вынікі.

5. Растлумачце прычынна-выніковую сувязь:




6. Якія прынцыпы ляжалі ў аснове нацыянальнай палітыкі бальшавікоў? Апішыце працэс утварэння СССР. Пакажыце яго ў выглядзе схемы. Якое значэнне мела ўтварэнне СССР? Ахарактарызуйце СССР з пункту гледжання дзяржаўнага ладу і формы дзяржаўнага кіравання.

7. Апішыце працэс фарміравання палітычнай сістэмы ў СССР. Якія фактары садзейнічалі ператварэнню СССР у цэнтралізаваную дзяржаву з каманднa-адміністрацыйнай сістэмай?

8. Якія этапы можна вылучыць у знешняй палітыцы Савецкай дзяржавы 1919—1939 гг.? Якія фактары ўплывалі на змяненне напрамкаў знешняй палітыкі? Якія былі, на ваш погляд, дасягненні і пралікі знешнепалітычнай дзейнасці Савецкай дзяржавы ў названы перыяд?

9. Вызначыце сутнасць культурнай рэвалюцыі ў СССР. Якія дасягненні культурнай рэвалюцыі вы можаце адзначыць? Якія былі яе негатыўныя наступствы?

10. 1920-я гг. характарызуюцца багаццем новых напрамкаў і форм у савецкай культуры. Як змянілася палітыка Савецкай дзяржавы ў галіне культуры ў 1930-я гг.? Якія фактары ўплывалі на сацыякультурныя працэсы ў савецкім грамадстве? Арганізуйце выстаўку рэпрадукцый твораў мастацтва, створаных у 1920—1930-х гг. Які з іх зрабіў на вас найбольшае ўражанне? Растлумачце чаму.

Правообладатель Народная асвета

## Раздзел III
# КРАІНЫ УСХОДУ І ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ ПАМІЖ СУСВЕТНЫМІ ВОЙНАМІ

## § 17. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё краін Усходу і Лацінскай Амерыкі

**Успомніце:** Якія адметныя рысы ўсходніх цывілізацый? Чаму ў пачатку XX ст. вядучыя капіталістычныя краіны імкнуліся да тэрытарыяльнага перадзелу свету?

Да пачатку XX ст. большасць краін Усходу (Азіі) і Лацінскай Амерыкі захоўвалі сваю нацыянальна-культурную самабытнасць і знаходзіліся ў рознай ступені залежнасці ад еўрапейскіх дзяржаў. Асаблівасцю ўсходніх цывілізацый быў і іх аграрна-традыцыйны характар (за выключэннем Японіі). Аднак новыя тэндэнцыі XX стагоддзя паступова пранікалі і ў гэтыя краіны.

Палітыка каланіялізму ў той ці іншай ступені садзейнічала ўключэнню краін Усходу і Лацінскай Амерыкі ў сусветную гаспадарку, пераадоленню традыцыйнай замкнёнасці і ізаляванага развіцця, абмену культурнымі і духоўнымі каштоўнасцямі. Ключавой з'явай у іх гісторыі ў першай палове XX ст. стала мадэрнізацыя. Бурны рост рынку капіталу спрыяў крызісу традыцыйнага грамадства, паскоранаму буржуазнаму развіццю, карэнным зменам у сацыяльнай структуры.

Аднačасова на Усходзе прымаў новыя формы нацыянальна-вызваленчы рух за незалежнасць і мадэрнізацыю. Ён меў тры асноўныя напрамкі. Першы — ліберальна-рэфармісцкі (эвалюцыйны шлях да незалежнасці ў рэчышчы мадэрнізацыі ў бок еўрапейскай цывілізацыі). Другі — рэвалюцыйна-дэмакратычны (актыўная, часам са зброяй у руках, барацьба за рэспубліку і канстытуцыйны лад). І трэці, найбольш распаўсюджаны і традыцыйны, — стыхійныя выступленні і паўстанні народных мас, прасякнутыя «ўсходняй» спецыфікай: на чале іх стаялі рэлігійныя лідары, секты і тайныя арганізацыі.

**Тэрытарыяльны перадзел свету.** Пасля Першай сусветнай вайны адбыўся тэрытарыяльны перадзел свету. Пераможаная Германія страціла свае каланіяльныя ўладанні. Маштабная перабудова сусветнай палітычнай прасторы прывяла да стварэння так званай **мандатнай сістэмы кіравання калоніямі**. Яе прапанавалі Англія і Францыя з мэтай узаконіць раздзел імі германскіх калоній у Афрыцы, Азіі, на Ціхім акіяне і ўладанняў Асманскай імперыі на Блізкім Усходзе. Краіны-пераможцы не толькі захавалі ўсе свае каланіяльныя ўладанні, але і атрымалі пад кіраванне калоніі Германіі і Японіі, правінцыі былой Асманскай імперыі.

Мандат, які выдаваўся Лігай Нацый, дазваляў «перадавым нацыям» ажыццяўляць «свяшчэнную місію», гэта значыць апекаваць народы, якія «яшчэ не ў стане



Правообладатель Народная асвета

кіраваць сабою» і ўласнымі тэрыторыямі. Такая фармулёўка адлюстроўвала ідэалогію «белага» каланіялізму, якой прытрымліваліся кіраўнікі еўрапейскіх краін. Мандат на кіраванне атрымалі Вялікабрытанія і Францыя — традыцыйныя каланіяльныя дзяржавы.

У цэлым жа становішча калоній пасля Першай сусветнай вайны мала змянілася. Каланіяльныя дзяржавы навязвалі паднявольным народам мадэль развіцця, якая капіравала еўрапейскія ўзоры і парушала мясцовыя гістарычныя традыцыі, што выклікала натуральны адпор і супраціўленне.

**Сацыяльныя працэсы на Усходзе.** На працягу першай паловы XX ст. паступова змянялася сацыяльная структура ўсходняга грамадства. Першая і Другая сусветныя войны садзейнічалі росту эканомікі і гандлю. Умацоўвала свае пазіцыі нацыянальная буржуазія, фарміравалася інтэлігенцыя сучаснага тыпу, павялічвалася колькасць рабочых. Аднак па колькасці і ступені ўплыву ў грамадстве буржуазія ўступала бюракратыі, афіцэрству, чыноўнікам і інтэлігенцыі. Рабочы клас у большасці выпадкаў не аддзяляў сябе ад масы гарадскіх нізоў і выступаў не столькі за свае прыватныя інтарэсы, колькі прымаў удзел у агульнанацыянальных кампаніях, дэманстрацыях і рухах.

Класы і сацыяльныя пласты сучасных укладаў (прыватнакапіталістычны, дзяржаўны капіталізм) складалі ў краінах Усходу да сярэдзіны XX ст. 10—20 % ад усяго насельніцтва, у тым ліку 2—5 % — прадпрымальнікі ўсіх тыпаў, 5—7 % — новыя сярэднія пласты (інтэлігенцыя, чыноўнікі, тэхнічныя спецыялісты) і ўсяго 5—7 % — сучасны пралетарыят. Больш за $^4/_5$ насельніцтва былі заняты ў традыцыйных дакапіталістычных сектарах, у тым ліку да 70 % складалі бедныя сяляне. Рэформы, калі і праводзіліся, не знаходзілі падтрымкі з боку феадальна-патрыярхальных, патрыярхальна-абшчынных і іншых традыцыйных колаў грамадства. Азія значна ўступала Еўропе і па тэмпах урбанізацыі. Да сярэдзіны XX ст. з найбуйнейшых гарадоў свету толькі тры знаходзіліся ў Азіі (Токіа — 6,7 млн чалавек, Шанхай — 5,3 млн, Калькута — 4,4 млн).

**Нацыянальна-вызваленчы рух за незалежнасць і мадэрнізацыю.** Нацыянальна-вызваленчы рух — гэта барацьба прыгнечаных народаў за нацыянальную незалежнасць, эканамічную самастойнасць, духоўнае вызваленне і сацыяльны прагрэс. У краінах Усходу ў першай палове XX ст. яго ўзначальвалі нацыянальна і патрыятычна настроеныя буржуазія, афіцэрства, інтэлігенцыя, духавенства, правадыры родавых і рэлігійных кланаў.



Шанхай у першай палове XX ст.



Правообладатель Народная асвета

Сацыяльную базу антыкаланіяльнай барацьбы складалі сялянства, рабочыя, рамеснікі, гандляры, дробныя прадпрымальнікі, служачыя. Як правіла, усе гэтыя сацыяльныя групы ішлі да дасягнення сваёй мэты пад сцягам ідэалогіі нацыяналізму. У дадзеным выпадку нацыяналізм быў прагрэсіўнай з'явай, паколькі гэтая ідэалогія з'ядноўвала нацыю ў барацьбе супраць замежнага панавання. Вялікую ролю ў нацыянальна-вызваленчых рухах адыгрывала рэлігія (іслам на Блізкім і Сярэднім Усходзе, індуізм у Індыі і г. д.). Метады барацьбы залежалі ад канкрэтнай гістарычнай сітуацыі, расстаноўкі палітычных сіл, ступені кансалідацыі патрыятычных колаў грамадства і іншых фактараў. Найбольш тыповымі з іх былі дэманстрацыі, мітынгі, паўстанні, акцыі грамадзянскага непадпарадкавання і інш.

Нацыянальна-вызваленчыя рухі ў краінах Усходу не толькі прымалі розныя формы, але і мелі шэраг рэгіянальных асаблівасцей (Індыя, Кітай, краіны мусульманскага рэгіёна).

Росту нацыянальна-вызваленчага руху садзейнічалі рэвалюцыйныя падзеі ў Расіі. Найважнейшым інструментам палітыкі Савецкай дзяржавы ў краінах Усходу з'яўляўся Камінтэрн.

У перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі адбыліся кемалісцкая рэвалюцыя ў Турцыі (1919—1923) і абвяшчэнне Турэцкай Рэспублікі, трэцяя англа-афганская вайна (1919), у якой Афганістан абараніў сваю незалежнасць, паўстанні ў Егіпце (1919), Іраку (1920), Сірыі (1925—1927). Нацыянальная рэвалюцыя ў Кітаі 1925—1927 гг. адкрывала новыя перспектывы перад гэтай краінай. Аднак акупацыя Японіяй Маньчжурыі ў 1931 г. і пачатак японa-кітайскай вайны ў 1937 г. прыпынілі гэты працэс. На афрыканскім кантыненце нацыянальна-вызваленчы рух набыў найбольш актыўныя формы ў Егіпце і Марока. Буйныя паўстанні 1919 і 1921 гг. прымусілі Вялікабрытанію даць фармальную незалежнасць Егіпту. У Марока плямёны рыфаў абвясцілі рэспубліку і аказалі ўпартае супраціўленне Францыі і Іспаніі.

З'яўленне ў пачатку 1930-х гг. Германіі, Італіі і асабліва Японіі ў якасці сапернікаў традыцыйных каланіяльных дзяржаў (Вялікабрытаніі, Францыі, Галандыі, ЗША) унесла новыя ўскладненні ў расстаноўку палітычных сіл на Усходзе. Дзяржавы «восі Берлін — Рым — Токіа» імкнуліся да новага перадзелу свету. Яны ўстанаўлівалі кантакты з лідарамі нацыянальна-вызваленчых рухаў, імкнучыся прыцягнуць іх на свой бок. Найбольш паспяховай у гэтым плане была Японія. Летам 1941 г. яна акупіравала Інданезію, а ў снежні 1941 г. пасля нападзення на амерыканскую ваенную базу Пёрл-Харбар нанесла ўдар па калоніях Вялікабрытаніі, Галандыі і ЗША — заняла Малайю, Інданезію, Бірму, Філіпіны. Японія падтрымлівала стварэнне нацыянальна-вызваленчых армій у Бірме, Індыі і г. д. пад лозунгам «Японія — лідар Азіі, абаронца Азіі, светач Азіі». Калі ж стала зразумела, што Японія — тыповы каланізатар, у захопленых краінах пачаўся рух супраціўлення.



Правообладатель Народная асвета

Другая сусветная вайна дашчэнту ўзрушыла Усход. У ваенных дзеяннях прыняла ўдзел вялікая колькасць салдат з каланіяльных краін. Толькі ў Індыі ў армію было прызвана 2,5 млн чалавек. У Кітаі загінула за гады вайны 10 млн чалавек, у Інданезіі — 2 млн. Паражэнне дзяржаў «восі Берлін — Рым — Токіа» садзейнічала ўздыму нацыянальна-вызваленчых рухаў. Менавіта ў Азіі пачаўся распад каланіяльнай сістэмы.

**Лацінская Амерыка.** У першай палове XX ст. эканамічнае развіццё Лацінскай Амерыкі мела ярка выражаны экспартна-сыравінны характар. З краін рэгіёна на сусветны рынак пастаўляліся мяса і збожжа, садавіна, кава і цукар, мінеральная сыравіна (серабро, нафта, стратэгічныя металы, волава, медзь і г. д.). Сыравінная спецыялізацыя эканомікі прымушала лацінаамерыканскія краіны імпартаваць прамысловую прадукцыю і передавыя тэхналогіі з Заходняй Еўропы і ЗША.

Сусветны эканамічны крызіс 1929—1933 гг. прывёў да рэзкага скарачэння попыту на сельскагаспадарчую і сыравінную прадукцыю, падзення нацыянальнай вытворчасці, росту беспрацоўя і паніжэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва. У краінах Лацінскай Амерыкі абвастрыліся сацыяльныя супярэчнасці. У Бразіліі і на Кубе адбыліся рэвалюцыі, у Нікарагуа разгарнулася партызанская барацьба супраць кіруючага рэжыму, які падтрымлівалі ЗША. З мэтай выхаду з крызісу кіруючыя колы лацінаамерыканскіх краін актывізавалі палітыку дзяржаўнага рэгулявання.

У гэты ж час амерыканскі прэзідэнт Ф. Д. Рузвельт абвясціў у адносінах да Лацінскай Амерыкі палітыку «добрага суседа», што азначала адмаўленне ЗША ад узброенага ўмяшання ў справы краін рэгіёна дзеля абароны амерыканскіх інтарэсаў. Аднак палітыка «добрага суседа» не перашкаджала развіццю больш гібкіх форм эканамічнай, фінансавай і палітычнай экспансіі ЗША ў лацінаамерыканскіх краінах. Другая сусветная вайна садзейнічала далейшаму росту ўплыву ЗША ў Лацінскай Амерыцы.

?

1. Чаму і якім чынам было вырашана пытанне з калоніямі пераможанай Германіі?
2. Што такое мадэрнізацыя? Чаму краіны Усходу і Лацінскай Амерыкі першай паловы XX ст. сталі на шлях мадэрнізацыі? Якія наступствы яна мела?
3. Якія фактары ўплывалі на змяненне сацыяльнай структуры ў краінах Усходу? У чым заключалася адрозненне сацыяльнай структуры краін Усходу і краін Захаду?
4. Якая падзея паўплывала на актывізацыю нацыянальна-вызваленчага руху ў краінах Усходу і Лацінскай Амерыкі? Якія былі асаблівасці нацыянальна-вызваленчага руху ў краінах Усходу ў 1920—1930-х гг.?
5. Якія ўскладненні ў расстаноўцы палітычных сіл узніклі на Усходзе ў 1930-х гг.?
6. Якая азіяцкая краіна ў 1930-х гг. стала на шлях каланіяльных захопаў?

**Прапануем абмеркаваць.** Чым вы можаце растлумачыць супярэчнасць, звязаную з тым, што значная колькасць кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху ў краінах Усходу атрымала адукацыю ў развітых краінах Захаду?



Правообладатель Народная асвета

## § 18—19. Кітай

**Успомніце:** Калі ў Кітаі была звергнута манархія? Якая палітычная партыя была створана ў 1912 г.? Хто быў яе заснавальнікам? Якую палітыку ў адносінах да Кітая праводзілі краіны Захаду?

Сунь Ятсен — «бацька» кітайскай рэвалюцыі — так апісаў становішча Кітая ў пачатку XX ст.: «У параўнанні з іншымі дзяржавамі ў нас самае шматлікае насельніцтва і самая старажытная культура, гісторыя якой налічвае 4000 гадоў. Нягледзячы на гэта, Кітай дагэтуль застаецца самай беднай і слабай дзяржавай свету. У той час як іншыя краіны выступілі на міжнароднай арэне «з рэжучым нажом і талеркай», Кітай з'яўляўся ўсяго толькі «рыбай і мясам».

Па меры станаўлення Кітайскай рэспублікі нацыянальныя дзеячы, падобныя Сунь Ятсену, ставілі за мэту дагнаць і перагнаць дзяржавы, размешчаныя на ўсход і захад ад Кітая. Але гэтая мэта заставалася недасягальнай, пакуль краіна пакутавала ад унутраных непарадкаў, грамадзянскай вайны і замежнага ўмяшання.

**Кітайская рэспубліка ў пачатку XX ст.** Цінская манархія была звергнута ў 1911 г. Сунь Ятсен спадзяваўся перабудаваць Кітай на аснове вылучаных ім «трох народных прынцыпаў»: незалежнасць, суверэнітэт і дабрабыт народа. Аднак краіна хутка скочвалася ў стан анархіі і хаосу.

У 1912 г. Сунь Ятсен адмовіўся ад пасады прэзідэнта Кітайскай рэспублікі на карысць уплывовага генерала Юань Шыкая. Сунь Ятсен спадзяваўся, што Юань Шыкай здолее аднавіць парадак і стварыць моцную цэнтралізаваную дзяржаву. Аднак амбіцыйны генерал ставіў іншыя мэты. Ён рыхтаваўся да аднаўлення манархіі і разглядаў сябе ў якасці будучага імператара. Супраць яго, у сваю чаргу, выступілі военачальнікі правінцый — так званыя генералы-мілітарысты. Пасля раптоўнай смерці Юань Шыкая ў 1916 г. краіна скацілася ў бездань яшчэ большых беспарадкаў і бедстваў. Кітай распаўся на асобныя правінцыі, улада у якіх перайшла ў рукі мілітарыстаў. Цэнтральны ўрад у Пекіне займаўся ў асноўным знешняй палітыкай.

Паміж мілітарыстамі ішла барацьба за ўладу, адбываліся крывавыя і разбуральныя сутыкненні. У той час як феадальныя клікі ваявалі адна з адной, эканоміка краіны прыходзіла ў заняпад. Мільёны сялян знаходзіліся ў бядотным становішчы, пакутавалі ад голаду і галечы. Мілітарысты прымушалі іх выплачваць падаткі на ўтрыманне сваіх шматлікіх войскаў. Рабаванні і бандытызм у паўсядзённым жыцці яшчэ больш пагаршалі становішча кітайскіх сялян.

**Уздым нацыянальнага руху ў 1919—1924 гг.** У перыяд хаосу і беспарадкаў у Кітаі ўзмацніўся ўплыў замежных дзяржаў. Еўрапейскія, амерыканскія і японскія камерсанты, місіянеры і салдаты былі гаспадарамі ў кітайскіх адкрытых для гандлю



Правообладатель Народная асвета

партовых гарадах. У 1915 г. новы ціск на свайго калісьці магутнага суседа аказала Японія. У самы разгар Першай сусветнай вайны Японія накіравала Юань Шыкаю 21 патрабаванне з мэтай ператварэння Кітая ў японскі пратэктарат. Занадта слабы, каб супраціўляцца, Юань Шыкай прыняў частку патрабаванняў. У 1919 г. на Парыжскай мірнай канферэнцыі дзяржавы-пераможцы дазволілі Японіі ўстанавіць кантроль над германскімі ўладаннямі ў Кітаі, які яны фактычна разглядалі як паўкаланіяльную дзяржаву. Гэтае рашэнне прывяло да абурэння кітайскіх нацыяналістаў.

У знак пратэсту супраць такога адкрытага прыніжэння Кітая вялікімі дзяржавамі **4 мая 1919 г.** у Пекіне ўспыхнула буйная патрыятычная маніфестацыя студэнтаў. Да яе далучыліся прадстаўнікі дзелавых колаў і нават рабочыя. У розных гарадах Кітая пачаліся забастоўкі, маніфестацыі, рух байкоту японскіх тавараў. Такі маштабны размах незадаволенасці прывёў да таго, што кітайскі ўрад у Пекіне адмовіўся ратыфікаваць Версальскі дагавор. *«Рух 4 мая»* паставіў пад сумненне канфуцыянскую мараль (павага да традыцый, шанаванне старэйшых і г. д.), выставіў на першы план ідэі радыкальных змяненняў у грамадстве.

Асноўную ролю ў далейшых падзеях у краіне адыгралі дзве палітычныя арганізацыі — буржуазная партыя *Гаміньдан*, ці Нацыянальная партыя, і *партыя кітайскіх камуністаў*, якая ўзнікла ў перыяд уздыму нацыянальнага руху і пад уплывам рэвалюцыйных падзей у Савецкай Расіі.

У 1921 г. Сунь Ятсен, старшыня Гаміньдана, узначаліў урад у Гуанчжоў на поўдні Кітая. Ён разумеў, што ў адзіночку не здолее ні аб'яднаць Кітай, ні вызваліць яго ад эканамічнай апекі Японіі і Захаду. Таму Сунь Ятсен звярнуўся за дапамогай да Савецкай Расіі, адзінай з буйнейшых дзяржаў, якая адмовілася ад «нераўнапраўных дагавораў», заключаных у Версалі. Савецкая Расія, у сваю чаргу, была гатова выкарыстаць кітайскіх рэвалюцыянераў у інтарэсах сусветнай рэвалюцыі.

Практычныя асновы супрацоўніцтва СССР і Гаміньдана залажыў візіт кітайскай дэлегацыі ў Маскву ў *1923 г.* Кіраўнік дэлегацыі **Чан Кайшы**, выступаючы на пасяджэнні Выканкама Камінтэрна, заявіў: «Мы лічым, што фундаментальная база рэвалюцыі знаходзіцца ў Расіі... Партыя Гаміньдан прапануе, каб Расія, Германія (вядома, пасля поспеху рэвалюцыі ў Германіі) і Кітай (пасля поспеху кітайскай рэвалюцыі ў Кітаі) арганізавалі саюз трох буйнейшых дзяржаў для барацьбы з капіталістычным



Дэманстрацыя 4 мая 1919 г. у Пекіне



Правообладатель Народная асвета

уплывам у свеце». Пазіцыя Чан Кайшы адлюстроўвала як погляды Сунь Ятсена, так і чаканні савецкага кіраўніцтва.

З дапамогай Камінтэрна Сунь Ятсен рэарганізаваў Гаміньдан і пачаў ствараць узброеныя сілы. У Гуанчжоў былі накіраваны савецкія ваенныя саветнікі і інструктары, пачалося збліжэнне паміж Гаміньданам і маладой партыяй кітайскіх камуністаў. Абвешчаная ў **ліпені 1921 г.** Камуністычная партыя Кітая (КПК), па рэкамендацыі Выканкама Камінтэрна, паскорыла стварэнне адзінага фронту, дамагаючыся ад Гаміньдана падтрымкі рабочага і сялянскага руху. У 1924 г. кітайскія камуністы ўступілі ў Гаміньдан пры захаванні палітычнай і арганізацыйнай самастойнасці КПК.

Такім чынам, перыяд 1919—1924 гг. характарызаваўся радыкалізацыяй поглядаў Сунь Ятсена, перабудовай на гэтай аснове нацыянальна-буржуазнай партыі Гаміньдан, а таксама ўтварэннем КПК як альтэрнатывы буржуазнаму кіраўніцтву кітайскай рэвалюцыяй, стварэннем адзінага нацыянальнага фронту КПК і Гаміньдана, якія абапіраўся на дапамогу і падтрымку Савецкай Расіі (пазней СССР).

**Нацыянальная рэвалюцыя 1925—1927 гг.** Нацыянальна-дэмакратычная рэвалюцыя ў Кітаі развівалася пры савецкай падтрымцы і прыняла форму першай грамадзянскай вайны поўдня Кітая (блока КПК — Гаміньдана ) супраць паўночных феадальна-мілітарысцкіх клік.

У сакавіку 1925 г. памёр Сунь Ятсен. У адпаведнасці з яго завяшчаннем саюз паміж нацыяналістамі і кітайскімі камуністамі з арыентацыяй на СССР захаваўся. Аднак правыя ў Гаміньдане былі ўстрывожаны размахам народных рухаў, у тым ліку выступленнямі рабочых Шанхая, Гуанчжоў і Ганконга супраць міжнародных канцэсій, стварэннем сялянскіх саюзаў, накіраваных супраць памешчыкаў-землеўладальнікаў.

Нацыянальная рэвалюцыя 1925—1927 гг. пачалася з дэманстрацыі 30 мая 1925 г. і ўсеагульнай 500-тысячнай забастоўкі, якая ахапіла ў чэрвені англійскія і японскія фабрыкі, замежныя банкі, друкарні, параходныя кампаніі ў Шанхаі. Патрыятычныя маніфестацыі і антыанглійскі байкот на ўсёй тэрыторыі правінцыі Гуандун садзейнічалі ўмацаванню становішча гаміньданаўскага ўрада ў Гуанчжоў. У гэты ж час з дапамогай савецкіх спецыялістаў на чале з В. К. Блюхерам завяршылася рэарганізацыя ўзброеных сіл Гаміньдана ў адзіную Нацыянальна-рэвалюцыйную армію (НРА).

Спачатку сіламі НРА былі разгромлены гуандунскія мілітарысты, затым пачалася падрыхтоўка ваеннага паходу на Поўнач, каб узброеным шляхам аб’яднаць увесь Кітай пад уладай Гаміньдана. Гэтая ідэя належала Сунь Ятсену. У маі 1926 г. старшынёй Ваеннага савета Нацыянальнага ўрада і галоўнакамандуючым НРА быў выбраны Чан Кайшы, што прывяло да надзвычайнага ўзмацнення яго ўлады. 1 ліпеня было абвешчана аб пачатку *Паўночнага паходу* НРА. Падтрымка паходу са-



Правообладатель Народная асвета

мымі шырокімі пластамі насельніцтва і ваенная дапамога Савецкага Саюза ваеннымі спецыялістамі, зброяй і самалётамі забяспечылі рэвалюцыйным войскам перамогу над рэакцыйнымі мілітарыстамі. У сакавіку 1927 г. войскі НРА вызвалілі Шанхай і Нанкін.

У перыяд Паўночнага паходу значна ўзрос уплыў КПК, колькасць якой у 1927 г. дасягнула амаль 25 тыс. чалавек. Гэтая акалічнасць была ўспрынята пра-




Кітай у 1925—1937 гг.



Правообладатель Народная асвета

вымі як сігнал для ўтаймавання камуністаў. У красавіку 1927 г. па загадзе Чан Кайшы ў Шанхаі былі ажыццёўлены антыкамуністычныя акцыі. Расправы з камуністамі адбыліся і ў іншых гарадах. Гэтыя падзеі паклалі пачатак крызісу рэвалюцыі і адзінага фронту. У ліпені гэтага ж года Цэнтральны выканаўчы камітэт Гаміньдана прыняў рашэнне аб разрыве з КПК.

У **лютым 1928 г.** Нацыянальны ўрад Кітая ў Нанкіне ўзначаліў Чан Кайшы, які і завяршыў Паўночны паход і аб'яднанне Кітая. Неўзабаве гаміньданаўскі ўрад быў прызнаны вялікімі дзяржавамі як агульнакітайскі.

**Грамадзянская вайна 1927—1937 гг.** Пасля распаду адзінага фронту кіраўніцтва КПК, не лічачыся з рэальнымі ўмовамі, узяло курс на ўзброеную барацьбу з Гаміньданам, каб усталяваць гегемонію пралетарыяту, «паглыбіць» нацыянальную рэвалюцыю і перавесці яе на рэйкі сацыялістычнай рэвалюцыі. Узброеныя выступленні, арганізаваныя КПК летам і восенню 1927 г., выклікалі жорсткія рэпрэсіі гаміньданаўскіх улад, знішчэнне камуністаў. У гарадах Кітая амаль не засталося партыйных ячэек. Пачалося вымушанае перабазіраванне дзейнасці КПК у сельскія раёны. У гэтых аддаленых і практычна недаступных для ўлад раёнах ствараліся рэвалюцыйныя базы, абвяшчалася савецкая ўлада, фарміраваліся атрады Рабоча-сялянскай рэвалюцыйнай, ці Чырвонай, арміі. Гаміньданаўская армія і Чырвоная армія рабоча-сялянскай рэспублікі знаходзіліся ў стане бесперапыннай вайны.

На стыку правінцыі Цзянсі і захаду правінцыі Фуцзянь узнік *Цэнтральны савецкі раён*. **7 лістапада 1931 г.** тут было абвешчана аб утварэнні *Кітайскай Савецкай Рэспублікі*, кіраўніком і старшынёй урада якой быў абраны *Маа Цзэдун*. Толькі пяты паход у Цэнтральны раён, арганізаваны Чан Кайшы ў 1934 г., стаў паспяховым. Чырвоная армія апынулася ў акружэнні гаміньданаўскіх войскаў. Адзіным выхадам быў прарыў акружэння і пакіданне Цэнтральнага раёна. Пачаўся *Вялікі паход* Чырвонай арміі на паўночны захад краіны, які каштаваў велізарных людскіх страт. Вялікі паход стаў сімвалам гераічнай барацьбы кітайскіх камуністаў супраць Гаміньдана. Маа Цзэдун параўноўваў гэты паход з сеялкай, якая пасеяла «мноства насення ў адзінаццаці правінцыях» Кітая: «Насенне пусціць парасткі, дасць лісце, кветкі, і плады прынясуць ураджай у будучыні». Праз два гады ў правінцыі Шаньсі была створана новая рэвалюцыйная база КПК.



Кіраўнік КПК Маа Цзэдун у час Вялікага паходу. Кастрычнік 1935 г.



Правообладатель Народная асвета

**Японская агрэсія.** У той час як Чан Кайшы праследаваў камуністаў па ўсім Кітаі, краіна сутыкнулася з яшчэ адной пагрозай.

У **1931 г.** Японія ўварвалася ў Маньчжурыю і захапіла яе. У краіне разгарнуўся масавы антыяпонскі рух. Нават гаміньданаўскія генералы былі незадаволены тым, што Нацыянальны ўрад у Нанкіне растрачваў каштоўныя рэсурсы, змагаючыся з кітайцамі-камуністамі, замест таго каб мабілізаваць усіх на барацьбу супраць японскіх заваёўнікаў. У канцы 1935 г. ЦК КПК абвясціў курс на стварэнне адзінага антыяпонскага фронту, а ў маі 1936 г. Маа Цзэдун прапанаваў Нанкінскаму ўраду спыніць грамадзянскую вайну. Аднак Чан Кайшы не спяшаўся, нягледзячы на антыяпонскі патрыятычны настрой у грамадстве, які нарастаў.

Між тым у **ліпені 1937 г.** японскія войскі ўварваліся ў Паўночны Кітай і акупіравалі Пекін. Пачалася поўнамаштабная япона-кітайская вайна, якая працягвалася восем гадоў. Урад СССР прапанаваў Чан Кайшы заключыць дагавор аб дружбе і пагадненне аб пастаўках у Кітай сучаснай ваеннай тэхнікі. *21 жніўня 1937 г.* быў заключаны савецка-кітайскі дагавор аб ненападзенні. Гэта мела вырашальнае значэнне ў спыненні грамадзянскай вайны ў Кітаі. **23 верасня 1937 г.** Чан Кайшы заявіў аб стварэнні адзінага фронту Гаміньдана і КПК у вайне супраць японскіх захопнікаў.

Нягледзячы на цяжкія паражэнні (захоп японцамі Цяньцзіня, Шанхая, Нанкіна, Уханя), японскім агрэсарам не ўдалося дамагчыся капітуляцыі Кітая. Аднак вайна прывяла да фактычнага распаду краіны на тры часткі. Першая частка кантралявалася японцамі, другая — гаміньдананаўскімі ўладамі і трэцяя (так званыя вызваленыя раёны з насельніцтвам 95 млн чалавек) — КПК. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё кожнага з рэгіёнаў істотна адрозніваліся адно ад аднаго.

У ходзе японска-кітайскай вайны пазіцыі Гаміньдана прыкметна аслаблі, у той час як пазіцыі КПК умацаваліся. У **жніўні 1945 г.** войскі СССР разграмілі японскую Квантунскую армію ў Маньчжурыі.

Уступленне савецкіх войскаў на тэрыторыю Кітая шмат у чым паўплывала на пасляваеннае развіццё падзей у краіне. Грамадзянская вайна паміж Гаміньданам і КПК аднавілася. Праз некалькі гадоў камуністы, атрымаўшы перамогу, прыступілі да сацыялістычнай мадэрнізацыі Кітая.



Японскія войскі ў Кітаі. 1937 г.



Правообладатель Народная асвета

**Культура Кітая.** Аж да пачатку XX ст. у Кітаі існавала традыцыйная сістэма адукацыі, заснаваная на вывучэнні старажытных класічных канфуцыянскіх кніг. У 1902—1903 гг. былі ажыццёўлены першыя рэформы ў галіне адукацыі, у выніку якіх у 1920-х гг. склалася школьная сістэма на ўзор еўрапейскіх краін і ЗША. Галоўнай праблемай Кітая ў сферы адукацыі была ліквідацыя непісьменнасці. У пачатку 1920-х гг. у краіне налічвалася 320 млн (каля 90 % насельніцтва) непісьменных. Вядомыя педагогі і вучоныя Кітая ўзначалілі барацьбу за пераадоленне непісьменнасці. У 1921 г. быў выдадзены танны «Народны падручнік», які ўключаў 1000 іерогліфаў. Выкладанне стала праходзіць на зразумелай народу гутарковай мове *байхуа*.

У сярэдняй школе ўстанавіўся 12-гадовы тэрмін навучання. У Кітаі адкрылася больш за 50 вышэйшых навучальных устаноў. Абавязковым для вывучэння прадметам было вучэнне Сунь Ятсена. У савецкіх раёнах, дзе ва ўладзе стаяла КПК, адкрываліся народныя і ленінскія школы, навучэнцы праходзілі абавязковую ваенную падрыхтоўку.

У гады Першай сусветнай вайны ў Кітаі ўзнік «рух за новую культуру», які ўзначаліла перадавая кітайская інтэлігенцыя. Многія пісьменнікі сталі ствараць простыя, звязаныя з сучасным жыццём, мастацкія творы. Найбуйнейшым прадстаўніком гэтага руху стаў заснавальнік сучаснай кітайскай літаратуры *Лу Сінь*. У сваіх творах ён крытыкаваў састарэлыя прынцыпы канфуцыянскай маралі і ўпершыню зрабіў радавога чалавека галоўным героем мастацкай літаратуры.

У пачатку XX ст. у Кітаі пачаў фарміравацца сучасны драматычны тэатр. Яго станаўленне адбывалася пад уздзеяннем еўрапейскага драматычнага мастацтва. У 1930-х гг. тэатры ставілі п'есы рускай і заходнееўрапейскай драматургіі: «Рэвізор» М. В. Гогаля, «Навальніца» А. М. Астроўскага, «На дне» М. Горкага, «Нара» Г. Ібсена і творы нацыянальнай драматургіі.

У 1920—1930-я гг. прыкметнае месца ў кітайскім мастацтве займаў класічны жывапіс тушшу і мінеральнымі фарбамі на шоўку або паперы — *гохуа*. Для яго былі па-ранейшаму характэрны два асноўныя жанры — пейзаж і партрэт. Вядомым майстрам гохуа з'яўляўся *Ці Байшы*. У гэты ж час некаторыя кітайскія мастакі вучыліся за мяжой і авалодалі прыёмамі еўрапейскага жывапісу. Уплыў П. Пікасо, П. Гагена і А. Матыса адбіўся на творчасці найбольш выдатнага прадстаўніка «новага гохуа» *Сюй Бэйхуна*.

У архітэктуры і скульптуры Кітая дамінавалі старыя сярэдневяковыя формы, якія з'яўляліся часткай культавага мастацтва. У 1925 г. адкрыўся музей Гугун у Пекіне, які ўключаў палацы і павільёны былога імператарскага Забароненага горада. У 1929 г. у Нанкіне быў пабудаваны велічны маўзалей Сунь Ятсена, унутры якога ўстанавілі скульптуру правадыра Гаміньдана.



Правообладатель Народная асвета

У 1917 г. выйшаў першы мастацкі (іграві) фільм, пастаўлены кітайскай кінастудыяй. Кітайскія фільмы 1920—1930-х гг. закраналі найбольш важныя грамадскія праблемы, абуджалі пачуццё патрыятызму, заклікалі на барацьбу з японскай агрэсіяй.

1. Вылучыце асноўныя этапы ў гісторыі Кітая 1919—1945 гг. Дайце ім кароткую характарыстыку.
2. Што прывяло да ўздыму нацыянальнага руху ў Кітаі? Якія падзеі паслужылі падставай да пачатку нацыянальнай рэвалюцыі? Якія былі яе вынікі? Якія фактары садзейнічалі перамозе рэвалюцыі?
3. Калі ўзнікла Кітайская камуністычная партыя? Ахарактарызуйце ўзаемаадносіны паміж Гаміньданам і КПК. У чым заключалася асноўная праблема іх узаемаадносін? Якія наступствы для краіны мела супрацьстаянне гэтых партый?
4. Як складваліся ў 1919—1945 гг. узаемаадносіны Кітая з Савецкім Саюзам? Чаму яны былі зацікаўлены ў развіцці сяброўскіх узаемаадносін?
5. Калі Японія напала на Кітай? Чаму Кітай не здолеў супрацьстаяць Японіі? Якія наступствы для Кітая мела агрэсія Японіі і грамадзянская вайна паміж Гаміньданам і КПК?
6. Складзіце сінхранічную табліцу «Унутраная і знешняя палітыка Кітая ў 1919—1945 гг.».

| Дата | Унутраная палітыка | Знешняя палітыка |
|---|---|---|
| | | |

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Чан Кайшы** (сапр. прозвішча — Цзян Цзешы, Цзян Чжунчжэн) (1887—1975), кітайскі дзяржаўны і палітычны дзеяч. Вучыўся ў Дзяржаўнай ваеннай школе японскай арміі ў Токіа, дзе пазнаёміўся з Сунь Ятсенам. Пасля смерці Сунь Ятсена (1925) узначаліў рэвалюцыйны рух на поўдні Кітая і арганізаваў Паўночны паход (1926—1928). 12 красавіка 1927 г. здзейсніў контррэвалюцыйны пераварот, усталяваў у краіне рэакцыйны дыктатарскі рэжым. Засяродзіў у сваіх руках пасады старшыні ЦВК Гаміньдана, старшыні ўрада, прэзідэнта рэспублікі, галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі, прысвоіў сабе званне генералісімуса. У 1930—1934 гг. здзейсніў 5 карных паходаў у Цэнтральны савецкі раён. Пасля нападу Японіі на Кітай (1937) вымушаны быў пайсці на стварэнне адзінага антыяпонскага фронту з КПК. Пасля капітуляцыі Японіі (2 верасня 1945 г.) адхіліў прапанову КПК аб стварэнні кааліцыйнага ўрада і развязаў новую грамадзянскую вайну. Пацярпеўшы паражэнне, Чан Кайшы разам з рэшткамі сваіх войскаў збег на в. Тайвань.



Правообладатель Народная асвета

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### З лістоўкі студэнтаў Пекінскага ўніверсітэта

*Май 1919 г.*

Цяпер Японія запатрабавала на [Парыжскай] мірнай канферэнцыі адарвання Цындаа і права кантролю над Шаньдунам і дамаглася ў гэтым поспеху. Яе перамога азначае наша паражэнне. Передача Японіі правоў у Шаньдуні падрывае суверэнітэт Кітая, што вядзе краіну да гібелі. Таму мы, студэнты, арганізавана накіроўваемся да замежных пасольстваў, каб запатрабаваць ад усіх краін падтрымкі, справядлівасці... Усе суайчыннікі цяпер павінны засвоіць тую ісціну, што нельга мірыцца з адарваннем тэрыторыі краіны, нельга дапускаць, каб народ схіліў галаву. Краіна ў небяспецы! Суайчыннікі, узнімайцеся!

*Што паслужыла падставай да выступлення кітайскіх студэнтаў? Чаго патрабавалі студэнты? Якія наступствы мела гэтае выступленне студэнтаў?*

## § 20. Індыя

**Успомніце:** Калі была створана партыя Індыйскі нацыянальны кангрэс? Чые інтарэсы яна прадстаўляла? Якія палітычныя і сацыяльна-эканамічныя фактары садзейнічалі разгортванню нацыянальна-вызваленчага руху ў Індыі ў канцы XIX — пачатку XX ст.?

Індыя была самай буйной, найбагацейшай калоніяй Вялікабрытаніі. Нацыянальна-вызваленчы рух тут узначальвала партыя Індыйскі нацыянальны кангрэс (ІНК) і яе лідар М. К. Гандзі. Дзейнасць Гандзі і прапанаваныя ім формы барацьбы адыгралі значную ролю ў дасягненні Індыяй незалежнасці пасля Другой сусветнай вайны.

**Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў 1918—1922 гг.** У гады Першай сусветнай вайны Індыя аказала вялікую дапамогу сваёй метраполіі. На баку Англіі змагалася 1,3 млн індыйскіх салдат. У перыяд вайны Англіяй шырока выкарыстоўваліся рэсурсы Індыі: марганцавая руда, салетра, лес, пянька, чай, пшаніца, джут. У Еўропу адпраўляліся паравозы, канструкцыі для чыгуначных мастоў, пераганяліся параходы. У 1915 г. Нацыянальны кангрэс прыняў рэзалюцыю аб сваёй лаяльнасці да брытанскага ўрада, пасля чаго запатрабаваў перадачы ўлады народу. Нават умераныя дзеячы індыйскага нацыянальна-вызваленчага руху чакалі сур'ёзных уступак ад англійскіх улад.

Аднак заканчэнне Першай сусветнай вайны прынесла расчараванне. Каланізатары яўна не спяшаліся з пераўтварэннямі. Праект рэформ, які быў апублікава-



Правообладатель Народная асвета

ны ў *ліпені 1918 г.*, толькі нязначна пашыраў удзел індыйцаў у кіраванні краінай. А ў *сакавіку 1919 г.* былі прыняты два законы, якія давалі ўладам надзвычайныя паўнамоцтвы.

Прыняцце гэтых законаў выклікала выбух масавага абурэння. ІНК пайшоў на рэзкае абвастрэнне адносін з каланіяльнымі ўладамі. Ён абвясціў аб правядзенні ўсеіндыйскай забастоўкі (закрыццё крамаў, спыненне дзелавой актыўнасці), у якой удзельнічала больш за 30 гарадоў. У некаторых месцах адбыліся моцныя хваляванні.

У *Амрытсары* (правінцыя Пенджаб), рэлігійным цэнтры сікхаў, былі забіты 4 англічане, спалена некалькі банкаў і ўрадавых устаноў. У горадзе была ўведзена каменданцкая гадзіна і забаронены ўсе мітынгі і дэманстрацыі. Аднак **13 красавіка 1919 г.**, калі ў Пенджабе адзначаецца вялікае свята вясны, на цэнтральнай плошчы Амрытсара адбыўся шматлюдны мітынг. Камендант горада вырашыў правучыць індыйцаў або, па яго словах, «аказаць маральнае ўздзеянне» на мітынгуючых. Ён адправіўся на плошчу на чале атрада з 90 салдат, якія адкрылі агонь па святочным натоўпе без папярэджання. Салдаты стралялі, пакуль не скончыліся патроны, забіўшы 379 і параніўшы 1208 чалавек.

«Амрытсарская бойня» ўзрушыла ўсю Індыю і прывяла да рэзкай радыкалізацыі лідараў Нацыянальнага кангрэса. Надзеі на мірныя дамоўленасці з уладамі былі сур'ёзна падарваны. Кангрэс прыняў праграму Махандаса Карамчанда Гандзі — праграму поўнага байкоту англічан і іх улады і ў 1920 г. пачаў яе ажыццяўляць. З гэтага часу Гандзі становіцца прызнаным лідарам Нацыянальнага кангрэса.

**Ідэалогія гандзізму.** У той час як некаторыя лідары ў краінах Усходу прымалі заходнія мадэлі вырашэння нацыянальнай праблемы, **М. К. Гандзі** абапіраўся перш за ўсё на індуісцкія традыцыі. У барацьбе за нацыянальныя правы ён актыўна прапаведаваў старажытную дактрыну ненасілля (*ахімса*). Неад'емнай часткай пасіўнага супраціўлення, вучыў ён, з'яўляюцца пакуты, самаахвярнасць і сіла любві, здольная пераканаць самага грознага праціўніка ісці па правільным шляху.


«Амрытсарская бойня». 13 красавіка 1919 г.

Створаная ім сістэма палітычных, філасофскіх і маральна-этычных ідэй — гандзізм — вырасла з нацыянальна-сялянскай спецыфікі Індыі і асаблівасцей рэлігіі індуізму.

**Гандзізм** стаў афіцыйнай ідэалогіяй ІНК. Яго сутнасцю з'яўляюцца *сарвадая* (грамадства ўсеагульнага да-



Правообладатель Народная асвета

брабыту) і *сацьяграха* (негвалтоўнае супраціўленне) як адзін са сродкаў дасягнення сарвадаі. Класавую барацьбу Гандзі адмаўляў, лічачы яе фактарам, які раз'ядноўвае грамадства. Сацьяграха ўключала: негвалтоўнае несупрацоўніцтва з уладамі і розныя формы грамадскага непадпарадкавання (байкот англійскіх тавараў, школ, судовых і дзяржаўных устаноў; закрыццё крамаў, якія належалі каланіяльным уладам; правядзенне рэлігійных акцый і дэманстрацый у знак пратэсту дзеянням брытанскай адміністрацыі). Нават у тых выпадках, калі англійскія войскі адкрывалі агонь па дэманстрантах або мітынгуючых, Гандзі настойваў на выкананні прынцыпу ненасілля.

Філасофія гандзізму адлюстроўвала не толькі індуісцкі, але і заходні ўплыў. Гандзі захапляўся хрысціянскім вучэннем аб любві, чытаў працы амерыканскага філосафа XIX ст. Генры Тора, які верыў у сілу грамадзянскага непадпарадкавання і лічыў цалкам прымальным не падпарадкоўвацца несправядлівым законам. Зусім не чужыя яму былі ідэі дэмакратыі і нацыяналізму. Ён не прымаў няроўнасць каставай сістэмы і паслядоўна змагаўся за спыненне жорсткага абыходжання з «недатыкальнымі», прадастаўленне роўных правоў усім індыйцам, жанчынам і мужчынам.

У сваёй грамадска-палітычнай дзейнасці Гандзі надаваў вялікае значэнне асабістаму прыкладу. Адмовіўшыся ад заходняга адзення, ён апранаўся ў простае белае адзенне, якое насілі сяляне. Ён выступаў за паўсюднае развіццё і заахвочванне традыцыйнай прадзільнай і ткацкай прамысловасці, зрабіўшы прадзільнае кола сімвалам нацыянальнага руху. У 1920—1930-я гг. Гандзі ажыццявіў серыю акцый негвалтоўнага характару супраць брытанскага праўлення, заклікаючы да байкоту англійскіх тавараў, асабліва тэкстыльных, і пераконваючы індыйцаў насіць адзенне з бавоўны, вырашчанай і вытканай толькі ў Індыі.

Кампаніі грамадзянскага непадпарадкавання атрымалі шырокую народную падтрымку. У выпадках, калі рух пратэсту прыводзіў да насілля і ахвяр, Гандзі глыбока засмучваўся. Ён устрымліваўся ад ежы, маліўся і заклікаў патрыётаў вучыцца кантраляваць свае пачуцці і дзеянні.

**Саляны паход.** У 1930 г. Гандзі заклікаў пакласці канец брытанскай салянай манаполіі ў Індыі. Падобна ранейшым правіцелям Індыі, брытанцы ўстанавілі сваё выключнае права на здабычу і продаж солі. Саляная манаполія дазваляла атрымліваць значныя сродкі, якія ішлі на ўтрыманне каланіяльнага апарату.

Для Гандзі гэтая ўрадавая манаполія была ўвасабленнем каланіяльнага зла, сімвалам брытанскага прыгнёту. У адрозненне ад іншых падаткаў падатак на соль ляжаў цяжарам на ўсім насельніцтве краіны, і перш за ўсё на яго самых бедных пластах. Таму Гандзі і выбраў гэты падатак мішэнню сваёй кампаніі.

У пачатку 1930 г. Гандзі пісаў брытанскаму віцэ-каралю Індыі, тлумачачы матывы і мэты сваіх дзеянняў. Заявіўшы пра свой намер адмяніць закон аб салянай



Правообладатель Народная асвета




Індыя ў 1929—1939 гг.

манаполіі, ён асудзіў брытанскае праўленне як «бедства»: «[Яно] давяло да галечы многія мільёны людзей сістэмай неабмежаванай эксплуатацыі... Яно звяло нас у палітычным дачыненні да рабскага ўзроўню. Яно падарвала асновы нашай культуры... і разлажыла нас духоўна».

Гістарычны *саляны паход* Гандзі пачаўся **12 сакавіка 1930 г.** На чале групы сваіх прыхільнікаў ён адправіўся да ўзбярэжжа Аравійскага мора, каб дэманстратыўна выпарваць там соль з марской вады. Натоўпы людзей горача віталі працэсію на ўсім яе амаль 400-кіламетровым шляху. Гандзі заклікаў паўсюль парушаць саляную манаполію, здабываючы соль самастойна. Людзі маліліся за поспех кампаніі, а некаторыя далучаліся да ўдзельнікаў паходу. Дасягнуўшы прыіска на ўзбярэжжы, Гандзі падняў кавалак саляной глыбы над галавой і абвясціў: «Тым самым я падрываю асновы Брытанскай імперыі». Саляны паход прыцягнуў увагу ўсёй Індыі, а таксама найбуйнейшых сусветных тэлеграфных агенцтваў.

Гандзі ўсяляк заахвочваў індыйцаў прытрымлівацца яго прыкладу. І хоць неўзабаве ён быў арыштаваны і заключаны ў турму, жыхары прыбярэжных раёнаў пачалі самастойна выпарваць соль з марской вады, а то і захопліваць яе на пры-



Правообладатель Народная асвета

ісках. Актывісты Нацыянальнага кангрэса прадавалі соль на гарадскіх вуліцах, дэманстравалі яе на шматлюдных мітынгах, іх арыштоўвалі і кідалі ў турмы. Нацыянальны кангрэс быў абвешчаны па-за законам. Па меры таго як кампанія Гандзі набірала сілу, дзясяткі тысяч індыйцаў прыгаворваліся да турэмнага зняволення.

**Канстытуцыя 1935.** Пад ціскам нацыянальна-вызваленчага руху быў прыняты закон аб кіраванні Індыяй, больш вядомы як «канстытуцыя 1935 г.». Гэты закон азначаў значны крок наперад па шляху да самакіравання Індыі, але і па дадзеным законе англічане захоўвалі за сабой вярхоўную ўладу ў краіне. Нядзіўна, што канстытуцыя 1935 г. выклікала незадаволенасць практычна ўсіх палітычных колаў. З іх ІНК найбольш рашуча выступаў за поўную незалежнасць Індыі.

Напярэдадні Другой сусветнай вайны дзейнасць Кангрэса стала набываць антымусульманскую афарбоўку. Гэтая акалічнасць выклікала ўзмацненне сепаратысцкага руху індыйскіх мусульман і іх усеіндыйскай арганізацыі — Мусульманскай Лігі. Кіраўніцтва Лігі апасалася, што калі ІНК прыйдзе да ўлады, то уладай з ёю не стане дзяліцца. Яе лідар Мухамед Алі Джына ўсё больш схіляўся да ідэі ўтварэння незалежнай дзяржавы мусульман на тэрыторыі Індыі.

**Індыя ў гады Другой сусветнай вайны.** У *верасні 1939 г.* англійскія ўлады абвясцілі Індыю ваюючай краінай. Велізарны цяжар вайны лёг на сотні мільёнаў людзей і ўзмацніў нянавісць народа да англійскіх каланізатараў. Індыя забяспечвала харчовым збожжам індыйскія і англійскія войскі, якія знаходзіліся на тэатры ваенных дзеянняў. У выніку цэны на рыс і пшаніцу ўнутры краіны выраслі ў 5 разоў. У Індыі пачаўся голад. У адной толькі Бенгаліі ў 1943 г. ад голаду памерла некалькі мільёнаў чалавек.

Нягледзячы на аб'яўленне Індыі ваюючай краінай і ўвядзенне рэжыму рэпрэсій, антыкаланіяльны рух не спыніўся і набыў вялікі размах і сілу. У 1940 г., пасля таго як Англія ўцягнула Індыю ў вайну без кансультацыі з Нацыянальным кангрэсам, яго лідары запатрабавалі ад каланіяльных улад даць краіне незалежнасць. Англічане праігнаравалі гэтае патрабаванне, пасля чаго Гандзі заклікаў да новай кампаніі грамадзянскага непадпарадкавання. Аднак каланіяльныя ўлады разграмілі распачатую кампанію ў зародку, арыштаваўшы 30 тыс. членаў Кангрэса, у тым ліку аднаго з лідараў ІНК *Джавахарлала Неру*. Новымі рэпрэсіямі сустрэлі англічане і масавы рух пратэсту ў 1942—1945 гг. Дзясяткі тысяч людзей былі прыгавораны да смяротнага пакарання, лік забітых дасягнуў 25 тыс. Усё гэта сведчыла аб крызісе брытанскага панавання ў Індыі.

**Культура і спосаб жыцця індыйцаў.** Паводле перапісу насельніцтва ў 1931 г., у Індыі пражывала 360 млн чалавек. Толькі 8 % ад іх ліку былі пісьменнымі, прычым адукацыя насіла рэлігійны і гуманітарны характар. Вялікі працэнт непісьменных быў абумоўлены беднасцю насельніцтва і недахопам школ.



Правообладатель Народная асвета



Р. Тагор і М. Гандзі

Нягледзячы на вельмі абмежаваныя магчымасці для навуковых даследаванняў, індыйскія вучоныя першай паловы XX ст. унеслі вялікі ўклад у сусветную навуку. Сярод іх асаблівае месца займае фізік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі (1930) *Ч. В. Раман*. Важная роля ў адкрыцці культуры Махенджа-Дара і Харапы ў 1920-х гг. належыць гісторыку *Р. Д. Банерджы*.

Найбуйнейшым пісьменнікам у Індыі быў *Р. Тагор*, які атрымаў Нобелеўскую прэмію ў 1913 г. Ён заклікаў індыйцаў да духоўнага самаўдасканалення, выступаў за нацыянальнае адраджэнне. У сваім родавым памесці Тагор адкрыў універсітэт мастацтваў, выпускнікі якога сталі вядомымі майстрамі ў многіх сферах культуры. Пасля Першай сусветнай вайны цэнтральнай тэмай індыйскай літаратуры становіцца барацьба за нацыянальную незалежнасць. У індыйскай прозе гэтага часу моцна адчуваліся ўплыў ідэй М. К. Гандзі і прабуджэнне цікавасці да жыцця сацыяльных нізоў.

У 1913 г. у Індыі пачалася вытворчасць фільмаў. Аднак экспансія заходнееўрапейскага і асабліва амерыканскага кіно пасля Першай сусветнай вайны тармазіла развіццё індыйскай кінематаграфіі. Выпускаліся ў свет галоўным чынам камерцыйныя фільмы на міфалагічныя сюжэты, а таксама меладрамы і псеўдагістарычныя фільмы. У краіне з'явілася вядомая ў галіне тэатра і кіно дынастыя Капураў. Яе заснавальнікамі лічацца *Прытхвірадж Капур* і яго сын *Радж Капур*, які здымаўся ў кіно з 1935 г.

Вялікую ролю ў паўсядзённым жыцці індыйцаў адыгрывалі рэлігійныя звычаі і традыцыі. Грамадства ў Індыі захоўвала традыцыйную абшчынна-каставую структуру, якая налічвала больш за 3 тыс. каст. Самымі бяспраўнымі былі «недатыкальныя» (яны не ўваходзілі нават у склад афіцыйных каст). Ім дазвалялася сяліцца толькі асобна на ўскраінах вёсак і гарадоў. Яны не маглі вучыцца ў школах разам з дзецьмі «чыстых» каст, ездзіць у адных вагонах, знаходзіцца ў рэстаранах і гасцініцах побач з іншымі індусамі, падыходзіць блізка да храмаў.

У адрозненне ад заможных пластоў грамадства большасць індыйцаў, асабліва сяляне, жылі ў глінабітных хацінах і карысталіся самым простым начыннем, зямлю апрацоўвалі з дапамогай сахі і матыкі. Сяляне вырошчвалі рыс і пшаніцу. У гарадах працоўны дзень рабочых доўжыўся 12 гадзін.

Аснову ежы індыйцаў складалі хлеб, рыс, малочныя прадукты, садавіна, гародніна, вострыя прыправы, арэхі. У большасці індыйцаў не было прынята есці га-



Правообладатель Народная асвета

вядзіну і свініну, а ў некаторых раёнах Індыі — рыбу і хатнюю птушку. Толькі невялікая колькасць індыйцаў у 1920—1930-х гг. засвоіла некаторыя бакі заходняга спосабу жыцця.

?

1. Чаму пасля Першай сусветнай вайны англійскі ўрад вымушаны быў уносіць пэўныя змяненні ў палітыку па кіраванні Індыяй? Якія былі прыняты законы? Якія былі наступствы прыняцця гэтых законаў?
2. Якія падзеі ў гісторыі Індыі атрымалі назву «Амрытсарская бойня»? Якія наступствы яна мела?
3. Ахарактарызуйце дзейнасць ІНК у 1918—1945 гг. Якое значэнне яна мела для разгортвання нацыянальна-вызваленчага руху ў Індыі?
4. Якое вучэнне стала ідэалогіяй індыйскага нацыянальна-вызваленчага руху? Якія яго асноўныя палажэнні? Дайце ацэнку палітычнаму дзеячу, які распрацаваў гэтае вучэнне.
5. З якой мэтай у 1935 г. быў прыняты новы закон аб кіраванні Індыяй? Чаму ён быў названы «рабскай канстытуцыяй»?

**Прапануем абмеркаваць.** М. Гандзі сцвярджаў: «Зброяй нельга атрымаць перамогу ні над нізкімі пачуццямі людзей, ні над іх узнёслымі ідэаламі». Негвалтоўнае супраціўленне з'яўлялася для М. Гандзі не толькі метадам дасягнення свабоды, але і шляхам пабудовы новага грамадства. Якія метады барацьбы для дасягнення свабоды і незалежнасці, рэвалюцыйныя або негвалтоўныя, уяўляюцца вам найбольш эфектыўнымі?

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Махандас Карамчанд Гандзі** (1869—1948), адзін з кіраўнікоў індыйскага нацыянальна-вызваленчага руху. Атрымаў юрыдычную адукацыю ў Англіі. Займаўся адвакацкай практыкай у Бамбеі, служыў юрысконсультам у Паўднёвай Афрыцы. Менавіта ў Паўднёвай Афрыцы (1893—1914) выпрацаваў тактыку негвалтоўнага супраціўлення, названую ім сацьяграхай. У гэты перыяд пазнаёміўся з працамі Л. М. Талстога, які аказаў на яго вялікі ўплыў і якога Гандзі лічыў сваім духоўным настаўнікам. Па вяртанні на радзіму (1915) стаў адным з вядучых лідараў нацыянальна-вызваленчага руху, ідэйным кіраўніком Індыйскага нацыянальнага кангрэса (ІНК). Народ празваў яго Махатмай («Вялікай душой»). У перыяд уздыму нацыянальна-вызваленчага руху ў Індыі (1919—1922) узначаліў кампанію негвалтоўнага несупрацоўніцтва з англійскімі ўладамі. Вёў барацьбу за ліквідацыю інстытута «недатыкальных». У гады новага ўздыму нацыянальна-вызваленчага руху (1929—1933) кіраваў кампаніяй грамадзянскага непадпарадкавання, накіраванай супраць брытанскай саляной манаполіі. Неаднаразова падвяргаўся арыштам і сядзеў у турмах, не раз аб'яўляў галадоўкі. Быў забіты членам індуісцкай экстрэмісцкай арганізацыі.



Правообладатель Народная асвета

## ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

**З кнігі М. Гандзі «Маё жыццё»**

Падрыхтоўваючы кампанію грамадзянскага непадпарадкавання, мы абмеркавалі два-тры пытанні. Было вырашана, што грамадзянскае непадпарадкаванне закране толькі тыя законы, якія масы самі схільны парушаць. Так, у вышэйшай ступені непапулярны быў саляны падатак, і зусім нядаўна праходзіў рух за яго адмену. Я прапанаваў, каб насельніцтва, ігнаруючы закон аб саляной манаполіі, само выпарвала соль з марской вады хатнім спосабам. Другая мая прапанова тычылася продажу забароненай літаратуры. Для гэтага спатрэбіліся толькі што забароненыя мае кнігі... Была надрукавана дастатковая колькасць экзэмпляраў і падрыхтавана для распродажу на грандыёзным мітынгу…

Увечары 6 красавіка цэлая армія добраахвотнікаў ўзялася за распродаж забароненых кніг... Кнігі былі распраданы хутка. Атрыманыя грошы меркавалася перадаць на падтрымку кампаніі грамадзянскага непадпарадкавання. Ні адзін чалавек не купіў кнігу за прызначаную цану...: кожны даваў больш; іншыя аддавалі за кніжку ўсё, што было ў кішэні... Мы папярэджвалі пакупнікоў, што іх могуць арыштаваць і пасадзіць у турму за куплю забароненай літаратуры. Але ў той момант людзі страцілі ўсялякі страх перад турмой.

# § 21. Японія

**Успомніце:** Чаму Японія, адзіная краіна ў Азіі, здолела ў канцы XIX ст. стаць на шлях паскоранага эканамічнага развіцця? Якія рашэнні былі прыняты на Вашынгтонскай канферэнцыі? Як яны адбіліся на становішчы Японіі?

Пачатак праўлення імператара *Хірахіта* ў 1926 г. быў адзначаны ўрачыстай цырымоніяй. Некалькі ганаровых удзельнікаў сабраліся ў Тайнай Пурпурнай Зале, іншыя высокапастаўленыя госці — у знешнім пакоі, маючы магчымасць чуць, але не бачыць імператара. Новы імператар безуважна сядзеў у Зале на старажытным троне Японіі, побач з ім — яго жонка імператрыца Нагако. З вялікай дбайнасцю імператар выканаў свяшчэнны рытуал ачышчэння, які налічваў тысячы гадоў. Заклікаючы да духаў сваіх продкаў, ён даў зарок «захоўваць усяленскі свет і садзейнічаць росквіту чалавечай расы». Пасля гэтага з кароткай прамовай выступіў прэм'ер-міністр, якую закончыў гучным воклічам «Няхай жыве 10 000 гадоў Яго Імператарская Вялікасць!». Ва ўнісон прагучалі гэтыя словы па ўсёй краіне. Мільёны японцаў традыцыйна жадалі доўгага і паспяховага праўлення новаму імператару.



Імператар Хірахіта



Правообладатель Народная асвета

Хірахіта правіў з **1926** па **1989 г.** На працягу гэтых дзесяцігоддзяў Японія зведала не толькі поспехі, але і трагедыі. У 1920—1930-я гг. пад уплывам крайняга нацыяналізму, эканамічных крызісаў і прыродных катаклізмаў Японія стала на мілітарысцкі і захопніцкі шлях развіцця, які прывёў краіну да сакрушальнага паражэння ў гады Другой сусветнай вайны.

**Праблемы японскай эканомікі.** Першая сусветная вайна ў значнай ступені стымулявала японскую прамысловасць і гандаль. Японія не толькі ішла ў фарватары палітыкі вялікіх дзяржаў, але і аказвала пэўны ўплыў на іх дзеянні ў Азіі, на Ціхім акіяне (у Аўстраліі, Новай Зеландыі) і ў Лацінскай Амерыцы. Яе прамысловая вытворчасць у 1919 г. перавысіла паказчыкі 1914 г. амаль у 5 разоў. Краіна, у прыватнасці, стала другім у свеце вытворцам баваўняных тканін, а яе гандлёвы флот заняў трэцяе месца ў свеце. Такі хуткі індустрыяльны рост яшчэ больш узмацняў дысбаланс паміж слабаразвітой сельскай гаспадаркай і досыць высокім узроўнем развіцця сучаснай прамысловасці, які існаваў дагэтуль.

За знешнім дабрабытам Японіі пасля Першай сусветнай вайны таіліся сур'ёзныя праблемы. У 1920-х гг. эканоміка расла павольней, чым у які-небудзь іншы час японскай мадэрнізацыі. Сяляне, у адрозненне ад гарадскіх жыхароў, практычна не адчувалі ўсіх выгод індустрыялізацыі. У гарадах завадскія рабочыя, якія атрымлівалі нізкую зарплату, станавіліся ўсё больш успрымальныя да сацыялістычных ідэй Маркса і Леніна. Таму калі яны атрымалі права голасу, то сацыялісты адразу былі выбраны ў парламент. У гарадах моладзь бунтавала супраць старых звычаяў і традыцый, усё больш успрымаючы заходнія ідэі і наваўвядзенні.

Японская прамысловасць у 1920-х гг. у асноўным канцэнтравалася ў *дзайбацу*. Гэта былі манапалістычныя аб'яднанні, фактычна пераўтвораныя ў індустрыяльныя і фінансавыя імперыі (Міцуі, Міцубісі, Ясуда, Сумітома). Дзейнасць дзайбацу была арыентавана перш за ўсё на экспарт, на барацьбу за рынкі збыту з тым, каб прыносіць валюту для забеспячэння краіны сельскагаспадарчай прадукцыяй і сыравінай першай неабходнасці. Але ўжо ў 1920 г. японскі гандаль, які дзякуючы вайне знайшоў новыя рынкі збыту сваіх тавараў, зноў сутыкнуўся з еўрапейскімі і амерыканскімі канкурэнтамі. Падзенне экспарту цяжка адбілася на японскай прамысловасці і прывяло да павелічэння беспрацоўя да 2 млн чалавек.

Гэтая праблема абцяжарвалася цыклічнымі эканамічнымі крызісамі і прыроднымі катастрофамі. Спачатку ў жніўні 1918 г. успыхнулі **«рысавыя бунты»**. Затым Японія пацярпела ад эканамічнай дэпрэсіі 1920—1921 гг., у прыватнасці рэзка ўпалі цэны на шоўк. У 1923 г. землетрасенне, якое выклікала велізарныя пажары ў Токіа і Іакагаме, прывяло да вялікіх ахвяр і разбурэнняў. У 1927 г. у Японіі адбылося ўсеагульнае банкруцтва банкаў, што справакавала закрыццё многіх прамысловых прадпрыемстваў або іх выкуп дзайбацу.



Правообладатель Народная асвета

**Палітычнае развіццё.** Пасля Першай сусветнай вайны ў Японіі ўсталявалася толькі бачнасць дэмакратычнага рэжыму. Парламент, які складаўся з дзвюх палат — палаты пэраў і палаты прадстаўнікоў, з 1925 г. выбіраўся ўсеагульным галасаваннем асоб мужчынскага полу. Але імператар валодаў усёй паўнатой выканаўчай улады, міністры былі адказныя выключна перад ім. Лічылася, што імператар з'яўляецца персонай боскага паходжання, аднак Хірахіта адыгрываў ва ўнутранай і знешняй палітыцы краіны непрыкметную ролю.

Фактычнай уладай у дзяржаве валодаў не імператар, не парламент, а дзве вельмі магутныя групы: дзайбацу і армія. Першая кантралявала не толькі эканоміку, але і прэсу, і палітычныя партыі, якія былі заснаваны на цесных сямейных сувязях. Партыя кансерватараў (*Сэйюкай*) знаходзілася пад кантролем фінансавай імперыі Міцуі, ліберальная партыя (*Мінсэйта*) — пад кантролем Міцубісі. Карупцыя, палітычныя забойствы і розныя махінацыі падчас выбараў былі паўсядзённай з'явай. Левыя, падзеленыя на камуністычную партыю (створана ў 1922 г.) і некалькі сацыялістычных партый, мелі абмежаваную падтрымку з боку рабочага класа, які па-ранейшаму знаходзіўся пад уплывам нацыяналістычна настроеных ваенных і дзайбацу.

Пасля Першай сусветнай вайны ў краіне памнажаліся ўльтранацыяналістычныя арганізацыі і тайныя таварыствы, якія складаліся з ваенных і актыўна выступалі за правядзенне палітыкі знешніх тэрытарыяльных захопаў.

**Нацыяналістычная рэакцыя.** Сусветны эканамічны крызіс 1929—1933 гг. з велізарнай сілай абрушыўся на Японію. Асабліва пацярпеў гандаль — гэты выратавальны якар краіны. Цэны на ўвесь экспарт упалі да мінімальна нізкага ўзроўню, гарады захліснула беспрацоўе, жыхары сельскай мясцовасці знаходзіліся на мяжы голаду.

Эканамічныя праблемы пачатку 1930-х гг. стварылі жыватворную глебу для незадаволенасці крайніх нацыяналістаў, або *ўльтранацыяналістаў*, асабліва сярод ваенных колаў. У гэты час на палітычную арэну выйшла так званае *«новае афіцэрства»*, якое адрознівалася па сваім сацыяльным складзе ад генералітэту. Ультранацыяналісты асуджалі палітычных дзеячаў краіны за тое, што яны, уступаючы патрабаванням заходніх дзяржаў, прыпынілі знешнепалітычную экспансію. «Вялікія індустрыяльныя дзяржавы ўжо даўно стварылі вялікія каланіяльныя імперыі. У параўнанні з імі японская імперыя выглядае малюсенькай», — аргументавалі яны. Акрамя таго, японскія нацыяналісты былі вельмі незадаволены расавай палітыкай у ЗША, Канадзе і Аўстраліі, дзе ўлады ўсяляк перашкаджалі ўезду японскіх імігрантаў. Японцы глыбока ганарыліся дасягненнямі сваёй сучаснай індустрыяльнай дзяржавы і абураліся, калі з імі абыходзіліся як з грамадзянамі другога сорту.

Па меры абвастрэння эканамічнага крызісу ў краіне нацыяналісты патрабавалі аднаўлення знешнепалітычнай экспансіі. Японская каланіяльная імперыя ў



Правообладатель Народная асвета

Азіі, лічылі яны, забяспечыць эканоміку гэтак неабходнай сыравінай і матэрыяламі, а таксама каналам міграцыі для насельніцтва Японіі, якое хутка павялічвалася.

**Мілітарысты ва ўладзе.** Да пачатку 1930-х гг. ультранацыяналісты атрымалі падтрымку шырокіх пластоў насельніцтва для правядзення агрэсіўнай знешняй палітыкі. Члены «патрыятычных» арганізацый забівалі палітычных дзеячаў і лідараў бізнесу, якія выступалі супраць ваеннай экспансіі. Мілітарысцкая група «Маладыя афіцэры» склала змову з мэтай устаранення ўрада, і ў 1936 г. на кароткі час захапіла цэнтр Токіа. Аднак яе выступленне не было падтрымана арміяй, і путч быў падаўлены.

Грамадзянскі ўрад такім чынам застаўся ва ўладзе, але ён быў вымушаны змірыцца з панаваннем у краіне ваенных. Каб супакоіць ультранацыяналістаў, урад абрушыўся з ганеннямі на сацыялістаў і паклаў канец большасці дэмакратычных свабод. У краіне шырока прапагандаваўся кодэкс гонару самурая і ўзмацняўся культ імператара.

У 1940 г. японскі генералітэт узвёў на пасаду прэм’ер-міністра прынца **Каноэ Фумімара** — ідэолага мілітарысцкіх колаў. Найбольш важныя пасады ва ўрадзе былі аддадзены прадстаўнікам канцэрнаў цяжкай прамысловасці. У краіне былі распушчаны ўсе палітычныя партыі. Адзінай афіцыйнай арганізацыяй, якая аб’ядноўвае нацыю, прызнавалася *«Асацыяцыя дапамогі трону»*.

**Знешняя палітыка Японіі.** У 1927 г. кіраўніком урада Японіі стаў генерал **Танака Гііці**, які быў блізкі да ваенных ультранацыяналістычных колаў. Генерал актыўна праводзіў захопніцкую знешнюю палітыку. У *1927 г.* на сустрэчы прадстаўнікоў арміі, манаполій і дыпламатаў быў прыняты *«мемарандум Танака»*, які прадстаўляў сабой план заваёвы Японіяй сусветнага панавання ў сем этапаў (Маньчжурыя, Манголія, Кітай, савецкі Далёкі Усход, краіны Паўднёвых мораў, Еўропа, ЗША).



Японскія войскі ў Маньчжурыі. 1931 г.

На працягу 1930-х гг. Японія скарысталася грамадзянскай вайной у Кітаі, каб узмацніць у ёй свой уплыў. У *1931 г.* група ваенных афіцэраў справакавала інцыдэнт, які стаў падставай для захопу Маньчжурыі. Без кансультацыі са сваім урадам японская армія захапіла ўсю правінцыю і ў 1932 г. стварыла марыянетачную дзяржаву, якая атрымала назву *Маньчжоу-Го* на чале з апошнім кітайскім імператарам *Пу І*. Калі ж Ліга Нацый асудзіла японскую агрэсію, Японія проста выйшла з гэтай арганізацыі. Па-



Правообладатель Народная асвета




Японія ў 1931—1939 гг.

літыкі ў Токіа выступілі супраць аднабаковых дзеянняў арміі, але грамадская думка была на баку ваенных. У *1937 г.* японская ваеншчына распаўсюдзіла агрэсію на астатні Кітай. У *1938—1939 гг.* японская армія выпрабавала на трываласць савецкую абарону на *возеры Хасан* і каля *ракі Халхін-Гол*. У гэты ж час склалася агрэсіўная «вось Берлін — Рым — Токіа». Японская ваеншчына распрацавала планы вядзення вайны супраць СССР. Аж да жніўня 1939 г. усе заходнія дзяржавы падштурхоўвалі Японію да агрэсіі ў паўночным накірунку, да гэтага ж схіляліся і ў Токіа.

Аднак заключэнне савецка-германскага дагавора аб ненападзенні без паведамлення Берлінам Токіа прымусіла японскае кіраўніцтва перагледзець свае захопніц-



Правообладатель Народная асвета

кія планы. Японія не збіралася ваяваць з СССР у адзіночку. Атрымаўшы ўрокі Хасана і Халхін-Гола, яна пачала рыхтавацца да вайны супраць заходніх дзяржаў ва Усходняй Азіі. **5 красавіка 1941 г.** без папярэдняга паведамлення Берліна Японія падпісала дагавор аб нейтралітэце з СССР і тым самым забяспечыла сабе тылы з поўначы.

**Японія ў Другой сусветнай вайне.** Пасля разгрому Германіяй Францыі і Галандыі ў пачатковы перыяд Другой сусветнай вайны японцы прыступілі да заваявання іх калоній у Паўднёва-Усходняй Азіі. Яны падпарадкавалі сабе Малаю, Бірму, Тайланд, Філіпіны, здзейснілі агрэсію супраць ЗША, напаўшы на Пёрл-Харбар **у снежні 1941 г.** Практычна не сустракаючы сур'ёзнага супраціўлення амерыканцаў і еўрапейцаў, Японія паставіла пад свой кантроль велізарныя мацерыковыя і ціхаакіянскія тэрыторыі агульнай плошчай 10 млн км$^2$ з насельніцтвам 400 млн чалавек. Увасабленнем японскага мілітарызму і шавінізму ў гады вайны быў генерал *Тодзіа*, заўзяты мілітарыст і шавініст.

У параўнанні са сваімі праціўнікамі японскі мілітарызм валодаў вельмі сціплым ваенна-эканамічным патэнцыялам, але спадзяваўся на раптоўнасць і раз'яднанасць інтарэсаў ЗША, Вялікабрытаніі і СССР. У ходзе Другой сусветнай вайны заходнія дзяржавы вызначылі галоўным еўрапейскі тэатр ваенных дзеянняў. Прыняцце рашучых мер супраць Японіі было адкладзена імі на перыяд пасля капітуляцыі Германіі. Таму вайна на Ціхім акіяне зацягнулася на чатыры гады. Такім чынам, лёс Японіі вырашаўся на франтах Еўропы.

У **жніўні 1945 г.** у вайну на Ціхім акіяне ўступіў СССР. Разгром найбуйнейшай групоўкі японскіх сухапутных войскаў у Манчжурыі прымусіў Японію капітуляваць. У звароце імператара Японіі да народа 15 жніўня 1945 г. у сувязі з капітуляцыяй гаварылася: «Мы прайгралі, але толькі часова. Памылка Японіі заключалася ў недахопе матэрыяльнай сілы, навуковых ведаў і ўзбраення. Гэтую памылку мы выправім».

**Культура Японіі.** Пасля Першай сусветнай вайны Японія стала краінай усеагульнай пісьменнасці і высокага ўзроўню развіцця навукі і тэхнікі. Абавязковым для ўсіх японцаў з'яўлялася навучанне ў 6-гадовай малодшай пачатковай школе. Асаблівасцю японскай адукацыі была наяўнасць развітой сеткі розных універсітэтаў. Найбольш аўтарытэтнымі з'яўляліся 5 імператарскіх і 12 урадавых універсітэтаў. Акрамя іх, існавалі прыватныя ўніверсітэты. Выхаванне вучняў у школах ажыццяўлялася ў духу мілітарызму, шавінізму і нацыяналізму.

Як адукацыя, так і мастацкая культура Японіі 1920—1930-х гг. былі прасякнуты ідэямі нацыянальнага адзінства, вялікай місіі японскай нацыі. Культура гэтага часу ў поўнай меры адлюстравала станаўленне ваенна-фашысцкай Японіі і агрэсіўнага знешнепалітычнага курсу. У 1937 г. было створана ўпраўленне інфармацыі для нагляду за культурным жыццём краіны. Па загадзе ўпраўлення арганізоўваліся



Правообладатель Народная асвета

«атрады воінаў пяра», якія накіроўваліся ў дзеючую армію. Пісьменнікі, мастакі, артысты павінны былі праслаўляць «свяшчэнную вайну», самурайскія подзвігі, агрэсію Японіі ў Азіі. Мастак Ікоса напісаў сваёй крывёю партрэт першага японскага імператара Дзіму, міфічнага продка ўсіх японскіх імператараў. Яскравым прыкладам праслаўлення «свяшчэннай вайны» была трылогія Асіхэй Хіна «Хлеб і салдаты», «Зямля і салдаты», «Кветкі і салдаты».

Прадстаўнікі перадавых колаў японскай інтэлігенцыі рабілі спробы пераасэнсаваць праблемы вывучэння гісторыі краіны, у прыватнасці паказаць ролю народных мас, сацыяльна-эканамічныя перадумовы рэвалюцыі Мэйдзі 1867—1868 гг., якая аднавіла ўладу імператараў, і іншыя найважнейшыя гістарычныя падзеі. Аднак у 1930-я гг. гэтыя вучоныя практычна пазбавіліся магчымасці выказваць свае погляды, паколькі нават нязначныя адступленні ад афіцыйных канонаў строга караліся.

У жывапісе склаліся два напрамкі — традыцыйны і еўрапейскі. Майстры традыцыйнага стылю працягвалі развіваць прынцыпы сярэдневяковага дэкаратыўнага пейзажнага жывапісу. Творчасць майстроў алейнага жывапісу, якія навучаліся за мяжой, фарміравалася пад уплывам еўрапейскага мастацтва. Усё большы ўплыў на выяўленчае мастацтва Японіі аказвалі кубізм, сюррэалізм і іншыя мадэрнісцкія плыні.

У 1920—1930-я гг. інтэнсіўна развіваліся класічныя тэатры *ноа* і *кабукі*. Узнікла японская нацыянальная кінематаграфія. Асаблівасці японскіх фільмаў заключаліся ў тым, што жаночыя ролі ігралі мужчыны, кінастужкі змяшчалі працяглы агульны план, асобую кампазіцыю кадраў.

?

1. У чым заключаліся праблемы развіцця эканомікі Японіі пасля Першай сусветнай вайны?
2. Ахарактарызуйце палітычную сістэму Японіі, якая склалася пасля Першай сусветнай вайны. Пакажыце яе ў выглядзе схемы.
3. Як сусветны эканамічны крызіс 1929—1933 гг. адбіўся на сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці краіны?
4. Чаму ў Японіі ў пачатку 1930-х гг. узмацніўся ўплыў ваенных? Што прывяло да ўзмацнення агрэсіўных тэндэнцый у знешняй палітыцы Японіі ў гэты перыяд? Чаму Японія імкнулася да правядзення захопніцкай палітыкі? Прывядзіце прыклады агрэсіўнай знешняй палітыкі Японіі.
5. Як у 1930-х гг. складваліся адносіны Японіі з Германіяй і Савецкім Саюзам? Чаму Японія заключыла з СССР дагавор аб нейтралітэце?
6. Чаму ў гады Другой сусветнай вайны Японія здолела захапіць вялікую тэрыторыю ў Азіі? Чым скончылася вайна на Ціхім акіяне для Японіі? Чаму?
7. Якія асноўныя тэндэнцыі можна вылучыць у развіцці культуры Японіі 1920—1930-х гг.?



Правообладатель Народная асвета

## ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

**З кнігі «Гісторыя вайны на Ціхім акіяне»**

Жорсткі ваенны кантроль быў усталяваны ў Японіі ў галіне ідэалогіі, культуры і забаў. Узмацнілася цэнзура над друкам, стала ажыццяўляцца прамое ўмяшанне ў работу выдавецтваў... Было забаронена займацца літаратурнай дзейнасцю пісьменнікам Міямота Юрыка і Накана Сігэхару. Пазней шэраг прагрэсіўных пісьменнікаў і іншых дзеячаў культуры быў кінуты ў турмы.

...у Японіі па прыкладзе нацысцкай Германіі быў прыняты «Закон аб кінафільмах» і ўстаноўлены кантроль у галіне музыкі і тэатра... «Закон аб кінафільмах»... забараняў паказ ценявых бакоў жыцця грамадства... Гэты закон патрабаваў стварэння галоўным чынам фільмаў нацыяналістычнага характару, якія заклікалі «звязаць лёс народа з лёсам дзяржавы»...

Узмацніўся дзяржаўны кантроль і над рэлігіяй. На будаўніцтва і рэканструкцыю сінтаісцкіх храмаў асігнаваліся велізарныя сумы, тады як іншыя рэлігіі выкараняліся...

У жніўні 1936 года ў Берліне адкрыліся XI Алімпійскія гульні. Японія... па прыкладзе нацысцкай Германіі выкарыстала гэтыя гульні для распальвання ў народзе нацыяналістычных настрояў. Пасля Алімпійскіх гульняў у Японіі сталі надаваць сур'ёзнае значэнне спорту як сродку выхавання з моладзі «здаровых салдат». Па ўсёй краіне пачалі праводзіцца розныя спартыўныя спаборніцтвы. Моладзь навучалі біцца на доўгіх драўляных мячах і да т. п.

У 1938 годзе была ўведзена сістэма абавязковага навучання, якая прадугледжвала прыцягненне да вучобы ў школах больш за 80 працэнтаў японскіх дзяцей. Увядзенне сістэмы абавязковага навучання ставіла за мэту далучыць дзяцей да справы «ўзмацнення абараназдольнасці краіны» шляхам ваеннага навучання і ўдзелу ў «развіцці вытворчасці і пашырэнні прадукцыйных сіл»...

З 1 верасня 1939 года ў Японіі першае чысло кожнага месяца было абвешчана «днём служэння росквіту Азіі»... Паўсюль выконваўся «Патрыятычны марш», санкцыянаваны інфармацыйным бюро кабінета міністраў...

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Танака Гііці** (1863—1929), японскі дзяржаўны і палітычны дзеяч. З верасня 1918 да чэрвеня 1921 г. і з верасня 1923 да студзеня 1924 г. — ваенны міністр. Быў адным з галоўных кіраўнікоў японскай ваеннай інтэрвенцыі на савецкім Далёкім Усходзе. У 1925 г. выйшаў у адстаўку, стаў лідарам партыі Сэйюкай. З красавіка 1927 да ліпеня 1929 г. — прэм'ер-міністр, міністр замежных спраў і міністр калоній. Зрабіў дзве спробы (1927, 1928) ваеннага



Правообладатель Народная асвета

ўварвання ў кітайскую правінцыю Шаньдун, якія скончыліся правалам. Праводзіў крайне рэакцыйную ўнутраную палітыку. З яго імем звязваюць сакрэтны дакумент (так званы «мемарандум Танака») па пытаннях знешняй палітыкі Японіі, які быў прадстаўлены ў ліпені 1927 г. японскаму імператару і адкрыта абвяшчаў асновай знешняй палітыкі Японіі агрэсію супраць Кітая, СССР і іншых краін з наступным заваяваннем сусветнага панавання. Адносна дакладнасці гэтага дакумента ў некаторых гісторыкаў маюцца сумненні.



**Каноэ Фумімара** (1891—1945), прынц, японскі дзяржаўны дзеяч. У 1933—1937 гг. — старшыня палаты пэраў. З чэрвеня 1937 да студзеня 1939 г. — прэм'ер-міністр Японіі. У 1937 г. урад Каноэ распачаў вайну за захоп Кітая, у 1938 г. арганізаваў узброены напад на СССР у раёне возера Хасан. У 1938 г. Каноэ пад лозунгам пабудовы «новага парадку» ў Азіі абвясціў палітыку агрэсіі Японіі ў гэтым рэгіёне. З ліпеня 1940 да кастрычніка 1941 г. зноў займаў пасаду прэм'ер-міністра. Пасля роспуску палітычных партый стаў арганізатарам і першым прэзідэнтам «Асацыяцыі дапамогі трону». У верасні 1940 г. урад Каноэ падпісаў дагавор аб агрэсіўным саюзе з Германіяй і Італіяй. Пасля капітуляцыі Японіі ў Другой сусветнай вайне скончыў жыццё самагубствам.

## ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**«Рысавыя бунты»** — масавыя сацыяльныя хваляванні, якія пракаціліся па Японіі з ліпеня па кастрычнік 1918 г. Непасрэднай падставай да выступленняў паслужыла спекулятыўнае павышэнне ўладамі цэн на рыс — галоўны прадукт харчавання японцаў. Бунт пачаўся з маніфестацыі жонак рыбакоў невялікага пасёлка ў паўночнай частцы прэфектуры Таяма, якія запатрабавалі спынення вывазу рысу на экспарт і продажу яго па патанненых цэнах унутры краіны. Неўзабаве рух ахапіў $^{2}/_{3}$ тэрыторыі Японіі з колькасцю ўдзельнікаў каля 10 млн чалавек. Рух распаўсюдзіўся на буйныя гарады, шахты і руднікі, сталеліцейныя заводы і суднабудаўнічыя верфі. Удзельнікі бунтаў спальвалі і разбуралі склады і дамы гандляроў, якія адмаўляліся прадаваць рыс па патанненай цане, памяшканні паліцэйскіх участкаў, дамы буйных фабрыкантаў. На падаўленне бунту ўрад накіраваў войскі. Было арыштавана больш за 8 тыс. чалавек. У той жа час урад быў вымушаны асігнаваць 10 млн іен для забеспячэння продажу рысу па патанненых цэнах.



Правообладатель Народная асвета

## § 22. Мусульманскі свет

**Успомніце:** У якіх мусульманскіх краінах да Першай сусветнай вайны адбыліся рэвалюцыі? Якія былі іх вынікі?

Пасля Першай сусветнай вайны амаль усе краіны мусульманскага свету апынуліся ў рознай ступені залежнасці ад еўрапейскіх дзяржаў.

**Турцыя.** Паражэнне ў Першай сусветнай вайне паставіла Турцыю на мяжу страты свайго суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці. Краіна была акупіравана англійскімі, італьянскімі і грэчаскімі войскамі. У *жніўні 1920 г.* лідары Антанты навязалі султану *Сеўрскі мірны дагавор*, паводле якога Турцыя, па сутнасці, дзялілася паміж Англіяй, Францыяй, Італіяй і Грэцыяй. У гэтых умовах вызваленчую барацьбу турэцкага народа ў 1919—1923 гг. узначаліў генерал **Мустафа Кемаль**.

Цаною велізарных ахвяр Кемалю ўдалося атрымаць перамогу над «халіфацкай арміяй» султана Мехмета VI і войскамі інтэрвентаў. *1 лістапада 1922 г.* Вялікі нацыянальны сход Турцыі (ВНСТ) прыняў закон аб скасаванні султанату. У *красавіку 1923 г.* была створана новая палітычная арганізацыя — Народная партыя, пазней перайменаваная ў *Народна-рэспубліканскую партыю* (НРП). **23 кастрычніка 1923 г.** Турцыя была абвешчана рэспублікай. Гэтымі актамі завяршыўся працэс злому старой палітычнай сістэмы і стварэння турэцкай нацыянальнай дзяржавы, які атрымаў назву **кемалісцкай рэвалюцыі**.

У другой палове 1920-х — 1930-я гг. у краіне ажыццяўлялася палітыка мадэрнізацыі ў розных сферах культурнага, сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця. У *сакавіку 1924 г.* быў ліквідаваны халіфат, скасоўвалася міністэрства па справах рэлігій, былі закрыты медрэсэ (мусульманскія вышэйшыя і сярэднія школы), з распараджэння духавенства выключалася судаводства. Уводзілася новае адміністрацыйнае дзяленне на губерні, непасрэдна падначаленыя цэнтру. Гэтыя рэформы ляглі ў аснову першай рэспубліканскай канстытуцыі, якая была прынята **20 красавіка 1924 г.** і афарміла панаванне нацыянальнай буржуазіі і звязаных з ёю памешчыкаў. У краіне ўсталёўваўся аднапартыйны рэжым НРП. У 1925—1928 гг. былі прыняты новыя, на еўрапейскі ўзор, крымінальны і грамадзянскі кодэксы. Было забаронена мнагажонства. Уводзіўся еўрапейскі каляндар, еўрапейскае адзенне, новы лацінскі алфавіт змяніў ранейшы арабскі. У *1934 г.* быў выдадзены закон аб увядзенні прозвішчаў. Мустафа Кемаль прыняў прозвішча Ататюрк, якое азначае «Бацька турак».

Галоўным зместам эканамічнай палітыкі стаў *этатызм*, які ўяўляў сабой форму дзяржаўнага рэгулявання эканамічнага жыцця краіны. Дзяржава ўкладвала сродкі ў прамысловасць, чыгуначны транспарт, а затым і ў іншыя галіны гаспадаркі. Адначасова заахвочвалася прыватная ініцыятыва.



Правообладатель Народная асвета

Этатызм паскорыў працэс першапачатковага накаплення капіталу, садзейнічаў эканамічнаму развіццю краіны. У 1920—1930-я гг. узніклі прадпрыемствы харчовай і лёгкай прамысловасці, пашырылася чыгуначная сетка, павялічыўся знешні гандаль. У 1938 г. у краіне быў пабудаваны першы металургічны камбінат. Эканамічны ўздым, які намеціўся, умацаваў становішча нацыянальнай буржуазіі і дазволіў прыступіць да ажыццяўлення рэформ у сацыяльна-палітычнай сферы.



Турцыя ў 1919—1923 гг.

У ходзе буржуазных рэформ канчаткова аформілася ідэалогія **кемалізму** (або *атацюркізму*) — адной з плыняў турэцкага буржуазнага нацыяналізму. Яе асноўнымі прынцыпамі абвяшчаліся: рэспубліканізм; нацыяналізм; этатызм (развіццё дзяржаўнага прадпрымальніцтва і пратэкцыянізму); лаіцызм (аддзяленне ісламу ад дзяржаўных спраў і народнай адукацыі); адзінства турэцкага народа, якое адмаўляла наяўнасць класаў і класавай барацьбы ў Турцыі; рэвалюцыйнасць, якая азначала вернасць кемалісцкім ідэям і рэформам.

Да канца 1930-х гг. кемалісцкая ўлада набыла рысы аднапартыйнага аўтарытарнага рэжыму на чале з прэзідэнтам Атацюркам, а пасля яго смерці ў 1938 г. на чале з прэзідэнтам *Ісметам Іненю*. Вялікі нацыянальны сход Турцыі прадстаўляў не народ, а кіруючую партыю. Былі забаронены ўсе астатнія палітычныя партыі. Рабочыя не маглі ствараць прафсаюзы, пазбаўляліся права баставаць. Левая апазіцыя ўсяляк душылася, з падполля амаль не выходзіла Камуністычная партыя Турцыі.

З пачаткам Другой сусветнай вайны Турцыя заявіла аб сваім нейтралітэце. Але пры гэтым заляцалася то з дзяржавамі «восі Берлін — Рым — Токіа», то з саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі. Толькі ў лютым 1945 г. яна аб’явіла вайну Германіі і Японіі.



Правообладатель Народная асвета



Рэза-хан Пехлеві

**Іран.** Асаблівасцю нацыянальна-вызваленчага руху ў Іране была барацьба ўсіх патрыятычных сіл супраць уплыву Вялікабрытаніі і Расіі ў краіне. Пасля акупацыі тэрыторыі Ірана англійскімі войскамі (1918) пачалося ўзброенае супраціўленне інтэрвентам. Да ўлады ў *1925 г.* прыйшоў *Рэза-хан*, заснавальнік новай шахскай дынастыі *Пехлеві*. Пасля ўстанаўлення рэжыму асабістай дыктатуры шаха ў краіне пачаліся рэформы, накіраваныя на мадэрнізацыю дзяржавы і кансалідацыю нацыі. Але пастаянная барацьба паміж прыхільнікамі манархіі і іранскай буржуазіяй прывяла да таго, што ў Іране ўзмацніўся ўплыў эканамічна больш развітых краін.

**Дасягненне незалежнасці Афганістанам.** Да пачатку XX ст. Афганістан з'яўляўся краінай, часткова залежнай ад Вялікабрытаніі, якая мела права кантраляваць яго знешнюю палітыку. У гады Першай сусветнай вайны кіруючыя колы Афганістана прытрымліваліся палітыкі нейтралітэту. Аднак частка насельніцтва зведвала пранямецкія і пратурэцкія сімпатыі.

У сакавіку 1919 г. на афганскі трон уступіў патрыятычна настроены *Аманула-хан*. Новы эмір запатрабаваў ад Вялікабрытаніі аднаўлення поўнай незалежнасці Афганістана. Англійскі ўрад адказаў адмовай, пагражаючы ваеннымі дзеяннямі. У гэтыя цяжкія для Афганістана дні Савецкая Расія першай прызнала незалежнасць афганскай дзяржавы. У сваю чаргу эмір Аманула-хан першым прызнаў незалежнасць Савецкай Расіі.

У *маі 1919 г.* Вялікабрытанія развязала трэцюю захопніцкую вайну супраць Афганістана. Ваенныя дзеянні складваліся не на карысць англічан, пачаліся перагаворы, і ў *жніўні 1919 г.* Вялікабрытанія прызнала незалежнасць Афганістана. 28 лютага 1921 г. быў падпісаны савецка-афганскі дагавор аб дружбе, пасля чаго паднялася хваля прызнання незалежнасці Афганістана іншымі дзяржавамі.

Афганскі ўрад прыступіў да правядзення рэформ, накіраваных на ліквідацыю палітычнай адсталасці краіны. Найважнейшым пераўтварэннем з'явілася прыняцце ў *1923 г.* першай у гісторыі Афганістана канстытуцыі. Эмір аб'яўляўся носьбітам вярхоўнай улады з выразным абазначэннем уладных паўнамоцтваў. Упершыню дэклараваліся некаторыя грамадзянскія свабоды — свабода друку, права на адукацыю, роўнасць усіх падданых перад шарыятам і дзяржаўнымі законамі, недатыкальнасць жылля. Іслам абвяшчаўся дзяржаўнай рэлігіяй, адмяняліся сярэдневяковыя ўстанаўленні — рабства, катаванні, феадальныя паборы і павіннасці, прымусовая праца і інш.



Правообладатель Народная асвета

У 1920-я гг. назіралася інтэнсіўнае эканамічнае развіццё краіны. З'явілася некалькі прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку гарбарна-абутковая фабрыка, завод бяздымнага пораху, запалкавая фабрыка, прадзільная і ткацкая фабрыкі, прадпрыемствы па вытворчасці алею. Пачалося будаўніцтва тэлеграфных ліній і электрастанцый. У гады праўлення Аманулы-хана была ўведзена абавязковая пачатковая адукацыя, адкрыліся 3 ліцэі і некалькі прафесійных школ. Прыкметныя змены адбываліся ў культурным жыцці краіны. У Кабуле адкрыўся першы кінатэатр, былі створаны Нацыянальны музей Афганістана і Нацыянальная публічная бібліятэка.

Рэформы Аманулы-хана натыкнуліся на ўпартае процідзеянне кансерватыўных пластоў грамадства — вярхоў мусульманскіх багасловаў, ханаў плямён, феадальных землеўладальнікаў. Эмір-рэфарматар быў абвешчаны бязбожнікам. У краіне ўспыхнулі антыўрадавыя паўстанні, якія перараслі ў грамадзянскую вайну. У 1929 г. Аманула-хан адрокся ад прастола і пакінуў краіну.

Сітуацыя ў Афганістане стабілізавалася толькі пасля прыходу да ўлады ваеннага міністра генерала *Надзір-хана*, які абвясціў сябе каралём і з крайняй асцярожнасцю прадоўжыў пачатыя рэформы. Пасля смерці Надзір-хана ў 1933 г. каралём стаў яго сын *Мухамед Захір-шах*, пры якім захаваўся ранейшы курс развіцця краіны. З пачаткам Другой сусветнай вайны ў Еўропе ў 1939 г. Афганістан аб'явіў аб сваім нейтралітэце.

**Егіпет.** У Паўночнай Афрыцы нацыянальна-вызваленчы рух у 1919—1939 гг. набыў найбольшы размах у Егіпце, які быў акупіраваны Англіяй яшчэ ў 1882 г.

Пасля Першай сусветнай вайны ў Егіпце пачаўся новы этап вызваленчага руху. Асаблівасцю егіпецкага нацыяналізму стаў так званы *фараанізм* — услаўленне эпохі Старажытнага Егіпта, асабліва пасля адкрыцця грабніцы Тутанхамона ў 1922 г. Барацьбу за незалежнасць узначаліла буржуазная партыя «Егіпецкая дэлегацыя» — *Вафд*. Два буйныя паўстанні ў 1919 і 1921 гг., хаця і былі жорстка задушаны, прадэманстравалі хісткасць становішча англічан у Егіпце. У *лютым 1922 г.* Англія вымушана была падпісаць дэкларацыю аб прадастаўленні незалежнасці (шмат у чым фармальнай) Егіпту, але пры ўмове захавання ў ім сваіх войскаў. Паводле канстытуцыі *1923 г.* Егіпет стаў канстытуцыйнай манархіяй. Аднак англічане яшчэ доўгі час захоўвалі свае пазіцыі ў гэтай краіне.

**Асаблівасці культурнага развіцця і спосабу жыцця ў краінах мусульманскага свету.** Духоўную аснову мусульманскай цывілізацыі складае іслам з верай у адзінага, вечнага, справядлівага, міласцівага, міласэрнага Алаха. У першай палове XX ст. у ісламе вылучыліся два асноўныя напрамкі: фундаменталізм і рэфармізм, якія сталі аказваць вялікі ўплыў на развіццё культуры.



Правообладатель Народная асвета

**Фундаменталісты** выступалі за захаванне і перанясенне ў цяперашні час асноўных (фундаментальных) прынцыпаў ісламу часоў Мухамеда і першых халіфаў. Яны лічылі, што грамадскія змяненні не павінны супярэчыць традыцыйным ісламскім каштоўнасцям і спосабу жыцця. **Рэфармісты** імкнуліся знайсці шляхі прыстасавання ісламу да сучаснага свету, выступалі за адмову ад састарэлых прадпісанняў, падкрэслівалі ролю навукі і тэхнікі, дапускалі магчымым спалучэнне ісламу з ліберальнымі, сацыялістычнымі і іншымі ідэямі Захаду. Рэфармісты з'яўляліся прыхільнікамі свецкай дзяржавы, а фундаменталісты — ісламскай дзяржавы.

У канцы 1920-х — пачатку 1930-х гг. у мусульманскім свеце пачалося прыкметнае ўзрастанне ролі фундаменталісцкай плыні. Гэта было абумоўлена перш за ўсё тым, што рэфарміісцкія, ліберальныя, дэмакратычныя і рэвалюцыйныя сілы не здолелі пасля Першай сусветнай вайны дабіцца поўнай нацыянальнай незалежнасці і вырашыць набалелыя сацыяльныя праблемы (галеча, беспрацоўе, беззямелле, эксплуатацыя з боку заходніх краін).

У галіне адукацыі мусульманскі свет значна адставаў ад Захаду. Аднак у 1930-я гг. узровень пісьменнасці тут павысіўся. У некаторых краінах сталі адкрывацца навучальныя ўстановы еўрапейскага тыпу, у тым ліку і для жанчын.

У мастацкай культуры мусульманскага свету 1920—1930-х гг. адлюстраваліся праблемы нацыянальна-вызваленчага руху, яго супярэчлівы і складаны характар. Напрыклад, егіпецкія пісьменнікі-рэалісты ў сваіх творах выказвалі ідэі егіпецкага нацыяналізму і фараанізму. Егіпецкі скульптар *М. Мухтар* стварыў шэраг работ: помнік «Абуджэнне Егіпта», скульптурны партрэт «Зорка Усходу» спявачкі і актрысы *Ум Кульсум*, якія выклікалі хвалю патрыятычнага ўздыму ў асяроддзі інтэлігенцыі.

Паўсядзённае жыццё мусульман па-ранейшаму рэгуляваў шарыят — збор прававых і маральных норм паводзін, заснаваных на Каране. У адпаведнасці з імі мусульманін абавязаны маліцца пяць разоў на дзень, падаваць міласціну бедным, здзейсніць **хадж** — паломніцтва ў Мекку і г. д. Увесь спосаб жыцця мусульман непарыўна звязаны з прадпісаннямі Карана і традыцыямі.

Узровень жыцця большасці мусульман быў вельмі нізкім. Прылады працы сялян заставаліся прымітыўнымі — саха, плуг, матыка, серп. Ірыгацыйныя збудаванні былі традыцыйнымі — каналы і арыкі. Фелахі (сяляне) вырошчвалі пераважна пшаніцу, рыс і кукурузу, а таксама бавоўну, гародніну, садавіну. Аснову гаспадаркі бедуінаў-качэўнікаў складала жывёлагадоўля. Аднак развіццё капіталізму падарвала качавую гаспадарку. Жалезныя дарогі, шасэ, аўтатранспарт, танныя тавары зрабілі непатрэбнымі ўючныя перавозкі грузаў, ускладнілі збыт воўны, скуры і іншых прадуктаў жывёлагадоўлі. Сотні тысяч качэўнікаў перайшлі да аселага спосабу жыцця.



Правообладатель Народная асвета

?

1. Дайце абагульненую характарыстыку краін мусульманскага свету пасля Першай сусветнай вайны.
2. Выкарыстоўваючы карту (с. 141), пакажыце, як былі вызначаны граніцы Турцыі паводле Сеўрскага і Лазанскага мірных дагавораў. Чым была выклікана неабходнасць падпісання Лазанскага дагавора?
3. Якія мерапрыемствы былі праведзены ў Турцыі з мэтай яе мадэрнізацыі? Дайце ацэнку дзейнасці Мустафы Кемаля Атацюрка.
4. Якія мусульманскія краіны здолелі дамагчыся незалежнасці ў 1919—1939 гг.? Якія перашкоды неабходна было пераадолець мусульманскім краінам на шляху да незалежнасці?
5. Дакажыце, што ў Турцыі, Іране, Афганістане ў 1919—1939 гг. усталяваліся аўтарытарныя палітычныя рэжымы. Свой адказ аргументуйце.
6. Якую ролю ў працэсе мадэрнізацыі краін мусульманскага свету адыгрывала рэлігія? Як вырашалася рэлігійнае пытанне ў Турцыі?

### ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Мустафа Кемаль Атацюрк** (1881—1938), турэцкі палітычны і дзяржаўны дзеяч. Пры нараджэнні атрымаў імя Мустафа. Мянушка Кемаль («Сталасць і Дасканаласць») атрымаў у ваенным вучылішчы за матэматычныя здольнасці. Імя Атацюрк («Бацька турак») прысвоіў яму Вялікі нацыянальны сход Турцыі. Удзельнічаў у італа-турэцкай (1911—1912), Другой Балканскай (1913) і Першай сусветнай (1914—1918) войнах. Не прызнаў капітуляцыі і падзелу Асманскай імперыі паводле Сеўрскага мірнага дагавора. У 1920 г. быў выбраны старшынёй новага Вялікага нацыянальнага сходу Турцыі. Атацюрк узнавіў войска, выгнаў грэкаў з Малой Азіі, вымусіў краіны Антанты падпісаць больш справядлівы Лазанскі дагавор (1923), скасаваў султанат і халіфат, заснаваў рэспубліку. Быў выбраны першым прэзідэнтам Турцыі (1923—1938). Праводзіў палітыку мадэрнізацыі турэцкай дзяржавы і грамадства на заходні ўзор: была рэфармавана сістэма адукацыі, скасаваны інстытуты ісламскага права, абвешчана роўнасць полаў, жанчыны атрымалі выбарчыя правы, замест арабскага быў уведзены лацінскі алфавіт і сямейныя прозвішчы. У эканоміцы праводзіў палітыку нацыяналізацыі. Знешняя палітыка была накіравана на дасягненне поўнай незалежнасці краіны. Турцыя ўступіла ў Лігу Нацый і наладзіла дружалюбныя адносіны з суседзямі, у першую чаргу з Грэцыяй і СССР.

## § 23. Лацінская Амерыка

**Успомніце:** Што прывяло да рэвалюцыі ў Мексіцы ў 1910—1917 гг.? Якія яна мела наступствы? Якія адметныя прыкметы аўтарытарнага палітычнага рэжыму?

Лацінаамерыканскія краіны адыгралі нязначную ролю ў Першай сусветнай вайне. Тым не менш сусветны канфлікт адбіўся на Лацінскай Амерыцы, асабліва на



Правообладатель Народная асвета

яе эканоміцы. Сусветны эканамічны крызіс 1929—1933 гг. таксама аказаў глыбокі ўплыў на эканамічнае і палітычнае жыццё краін Лацінскай Амерыкі.

**Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця.** Да пачатку XX ст. эканоміка Лацінскай Амерыкі грунтавалася ў асноўным на экспарце сыравіны і харчовых тавараў. Многія краіны прадавалі за граніцу адзін або два віды тавараў: Аргенціна — гавядзіну і пшаніцу, Чылі — нітраты і медзь, Бразілія, Куба і краіны Карыбскага басейна — цукар, краіны Цэнтральнай Амерыкі — бананы.

З пачатку 1920-х гг. ЗША пачалі адцясняць Вялікабрытанію ў якасці асноўнага інвестара ў краінах Лацінскай Амерыкі. У адрозненне ад англійскіх амерыканскія інвестыцыі ўкладваліся непасрэдна ў вытворчую сферу. У выніку значная частка лацінаамерыканскай экспартнай прамысловасці апынулася ў руках ЗША. Амерыканская «Юнайтэд Фрут кампані», напрыклад, ператварыла цэнтральнаамерыканскія дзяржавы ў так званыя «бананавыя рэспублікі», пасля таго як стала ў іх уладальнікам зямлі, перапрацоўчых заводаў і чыгунак. Амерыканскія кампаніі дабіліся таксама кантролю над меднараднай прамысловасцю Чылі і Перу, нафтавай прамысловасцю ў Мексіцы, Перу і Балівіі.

Сапраўдным бедствам для эканомікі лацінаамерыканскіх краін стаў сусветны эканамічны крызіс 1929—1933 гг. Скарачэнне вытворчасці ў ЗША і Еўропе прывяло да падзення попыту на харчовыя тавары і сыравіну, асабліва на каву, цукар, мяса і метал. Агульны ўзровень лацінаамерыканскага экспарту ў 1930 г. упаў на 50 % у параўнанні з 1925—1929 гг. Асабліва пацярпелі тыя краіны, эканоміка якіх залежала ад аднаго ці двух відаў экспартнай прадукцыі.

Праўда, сусветны крызіс меў адзін важны станоўчы эфект. Неспрыяльная экспартная сітуацыя прымусіла некаторыя краіны Лацінскай Амерыкі заахвочваць развіццё новых галін прамысловасці для вытворчасці тавараў, якія раней імпартаваліся. Так, у Чылі і Бразіліі з’явіліся дзяржаўныя прадпрыемствы стальной прамысловасці, а ў Аргенціне і Мексіцы — нафтавай.

**Палітыка ЗША ў адносінах да краін Лацінскай Амерыкі.** Злучаныя Штаты Амерыкі ўжо даўно разглядалі Лацінскую Амерыку як непасрэдную сферу свайго ўплыву. На працягу многіх гадоў яны ўмешваліся ва ўнутраныя справы лацінаамерыканскіх краін, выкарыстоўваючы, як правіла, узброеную сілу. Асабліва часта — у адносінах да краін Цэнтральнай Амерыкі і Карыбскага басейна. Многія амерыканцы лічылі гэтыя два рэгіёны задворкамі ўласнай дзяржавы. Такая палітыка ЗША выклікала супраціўленне з боку лацінаамерыканскіх краін. Дзякуючы росту нацыянальнай самасвядомасці многія лацінаамерыканцы бачылі ў ЗША агрэсіўную імперыялістычную дзяржаву. Амерыканцаў абвінавачвалі ў тым, што значная частка даходаў, якія яны атрымлівалі ў краінах Лацінскай Амерыкі, ішла на падтрымку і захаванне ва ўладзе дыктатарскіх рэжымаў.

Да сярэдзіны 1930-х гг. ЗША змянілі сваю палітыку ў дачыненні да краін Лацінскай Амерыкі. Прэзідэнт Ф. Д. Рузвельт абвясціў палітыку «добрага суседа».



Правообладатель Народная асвета

Гэтая палітыка прадугледжвала адмову ЗША ад выкарыстання ваеннай сілы ў краінах Лацінскай Амерыкі. Але ў цэлым ранейшы курс захоўваўся, толькі зараз з упорам на эканамічныя рычагі ціску.

**На шляху да аўтарытарызму.** Большасць лацінаамерыканскіх краін пачыналі сваю гісторыю ў XIX ст. з рэспубліканскай формы праўлення. Аднак у рэчаіснасці палітычная ўлада ў кожнай краіне належала даволі вузкаму колу асоб — вышэйшаму духавенству, ваенным, буйным землеўладальнікам. Гэтая кіруючая эліта кантралявала народныя масы, большасць якіх былі беднымі сялянамі. Узброеныя сілы часта адыгрывалі вырашальную ролю ў захаванні ўлады ў руках той ці іншай групоўкі. Ваенныя кіраўнікі кантралявалі ўрад. Замежныя інвестары, будзь то англічане або амерыканцы, таксама падтрымлівалі кіруючыя групоўкі ў мэтах захавання існуючага парадку.

Тэндэнцыя да аўтарытарызму ў краінах Лацінскай Амерыкі ўзмацнілася пад уздзеяннем сусветнага эканамічнага крызісу 1929—1933 гг. Унутраная нестабільнасць, выкліканая крызісам, прывяла да ваенных пераваротаў і стварэння ваенных дыктатур у пачатку 1930-х гг. у Аргенціне, Бразіліі, Чылі, Перу, Гватэмале, Сальвадоры і Гандурасе.

Найбольш важную ролю сярод лацінаамерыканскіх дзяржаў адыгрывалі тры краіны — Аргенціна, Бразілія і Мексіка, якія, разам узятыя, валодалі больш чым паловай зямельных рэсурсаў і іншых багаццяў Лацінскай Амерыкі.

**Аргенціна.** Пасля дасягнення незалежнасці (1826) краіну кантралявала невялікая група кансерватыўна настроеных буйных землеўладальнікаў-латыфундыстаў. Памешчыцкая алігархія карысталася манаполіяй на зямлю і асноўную ўвагу надавала развіццю экспартнай эканомікі. Вытворчасць збожжа і мяса на экспарт з'яўлялася важнейшай крыніцай яе ўзбагачэння. Кіруючая групоўка адкрыта ігнаравала патрэбы сярэдняга класа, інтарэсы якога з канца XIX ст. выказвала партыя *Грамадзянскі радыкальны саюз*.

Першая сусветная вайна дала магутны штуршок для развіцця эканомікі. Аргенціна ператваралася ў адну з найбольш развітых дзяржаў Лацінскай Амерыкі. Значную ролю ў жыцці краіны сталі адыгрываць буржуазія і пралетарыят. Пад ціскам апазіцыйных сіл у краіне быў прыняты закон аб усеагульным выбарчым праве пры тайным галасаванні.

Новы выбарчы закон дазволіў лідару радыкалаў *Іпаліта Ірыгаену* дабіцца выбрання на пасаду прэзідэнта Аргенціны. У 1916—1930 гг. урады радыкалаў ажыццявілі шэраг прагрэсіўных мерапрыемстваў: абвясцілі асноўныя буржуазныя свабоды, увялі 8-гадзінны працоўны дзень, абмежавалі самавольства памешчыкаў, у 1929 г. нацыяналізавалі нафтавыя радовішчы. У знешняй палітыцы прэзідэнт Ірыгаен выступаў за мірнае ўрэгуляванне міждзяржаўных праблем і аказваў супраціўленне ціску Вялікабрытаніі і ЗША. Аднак эканамічная залежнасць Аргенціны ад



Правообладатель Народная асвета

замежных дзяржаў узмацнялася, пры гэтым асабліва ўмацоўваліся пазіцыі манаполій ЗША.

Сусветны эканамічны крызіс 1929—1933 гг. прывёў у Аргенціне да росту галечы і беспрацоўя, рэзкага абвастрэння класавых супярэчнасцей. У *1930 г.* на палітычную арэну выступілі ваенныя. Яны скінулі прэзідэнта Ірыгаена і аднавілі ўладу буйных землеўладальнікаў. Новы рэжым абрушыў жорсткія рэпрэсіі на рабочы і левы рух краіны. Прафсаюзы былі разгромлены, тысячы людзей рэпрэсіраваны або забіты.

У гады Другой сусветнай вайны прадстаўнікі армейскіх вярхоў здзейснілі дзяржаўны пераварот і ўсталявалі ў краіне аднаасобнае праўленне ваенных (1943). Сярод удзельнікаў перавароту быў будучы прэзідэнт Аргенціны Хуан Перон. Група афіцэраў, якую ён узначальваў, высунула лозунг «За вялікую Аргенціну».

**Бразілія.** Гэтая краіна таксама пайшла па аўтарытарным шляху развіцця. У 1889 г. армія ліквідавала бразільскую манархію і абвясціла рэспубліку, якая праіснавала да 1930 г. Улада кантралявалася ў асноўным зямельнай алігархіяй, і перш за ўсё той яе часткай, якая займала пануючыя пазіцыі ў вытворчасці кавы і яе экспарце. І пакуль цэны на каву заставаліся высокімі, рэспубліканская алігархія была здольна захоўваць сваю ўладу. Алігархі цалкам ігнаравалі рост гарадской прамысловасці і рабочага класа, які з'явіўся разам з ёй.

Сусветны эканамічны крызіс 1929—1933 гг. разарыў кававую прамысловасць. Ужо да канца 1929 г. цэны на каву ўпалі да рэкордна нізкага ўзроўню.

У 1930 г. у выніку ваеннага перавароту прэзідэнтам Бразіліі стаў *Жэтуліу Варгас*, багаты землеўладальнік. Варгас правіў Бразіліяй з 1930 па 1945 г. У першыя гады свайго праўлення ён супакоіў рабочых увядзеннем 8-гадзіннага працоўнага дня і мінімальнай заработнай платы. Аднак, сутыкнуўшыся з моцнай апазіцыяй у 1937 г., Варгас абвясціў сябе дыктатарам.

У 1938—1945 гг. Ж. Варгас устанавіў так званую «Новую дзяржаву», аўтарытарную па сваёй сутнасці. Па-за законам былі пастаўлены ўсе палітычныя партыі, абмежаваны палітычныя правы насельніцтва. Тайная паліцыя стала важным інструментам у барацьбе супраць палітычных апанентаў. У эканоміцы Варгас праводзіў палітыку стымулявання новых галін прамысловасці. Урад стварыў сталеліцейную прамысловасць і кампанію па здабычы і перапрацоўцы нафты. Да канца Другой сусветнай вайны Бразілія стала вядучай індустрыяльнай дзяржавай Лацінскай Амерыкі. Але і тут армія ўмяшалася ў палітычны працэс і ў 1945 г. прымусіла Варгаса пайсці ў адстаўку.

**Мексіка.** Мексіканская рэвалюцыя 1910—1917 гг. была першай значнай спробай у Лацінскай Амерыцы ліквідаваць сістэму буйных латыфундый і павысіць жыццёвы ўзровень народных мас. Пасля рэвалюцыі ў Мексіцы ўзнік адносна ўстойлівы палітычны парадак, дэмакратычны па форме. Аднак афіцыйная палітычная партыя, вядомая як Інстытуцыянальная рэвалюцыйная партыя, кантралявала практычна



Правообладатель Народная асвета

ўсе буйнейшыя палітычныя групоўкі мексіканскага грамадства. Кожныя шэсць гадоў партыйныя лідары выбіралі кандыдата ў прэзідэнты, які затым паслухмяна выбіраўся народам.

Новая хваля змяненняў пачалася з *Ласара Кардэнаса*, які быў прэзідэнтам Мексікі ў 1934—1940 гг. Ён ажыццявіў некаторыя з першапачатковых мэт рэвалюцыі. Найважнейшымі мерапрыемствамі сталі размеркаванне 44 млн акраў зямлі сярод мексіканскіх сялян і нацыяналізацыя ўласнасці замежных нафтавых кампаній. Усё гэта зрабіла Кардэнаса надзвычай папулярным у народзе.

У гады Другой сусветнай вайны лацінаамерыканскія краіны першапачаткова разлічвалі ўзбагаціцца за кошт паставак абодвум ваюючым бакам, прытрымліваючыся палітыкі нейтралітэту. Аднак скарачэнне з-за вайны гандлёвых сувязей з Еўропай і тая пагроза, якую фашысцкія дзяржавы сталі прадстаўляць для Лацінскай Амерыкі, прымусілі іх змяніць сваю недальнабачную палітыку. Большасць краін Лацінскай Амерыкі абвясцілі вайну фашысцкім дзяржавам.

**Культура Лацінскай Амерыкі.** Культурнае развіццё краін Лацінскай Амерыкі ў пачатку XX ст. вызначалі два найважнейшыя фактары — гэта ўплыў сучасных еўрапейскіх мастацкіх і літаратурных напрамкаў і рост нацыянальнай самасвядомасці.

Важную ролю ў стварэнні новых напрамкаў у мастацтве і літаратуры адыгралі сімвалізм і сюррэалізм. Багатая эліта, асабліва ў такіх буйных гарадах, як Буэнас-Айрэс у Аргенціне і Сан-Паўла ў Бразіліі, праяўляла вялікую цікавасць да творчасці мастакоў-авангардыстаў. Лацінаамерыканскія мастакі, якія бывалі за граніцай, авалодвалі сучаснай тэхнікай жывапісу і адаптоўвалі яе да нацыянальных умоў.

У пачатку XX ст. адукаваныя пласты грамадства ўсё больш сталі задумвацца аб нацыянальнай сутнасці сваіх дзяржаў. У 1920-х гг. гэтая тэндэнцыя прывяла да вывучэння народных традыцый і этнічнай гісторыі. Пошук нацыянальнай ідэнтычнасці станавіўся пануючым у культурным жыцці краін Лацінскай Амерыкі. Пісьменнікі і мастакі шмат у чым вызначалі змест новай нацыянальнай культуры, якая фарміравалася. Спроба стварыць нацыянальнае мастацтва на аснове камбінацыі еўрапейскай мастацкай тэхнікі і ўласных традыцый знайшла найбольш яркае адлюстраванне ў насценным жывапісе г. Мехіка.



Будынак Нацыянальнага тэатра ў г. Мехіка

Нацыянальнае мастацтва, створанае ў Мексіцы ў 1920—1930-я гг., было публічным мастацтвам. Мексіканскі



Правообладатель Народная асвета



Дыега Рывера. Фрэска «Механізацыя краіны». 1926 г.

ўрад фінансаваў фрэскавы жывапіс на сценах грамадскіх будынкаў, уключаючы школы і дзяржаўныя ўстановы. Найбольшую вядомасць у развіцці насценнага жывапісу набылі *Дыега Рывера, Хасэ Ароска* і *Давід Сікейрас*. Іх творчасць была разлічана ў першую чаргу на самыя шырокія пласты насельніцтва.

?

1. Ахарактарызуйце становішча эканомікі краін Лацінскай Амерыкі ў пачатку XX ст. Як сусветны эканамічны крызіс 1929—1933 гг. адбіўся на эканоміцы краін Лацінскай Амерыкі?
2. Якую ролю ў краінах Лацінскай Амерыкі адыгрывалі ЗША? Як змянілася іх палітыка да сярэдзіны 1930-х гг.?
3. У якіх краінах Лацінскай Амерыкі ў 1930-х гг. усталяваліся аўтарытарныя рэжымы? Якімі былі прычыны ўсталявання аўтарытарных дыктатур у гэтых краінах?
4. Якія фактары вызначалі развіццё культуры краін Лацінскай Амерыкі ў пачатку XX ст.? Па якіх асноўных напрамках развіваліся мастацтва і літаратура ў краінах Лацінскай Амерыкі ў 1920—1930-я гг.?
5. Аб чым сведчыць той факт, што капіталаўкладанні ЗША ў Лацінскай Амерыцы павялічыліся з 308 млн долараў у пачатку XX ст. да 1,65 млрд долараў у 1914 г. і 5,43 млрд долараў у 1929 г.?

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### Ф. Д. Рузвельт. З Першай інаўгурацыйнай прамовы

*4 сакавіка 1933 г.*

…У галіне сусветнай палітыкі мне хацелася б, каб наша краіна праводзіла палітыку «добрага суседа» — суседа, які асабліва паважае сябе і таму паважае правы іншых; суседа, які паважае свае абавязацельствы і паважае святасць сваіх пагадненняў з суседзямі ва ўсім свеце. Калі я правільна разумею характар нашага народа, мы сёння больш моцныя, чым калі-небудзь раней, усведамляем нашу ўзаемазалежнасць адзін ад аднаго; усведамляем, што нельга толькі браць, трэба таксама і аддаваць, што наперад трэба рухацца дысцыплінаванай, вернападданай арміяй, гатовай на ахвяры дзеля агульнай дысцыпліны, бо без такой дысцыпліны немагчымы рух наперад, немагчыма эфектыўнае кіраўніцтва. Я ведаю, мы гатовы і згодны падпарадкаваць сваё жыццё і свой здабытак такой дысцыпліне, адкрываючы магчымасць для кіраўніцтва, нацэленага на вялікую карысць. Гэта я і хачу прапанаваць, запэўніваючы, што вялікія мэты абудзілі ў нас святое пачуццё абавязку, падобнае таму, якое абуджаецца падчас узброенай барацьбы.

*Якая палітыка абвешчана ў прамове Ф. Д. Рузвельта? Што яна прадугледжвала? Якую мэту ставілі ЗША, пераходзячы да гэтай палітыкі?*



Правообладатель Народная асвета

## УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ

1. Якi ўплыў аказала Першая сусветная вайна на сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё каланіяльных і залежных краін?

2. Вызначыце значэнне паняццяў «калонія», «пратэктарат», «метраполія». Прывядзіце прыклады.

3. Чаму ў каланіяльных і залежных краінах у 1920—1930-я гг. атрымалі развіццё ідэі нацыяналізму? Якія нацыянальныя сацыяльна-палітычныя вучэнні ўзніклі ў краінах Усходу ў гэты перыяд? Правядзіце іх параўнальны аналіз.

4. Як складваліся адносіны краін Усходу з заходнімі дзяржавамі пасля Першай сусветнай вайны? Якую палітыку ў дачыненні да краін Усходу праводзіла Савецкая Расія (пазней Савецкі Саюз)?

5. Вызначыце асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця: а) Кітая, б) Індыі, в) Японіі, г) Турцыі, д) краін Лацінскай Амерыкі ў 1918—1945 гг.

6. Якая азіяцкая краіна ў 1930-х гг. стала на шлях знешняй экспансіі? Якія агрэсіўныя дзеянні яна ажыццявіла ў гэты перыяд? Чым гэта тлумачыцца? Якія гэта мела для яе наступствы?

7. Якія прычыны прывялі да ўступлення краін Усходу і Лацінскай Амерыкі ў Другую сусветную вайну?

8. Назавіце імёны палітычных дзеячаў краін Усходу і Лацінскай Амерыкі 1918—1945 гг., якія ўнеслі найбольшы ўклад у нацыянальна-вызваленчы рух сваіх краін. Складзіце гістарычны партрэт аднаго з іх (па вашым выбары). Дайце ацэнку яго дзейнасці.

9. Вызначыце асноўныя тэндэнцыі развіцця культуры і мастацтва краін Усходу і Лацінскай Амерыкі ў 1918—1945 гг.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

**Раздзел IV**

# ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА. ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА

## § 24. Пачатак Другой сусветнай вайны

**Успомніце:** Якія дзяржавы ў 1930-я гг. праводзілі агрэсіўную знешнюю палітыку? Чаму ў Еўропе ў 1930-я гг. не атрымалася стварыць сістэму калектыўнай бяспекі?

**Прычыны, характар вайны. Захоп Германіяй Польшчы.** Вясной 1939 г. А. Гітлер падпісаў план вайны супраць Польшчы — «Вайс» («Белы»). 31 жніўня 1939 г. пераапранутыя ў польскую форму эсэсаўцы захапілі радыёстанцыю ў нямецкім горадзе Глейвіц. Гэта правакацыя была выкарыстана Германіяй як зачэпка для вайны супраць Польшчы.

**1 верасня 1939 г.** Германія напала на Польшчу. 3 верасня саюзнікі Польшчы — Англія і Францыя аб'явілі вайну Германіі. Пачалася Другая сусветная вайна. Германія разлічвала захапіць вялікія тэрыторыі і ўсталяваць сваё панаванне на Еўрапейскім кантыненце. Пасля гэтага яна планавала падпарадкаваць Афрыку, Блізкі Усход і падрыхтавацца да вайны з ЗША. Дагавор аб ненападзенні з Савецкім Саюзам быў неабходны Германіі толькі на час вайны з дзяржавамі Захаду. Пасля іх разгрому павінна была надысці чарга СССР.

Планы Германіі не абмяжоўваліся захопам чужых тэрыторый. На Усходзе яна збіралася «ачысціць» значную іх частку ад мясцовага насельніцтва шляхам яго знішчэння ці высылкі, а затым засяліць нямецкімі каланістамі. Гэты план пад кодавай назвай *«Ост»* асабліва выразна адлюстраваў злачынныя мэты, якія праследавала Германія ў вайне.

Нападаючы на Польшчу, Германія разлічвала на непрацяглую вайну. Яна забяспечыла сабе значную перавагу сіл, асабліва тэхнікі і ўзбраення. Дзякуючы гэтаму германскія войскі на працягу верасня захапілі Польшчу, нягледзячы на ўпартае супраціўленне польскіх войскаў.

**Суадносіны сіл на германа-польскім фронце 1 верасня 1939 г.**

| | Германія | Польшча | Суадносіны |
|---|---|---|---|
| Дывізіі | 53,1 | 29,3 | 1,8:1 |
| Асабісты склад, тыс. чал. | 1516 | 840 | 1,8:1 |
| Гарматы і мінамёты | 9824 | 2840 | 3,5:1 |
| Танкі | 2379 | 475 | 5:1 |
| Самалёты | 2231 | 463 | 4,9:1 |



Правообладатель Народная асвета

*17 верасня 1939 г.* Чырвоная Армія ўступіла ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну, пачаўшы вызваленчы паход у інтарэсах беларускага і ўкраінскага народаў. Савецкі ўрад не аб'явіў Польшчы вайны. Кіраўніцтва СССР тлумачыла сваё рашэнне тым, што польская дзяржава перастала існаваць і што ў такой сітуацыі неабходна ўзяць пад абарону насельніцтва Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Значная перавага Германіі ў сілах і адсутнасць дапамогі з боку Захаду прывялі да таго, што ў канцы верасня — пачатку кастрычніка былі падаўлены апошнія ачагі супраціўлення польскіх войскаў. Аднак акта аб капітуляцыі польскі ўрад не падпісаў. *28 верасня 1939 г.* Германія і Савецкі Саюз падпісалі дагавор аб граніцы і дружбе, якім быў замацаваны падзел Польшчы. Гэта ўмацавала геапалітычныя пазіцыі СССР у Еўропе.

Становішча на Заходнім фронце з *верасня 1939 г.* па *май 1940 г.* увайшло ў гісторыю пад назвай *«дзіўная вайна»*. Вялікабрытанія і Францыя не вялі на сушы актыўных баявых дзеянняў супраць Германіі. Праціўнікі абмяжоўваліся толькі перастрэлкамі, якія не прыводзілі да вялікіх страт. Англія і Францыя ў жніўні 1939 г. былі схільны да кампрамісу — пагаднення з Германіяй за кошт уступак з боку Польшчы. Вялікабрытанія як ваенна-марская дзяржава не была падрыхтавана да вайны на сушы. Французскія ваенныя разлічвалі, што «лінія Мажыно» — абарончыя ўмацаванні на граніцы з Германіяй — дазволіць перавесці вайну ў пазіцыйную. Англія і Францыя спадзяваліся, што і ЗША з цягам часу выступяць супраць Гітлера, хаця 5 верасня гэта краіна аб'явіла аб сваім нейтралітэце. «Дзіўная вайна» на Захадзе дапамагла Германіі завяршыць разгром Польшчы і пачаць канцэнтрацыю сіл супраць Францыі і іншых заходніх краін.

**Разгром Францыі.** У красавіку 1940 г. Германія пачала захоп Даніі і Нарвегіі. *Данія* капітулявала *9 красавіка 1940 г.*, а ўзброеныя сілы *Нарвегіі*, падтрыманыя англічанамі, склалі зброю ў *чэрвені 1940 г.* У адпаведнасці з планам «Гельб» 10 мая 1940 г. пачалося генеральнае наступленне германскіх войскаў праз Люксембург, Бельгію, у абход «лініі Мажыно». Асноўныя сілы, якія супрацьстаялі вермахту, складаліся з войскаў Англіі, Францыі, Бельгіі і Галандыі. Аднак толькі англійскія і французскія сухапутныя войскі знаходзіліся пад агульным камандаваннем. Да таго ж яно зрабіла памылку, дазволіўшы германскай арміі нанесці галоўны ўдар на поўдзень ад раёнаў канцэнтрацыі галоўных сіл саюзнікаў. Іх фронт быў прарваны, і да 20 мая яны аказаліся прыціснутымі да ўзбярэжжа праліва Па-дэ-Кале



22 чэрвеня 1940 г. у Камп'енскім лесе Германія прадыктавала Францыі ўмовы перамір'я



Правообладатель Народная асвета




Заклік Ш. дэ Голя «Да ўсіх французаў». 1940 г.

ў раёне *Дзюнкерка* (порт на поўначы Францыі). Толькі спыненне германскага наступлення на двое сутак дазволіла англічанам арганізаваць эвакуацыю саюзных войскаў на Брытанскія астравы. Неўзабаве вермахт без бою заняў Парыж.

*22 чэрвеня 1940 г.* на станцыі Рэтонд у *Камп'енскім лесе*, у тым жа вагоне, дзе было заключана перамір'е з Германіяй у 1918 г., немцы прадыктавалі *Францыі* ўмовы новага перамір'я. Германія акупіравала ўсю Паўночную і Заходнюю Францыю, адрэзаўшы яе ад Атлантычнага ўзбярэжжа. Францыі былі пакінуты яе калоніі, таму што Германія не мела сіл для іх акупацыі.

На неакупіраванай частцы краіны (з цэнтрам у невялікім гарадку Вішы) стаў фарміравацца прафашысцкі рэжым пад кіраўніцтвам французскага маршала *А. Ф. Петэна* — прыхільніка капітуляцыі Францыі перад Германіяй. Частка французскіх ваенных не падпарадкавалася ўраду капітулянтаў і вырашыла працягваць барацьбу. У Лондане яны стварылі камітэт «Свабодная Францыя» на чале з генералам **Ш. дэ Голем**.

**«Бітва за Англію».** Гітлер разлічваў, што разгром Францыі вымусіць Англію выйсці з вайны. Але поспехі Германіі толькі ўзмацнілі рашучасць англічан працягваць барацьбу. У 1940 г. быў сфарміраваны кааліцыйны ўрад на чале з прынцыповым праціўнікам фашысцкай Германіі, лідарам партыі кансерватараў **У. Чэрчылем**.

Англія ўзмоцнена нарошчвала ваенную вытворчасць. Да лета 1940 г. яе аб'ём у параўнанні з пачаткам вайны павялічыўся ўдвая. Англія валодала магутным ваенна-марскім флотам, здольным перашкодзіць высадцы праціўніка з мора. Для паспяховага ўварвання на Брытанскія астравы германскае камандаванне вырашыла падавіць волю англічан да супраціўлення бесперапыннымі бамбардзіроўкамі, ад якіх англійскі бок нёс вялікія страты. Аднак паступова англічанамі была наладжана эфектыўная сістэма супрацьпаветранай абароны. Да канца кастрычніка 1940 г. Германія згу-



Лондан пасля нямецкай бамбардзіроўкі. 1940 г.



Правообладатель Народная асвета




Другая сусветная вайна. Ваенныя дзеянні з 1 верасня 1939 па 22 чэрвеня 1941 г.



Правообладатель Народная асвета

біла звыш 1100 самалётаў, у той час калі англійскія страты аказаліся амаль удвая меншымі. Улічваючы гэта, а таксама неабходнасць падрыхтоўкі да нападзення на Савецкі Саюз, гітлераўскае камандаванне спыніла паветраныя налёты на Англію.

**27 верасня 1940 г.** Германія, Італія і Японія заключылі **«Траісты пакт»** — ваенна-палітычны саюз фашысцкіх дзяржаў, да якога ў 1940—1941 гг. далучыліся Венгрыя, Румынія, Славакія, Балгарыя, Харватыя, Маньчжоў-Го і ўрад Ван Цзынвэя ў Кітаі.

**Палітыка СССР напярэдадні вайны з Германіяй.** Ужо ў першыя месяцы Другой сусветнай вайны кіраўніцтва СССР, абапіраючыся на дасягнутыя з Германіяй пагадненні аб падзеле сфер інтарэсаў, вырашыла рэалізаваць уласныя ваенна-палітычныя задумкі. Калі германскія войскі падступілі да тэрыторыі Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, Савецкі ўрад, як ужо адзначалася, аддаў загад Чырвонай Арміі перайсці савецка-польскую граніцу і ўзяць пад абарону беларускае і ўкраінскае насельніцтва. Большая частка заходнеўкраінскага і заходнебеларускага насельніцтва з радасцю і надзеяй сустрэла сваіх вызваліцеляў.

У верасні — кастрычніку 1939 г. СССР настаяў на заключэнні дагавораў аб узаемадапамозе з прыбалтыйскімі дзяржавамі — Эстоніяй, Латвіяй і Літвой. Падчас гэтых перагавораў савецкая дэлегацыя паставіла ўраду Літвы ўльтыматум. У ім утрымліваліся патрабаванні сфарміраваць прасавецкі ўрад і дапусціць на тэрыторыю Літвы савецкія войскі. Такія ж ультыматумы былі пастаўлены і ўрадам Латвіі і Эстоніі. Умовы былі прыняты. Неўзабаве прыбалтыйскія дзяржавы ўвайшлі ў склад СССР. Аналагічным чынам вырашыўся лёс Бесарабіі і Паўночнай Букавіны: гэтыя тэрыторыі былі далучаны да ўтворанай *Малдаўскай ССР*.



Фінскія лыжнікі, узброеныя аўтаматамі. 1939 г.

Драматычна складваліся адносіны СССР з Фінляндыяй. У 1939 г. Савецкі Саюз у інтарэсах умацавання бяспекі Ленінграда і Мурманска прапанаваў фінскаму ўраду пайсці на ўзаемныя тэрытарыяльныя ўступкі. Не дасягнуўшы жаданага выніку, **30 лістапада 1939 г**. савецкае камандаванне аддало загад пачаць баявыя дзеянні супраць *Фінляндыі*. У першыя дні вайны быў сфарміраваны прасавецкі ўрад Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Ён падпісаў дагавор аб узаемадапамозе і дружбе з СССР.

Аднак хуткага разгрому фінскіх войскаў, на што так спадзявалася савецкае кіраўніцтва, не атрымалася. Баі набылі зацяжны характар. Толькі ў сакавіку 1940 г., прарваўшы абарончую лінію фінаў, савецкія войскі разгарнулі наступленне. **12 са-**



Правообладатель Народная асвета




Савецка-фінляндская вайна (30 лістапада 1939 — 12 сакавіка 1940 г.)

**кавіка** Фінляндыя была вымушана прыняць умовы савецкага боку. Ваенныя і палітычныя дзеянні СССР супраць Фінляндыі прывялі да яго выключэння з Лігі Нацый.

Страты савецкіх войскаў падчас баявых дзеянняў склалі 127 тыс. чалавек супраць 23 тыс. фінаў. У выніку вайны савецка-фінляндская граніца была значна адсунута ад Ленінграда, і пагроза з боку Фінляндыі зменшылася. СССР атрымаў у арэн-



Правообладатель Народная асвета

ду паўвостраў Ханка для будаўніцтва там ваенна-марской базы. Была ўтворана новая саюзная рэспубліка — *Карэла-Фінская ССР* (ліквідавана ў 1956 г.). Улічваючы ўрокі вайны, Савецкі Саюз стаў праводзіць мерапрыемствы па ўмацаванні сваіх узброеных сіл і павышэнні іх баяздольнасці.

Пасля перамогі над Францыяй Германія пачала непасрэдную падрыхтоўку вайны супраць СССР. У *снежні 1940 г.* Гітлер падпісаў план вайны з СССР пад кодавай назвай **«Барбароса»**. План прадугледжваў разгром Савецкага Саюза ў непрацяглай кампаніі («бліцкрыга» — маланкавай вайны) і выхад германскіх войскаў яшчэ да наступлення зімы на лінію ракі Волгі.

У красавіку 1941 г. агрэсары захапілі Югаславію і Грэцыю. Да лета 1941 г. пад кантролем фашысцкіх дзяржаў аказалася значная частка кантынентальнай Еўропы.

?

1. Якія мэты ставіла Германія, пачынаючы вайну ў Еўропе? Які характар насіла вайна з боку Германіі? Свой адказ аргументуйце.
2. Чаму нападзенне Германіі на Польшчу прывяло да пачатку новай сусветнай вайны? Чым тлумачыцца той факт, што Вялікабрытанія і Францыя, аб'явіўшы вайну Германіі, не аказалі істотнай дапамогі Польшчы?
3. Прааналізуйце статыстычныя даныя табліцы «Суадносіны сіл на германа-польскім фронце 1 верасня 1939 г.». Ці магла Польшча самастойна супрацьстаяць Германіі?
4. Які перыяд Другой сусветнай вайны атрымаў назву «дзіўная вайна»? Чаму? Чым вы можаце растлумачыць бяздзейнасць заходніх краін у гэты час?
5. Якія фактары садзейнічалі паспяховаму супрацьстаянню Англіі ў ваенных дзеяннях супраць Германіі? Якую ролю ў гэтым адыграў прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі У. Чэрчыль?
6. Складзіце храналагічную табліцу «Акупацыя фашысцкай Германіяй краін Заходняй Еўропы». Якія, на ваш погляд, былі прычыны паспяховых баявых дзеянняў Германіі ў Заходняй Еўропе?
7. Пералічыце краіны, якія сталі саюзнікамі Германіі ў Другой сусветнай вайне.
8. Як змянілася тэрыторыя СССР у 1939—1940 гг.? Чаму Савецкі Саюз быў зацікаўлены ў далучэнні новых тэрыторый? Як гэта паўплывала на міжнароднае становішча СССР і на яго ўзаемаадносіны з іншымі краінамі?

**Прапануем абмеркаваць.** Для захопу ўсёй Заходняй Еўропы Германіі спатрэбілася крыху больш за год, пры гэтым яна панесла нязначныя страты. Чаму заходнееўрапейскія дзяржавы, якія мелі развітую прамысловасць, не змаглі супрацьстаяць Германіі?

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### З выступлення А. Гітлера на пасяджэнні Імперскай канцылярыі

*23 мая 1939 г.*

Становішча сёння такое: нацыянальнае аб'яднанне немцаў за нешматлікімі выключэннямі ажыццёўлена. Далейшыя поспехі без кровапраліцця дасягнуты быць не могуць... Польшча заўсёды будзе стаяць на баку нашых ворагаў.



Правообладатель Народная асвета

Нягледзячы на пагадненне аб дружбе, у Польшчы заўсёды існаваў намер выкарыстоўваць супраць нас любую магчымасць.

Данцыг — не той аб'ект, з-за якога ўсё задумана. Гаворка ідзе для нас аб пашырэнні жыццёвай прасторы на Усходзе і аб харчовым забеспячэнні, а таксама аб рашэнні праблемы Балтыкі. Забеспячэнне харчаваннем магчыма толькі адтуль, дзе шчыльнасць насельніцтва малая.

...Калі лёс штурхае нас на сутыкненне з Захадам, добра валодаць вялікай жыццёвай прасторай на Усходзе...

...Пытанне аб тым, каб пашкадаваць Польшчу, адпадае, і застаецца рашэнне пры першым жа выпадку напасці на яе. Аб паўторы Чэхіі няма чаго і думаць. Справа дойдзе да барацьбы. Задача — ізаляваць Польшчу. Поспех ізаляцыі Польшчы мае вырашальнае значэнне... Ізаляцыя Польшчы — справа спрытнай палітыкі.

*Як у выступленні А. Гітлера вызначаны мэты, якія імкнулася дасягнуць Германія, пачынаючы вайну супраць Польшчы? Чаму Гітлер лічыў, што ў вырашэнні задачы «ізаляцыі Польшчы» справа дойдзе да вайны? Ці магла Польшча пазбегнуць нападу Германіі?*

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Уінстан Леанард Спенсер Чэрчыль** (1874—1965), англійскі дзяржаўны і палітычны дзеяч, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі (1940—1945, 1951—1955). Адзін з лідараў кансерватыўнай партыі. З 1908 г. неаднаразова знаходзіўся на міністэрскіх пасадах. У 1930-я гг. актыўна выступаў супраць палітыкі «супакойвання» агрэсара. Пасля нападу Германіі на СССР заявіў аб падтрымцы барацьбы савецкага народа. У гады Другой сусветнай вайны стаў сімвалам вытрымкі брытанскага народа. Адзін з ініцыятараў стварэння антыгітлераўскай кааліцыі. Аўтар мемуараў, за якія атрымаў Нобелеўскую прэмію па літаратуры (1953). Пасля вайны рашэннем кангрэса ЗША яму было прысвоена званне ганаровага грамадзяніна ЗША.



**Шарль дэ Голь** (1890—1970), французскі ваенны, палітычны і дзяржаўны дзеяч, прэзідэнт Францыі (1958—1969). У 1920—1930-х гг. выкладаў ваенную гісторыю, служыў памочнікам маршала А. Петэна, напісаў некалькі кніг па пытаннях ваеннай стратэгіі і тактыкі. У адной з іх настойваў на механізацыі сухапутных войскаў, і перш за ўсё на шырокамаштабным выкарыстанні танкаў ва ўзаемадзеянні з авіяцыяй і пяхотай. Калі маршал Петэн вёў перамовы з Германіяй аб капітуляцыі Францыі, дэ Голь па-



Правообладатель Народная асвета

ляцеў у Лондан, адкуль 18 чэрвеня па радыё звярнуўся з заклікам да суайчыннікаў працягваць барацьбу з захопнікамі. Заснаваў у Лондане рух «Свабодная Францыя». Стаў сімвалам французскага Супраціўлення. З 1943 г. знаходзіўся ў Алжыры, дзе быў створаны Французскі камітэт нацыянальнага вызвалення (ФКНО), перайменаваны ў чэрвені 1944 г. у Часовы ўрад Французскай рэспублікі. Пасля вайны займаўся палітычнай дзейнасцю. Заснавальнік і першы прэзідэнт Пятай рэспублікі. У 1969 г. пасля паражэння на рэферэндуме добраахвотна пакінуў свой пост. Аўтар «Ваенных мемуараў».

## § 25. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны

**Успомніце:** Калі і чаму быў заключаны дагавор аб ненападзенні паміж Германіяй і Савецкім Саюзам? Якія ідэі ляжалі ў аснове захопніцкай палітыкі Германіі на Усходзе?

**Нападзенне Германіі на СССР.** Раніцай **22 чэрвеня 1941 г.** фашысцкая Германія без папярэдняга аб'яўлення вайны напала на Савецкі Саюз. Супраць СССР яна накіравала амаль 80 % агульнай колькасці сваіх войскаў. Да іх далучыліся войскі Італіі, Румыніі, Венгрыі і Фінляндыі.

**Суадносіны сіл СССР і Германіі на 22 чэрвеня 1941 г.**

| Сілы і сродкі | СССР (заходнія акругі) | Германія і яе саюзнікі | Суадносіны |
|---|---|---|---|
| Дывізіі | 167 | 181 | 1,0 : 1,08 |
| Асабісты састаў, млн чал. | 2,9 | 5,5 | 1,0 : 1,9 |
| Гарматы і мінамёты, тыс. шт. | 39,4 | 47,2 | 1,0 : 1,43 |
| Баявыя самалёты, тыс. шт. | 9,2 | 5,0 | 1,0 : 0,54 |
| Танкі і штурмавыя гарматы, тыс. шт. | 14,2 | 4,3 | 1,0 : 0,3 |

На асноўных напрамках наступлення германскія войскі мелі значную перавагу над Чырвонай Арміяй. Група армій «Поўнач» пад камандаваннем В. фон Лееба захапіла ўсю Прыбалтыку і блакіравала Ленінград. Група армій «Цэнтр» пад камандаваннем Ф. фон Бока нанесла паражэнне Чырвонай Арміі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У акружэнні апынулася звыш 300 тыс. савецкіх байцоў. 28 чэрвеня немцы занялі Мінск і да канца лета 1941 г. акупіравалі ўсю Беларусь. Значныя страты панеслі немцы пры штурме Брэсцкай крэпасці, і асабліва падчас гераічнай абароны Магілёва. У жніўні часткі вермахта падышлі непасрэдна да Смаленска. Завязаліся жорсткія баі за горад. Смаленская бітва адыграла вялікую ролю ў зрыве нямецкага плана «маланкавай вайны». Група армій «Поўдзень» пад камандаваннем Г. фон Рунштэта да верасня 1941 г. захапіла значную част-



Правообладатель Народная асвета




План «Барбароса»



Правообладатель Народная асвета

ку Правабярэжнай Украіны і падышла да Кіева. 19 верасня немцы занялі горад. Савецкія войскі ў раёне Кіева страцілі забітымі і палоннымі больш за 600 тыс. чалавек.

За першыя месяцы вайны Чырвоная Армія страціла каля паловы танкаў і самалётаў, а таксама значную частку свайго асабістага саставу. Была акупіравана тэрыторыя, на якой знаходзілася амаль палова ўсіх прамысловых прадпрыемстваў краіны. Пад акупацыяй апынуліся 60 млн чалавек з 197-мільённага насельніцтва СССР. У нямецкі палон трапілі 3,8 млн савецкіх ваеннаслужачых.

Няўдачы Чырвонай Арміі ў пачатковы перыяд вайны былі абумоўлены шэрагам прычын. Да чэрвеня 1941 г. у руках Германіі аказаліся эканамічныя і ваенныя рэсурсы амаль усёй Заходняй Еўропы. Германскія войскі валодалі вялікім вопытам вядзення вайны. Сваю ролю адыграла і нечаканасць нападзення Германіі. Нягледзячы на тое што многія военачальнікі неаднаразова прапаноўвалі І. В. Сталіну прывесці армію ў стан баявой гатоўнасці, ён катэгарычна адхіляў такія прапановы. І толькі за некалькі гадзін да нападзення Германіі Сталін выдаў дырэктыву аб прывядзенні войскаў у баявую гатоўнасць, але час быў страчаны. Камандны састаў Чырвонай Арміі быў аслаблены рэпрэсіямі напярэдадні вайны. Няўдалым аказалася размеркаванне савецкіх войскаў у Беларусі, асабліва на Беластоцкім выступе, чым скарысталіся немцы. Савецкае камандаванне чакала галоўны ўдар германскіх войскаў ва Украіне і сканцэнтравала там значныя сілы Чырвонай Арміі.

У сувязі з вайной у чэрвені 1941 г. у СССР былі створаны надзвычайныя органы па кіраўніцтве краінай і арміяй — **Дзяржаўны Камітэт Абароны (ДКА)** на чале з І. В. Сталіным, **Савет па эвакуацыі**, **Стаўка Галоўнага Камандавання**, неўзабаве пераўтвораная ў Стаўку Вярхоўнага Галоўнакамандавання. Стаўку ўзначаліў Сталін, які 8 жніўня стаў Вярхоўным Галоўнакамандуючым. Гэтыя органы правялі вялікую работу па мабілізацыі народа і арміі на барацьбу з фашысцкай Германіяй. Вялікую ролю ў гэтым адыграла выступленне І. В. Сталіна па радыё *3 ліпеня 1941 г.*, у якім ён заклікаў да абароны Айчыны, выказаў упэўненасць у перамозе над Германіяй і назваў барацьбу супраць нямецкіх захопнікаў «усенароднай Айчыннай вайной».



Плакат І. Таідзэ «Радзіма-маці кліча!». 1941 г.

З пачаткам вайны ўвесь савецкі народ падняўся на барацьбу з ворагам. Своеасаблівым гімнам, які ў гэты цяжкі час натхняў савецкіх людзей на подзвіг, стала песня «Свяшчэнная вайна» кампазітара А. В. Аляксандрава на словы В. І. Лебедзева-Кумача.



Правообладатель Народная асвета

Дзякуючы мужнаму супраціўленню савецкіх войскаў і насельніцтва гітлераўцы так і не здолелі ажыццявіць план разгрому Чырвонай Арміі ў прыгранічных баях. Абарона Магілёва, савецкія контрудары пад Смаленскам затрымалі наступленне вермахта. Аднак восенню 1941 г. германскія войскі ўсё ж выйшлі на подступы да Масквы.

**Бітва пад Масквой.** Гітлераўскае камандаванне надавала вялікае значэнне акружэнню і ўзяццю Масквы, звязваючы перамогу ў гэтай бітве з заканчэннем вайны. Генеральнае наступленне на Маскву ў адпаведнасці з нямецкім планам «Тайфун» пачалося **30 верасня 1941 г**. Аднак ужо ў канцы кастрычніка, дзякуючы ўпартаму супраціўленню савецкіх войскаў, гітлераўскае наступленне было спынена. Вялікую ролю ў арганізацыі абароны адыграў камандуючы Заходнім фронтам Г. К. Жукаў.

7 лістапада 1941 г. у Маскве на Чырвонай плошчы, як і ў перадваенныя гады, прайшоў парад войскаў Чырвонай Арміі. З парада баявыя падраздзяленні накіроўваліся на фронт — непасрэдна ў бой.

15 лістапада нямецкае камандаванне пачало новае наступленне на Маскву. У цяжкіх абарончых баях войскі Заходняга фронту абяскровілі варожыя ўдарныя групоўкі і спынілі іх рух наперад. Наступленне было сарвана.

Неўвядальнай славай у баях за Маскву пакрыў сябе лётчык *В. В. Талаліхін*, які здзейсніў начны паветраны таран, 28 байцоў са стралковай дывізіі генерала *І. В. Панфілава*, якія цаной свайго жыцця не прапусцілі танкі ворага да Масквы. Сапраўды неўміручымі сталі словы палітрука *В. Г. Клачкова-Дзіева:* «Вялікая Расія, а адступаць няма куды, за намі Масква». Схопленая пры выкананні баявога задання 18-гадовая камсамолка *Зоя Касмадзям'янская* вытрымала ўсе катаванні, але не выдала сваіх таварышаў.

5—6 снежня 1941 г. савецкія войскі пад камандаваннем **Г. К. Жукава** і **І. С. Конева** перайшлі ў контрнаступленне. Пагроза сталіцы была ліквідавана. Падчас агульнага наступлення Чырвонай Арміі, якое пачалося ў студзені 1942 г., фашысты згубілі каля 50 дывізій і былі адкінуты на 100—250 км.

Перамога савецкіх войскаў у Маскоўскай бітве, якая працягвалася да **20 красавіка 1942 г.**, азначала першае сур'ёзнае паражэнне гітлераўскіх войскаў у Другой сусветнай вайне. Стратэгія «маланкавай вайны», якая паспяхова прымянялася гітлераўцамі ў Заходняй Еўропе, пацярпела крах. Германія была пастаўлена перад перспектывай вядзення зацяжной вайны, да якой яна не была падрыхтавана. Перамога пад Масквой падняла



Абарончыя збудаванні («яжы») пад Масквой. 1941 г.



Правообладатель Народная асвета

міжнародны аўтарытэт СССР. Яна паскорыла стварэнне **антыгітлераўскай кааліцыі** — саюза дзяржаў і народаў, якія змагаліся ў гады Другой сусветнай вайны супраць фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў.

**Стварэнне антыгітлераўскай кааліцыі. Уступленне ў вайну ЗША.** Ужо 22 чэрвеня 1941 г. прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі У. Чэрчыль у сваім звароце па радыё да англійскага народа заявіў аб неабходнасці аб'яднання намаганняў у барацьбе супраць фашысцкай Германіі. У ліпені ў Лондане было падпісана пагадненне паміж урадамі СССР і Вялікабрытаніі аб сумесных дзеяннях у вайне. У гэтым жа месяцы Савецкі Саюз падпісаў дагаворы аб супрацоўніцтве з урадамі Польшчы і Чэхаславакіі, якія знаходзіліся ў эміграцыі ў Лондане.

Паступова адыходзіў ад нейтралітэту ў вайне і ўрад ЗША. У **жніўні 1941 г.** Ф. Д. Рузвельт і У. Чэрчыль падпісалі *Атлантычную хартыю*, у якой ставілася мэта скінуць «нацысцкую тыранію». СССР адобрыў змест хартыі. Яшчэ ў сакавіку 1941 г. кангрэс ЗША прыняў закон аб **ленд-лізе**. Паводле яго дазвалялася пазыка ці арэнда ваеннай тэхнікі, зброі, амуніцыі, стратэгічнай сыравіны і харчавання дзяржавам, якія вялі вайну супраць Германіі. У лістападзе 1941 г. дзеянне закона было распаўсюджана на СССР.

*Восенню 1941 г.* у Маскве адбылася канферэнцыя прадстаўнікоў СССР, Вялікабрытаніі і ЗША, на якой дзяржавы ўзгаднілі планы дзеянняў і аб'ёмы ваенных паставак.

**7 снежня 1941 г.** у выніку нападзення Японіі на амерыканскую ваенна-марскую базу *Пёрл-Харбар* на Гавайскіх астравах флот ЗША панёс вялікія страты. У адказ на гэта вераломнае нападзенне ЗША і Англія аб'явілі вайну Японіі, што ў сваю чаргу выклікала аб'яўленне вайны Злучаным Штатам з боку Германіі і Італіі. З гэтага часу ўсе буйнейшыя дзяржавы свету аказаліся ўцягнутымі ў ваенныя дзеянні.

**1 студзеня 1942 г.** 26 дзяржаў, якія прымалі ўдзел у вайне супраць Германіі і яе саюзнікаў, у тым ліку СССР, ЗША, Вялікабрытанія і Кітай, падпісалі ў Вашынгтоне *Дэкларацыю Аб'яднаных Нацый* (Вашынгтонскую дэкларацыю) аб сумеснай барацьбе супраць агрэсараў. У ёй было зафіксавана іх імкненне дабівацца поўнай перамогі над Германіяй і яе саюзнікамі. У маі 1942 г. быў падпісаны савецка-англійскі дагавор аб саюзе, у чэрвені — заключана савецка-амерыканскае пагадненне «Аб прынцыпах, прымянімых да ўзаемнай дапамогі ў вядзенні вайны супраць агрэсіі». СССР, ЗША і Вялікабрытанія дасягнулі дамоўлена-



Налёт японскай авіяцыі на Пёрл-Харбар. 7 снежня 1941 г.



Правообладатель Народная асвета

сці аб адкрыцці другога фронту ў Еўропе. Так канчаткова склалася антыгітлераўская кааліцыя.

**Баі на савецка-германскім фронце летам 1942 г.** Не дасягнуўшы поспеху на маскоўскім напрамку, А. Гітлер прыняў рашэнне аб наступленні на паўднёвым. Ён разлічваў захапіць буйныя прамысловыя, сельскагаспадарчыя і нафтаздабываючыя раёны Савецкага Саюза. Летам 1942 г. гітлераўцы авалодалі Данбасам, правабярэжжам Дона, выйшлі да перадгор'яў Галоўнага Каўказскага хрыбта і стварылі непасрэдную пагрозу Сталінграду.


WAR EXTRA! WAR EXTRA!
Seattle Post-Intelligencer
JAPAN, U.S. AT WAR
104 DIE IN HAWAII RAID:
2 U.S. TRANSPORTS SUNK

Абвяшчэнне Злучанымі Штатамі вайны Японіі, надрукаванае ў газеце

28 ліпеня 1942 г. Сталін выдаў загад № 227, вядомы пад назвай «Ні кроку назад!». У адпаведнасці з загадам байцы і камандзіры Чырвонай Арміі, якія «правініліся», накіроўваліся ў штрафныя роты і батальёны. Гэтыя падраздзяленні выкарыстоўваліся на самых цяжкіх участках фронту, дзе штрафнікі маглі «змыць сваю віну крывёю». Прадугледжвалася таксама стварэнне загараджальных атрадаў, якія размяшчаліся ў тыле войскаў і ў выпадку адступлення франтавых часцей расстрэльвалі на месцы «панікёраў і баязліўцаў».

Абарончыя баі Чырвонай Арміі ў пачатковы перыяд вайны, якія не дазволілі германскаму камандаванню ажыццявіць план «маланкавай вайны», перамога савецкіх войскаў у бітве пад Масквой, якая развеяла міф аб непераможнасці германскай арміі, упартая абарона Сталінграда — усё гэта стварала аснову для карэннага пералому ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны.

?

1. Які план быў распрацаваны Германіяй для вайны з Савецкім Саюзам? Ахарактарызуйце яго.
2. Прааналізуйце суадносіны сіл СССР і Германіі на 22 чэрвеня 1941 г. Чаму для Чырвонай Арміі вайна пачалася цяжкімі паражэннямі?
3. Якія надзвычайныя органы былі створаны ў СССР для аказання адпору захопнікам? Ахарактарызуйце дзейнасць палітычнага і ваеннага кіраўніцтва СССР на пачатковым этапе Вялікай Айчыннай вайны.
4. Ахарактарызуйце бітву пад Масквой. Якое было яе значэнне для далейшага ходу Другой сусветнай вайны? Якія фактары садзейнічалі зрыву плана «маланкавай вайны» Германіі супраць СССР?
5. Складзіце храналагічную табліцу «Стварэнне антыгітлераўскай кааліцыі». Якія агульныя інтарэсы аб'ядналі яе ўдзельнікаў? Ці існавалі паміж імі супярэчнасці?
6. У выніку якой падзеі ЗША ўступілі ў Другую сусветную вайну? Што прадугледжваў прыняты кангрэсам ЗША закон аб ленд-лізе?

**Прапануем абмеркаваць.** Існуе меркаванне аб тым, што Гітлер і Сталін рыхтаваліся да вайны ў Еўропе, маючы на ўвазе свае мэты. Таму яны ў роўнай ступені нясуць адказнасць за развязванне Другой сусветнай вайны. На гэтай падставе адмаўляецца вызваленчы характар Вялікай Айчыннай вайны. А як вы лічыце, хто вінаваты ў развязванні Другой сусветнай вайны?



Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Георгій Канстанцінавіч Жукаў** (1896—1974), савецкі дзяржаўны і ваенны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза, чатыры разы Герой Савецкага Саюза. На ваеннай службе з 1915 г. Удзельнік Першай сусветнай вайны. У 1939 г. прымаў удзел у разгроме японскіх войскаў на р. Халхін-Гол у Манголіі. Палкаводчы талент Жукава ярка раскрыўся ў Вялікую Айчынную вайну. З чэрвеня 1941 г. — член Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання, з жніўня 1942 г. — першы намеснік наркама абароны і намеснік Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Войскі пад яго камандаваннем адыгралі вырашальную ролю ў Маскоўскай бітве. Ажыццяўляў каардынацыю дзеянняў франтоў у Сталінградскай бітве, пры прарыве блакады Ленінграда, у Курскай бітве, у бітве за Днепр, у Беларускай аперацыі. Камандаваў 1-м Беларускім фронтам, які ўдзельнічаў у Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацыях. У ноч на 9 мая 1945 г. ад СССР падпісаў Акт аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі. 24 чэрвеня 1945 г. прымаў Парад Перамогі, які адбыўся ў Маскве на Чырвонай плошчы. Пасля вайны займаў шэраг кіруючых пасад ва Узброеных Сілах СССР. У 1955—1957 гг. — міністр абароны СССР. Аўтар кнігі «Успаміны і роздум» (1969), якая пачыналася словамі: «Савецкаму Салдату прысвячаю. Г. Жукаў».



**Іван Сцяпанавіч Конеў** (1897—1973), савецкі ваенны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза. На ваеннай службе з 1916 г. Удзельнік Першай сусветнай вайны. Падчас Грамадзянскай вайны ўдзельнічаў у баях супраць войскаў Калчака, банд Сямёнава і японскіх інтэрвентаў. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзэ (1934). З 1940 г. камандуючы войскамі Забайкальскай і Паўночна-Каўказскай ваеннай акруг. У Вялікую Айчынную вайну камандуючы 19-й арміяй (лета 1941), Заходнім (верасень — кастрычнік 1941, жнівень 1942 — люты 1943), Калінінскім (кастрычнік 1941 — жнівень 1942), Паўночна-Заходнім (сакавік — чэрвень 1943), Сцяпным (ліпень — кастрычнік 1943), 2-м Украінскім (кастрычнік 1943 — май 1944) і 1-м Украінскім (май 1944 — май 1945) франтамі. Удзельнік Маскоўскай, Курскай бітваў, Кіраваградскай, Корсунь-Шаўчэнкаўскай, Уманска-Батašанскай, Львоўска-Сандамірскай, Вісла-Одэрскай, Берлінскай, Пражскай аперацый. Пасля вайны займаў шэраг кіруючых пасад. Аўтар успамінаў «Сорак пяты» (1970) і «Запіскі камандуючага фронтам, 1943—1944» (1972).



Правообладатель Народная асвета

## ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**Ленд-ліз** — дзяржаўная праграма, згодна з якой ЗША, у асноўным на бязвыплатнай аснове, перадавалі сваім саюзнікам у Другой сусветнай вайне боепрыпасы, тэхніку, прадукты харчавання і стратэгічную сыравіну. Гэтая праграма давала прэзідэнту ЗША магчымасць дапамагаць любой краіне, чыя абарона прызнавалася жыццёва важнай для яго краіны. Закон аб ленд-лізе («Закон па забеспячэнні абароны Злучаных Штатаў») быў прыняты кангрэсам ЗША 11 сакавіка 1941 г. Хоць агульны аб'ём паставак складаў, па падліках савецкіх эканамістаў, прыкладна 4 % валавой прамысловай вытворчасці СССР у гады вайны, па асобных відах узбраенняў пастаўкі былі вельмі значныя: аўтамабіляў — каля 70 %, танкаў — 12 %, самалётаў — 10 %. Некаторыя віды тэхнікі, якая паступала, напрыклад радыёлакацыйная і гідраакустычная апаратура, у СССР наогул не выпрацоўваліся. Сярод паставак па ленд-лізе важнае месца таксама займалі баявыя караблі і катары для ВМФ, рухомы чыгуначны парк, боепрыпасы, тэхнічнае абсталяванне, каляровыя металы, розныя віды стратэгічнай сыравіны і матэрыялаў, абутак, прадукты харчавання і інш.

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

**З выступлення па англійскім радыё прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі У. Чэрчыля**

*22 чэрвеня 1941 г.*

Нацысцкаму рэжыму ўласцівы найгоршыя рысы... У яго няма ніякіх... прынцыпаў, акрамя... імкнення да расавага панавання. Па сваёй жорсткасці і лютай агрэсіўнасці ён пераўзыходзіць усе формы чалавечай сапсаванасці. За апошнія 25 гадоў ніхто не быў больш паслядоўным праціўнікам камунізму, чым я. Я не вазьму назад ніводнага слова, якое я сказаў пра яго. Але ўсё гэта бляднее перад відовішчам, якое зараз разгортваецца... Я бачу рускіх салдат, якія стаяць на парозе сваёй роднай зямлі... Я бачу, як яны абараняюць свае дамы, дзе іх маці і жонкі моляцца — так, бываюць часы, калі моляцца ўсе, — аб бяспецы сваіх блізкіх, аб вяртанні свайго карміцеля, свайго абаронцы і апоры... Я бачу, як на ўсё гэта насоўваецца гнюсная ваенная машына...

Мы поўныя рашучасці знішчыць Гітлера і ўсе сляды нацысцкага рэжыму... Адсюль вынікае, што мы акажам Расіі і рускаму народу ўсю дапамогу, якую толькі здолеем...

*Чаму Вялікабрытанія выступіла ў падтрымку СССР пасля нападзення на яго Германіі? Як гэта выступленне характарызуе прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі У. Чэрчыля?*



Правообладатель Народная асвета

### З выступлення І. В. Сталіна па радыё

*3 ліпеня 1941 г.*

…Вайну з фашысцкай Германіяй нельга лічыць вайной звычайнай. Яна з'яўляецца не толькі вайной паміж дзвюма арміямі. Яна з'яўляецца разам з тым вайной усяго савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх войскаў. Мэтай гэтай усенароднай Айчыннай вайны супраць фашысцкіх прыгнятальнікаў з'яўляецца не толькі ліквідацыя небяспекі, якая навісла над нашай краінай, але і дапамога ўсім народам Еўропы, якія стогнуць пад ярмом германскага фашызму. У гэтай вызваленчай вайне мы не будзем адзінокімі. У гэтай вялікай вайне мы будзем мець верных саюзнікаў у асобе народаў Еўропы і Амерыкі, у тым ліку ў асобе германскага народа, заняволенага гітлераўскімі заправіламі. Наша вайна за свабоду нашай Айчыны сальецца з барацьбой народаў Еўропы і Амерыкі за іх незалежнасць, за дэмакратычныя свабоды. Гэта будзе адзіны фронт народаў, якія стаяць за свабоду супраць зняволення і пагрозы зняволення з боку фашысцкіх армій Гітлера.

*Як І. В. Сталін вызначыў характар і мэты Савецкага Саюза ў вайне супраць нацысцкай Германіі? Каго ён бачыў саюзнікамі СССР у барацьбе супраць фашызму?*

ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

### З успамінаў камандуючага 2-й танкавай групы ў складзе групы армій «Цэнтр» Г. Гудэрыяна

Паводле дакументальных даных, якія я меў, 205 нашых дывізій на 22 чэрвеня 1941 г. размяркоўваліся наступным чынам: 38 дывізій знаходзіліся на захадзе, 12 дывізій — у Нарвегіі, 1 дывізія — у Даніі, 7 дывізій — на Балканах, 2 дывізіі — у Лівіі, 145 дывізій маглі быць выкарыстаны для ўсходняй кампаніі.

Такое размеркаванне сіл сведчыла аб непатрэбным драбненні...

Балканская кампанія прывяла да таго, што перакідка войскаў на ўсход пачалася са спазненнем.

Але яшчэ больш пагібельнай была недаацэнка сіл праціўніка... Гітлер не верыў... паведамленням аб моцы прамысловасці і трываласці дзяржаўнай сістэмы Расіі. Затое ён умеў перадаць свой неабгрунтаваны аптымізм непасрэднаму ваеннаму асяродку. У вярхоўным камандаванні ўзброеных сіл і ў галоўным камандаванні сухапутных сіл так упэўнена разлічвалі скончыць кампанію да пачатку зімы, што ў сухапутных войсках зімовае абмундзіраванне было прадугледжана толькі для кожнага пятага салдата...

...Вярхоўнае камандаванне думала зламаць ваенную моц Расіі на працягу 8—10 тыдняў, выклікаўшы гэтым і яе палітычны крах. Яно было так упэўне-



Правообладатель Народная асвета

на ў поспеху сваёй неразумнай задумы, што найважнейшыя галіны ваеннай прамысловасці ўжо восенню 1941 г. былі пераключаны на вытворчасць іншай прадукцыі. Думалі нават з пачаткам зімы вывесці з Расіі 60—80 дывізій, вырашыўшы, што дывізій, якія засталіся, будзе дастаткова для таго, каб на працягу зімы падавіць Расію…

## § 26. Карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў

**Успомніце:** Калі і як Германія планавала закончыць вайну супраць Савецкага Саюза? Якое значэнне для ходу Другой сусветнай вайны меў разгром германскіх войскаў пад Масквой?

**Сталінградская і Курская бітвы.** Вырашальнай падзеяй Другой сусветнай вайны стала **Сталінградская бітва**. Яна пачалася **17 ліпеня 1942 г.** прарывам нямецка-фашысцкімі войскамі лініі фронту, якая праходзіла па рацэ Дон. Праціўнік спрабаваў любой цаной авалодаць горадам, але савецкія войскі ўпарта яго абаранялі. Падчас абароны Сталінграда вызначылася падраздзяленне, якім камандаваў сяржант *Я. Ф. Паўлаў*. Яно працяглы час трымала абарону ў звычайным жылым доме. Пакінуты пасля вайны зруйнаваным Дом Паўлава служыць помнікам тых грозных падзей.



Дом Паўлава ў Сталінградзе

**Суадносіны сіл на Сталінградскім напрамку ў лістападзе 1942 г.**

| Баявыя сілы і сродкі | Чырвоная Армія | Германія і яе саюзнікі |
|---|---|---|
| Асабісты састаў (тыс. чал.) | 1134,8 | 1011,5 |
| Колькасць танкаў | 1560 | 675 |
| Колькасць гармат і мінамётаў | 14 934 | 10 290 |
| Колькасць самалётаў | 1916 | 1219 |

Цаной вялізнага напружання сіл усяго савецкага народа наступленне нямецка-фашысцкіх войскаў пад Сталінградам было спынена. Савецкае камандаванне падрыхтавала план стратэгічнай наступальнай аперацыі «Уран», галоўнай мэтай якой было акружэнне 6-й нямецкай арміі. У якасці адцягваючага ўвагу манеўра савецкія войскі рыхтавалі контрнаступленне ў раёне Ржэва (аперацыя «Марс»). Раніцай 19 лістапада 1942 г. магутнай артылерыйскай падрыхтоўкай пачалося контрнаступленне савецкіх войскаў пад Сталінградам. Кіраўніцтва контрнаступленнем Стаўка ўсклала на Г. К. Жукава і **А. М. Васілеўскага**. Войскі Паўднёва-Заходняга



Правообладатель Народная асвета

(пад камандаваннем М. Ф. Ватуціна), Данскога (на чале з К. К. Ракасоўскім), затым і Сталінградскага (камандуючы А. І. Яроменка) франтоў прарвалі абарону праціўніка і 23 лістапада злучыліся ў раёне г. Калач. Нямецка-фашысцкая групоўка колькасцю 330 тыс. чалавек (22 дывізіі) трапіла ў акружэнне. Асноўную сілу гэтай групоўкі складала 6-я нямецкая армія, якой камандаваў генерал Ф. Паўлюс. На дапамогу 6-й арміі А. Гітлер накіраваў армейскую групу «Дон» пад камандаваннем фельдмаршала Э. Манштэйна. Аднак немцам не ўдалося дэблакіраваць акружаную групоўку. **2 лютага 1943 г.** акружаныя нямецкія войскі капітулявалі. У палон здаліся Паўлюс, якому за дзень да гэтага было прысвоена званне фельдмаршала, і яшчэ 24 германскія генералы.



Камандуючы 6-й нямецкай арміяй Ф. Паўлюс, узяты ў палон у Сталінградзе

Разгром нямецка-фашысцкіх войскаў у ходзе Сталінградскай бітвы падарваў ваенную магутнасць Германіі і яе саюзнікаў. Агульныя страты нямецкіх войскаў у раёне Дона, Волгі і Сталінграда склалі каля 1,5 млн чалавек, 3,5 тыс. танкаў і больш за 3 тыс. самалётаў. Былі цалкам разгромлены 3-я і 4-я румынскія арміі (250 тыс.), 8-я італьянская армія (185 тыс.). Страты Чырвонай Арміі падчас Сталінградскай бітвы перавысілі 1,2 млн чалавек. Пасля Сталінграда маральны дух вермахта ў значнай ступені быў зламаны.

Разгром нямецкіх войскаў і іх саюзнікаў пад Сталінградам прывёў да агульнага наступлення Чырвонай Арміі. Пачаўся карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Умацавалася антыгітлераўская кааліцыя, а Японія ўстрымалася ад уступлення ў вайну супраць СССР.

У пачатку 1943 г. савецкія войскі нанеслі адчувальныя ўдары па праціўніку і на іншых франтах. У студзені быў ажыццёўлены прарыў блакады Ленінграда, разгарнулася наступленне Паўночна-Каўказскага і Паўднёвага франтоў. Савецкія салдаты праяўлялі масавы гераізм і стойкасць. Так, у баі за вёску Чарнушкі (Пскоўская вобласць) 27 лютага 1943 г. здзейсніў несмяротны подзвіг 19-гадовы радавы *А. М. Матросаў*. Ён закрыў сваім целам амбразуру варожага кулямётнага дзота. Гэта дазволіла савецкім салдатам паспяхова атакаваць праціўніка.

Германія не магла змірыцца з паражэннем пад Сталінградам і імкнулася ўзяць рэванш. Вясной 1943 г. увагу германскага камандавання прыцягнуў выступ у лініі фронту, накіраваны на захад, — так званая **Курская дуга**. У раёнах гарадоў Арол і Белгарад сканцэнтраваліся буйныя сілы вермахта для нанясення ўдараў у напрамку Курска (аперацыя «Цытадэль»). У гэты час на ўзбраенне германскай арміі паступілі новыя танкі «Тыгр» і «Пантэра» і самаходныя гарматныя ўстаноўкі «Фердынанд».



Правообладатель Народная асвета

Наступленне германскіх войскаў пачалося **5 ліпеня 1943 г.** Яно не стала нечаканасцю для савецкага камандавання. За некалькі гадзін да пачатку аперацыі войскі Чырвонай Арміі нанеслі магутны апераджальны артылерыйскі ўдар па пазіцыях праціўніка, што значна аслабіла яго наступленне. Падчас жорсткіх і ўпартых баёў праціўнік так і не здолеў прарвацца да Курска. Цэнтральны і Варонежскі франты пад камандаваннем К. К. Ракасоўскага і М. Ф. Ватуціна змаглі вытрымаць удар немцаў. 12 ліпеня пачалося контрнаступленне савецкіх войскаў. 5 жніўня былі вызвалены Арол і Белгарад. У гэты дзень упершыню за гады вайны ў Маскве быў праведзены пераможны салют. Закончылася бітва на Курскай дузе вызваленнем Харкава **23 жніўня 1943 г.**

У баях на Курскай дузе прымаў удзел лётчык А. П. Марэсьеў. Менавіта тут пісьменнік Б. М. Палявой пазнаёміўся з гэтым дзіўным чалавекам. Размаўляючы з Марэсьевым, пісьменнік даведаўся, што ў лётчыка няма абедзвюх ног. Зімой у адным з паветраных баёў самалёт Марэсьева быў падбіты. Васямнаццаць сутак цяжка паранены лётчык дабіраўся да сваіх і моцна абмарозіўся. Пасля ампутацыі ног Марэсьеў асвоіў пратэзы, дабіўся вяртання ў полк і ў наступных баях збіў 7 самалётаў праціўніка. Палявой апісаў подзвіг лётчыка ў кнізе «Аповесць аб сапраўдным чалавеку».




Карэнны пералом у Вялікай Айчыннай вайне



Правообладатель Народная асвета

Бітва пад Курскам стала адной з ключавых падзей Другой сусветнай вайны. Падчас яе пад Прохараўкай адбылася адна з буйнейшых танкавых бітваў, у якой прынялі ўдзел звыш 1200 танкаў з абодвух бакоў. У цэлым у ходзе бітвы вермахт страціў 30 дывізій (каля 500 тыс. салдат). Пасля Курскай бітвы стратэгічная ініцыятыва ў вядзенні вайны канчаткова перайшла да Савецкага Саюза.

Пасля Курска нямецкае камандаванне ўмацавала абарончую лінію па Дняпры (лінія «Пантэра»). Аднак у верасні — кастрычніку 1943 г. Чырвоная Армія здолела ў шэрагу месцаў фарсіраваць Днепр. У баях за Днепр вызначыўся малады лётчык лейтэнант Р. У. Дольнікаў. Пратараніўшы самалёт, ён выскачыў з парашутам, быў паранены, трапіў у палон і апынуўся ў фашысцкім канцлагеры. Толькі з трэцяй спробы яму ўдалося збегчы і дабрацца да партызан. У пачатку 1944 г. лётчык вярнуўся ў свой полк. Быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Г. У. Дольнікаў стаў правобразам галоўнага героя апавядання М. А. Шолахава «Лёс чалавека».

*23 верасня 1943 г.* савецкія войскі занялі першы раённы цэнтр БССР — *Камарын. 25 верасня* быў вызвалены *Смаленск, 6 лістапада* — сталіца Украінскай ССР *Кіеў*. У ходзе далейшага наступлення ў 1943 г. савецкія войскі вызвалілі каля $^{2}/_{3}$ акупіраванай тэрыторыі СССР. Пералом у ходзе вайны быў дасягнуты галоўным чынам намаганнямі народаў Савецкага Саюза і яго ўзброеных сіл. Гэтаму таксама садзейнічалі паспяховыя дзеянні саюзнікаў на іншых франтах і дапамога ЗША па ленд-лізе. Перамога на Курскай дузе і бітва за Днепр завяршылі пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.

**Ваенныя дзеянні саюзнікаў у канцы 1942—1943 гг. Умацаванне антыгітлераўскай кааліцыі.** Выкарыстоўваючы тыя абставіны, што на савецка-германскім фронце было занята $^{3}/_{4}$ усіх нямецкіх дывізій, Вялікабрытанія і ЗША здолелі дабіцца поспеху ў барацьбе на іншых франтах. У Паўночнай Афрыцы восенню 1942 г. англічане пасля працяглых баёў каля горада **Эль-Аламейна** спачатку спынілі нямецка-італьянскае наступленне на Егіпет, а затым разграмілі нямецкую армію Э. Ромеля. У бітве пры Эль-Аламейне праславіўся англійскі военачальнік **Б. Мантгомеры**.

У лістападзе 1942 г. у Марока і Алжыры высадзіліся англа-амерыканскія войскі, якія ўзначальваў амерыканскі генерал *Д. Эйзенхаўэр*. Наступаючы з двух бакоў, войскі Англіі і ЗША ў пачатку мая 1943 г. акружылі ў *Тунісе* вялікую нямецка-італьянскую групоўку, якая неўзабаве капітулявала.

У *ліпені 1943 г.* саюзнікі высадзіліся на востраве *Сіцылія* і пачалі вызваленне Італіі. Супраць Б. Мусаліні выступілі італьянскія ваенныя і некаторыя з яго паплечнікаў. 25 ліпеня 1943 г. Вялікі Фашысцкі Савет выказаў недавер Б. Мусаліні. Пасля гэтага ён быў зняты з усіх сваіх пасад і арыштаваны. Урад узначаліў маршал



Правообладатель Народная асвета

*П. Бадольё*. Новы ўрад *8 верасня 1943 г.* падпісаў перамір'е з англа-амерыканскім камандаваннем і неўзабаве аб'явіў вайну Германіі. 12 верасня нямецкія дэсантнікі вызвалілі Мусаліні, які па ўказанні Гітлера ўзначаліў «Італьянскую сацыяльную рэспубліку» са сталіцай у г. Сало на поўначы Італіі. Марыянетачная «Рэспубліка Сало» праіснавала да канца красавіка 1945 г.

Поспех у ваенных дзеяннях садзейнічаў саюзнікам і на ціхаакіянскіх прасторах, і ў Паўднёва-Усходняй Азіі. У Японіі не хапала сіл для вядзення барацьбы на такой вялікай тэрыторыі. З **лета 1942 г.**, пасля паражэння, нанесенага амерыканцамі японскаму флоту каля **вострава Мідуэй**, Японія стала саступаць адну пазіцыю за другой. У **пачатку 1943 г.** японцы прайгралі бітву за востраў **Гуадалканал** (Саламонавы астравы).

Нарастанне барацьбы супраць краін фашысцкага блока садзейнічала ўмацаванню палітычнага супрацоўніцтва ўдзельнікаў антыгітлераўскай кааліцыі. У кастрычніку 1943 г. адбылася Маскоўская канферэнцыя міністраў замежных спраў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі. На ёй абмяркоўваліся праблемы пасляваеннага ўладкавання свету, пытанне аб адкрыцці другога фронту, аб барацьбе супраць Японіі і інш. Каб наблізіць час адкрыцця другога фронту ў Еўропе, І. В. Сталін паабяцаў саюзнікам уступіць у вайну супраць Японіі праз 3 месяцы пасля перамогі над Германіяй. Аднак ЗША і Вялікабрытанія яшчэ не вызначылі канкрэтнай даты адкрыцця другога фронту.

**28 лістапада — 1 снежня 1943 г.** у *Тэгеране* (*Іран*) адбылася канферэнцыя кіраўнікоў трох дзяржаў — СССР, ЗША і Вялікабрытаніі. Упершыню адбылася сустрэча І. Сталіна, У. Чэрчыля і Ф. Рузвельта. Асноўным пытаннем Тэгеранскай канферэнцыі было адкрыццё другога фронту ў Заходняй Еўропе. Нягледзячы на супраціўленне У. Чэрчыля, які прытрымліваўся стратэгіі барацьбы на Міжземнаморскім тэатры ваенных дзеянняў і накаплення сіл для фарсіравання праліва Ла-Манш, было вырашана адкрыць другі фронт у маі 1944 г.


У. Чэрчыль, Ф. Рузвельт, І. Сталін (злева направа) у час Тэгеранскай канферэнцыі. Лістапад — снежань 1943 г.

Вялікае месца на канферэнцыі было адведзена абмеркаванню праблем пасляваеннага ўладкавання свету. Рузвельт і Сталін у прынцыпе дамовіліся аб стварэнні пасля вайны сусветнай арганізацыі па падтрыманні міру. Вострыя дыскусіі выклікала германскае пытанне, г. зн. праблема пасляваеннага статуса Германіі. Чэрчыль і Рузвельт выступалі за раздзел Германіі на некалькі дзяржаў, у прыватнасці Рузвельт пра-



Правообладатель Народная асвета

панаваў стварыць 5 асобных нямецкіх дзяржаў і два асобныя рэгіёны — Кіль — Гамбург і Рур — Саар. Удзельнікі канферэнцыі былі адзінадушны ў тым, каб прыняць меры па выкараненні германскага мілітарызму і аслабленні ці ліквідацыі Прусіі як дзяржавы. Чэрчыль настойваў, каб Баварыя, Вюртэмберг, Саксонія і іншыя нямецкія землі ўвайшлі ў Дунайскую федэрацыю дзяржаў. У канчатковым выніку вырашэнне германскага пытання было адкладзена.

Вострыя спрэчкі на канферэнцыі выклікала і польскае пытанне. Сталіну ўдалося атрымаць згоду Рузвельта і Чэрчыля на перанос польскай усходняй граніцы на «лінію Керзана», а заходняй — на раку Одэр.

Па выніках канферэнцыі была прынята сумесная дэкларацыя саюзнікаў. У ёй заяўлялася аб неабходнасці ўзмацнення сумеснай барацьбы супраць Германіі і яе саюзнікаў, а таксама намячаліся шляхі пасляваеннага супрацоўніцтва трох асноўных дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі.

?

1. Што азначае паняцце «карэнны пералом у вайне»? Якія падзеі прывялі да карэннага пералому ў ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў?
2. Складзіце сінхранічную табліцу «Карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў».

| Дата | Савецка-германскі фронт | Паўночная Афрыка і Азія |
|---|---|---|
| | | |

3. Прывядзіце прыклады гераізму савецкіх воінаў на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У чым заключаліся вытокі гераізму і мужнасці савецкіх людзей у гады вайны?
4. Ці існавала ўзаемасувязь паміж дзеяннямі Чырвонай Арміі і войскаў саюзнікаў у ходзе Другой сусветнай вайны? Прывядзіце факты.
5. Дзе і калі адбылася першая за гады Другой сусветнай вайны канферэнцыя з удзелам кіраўнікоў дзяржаў У. Чэрчыля, І. В. Сталіна і Ф. Д. Рузвельта? Якія пытанні на ёй абмяркоўваліся? Ці па ўсіх пытаннях існавала адзінства ў кіраўнікоў дзяржаў?

## ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**Бітва пад Прохараўкай.** 12 ліпеня 1943 г. у раёне Прохараўкі разгарнулася сустрэчная танкавая бітва. З абодвух бакоў у бой уступіла звыш 1200 танкаў, велізарная колькасць артылерыі і авіяцыі. Ні аднаму з бакоў не атрымалася дасягнуць мэт, пастаўленых на 12 ліпеня. Немцы не здолелі захапіць Прохараўку, прарваць абарону савецкіх войскаў і выйсці на аператыўны прастор, савецкім войскам не ўдалося поўнасцю акружыць групоўку праціўніка. Тым не менш бітва пад Прохараўкай стала паваротным пунктам у ходзе бітвы на поўдні Курскага выступу. Гераічнымі намаганнямі савецкіх воінаў нямецкае наступленне пад Курскам было спынена.



Правообладатель Народная асвета

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Аляксандр Міхайлавіч Васілеўскі** (1895—1977), савецкі дзяржаўны і ваенны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза. На вайсковай службе з 1915 г. Удзельнік Першай сусветнай і Грамадзянскай вайнаў. Унёс значны ўклад у тэорыю і практыку савецкага вайсковага мастацтва. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў якасці начальніка Генеральнага штаба (1942—1945) прымаў удзел у распрацоўцы і ажыццяўленні практычна ўсіх буйных аперацый на савецка-германскім фронце. У 1945 г. — галоўнакамандуючы савецкімі войскамі на Далёкім Усходзе ў вайне з Японіяй. Пасля вайны займаў шэраг кіруючых пасад. Аўтар мемуараў «Справа ўсяго жыцця» (1973).



**Бернард Лоу Мантгомеры Аламейнскі** (1887—1976), англійскі ваенны дзеяч, фельдмаршал. На вайсковай службе з 1905 г. Са жніўня 1942 г. — камандуючы 8-й арміяй («Арміяй Ніла») у Паўночнай Афрыцы, якая нанесла паражэнне італа-германскім войскам генерала Э. Ромеля пад Эль-Аламейнам (Паўночны Егіпет), а потым дзейнічала ў Сіцыліі і Італіі. У 1944 г. — галоўнакамандуючы саюзнай групай армій, якая высадзілася ў Нармандыі. У 1945 г. — галоўнакамандуючы брытанскімі акупацыйнымі войскамі ў Германіі. Кавалер усіх вышэйшых ордэнаў Вялікабрытаніі і шматлікіх замежных ордэнаў, у тым ліку савецкіх ордэнаў «Перамога» і Суворава 1-й ступені.

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### З выступленняў на пасяджэнні канферэнцыі кіраўнікоў урадаў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі

*Тэгеран, 28 лістапада 1943 г.*

*Сталін:* …Што тычыцца таго, каб з Італіі распачаць наступленне непасрэдна на Германію, то мы, рускія, лічым, што для такіх мэт Італьянскі тэатр не падыходзіць... Мы, рускія, лічым, што найлепшы вынік даў бы ўдар па ворагу ў Паўночнай ці ў Паўночна-Заходняй Францыі... Вядома, гэта цяжкая аперацыя, і немцы ў Францыі будуць шалёна абараняцца, але ўсё ж гэта самае лепшае рашэнне...

*Чэрчыль:* …Перад намі зараз стаіць задача стварыць умовы для магчымасці перакідкі арміі ў Францыю праз Канал [Ла-Манш] у канцы вясны



Правообладатель Народная асвета

1944 года... Наша першая задача заключаецца ў тым, каб узяць Рым... Мы не думаем рухацца далей у Ламбардыю або ісці праз Альпы ў Германію. Мы мяркуем толькі прасоўвацца крыху на поўнач ад Рыма да лініі Піза — Рыміні, пасля чаго можна было б зрабіць высадку ў Паўднёвай Францыі і праз Канал [Ла-Манш].

*Якія рознагалоссі былі паміж Сталіным і Чэрчылем па пытанні адкрыцця другога фронту ў Еўропе?*

ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

**З успамінаў наркама танкавай прамысловасці СССР В. А. Малышава аб Сталінградзе ў 1942 г.**

Увечары 24.VIII немцы па-зверску бамбілі горад... Мясцовыя ўлады разгубіліся... Трэба хаваць людзей, трэба карміць, няма вады, няма святла, амаль усе хлебазаводы, млыны, кансервавыя заводы, склады разбураны і гарадзь. Прынялі крутыя меры супраць рабаванняў і марадзёрства... Змянілі ў Сталінградзе 3 сховішчы. З'язджалі кожны раз, калі немцы білі ўжо не толькі авіяцыяй, але і мінамётамі.

## § 27. Барацьба з захопнікамі на акупіраванай тэрыторыі

**Успомніце:** Якія краіны Еўропы былі акупіраваны Германіяй да лета 1941 г.? Што прадугледжваў план «Ост»?

**Устанаўленне фашысцкага «новага парадку» ў Еўропе.** З вясны 1938 да лета 1941 г. нацысцкая Германія захапіла 11 еўрапейскіх краін. Пад яе панаваннем аказалася тэрыторыя каля 2 млн км$^2$, дзе пражывала амаль 190 млн чалавек. У большасці акупіраваных краін Заходняй Еўропы нацысты падтрымлівалі фашысцкія і рэакцыйныя арганізацыі і партыі, якія сталі на шлях **калабарацыянізму**.

Найбольш гібкую і адносна мяккую акупацыйную палітыку Германія праводзіла ў Даніі, Нарвегіі, Галандыі і Бельгіі. У Даніі працягваў дзейнічаць нацыянальны ўрад. У Нарвегіі з ліку калабарацыяністаў быў створаны Адміністрацыйны савет, які выконваў функцыі ўрада. У наступным ён быў распушчаны. Правадыром нарвежскага народа быў аб'яўлены В. Квіслінг, які спрабаваў умацаваць «новы парадак» нацыстаў у краіне. Кароль Бельгіі Леапольд III адмовіўся эмігрыраваць са сваім урадам у Англію. Кароль падпісаў акт аб капітуляцыі бельгійскай арміі і ў лістападзе 1940 г. падчас сустрэчы з А. Гітлерам выказаў яму падзяку за лаяльную палітыку ў адносінах да Бельгіі. За цеснае супрацоўніцтва паміж Германіяй і Францыяй выступіў кіраўнік «рэжыму Вішы» маршал А. Ф. Петэн.



Правообладатель Народная асвета

Некаторыя еўрапейскія краіны былі ўключаны ў склад Германіі, у прыватнасці Аўстрыя і Люксембург. Заходняя частка Польшчы была далучана да Германіі, усходнюю Польшчу нацысты ператварылі ў «генерал-губернатарства», якім кіраваў нямецкі генерал-губернатар. Падзелу падверглася таксама Югаславія. На тэрыторыі Харватыі, Босніі і Герцагавіны была створана марыянетачная дзяржава Харватыя. У Сербіі захаваўся ўрад, які цалкам кантраляваўся нямецкімі акупантамі. Астатнюю тэрыторыю Югаславіі падзялілі паміж сабой Італія, Германія, Венгрыя і Балгарыя. Грэцыю акупанты падзялілі на тры зоны: нямецкую, італьянскую і балгарскую. У Заходняй Еўропе засталіся толькі тры нейтральныя дзяржавы — Швецыя, Швейцарыя і Ірландыя.

Да канца 1942 г. Германія захапіла значную тэрыторыю СССР. Тут немцы насаджалі грамадзянскую адміністрацыю, якая падпарадкоўвалася міністэрству па справах акупіраваных усходніх тэрыторый на чале з А. Розенбергам. На захопленай частцы СССР былі створаны 2 рэйхскамісарыяты — «Остланд», куды ўвайшлі Літва, Латвія, Эстонія, частка Беларусі і Ленінградскай вобласці, і «Украіна», у які былі ўключаны асноўная частка Украіны і некаторыя раёны Беларусі. На тэрыторыі паміж Днястром і Бугам, акупіраванай Румыніяй, было створана румынскае генерал-губернатарства.

На занятых ворагам тэрыторыях устанаўліваўся **«новы парадак»** — сістэма ваенных, сацыяльна-эканамічных, палітычных і ідэалагічных мерапрыемстваў, накіраваных на стварэнне акупацыйнага рэжыму і рэалізацыю палітыкі генацыду, эканамічнай эксплуатацыі і рабаўніцтва. Для ажыццяўлення генацыду ствараліся (акрамя тылавых войскаў вермахта) аператыўныя групы (айнзатцгрупы) на чале з членамі СС (ахоўных атрадаў), якія з'яўляліся найбольш жорсткімі прадстаўнікамі фашысцкага рэжыму. Акупанты арганізавалі на захопленай тэрыторыі сотні **канцэнтрацыйных лагераў**. Своеасаблівымі канцлагерамі для яўрэяў у выглядзе спецыяльных ізаляваных кварталаў у гарадах сталі **гета**. Фашысты паставілі сабе за мэту выра-




Уваход у канцэнтрацыйны лагер Бухенвальд з надпісам «Кожнаму сваё»




Дзецi — вязнi канцэнтрацыйных лагераў



Правообладатель Народная асвета




Буйнейшыя канцэнтрацыйныя лагеры на тэрыторыі Еўропы

шыць «яўрэйскае пытанне» ў Еўропе і ў ходзе вайны знішчылі мільёны яўрэяў. Жорсткімі метадамі правядзення генацыду з'яўляліся таксама *карныя экспедыцыі, дэпартацыя* дарослых і дзяцей на прымусовыя работы ў Германію, палітыка «галоднай смерці» ў адносінах да насельніцтва, эканамічная эксплуатацыя, рабаўніцтва і масавыя расстрэлы, блакада і спальванне многіх населеных пунктаў.

**Рух Супраціўлення ў акупіраваных краінах Еўропы.** Важнай часткай барацьбы супраць фашызму стаў **рух Супраціўлення** ў акупіраваных краінах Еўропы. Ён развіваўся ў складаных умовах. Спачатку насельніцтва гэтых краін аказалася ў стане псіхалагічнага шоку, выкліканага хуткім разгромам Германіяй іх дзяржаў, яе значнай перавагай у ваенна-тэхнічным плане. У кастрычніку 1941 г. у французскім горадзе Нант гітлераўцы ўпершыню ў Заходняй Еўропе правялі масавае смяротнае пакаранне заложнікаў з ліку мірных жыхароў. Пасля такіх смяротныя пакаранні



Правообладатель Народная асвета

сталі праводзіцца пастаянна. Гітлераўцы расстрэльвалі 50—100 чалавек за аднаго забітага немца. Гэты «новы парадак», які ўстанаўлівалі фашысты на акупіраваных тэрыторыях, і масавы тэрор прымушалі насельніцтва захопленых краін, пераадольваючы страх і разгубленасць, шукаць шлях да вызвалення.



Нямецкія салдаты ў час карнай аперацыі

Шырокі размах рух Супраціўлення набыў у Польшчы, Югаславіі, Грэцыі, Італіі і Францыі. У ім удзельнічалі розныя палітычныя сілы. Яны аб'ядноўваліся ў народныя антыфашысцкія франты сваіх краін.

У Францыі рух Супраціўлення ўзначалілі *Французскі камітэт нацыянальнага вызвалення* і *Нацыянальны савет Супраціўлення*. У антыфашысцкай узброенай барацьбе прымалі ўдзел сотні тысяч французаў, а таксама 4 тыс. савецкіх грамадзян, якія ўцяклі з нямецкага палону. Лейтэнанту *В. В. Порыку* за подзвігі ў барацьбе супраць фашыстаў на тэрыторыі Францыі было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У Італіі рухам Супраціўлення кіравалі камітэты нацыянальнага вызвалення. У італьянскіх партызанскіх атрадах змагалася каля 5 тыс. савецкіх грамадзян. *Ф. А. Палятаеў* стаў нацыянальным героем Італіі, быў пасмяротна ўзнагароджаны італьянскім залатым медалём і ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Масавы характар рух Супраціўлення набыў у Югаславіі, дзе Народна-вызваленчая армія на чале з **І. Броз Ціта** кантралявала значную частку тэрыторыі краіны. Большую частку Грэцыі ачысціла ад акупантаў Народна-вызваленчая армія.

У Польшчы супраць гітлераўцаў дзейнічалі дзве асноўныя ўзброеныя арганізацыі — *Армія Краёва* (АК) і *Армія Людова*. Першая з іх арыентавалася на польскі эмігранцкі ўрад у Лондане, другая — на Маскву. АК не прызнавала ўсходнюю граніцу, устаноўленую СССР і Германіяй у выніку падпісання дагавора аб ненападзенні і дагавора аб граніцы і дружбе, і таму дзейнічала не толькі ў Польшчы, але і ў Заходняй Беларусі. Вясной 1943 г. стала вядома, што ў 1940 г. у Катынскім лесе на Смаленшчыне органамі НКУС было расстраляна каля 15 тыс. польскіх палонных афіцэраў. Гэта прывяло да разрыву адносін паміж СССР і польскім урадам у эміграцыі. У *красавіку — чэрвені 1943 г.* адбылося буйное *паўстанне ў Варшаўскім гета*. Пасля яго падаўлення гітлераўцы адправілі ў лагеры смерці каля 80 тыс. яўрэяў.

Пашырэнню руху Супраціўлення садзейнічалі распачаты карэнны пералом у ходзе Другой сусветнай вайны і роспуск Камінтэрна, праведзены па ўказанні



Правообладатель Народная асвета

І. В. Сталіна ў *1943 г.* Доўгія гады Камінтэрн быў сімвалам сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі. Гэта стрымлівала наладжванне супрацоўніцтва паміж камуністамі і іншымі антыфашысцкімі сіламі ў акупіраваных краінах.

**Барацьба савецкага народа ў тыле ворага.** На акупіраванай ворагам тэрыторыі СССР (Украіна, Беларусь, Малдавія, Прыбалтыка, шэраг абласцей Расіі) разгарнуўся **партызанскі рух**. Ужо да канца 1941 г. супраць акупантаў змагалася 2 тыс. партызанскіх атрадаў. Дапамогу партызанам аказала кавалерыйская група пад камандаваннем генерала **Л. М. Даватара**, якая здзейсніла рэйд па тылах праціўніка (Смаленская вобласць) у *жніўні — верасні 1941 г.* Падчас контрнаступлення Чырвонай Арміі пад Масквой партызаны знішчалі ў тыле варожых войскаў участкі чыгункі, масты, арганізоўвалі засады на дарогах, дэзарганізуючы забеспячэнне нямецкай групы армій «Цэнтр». У студзені — лютым 1942 г. партызаны Смаленскай вобласці вызвалілі 40 сёл і вёсак, дзе высадзіўся савецкі дэсант. Яны аб'ядноўваліся з падраздзяленнямі Чырвонай Арміі, якія здзяйснялі рэйды ў тыл германскіх войскаў.

Партызанскі рух, які разгарнуўся, меў патрэбу ў кіраўніцтве з аднаго цэнтра. У **маі 1942 г.** быў створаны **Цэнтральны штаб партызанскага руху** (ЦШПР), які ўзначаліў *П. К. Панамарэнка*. Партызанскія штабы былі арганізаваны ў Беларусі, Украіне, Малдавіі, Літве, Латвіі, Эстоніі. Гэта дазволіла каардынаваць аперацыі войскаў Чырвонай Арміі і дзеянні партызан. Па плане ЦШПР са жніўня 1943 па жнівень 1944 г. на тэрыторыі Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі партызаны правялі аперацыю **«рэйкавая вайна»** па знішчэнні чыгуначнага палатна. Былі выведзены са строю тысячы кіламетраў чыгункі. Гэта ўскладніла перавозку германскіх войскаў і тэхнікі падчас Курскай бітвы.

Партызаны арганізоўвалі дыверсіі, падрывалі варожыя эшалоны, разбуралі масты і лініі сувязі, нападалі на нямецкія штабы і гарнізоны, праводзілі баявыя рэйды па тылах праціўніка, арганізоўвалі ўцёкі ваеннапалонных, перашкаджалі масаваму вывазу савецкіх людзей на прымусовыя работы ў Германію, займаліся зборам разведданых. Легендарным стала імя савецкага разведчыка *М. І. Кузняцова*, які дзейнічаў пад выглядам нямецкага афіцэра і запяспечваў партызан карыснай інфармацыяй. Ён ліквідаваў намесніка рэйхскамісара Украіны і шэраг іншых кіраўнікоў акупацыйных улад.



Партызаны, якія рыхтуюць дыверсію на чыгунцы

У варожым тыле ўтварыліся **партызанскія зоны** — раёны, якія цалкам кантраляваліся народнымі мсціўцамі.



Правообладатель Народная асвета

Першая партызанская зона ўзнікла ў кастрычніку 1942 г. у Ленінградскай вобласці. Летам 1943 г. пад кантролем партызан знаходзілася $^{1}/_{6}$ частка ўсёй акупіраванай тэрыторыі. Тут дзейнічалі органы савецкай улады, узнавілі работу школы, невялікія прадпрыемствы і майстэрні, былі пабудаваны партызанскія аэрадромы, людзі сеялі і збіралі ўраджай. На тэрыторыі партызанскіх зон працавалі дзеля перамогі над ворагам і жылі па савецкіх законах каля 4 млн грамадзян.




Гітлераўцы ўстанаўліваюць папераджальны знак «Партызаны! Небяспечна!»

Вядомымі арганізатарамі партызанскага руху ва Украіне і Беларусі былі *С. А. Каўпак, А. Ф. Фёдараў, В. І. Казлоў, В. З. Корж, М. П. Шмыроў, К. Т. Мазураў, П. М. Машэраў* і інш. За гераізм і мужнасць 249 партызанам было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. С. А. Каўпак і А. Ф. Фёдараў былі ўдастоены гэтага звання двойчы.

Да канца 1943 г. партызанскі рух набыў масавы характар. Актыўную падтрымку партызанам аказвала мясцовае насельніцтва. Такім чынам, барацьба набыла ўсенародны характар. Усяго за гады вайны ў тыле ворага дзейнічала больш за 6 тыс. партызанскіх атрадаў, у якіх змагаліся звыш 1 млн чалавек. Больш за палову ўсіх партызан складала моладзь ва ўзросце да 25 гадоў. Больш чым 20 тыс. партызан не мелі і 18 гадоў, а 5 тыс. з'яўляліся школьнікамі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў варожым тыле дзейнічала камуністычнае **падполле** і створаныя пад яго кіраўніцтвам у гарадах і пасёлках баявыя антыфашысцкія камсамольска-маладзёжныя арганізацыі. Да канца 1941 г. на акупіраванай тэрыторыі працавала больш за 250 падпольных абласных, гарадскіх і раённых камітэтаў камуністычнай партыі. Усёй краіне сталі вядомы подзвігі юных камсамольцаў-падпольшчыкаў у Краснадоне, якія стварылі арганізацыю «Маладая гвардыя». Яе ўзначальвалі камандзір І. В. Туркеніч і камісар А. В. Кашавы. Падобныя арганізацыі меліся ў кожнай акупіраванай вобласці. 22 верасня 1943 г. мінскім падпольшчыкам удалося знішчыць генеральнага камісара Генеральнай акругі «Беларусь» В. Кубэ. За яго ліквідацыю А. Р. Мазанік, М. Б. Осіпава і Н. В. Траян былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Падпольная барацьба набыла шырокі размах. Супраць акупантаў актыўна змагалася каля 220 тыс. падпольшчыкаў. Страты немцаў у выніку дзеянняў партызан і падпольшчыкаў склалі каля 1 млн чалавек.

**?** 1. Ахарактарызуйце «новы парадак», які ўстанаўлівалі германскія захопнікі на акупіраванай тэрыторыі. У якіх краінах Еўропы «новы парадак» набыў найбольш жорсткія формы? Чаму?



Правообладатель Народная асвета

2. Растлумачце значэнне паняцця «калабарацыянізм». Чаму ў некаторых краінах Заходняй Еўропы шэраг дзяржаўных дзеячаў пайшоў на супрацоўніцтва з акупантамі?
3. У якіх формах адбывалася супраціўленне германскім захопнікам на акупіраваных тэрыторыях? У якіх краінах Еўропы рух Супраціўлення атрымаў найбольшы размах? Якія падзеі на франтах вайны садзейнічалі пашырэнню маштабаў руху Супраціўлення?
4. Прывядзіце прыклады барацьбы савецкіх партызан і падпольшчыкаў супраць акупантаў. Дакажыце, што гэтая барацьба насіла ўсенародны і інтэрнацыянальны характар. Вызначыце значэнне супраціўлення нямецкаму акупацыйнаму рэжыму на акупіраванай тэрыторыі СССР.
5. Якія партызанскія фарміраванні дзейнічалі ў Польшчы? У чым заключалася асаблівасць іх дзейнасці? Што ўскладняла ўзаемаадносіны СССР і Польшчы?

**Прапануем абмеркаваць.** Некаторыя замежныя гісторыкі разглядаюць дзеянні германскай арміі на акупіраванай тэрыторыі Савецкага Саюза як адказ на дзейнасць савецкіх партызан і падпольшчыкаў і з прычыны гэтага апраўдваюць іх. Як вы лічыце, жорсткасць акупацыйнага рэжыму на самай справе была справакавана дзеяннямі савецкіх партызан і падпольшчыкаў? Ці мае права бок, які падвергся агрэсіі, абараняцца ўсімі даступнымі яму сродкамі?

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### З кнігі П. К. Панамарэнкі «Усенародная барацьба ў тыле нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 1941—1944»

Вясна 1942 г. азнаменавалася бурным ростам народнай барацьбы ва ўсіх яе формах на ўсёй акупіраванай тэрыторыі... На Украіне, у Беларусі, Ленінградскай, Калінінскай, Смаленскай, Арлоўскай абласцях і ў Крыме існавалі партызанскія краі, якія знаходзіліся пад кантролем партызан, і партызанскія зоны, дзе праціўнік мог паяўляцца эпізадычна...

У 1941—1944 гг. у радах савецкіх партызан на акупіраваных тэрыторыях савецкіх рэспублік змагаліся:

| | | | |
|---|---|---|---|
| РСФСР (акупіраваная вобласць) | 250 000 | Літоўская ССР | 10 000 |
| Украінская ССР | 501 750 | Эстонская ССР | 2000 |
| Беларуская ССР | 373 942 | Малдаўская ССР | 3500 |
| Латвійская ССР | 12 000 | Карэла-Фінская ССР | 5500 партызан |

Усяго на акупіраваных тэрыторыях СССР вялі барацьбу звыш 1 150 000 партызан.

*Дзе на акупіраванай тэрыторыі Савецкага Саюза партызанскі рух набыў найбольш шырокі размах?*



Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**Канцэнтрацыйныя лагеры** — месцы знаходжання вялікіх мас людзей, якія заключаны пад варту па палітычных, расавых, рэлігійных і іншых прыкметах. Упершыню былі створаны англійскімі каланізатарамі падчас англа-бурскай вайны 1899—1902 гг. У гады Другой сусветнай вайны канцлагеры ўзніклі на тэрыторыі еўрапейскіх краін, акупіраваных фашысцкай Германіяй, і прызначаліся для фізічнага знішчэння і эксплуатацыі вязняў. Найбольш буйнымі канцлагерамі з'яўляліся: Бухенвальд, Дахау, Майданак, Асвенцім, Трэблінка і інш. У Беларусі было створана больш за 260 канцлагераў. З 18 млн чалавек, якія прайшлі канцлагеры, было знішчана больш за 11 млн грамадзян СССР, Польшчы, Францыі, Чэхаславакіі, Югаславіі і іншых краін. Сістэма канцэнтрацыйных лагераў была ліквідавана з разгромам гітлерызму і асуджана ў прыгаворы Міжнароднага ваеннага трыбунала ў Нюрнбергу як злачынства супраць чалавечнасці.

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Іосіп Броз Ціта** (1892—1980), дзеяч міжнароднага рабочага руху, дзяржаўны і палітычны дзеяч, маршал (1943), двойчы Народны герой Югаславіі (1944, 1972). Удзельнік Першай сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі. Падчас Другой сусветнай вайны — вярхоўны галоўнакамандуючы Народна-вызваленчай арміі Югаславіі, якая была прызнана саюзнікамі галоўнай антыфашысцкай сілай у краіне, ёй аказвалі ваенную дапамогу ЗША, Англія і Савецкі Саюз. 20 кастрычніка 1944 г. войскі Ціта вызвалілі Бялград. З лістапада 1943 г. з'яўляўся старшынёй Нацыянальнага камітэта вызвалення Югаславіі, у 1945 г. стаў прэм'ер-міністрам Югаславіі. З 1953 г. — прэзідэнт краіны.



**Леў Міхайлавіч Даватар** (1902—1941), генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза (1941, пасмяротна). Нарадзіўся ў в. Хоціна Лепельскага павета Віцебскай губерні. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны камандаваў кавалерыйскай групай, якая здзейсніла ў жніўні — верасні 1941 г. рэйд па тылах праціўніка ў Смаленскай вобласці, наносячы ўдары па камунікацыях, знішчаючы штабы, транспарт, склады і жывую сілу гітлераўцаў. За яго галаву нямецкае камандаванне прызначыла буйную ўзнагароду. Удзельнічаў у абароне Масквы на Валакаламскім напрамку. Загінуў у раёне вёскі Палашкіна (Рузскі раён Маскоўскай вобласці).



Правообладатель Народная асвета

## § 28. Савецкі тыл у час вайны

**Успомніце:** Якія задачы павінна была вырашыць індустрыялізацыя ў СССР? Якія меры прадпрымала савецкае кіраўніцтва па ўмацаванні абараназдольнасці краіны напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны?

**Перавод эканомікі на ваенны лад.** Важнейшай часткай выступлення І. В. Сталіна па радыё 3 ліпеня 1941 г. стаў план канкрэтных мер, накіраваных на неадкладную перабудову ўсёй работы на ваенны лад. У аснову гэтага плана лягла дырэктыва Саўнаркама і ЦК партыі ад *29 чэрвеня 1941 г.,* якая патрабавала максімальнай цэнтралізацыі ўсяго кіраўніцтва ў краіне.

**30 чэрвеня 1941 г.** быў створаны Дзяржаўны Камітэт Абароны (ДКА) на чале з І. В. Сталіным, які сканцэнтраваў у сваіх руках усю паўнату ўлады ў дзяржаве. Ваенныя, дзяржаўныя органы і грамадскія арганізацыі абавязаны былі беспярэчна выконваць яго рашэнні.

Першачарговай задачай перабудовы эканомікі стала **эвакуацыя** прамысловых прадпрыемстваў, матэрыяльных каштоўнасцей, людскіх рэсурсаў з заходніх і цэнтральных раёнаў на ўсход краіны (Паволжа, Урал, Сібір, Казахстан, Сярэдняя Азія). На працягу першых трох месяцаў вайны было эвакуіравана каля 10 млн чалавек. Да студзеня 1942 г. было перавезена і неўзабаве ўведзена ў строй больш за 1500 буйных прамысловых прадпрыемстваў, галоўным чынам абаронных. Каля $^1/_3$ штатнага саставу замацаваных за імі рабочых прыступілі да выпуску прадукцыі. Цэлы шэраг заводаў быў пераведзены на выраб ваеннай тэхнікі. Пачалася масавая вытворчасць лепшых на той час танкаў — Т-34, КВ («Клім Варашылаў») і ІС («Іосіф Сталін»), навейшых самалётаў і іншай баявой тэхнікі.

На Лысьвенскім металургічным заводзе (Пермская вобласть) быў наладжаны выпуск касак. Для іх вырабу была распрацавана асобая марка сталі: пластычная і ў той жа час вельмі трывалая. За гэту работу заводскія спецыялісты ў 1943 г. атрымалі Сталінскую прэмію. На заводзе «Скураміт» у самыя кароткія тэрміны ўдалося ўдасканаліць тэхналогію вырабу абутковага скуразаменніка — знакамітай кірзы, празванай у народзе «чортавай скурай». Масавая вытворчасць кірзавых ботаў дазволіла абуць да канца вайны 10 млн савецкіх салдат.

У Ніжнім Тагіле на Уральскім вагонабудаўнічым заводзе была наладжана вытворчасць танкаў Т-34. Першы эшалон з неабходным абсталяваннем прыбыў сюды 1 кастрычніка 1941 г., а ўжо 18 снежня з заводскіх варот выехала першая сабраная «трыццацьчацвёрка». Рабочыя завода з дня ў дзень нарошчвалі вытворчасць танкаў. Напрыклад, фрэзероўшчык Д. Босы, эвакуіраваны з Ленінграда, выканаў у лютым 1942 г. дзённую норму на 1480 %, а пасля перайшоў на абслугоўванне адразу трох танкаў. У сваіх успамінах ён адзначаў: «Пот коціцца, бывала, па твары, туман засцілае вочы, рукі дрыжаць ад стомленасці, але, калі яшчэ былі сілы, працавалі».



Правообладатель Народная асвета




Савецкі тыл у гады вайны

Па ўсёй краіне разгарнуўся рух «тысячнікаў» — тых, хто выконваў вытворчыя заданні на 1000 % і больш.

Нарошчванне ўласнага ваеннага патэнцыялу краіны патрабавала строгага размеркавання грашовых і матэрыяльных сродкаў. Таму дзяржава лічыла першачарговай задачай выдаткаванне сродкаў на патрэбы арміі, ваеннай індустрыі, вугальнай і нафтавай прамысловасці.

Перабудова тылу на ваенны лад, завершаная да сярэдзіны 1942 г., стала адным з фактараў карэннага пералому ў Вялікай Айчыннай вайне.

**Навука і культура.** Вайна патрабавала ад савецкай навукі новых распрацовак, звязаных з канструіраваннем сродкаў узбраення і станаўленнем ваеннай прамысловасці, з пошукам рэсурсаў сыравіны і энергіі. Лепшыя вучоныя краіны працавалі на абарону. Так, будучы стваральнік савецкай атамнай бомбы *І. В. Курчатаў* рас-



Правообладатель Народная асвета



Рэактыўная ўстаноўка «кацюша»



Савецкія авіяканструктары (злева направа): С. А. Лавачкін, А. М. Тупалеў, А. С. Якаўлеў, А. І. Мікаян

працаваў метад размагнічвання, які абараняў ад магнітных мін караблі і падводныя лодкі Ваенна-Марскога Флоту.

Вынікам напружанай працы вучоных стала стварэнне рэактыўнай зброі — знакамітых «кацюш». Вось як успамінаў адзін са сведкаў аб іх першым выпрабаванні: «Мы на назіральным пункце здранцвелі, калі пачулі першы залп. З аглушальным ровам, свістам і раскацістым скрыгатаннем услед за вялізнымі клубамі чырвона-чорнага дыму прачарцілі неба над нашымі галовамі палаючыя каметы... Немагчыма ўявіць, што рабілася ў чатырох кіламетрах ад нас. Не тое што там танкі і машыны — гарэла нават зямля! Сэрца ахоплівала радасць за Радзіму, за тварцоў грознай зброі».

Самай масавай аўтаматычнай зброяй Чырвонай Арміі ў час Вялікай Айчыннай вайны стаў пісталет-кулямёт (аўтамат) ППШ **Г. С. Шпагіна**. За гады вайны было выпушчана прыкладна 6 141 000 аўтаматаў.

Савецкія авіяканструктары вынайшлі ўнікальную інжынерную ўстаноўку — аэрадынамічную трубу. Яна дазваляла выпрабоўваць мадэлі высокахуткасных самалётаў без вырабу іх поўнафарматных узораў. За чатыры ваенныя гады ў серыйную вытворчасць было запушчана 25 новых і мадэрнізаваных тыпаў самалётаў. Знакаміты авіяканструктар *С. А. Лавачкін* адзначаў: «Я не бачу свайго ворага — немца-канструктара, які сядзіць над сваімі чарцяжамі... Але, не бачачы яго, я ваюю з ім... Я збіраю ўсю сваю волю і фантазію, усе мае веды і вопыт... каб у дзень, калі два новыя самалёты — наш і варожы — сутыкнуцца ў ваенным небе, наш аказаўся пераможцам». За гады вайны авіяканструктары распрацавалі больш за 20 новых тыпаў самалётаў, многія з якіх пераўзыходзілі па лётных якасцях нямецкія.

У тыле ўзнавілі сваю творчую дзейнасць буйнейшыя культурныя ўстановы краіны. Напрыклад, у Куйбышаве працягваў свае пастаноўкі Вялікі тэатр, у Свярдлоўску — МХАТ і г. д. У Алма-Аце і Самаркандзе адкрыліся новыя цэнтры савецкага кіно. За гады вайны было створана 102 фільмы, сярод якіх «Сакратар райкама» (рэжысёр *І. А. Пыр'еў*), «Кутузаў» (рэжысёр *У. М. Пятроў*) і інш.



Правообладатель Народная асвета

Больш за тысячу савецкіх пісьменнікаў і журналістаў з'яўляліся ваеннымі карэспандэнтамі (*К. М. Сіманаў, М. А. Шолахаў, Б. М. Палявой* і інш.) ці непасрэдна ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях (*В. У. Быкаў, В. С. Гросман* і інш.). У гады вайны сталі шырока вядомымі такія мастацкія творы, як «Народ бессмяротны» *В. С. Гросмана*, «Навука перамагаць» *М. А. Шолахава* і інш.

У сферы выяўленчага мастацтва вялікае месца стаў займаць патрыятычны плакат. Самым знакамітым з іх з'яўляецца плакат *І. М. Таідзэ* «Радзіма-маці кліча!». Шырокую вядомасць набылі карыкатуры *Кукрыніксаў*.



Кукрыніксы. «Бязлітасна разграмім і знішчым ворага!». 1941 г.

**Паўсядзённае жыццё ў савецкім тыле.** Для ўсіх савецкіх людзей жыццё ў тыле стала працоўным подзвігам. Пры значным скарачэнні колькасці рабочых і служачых ужо ў 1942 г. выпуск прамысловай прадукцыі ўзрос у 1,5 раза да ўзроўню 1941 г. Большую частку працоўнага насельніцтва (60 % у гарадах і 70 % у вёсцы) складалі жанчыны, а таксама старыя і падлеткі. Яны самааддана змагаліся на працоўным фронце і ўнеслі значны ўклад у перамогу. Для іх былі характэрны патрыятызм, працавітасць, вера ў перамогу над ворагам і надзея на лепшае жыццё пасля вайны. Яны стойка пераносілі цяжкасці і нягоды ваеннага ліхалецця. Да канца 1941 г. па ўсёй краіне была ўведзена картачная сістэма продажу прадуктаў харчавання, а ў 1942 г. — і прамысловых тавараў насельніцтву. Рынкавыя цэны на харчаванне былі высокія. Таму важнай крыніцай прадуктаў харчавання сталі дапаможныя гаспадаркі прадпрыемстваў, індывідуальнае і калектыўнае агародніцтва.

Значная доля сямейнага бюджэту ішла на дзяржаўныя падаткі і пазыкі. З 1942 г. урад увёў ваенны падатак, які распаўсюджваўся на ўсіх працаўнікоў тылу. Была абавязковай і падпіска на ваенныя пазыкі (за гады вайны іх было чатыры).


Нават дзеці ўносілі свой уклад у перамогу над ворагам

Аслабленне калгасаў у гады вайны адмоўна адбілася на даходах сялянскіх сем'яў. Яны зніжаліся ў некалькі разоў. Асноўную частку прадуктаў харчавання сялянам давалі ўласныя гаспадаркі. Жывучы галаднавата, вяскоўцы прадавалі прадукцыю са сваіх участкаў, каб заплаціць падаткі і падпісацца на дзяржаўныя пазыкі.



Правообладатель Народная асвета



Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Сергій

Але паўсядзённыя клопаты не маглі заглушыць пастаяннага пачуцця трывогі за сваё жыццё, жыццё родных і блізкіх, якія змагаліся на фронце. Аднак людзі жылі надзеяй на будучую перамогу, лавілі кожнае слова зводак ад Савецкага Інфармбюро і з болем успрымалі няўдачы Чырвонай Арміі.

**Царква ў гады вайны.** З самага пачатку вайны Руская Праваслаўная Царква заняла патрыятычную пазіцыю. *Мітрапаліт Сергій* 22 чэрвеня 1941 г. выступіў з заклікам да ўсіх праваслаўных падняцца на абарону Радзімы. Царква прыняла ўдзел у зборы грашовых сродкаў, каштоўнасцей і рэчаў у Фонд абароны. За гады вайны было сабрана некалькі соцень мільёнаў рублёў. Гэтыя сродкі пайшлі на стварэнне танкавай калоны імя Дзмітрыя Данскога і авіяэскадрыллі імя Аляксандра Неўскага.

Патрыятычная дзейнасць Рускай Праваслаўнай Царквы паслужыла штуршком да збліжэння ўлады і царквы. У лютым 1943 г. адбыўся абмен пасланнямі мітрапаліта Сергія і І. В. Сталіна. Вынікам гэтага стала аднаўленне дзейнасці Свяшчэннага Сінода, адкрыццё духоўных навучальных устаноў, выданне царкоўнай літаратуры. Неўзабаве Сергій быў выбраны Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі (да гэтага патрыяршы прастол пуставаў 18 гадоў). Створаны пры Саўнаркаме СССР Савет па справах Рускай Праваслаўнай Царквы выконваў абавязкі пасрэдніка паміж урадам і царквой. З канца 1943 г. сталі адкрывацца для службы храмы, вяртацца з лагераў рэпрэсіраваныя служыцелі царквы, спыніліся ганенні на веруючых.

**Блакадны Ленінград.** Нямецкае камандаванне вялікае значэнне надавала захопу Ленінграда. Падзенне горада дазволіла б гітлераўцам знішчыць базу Балтыйскага флоту, вывесці са строю ваенную прамысловасць горада, засцерагчы з поўначы наступленне сваіх войскаў на Маскву, падарваць дух савецкага народа, пазбавіць яго сімвала Кастрычніцкай рэвалюцыі.

На абарону роднага горада падняліся ўсе жыхары Ленінграда. Гэта былі і падраздзяленні народнага апалчэння, і калектывы абаронных прадпрыемстваў, і простыя гараджане, якія будавалі абарончыя рубяжы і вялі барацьбу з запальнымі бомбамі ворага. **8 верасня 1941 г.** праціўнік захапіў горад Шлісельбург, і сухапутныя зносіны Ленінграда з Вялікай зямлёй спыніліся, пачалася **блакада**. Горад быў адрэзаны ад электрастанцый, падвяргаўся пастаянным бамбардзіроўкам з паветра, якія немцы праводзілі са звышцяжкіх гармат, у тым ліку з гіганцкага 400-міліметровага, снарад якога важыў амаль тону.



Правообладатель Народная асвета




Баявыя дзеянні савецкіх войскаў на подступах да Ленінграда (10 ліпеня — 30 снежня 1941 г.)



Правообладатель Народная асвета

Да пачатку блакады насельніцтва Ленінграда не паспела эвакуіравацца. У горадзе заставалася амаль 3 млн чалавек, у тым ліку 400 тыс. дзяцей. Гітлераўцы знішчылі прадуктовыя склады. У лістападзе 1941 г. сутачная норма хлеба, змешанага напалову з вотруб’ем, складала для рабочых 250 г, для астатніх — усяго 125 г. Паэтэса **В. Бергольц**, якая перажыла блакаду, пісала аб ленінградскім хлебе так: «Сто дваццаць пяць блакадных грамаў з агнём і крывёю напалам». Галадаючыя людзі пакутавалі ад холаду: не было паліва. Слупок тэрмометра зімой 1941/1942 г. апускаўся да адзнакі −35 °С. Адзіным шляхам, па якім у асаджаны горад магла прыйсці дапамога з Вялікай зямлі, стала **«Дарога жыцця».** Толькі ў *студзені 1943 г.* блакада Ленінграда была прарвана, а ў **студзені — лютым 1944 г.** — знята канчаткова.




Прарыў блакады Ленінграда (12—30 студзеня 1943 г.)

Нягледзячы на страшны голад, ленінградцы зберaглі буйнейшую ў свеце калекцыю насення культурных раслін. Яна ўтрымлівала 200 тыс. узораў (у тым ліку прыдатных для харчавання), сабраных у перадваенныя гады ў 64 краінах свету. Калекцыя як зыходны генетычны матэрыял і ў наш час з’яўляецца сапраўды бясцэннай.



«Дарога жыцця»

Абаронцаў Ленінграда натхнялі выступленні па радыё пісьменніка У. Вішнеўскага, паэтэсы В. Бергольц, чые вершы і паэмы нярэдка называюць «першым шчырым дакументам жыцця блакаднага горада». Адлюстраваннем гераізму ленінградцаў стала стварэнне кампазітарам *Д. Д. Шастаковічам* Сёмай сімфоніі, якая атрымала назву «Ленінградскай» і была выканана ў блакадным горадзе ў жніўні 1942 г.

Гераічная абарона горада на Няве стала сімвалам мужнасці савецкіх людзей. Ад голаду, хвароб, варожых бомб і снарадаў загінула каля 1 млн жыхароў горада.



Правообладатель Народная асвета

1. Якую першачарговую задачу неабходна было вырашыць кіраўніцтву СССР пасля нападзення Германіі? Якія меры былі прыняты з мэтай вырашэння гэтай задачы?
2. Калі была завершана перабудова эканомікі на ваенны лад? Якія фактары дазволілі ажыццявіць гэта ў самыя кароткія тэрміны?
3. Ахарактарызуйце дзейнасць Рускай Праваслаўнай Царквы ў гады вайны. Як і чаму змяніліся ўзаемаадносіны царквы і савецкай улады?
4. Якія навуковыя адкрыцці і дасягненні былі зроблены ў гады вайны? Назавіце лепшыя ўзоры савецкай ваеннай тэхнікі, імёны іх стваральнікаў.
5. Апішыце паўсядзённае жыццё людзей у савецкім тыле. Які быў уклад працаўнікоў тылу ў разгром ворага?
6. Чаму нямецкае камандаванне імкнулася захапіць Ленінград? Колькі часу працягвалася блакада Ленінграда? У чым заключаюцца вытокі мужнасці абаронцаў блакаднага Ленінграда?

## ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

### З успамінаў П. П. Садоўнікава і С. С. Сцяпанава, якія працавалі ў гады вайны на заводзе «Уралэлектрацяжмаш»

Асноўнай рабочай сілай на заводзе ў час вайны сталі дзяўчынкі і хлопчыкі ва ўзросце 14—17 гадоў. Ім прыйшлося замяніць бацькоў і братоў, якія пайшлі на фронт.

...Бывалі дні, калі працуеш некалькі змен запар, так стомішся, так спаць хочацца, што адчуваеш, вось-вось зараз заснеш, а адыходзіць ад станка нельга. Пераключыш станок на халасты ход і, каб не бачылі, уставіш запалкі ў вочы і так падрэмлеш некалькі хвілін, а потым зноў за працу.

## ГІСТАРЫЧНЫ ДАКУМЕНТ

### Са звароту мітрапаліта Ленінградскага і Наўгародскага Алексія

*Ленінград, сакавік 1942 г.*

Перамога дасягаецца сілай не адной зброі, а сілай усеагульнага ўздыму і магутнай веры ў перамогу, спадзяваннем на Бога, які вянчае трыумфам зброю праўды, «выратоўвае» нас ад «маладушнасці і буры». І само воінства наша моцнае не адною колькасцю і моцай зброі, у яго пераліваецца і запальвае сэрцы воінаў той дух яднання і натхнення, якім жыве зараз увесь рускі народ. Нягледзячы на неймаверныя цяжкасці сучаснай вайны, мы не толькі не аслабелі, але, наадварот, падужэлі ў ратных подзвігах; сіле і майстэрству ворага мы супрацьпаставілі нашу сілу і наша воінскае майстэрства і, што важней за ўсё, усенароднае натхненне, якое не знемагае ні перад якімі цяжкасцямі.

*У чым бачыў вытокі перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне мітрапаліт Алексій?*



Правообладатель Народная асвета

## ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**«Дарога жыцця»** — адзіная транспартная магістраль, якая звязвала з верасня 1941 па сакавік 1943 г. праз Ладажскае возера блакадны Ленінград з тылавымі раёнамі краіны падчас Вялікай Айчыннай вайны. Па «Дарозе жыцця» праходзіла эвакуацыя насельніцтва, фабрык і заводаў, падвозіліся прадукты харчавання, паліва, воінскія падмацаванні, узбраенне і боепрыпасы. За перыяд яе існавання з Ленінграда было эвакуіравана звыш 1,3 млн чалавек і ўвезена звыш 1,5 млн т грузаў. У навігацыйныя перыяды перавозкі ажыццяўляліся па воднай трасе на караблях і суднах; у перыяд ледаставу — па ляновай дарозе на аўтамашынах. Па рашэнні ДКА па дне Ладажскага возера ў рэкордна кароткія тэрміны быў пракладзены трубаправод даўжынёй 35 км для падачы нафтапрадуктаў. «Дарога жыцця» падвяргалася абстрэлам нямецкай цяжкай артылерыі і ўдарам авіяцыі. Многія вадзіцелі, якія выконвалі рэйсы, знаходзіліся за рулём машыны суткамі. Асцерагаючыся артылерыйскіх абстрэлаў і авіяцыйных налётаў, вадзіцелі не ўключалі фары машын нават ноччу. Часці Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту забяспечылі надзейную абарону «Дарогі жыцця» і яе бесперабойнае дзеянне, што адыграла выключна важную ролю ў абароне Ленінграда.

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Георгій Сямёнавіч Шпагін** (1897—1952), савецкі канструктар стралковай зброі, Герой Сацыялістычнай Працы (1945). З 1922 г. удзельнічаў у стварэнні новых узораў зброі. Адной са значных работ канструктара з'явілася мадэрнізацыя 12,7-міліметровага буйнакалібернага кулямёта Дзегцярова, знятага з вытворчасці з-за выяўленых недахопаў. Найбольшую славу канструктару прынесла стварэнне пісталета-кулямёта (ППШ) узору 1941 г. Гэты «аўтамат», як яго звычайна называлі, з'яўляецца адным з сімвалаў Перамогі над фашысцкай Германіяй.



**Вольга Фёдараўна Бергольц** (1910—1975), руская савецкая паэтэса. У гады Вялікай Айчыннай вайны засталася ў блакадным Ленінградзе, працавала на радыё, амаль штодня звяртаючыся да жыхароў горада. У 1942 г. Бергольц напісала свае лепшыя паэмы, прысвечаныя абаронцам Ленінграда: «Лютаўскі дзённік», «Ленінградская паэма». Пасля вайны на гранітнай стэле Піскароўскіх мемарыяльных могілак, дзе спачываюць 470 000 ленінградцаў, якія памерлі падчас блакады і ў баях пры абароне горада, былі высечаны менавіта яе словы:



Правообладатель Народная асвета

Здесь лежат ленинградцы.
Здесь горожане — мужчины, женщины, дети.
Рядом с ними солдаты-красноармейцы.
Всею жизнью своею
Они защищали тебя, Ленинград,
Колыбель революции.
Их имен благородных мы здесь перечислить не сможем,
Так их много под вечной охраной гранита.
Но знай, внимающий этим камням:
Никто не забыт и ничто не забыто.

У 1994 г. Вользе Бергольц было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Санкт-Пецярбурга».

## § 29—30. Заключны этап Другой сусветнай вайны. Разгром фашысцкага блока (1944—1945)

**Успомніце:** Што азначае паняцце «карэнны перамол у ходзе вайны»? Якія падзеі прывялі да карэннага пералому ў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах? Якая міжнародная арганізацыя для падтрымання міру была створана пасля Першай сусветнай вайны? Ці справілася гэта арганізацыя з ускладзенай на яе функцыяй?

**Вызваленне Чырвонай Арміяй тэрыторыі СССР і еўрапейскіх краін у 1944—1945 гг.** У 1944 г. Чырвоная Армія правяла шэраг наступальных аперацый. У студзені — лютым была знята блакада Ленінграда, нанесена сур'ёзнае паражэнне праціўніку ў Правабярэжнай Украіне. У маі быў вызвалены Крым.

Вынікам адной з буйнейшых наступальных аперацый «Баграціён» стала вызваленне Беларусі. Аперацыя пачалася 22—23 чэрвеня 1944 г. наступленнем войскаў 1, 2, 3-га Беларускіх франтоў (камандуючыя **К. К. Ракасоўскі**, Г. Ф. Захараў і І. Д. Чарняхоўскі адпаведна) і 1-га Прыбалтыйскага фронту на чале з І. Х. Баграмянам. **3 ліпеня 1944 г.** быў вызвалены Мінск, а да канца ліпеня — уся тэрыторыя Беларусі. У выніку аперацыі «Баграціён» была разгромлена нямецкая групоўка вермахта — група армій «Цэнтр». Яна страціла больш за 550 тыс. чалавек. У ходзе аперацыі асабліва вызначыўся французскі авіяполк «Нармандыя», якому ў лістападзе 1944 г. была прысвоена назва «Нармандыя — Нёман».



Лётчыкі авіяпалка «Нармандыя — Нёман»

У ліпені пачалася і працягвалася ўсё лета бітва за вызваленне Заходняй Украіны. Яна вялася ў асноўным войскамі 1-га Украінскага фронту пад кіраўніцтвам



Правообладатель Народная асвета




Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён» (23 чэрвеня — 29 жніўня 1944 г.)

І. С. Конева. У жніўні завяршылася Львоўска-Сандамірская аперацыя, у выніку якой Украіна была цалкам вызвалена. Тады ж войскі 2-га і 3-га Украінскіх франтоў разграмілі Яска-Кішынёўскую групоўку вермахта. У выніку гэтага была вызвалена Малдавія.

Восенню 1944 г. Чырвоная Армія перанесла баявыя дзеянні на тэрыторыю акупіраваных еўрапейскіх краін. У Балгарыі перад прыходам Чырвонай Арміі ўспыхнула антыфашысцкае паўстанне, дзякуючы якому краіна была вызвалена з адносна невялікімі стратамі. 9 верасня 1944 г. у Балгарыі ўсталявалася ўлада Айчыннага фронту. Да мая 1945 г. пры ўзаемадзеянні з Народна-вызваленчай арміяй пад кіраўніцтвам маршала І. Броз Ціта была ачышчана ад акупантаў Югаславія.

У Цэнтральнай Еўропе склалася больш складаная сітуацыя. У жніўні 1944 г. пры падыходзе савецкіх войскаў да Віслы Варшаву ахапіла антыфашысцкае паўстанне. Яго падрыхтавалі і пачалі фарміраванні Арміі Краёвай па ўказанні польскага



Правообладатель Народная асвета

эміgranцкага ўрада ў Лондане без узгаднення з савецкім бокам. Паўстанне ставіла сваёй мэтай вызваленне сталіцы Польшчы ўласнымі сіламі да прыходу савецкіх войскаў. Аднак яно пацярпела паражэнне. Варшаву вызвалілі савецкія войскі і Войска Польскае толькі ў студзені 1945 г. У выніку Вісла-Одэрскай аперацыі ў лютым 1945 г. была вызвалена і ўся Польшча.

Асабліва ўпартыя баі разгарнуліся ў Венгрыі, якая была саюзніцай Германіі. Амаль два месяцы спатрэбілася савецкім войскам, каб узяць яе сталіцу — Будапешт.

У баях на Балтыцы вызначыўся камандзір падводнай лодкі А. І. Марынеска. У студзені 1945 г. яго лодка патапіла карабель «Вільгельм Густлаф» з больш чым 5 тыс. афіцэраў, салдат, спецыялістаў і тарпедавала транспарт з 3,6 тыс. немцаў. За адзін баявы паход была знішчана цэлая дывізія ворага! Унікальны подзвіг Марынеска празвалі «атакай стагоддзя». Гітлер назваў Марынеска сваім асабістым ворагам. У 1990 г. А. І. Марынеска было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



Аперацыя «Оверлорд»

**Адкрыццё другога фронту ў Еўропе. Крымская канферэнцыя.** У адпаведнасці з рашэннем Тэгеранскай канферэнцыі адкрыццё ў Заходняй Еўропе другога фронту супраць Германіі разглядалася саюзнікамі ў якасці галоўнай задачы 1944 г. У пачатку чэрвеня да высадкі на Еўрапейскі кантынент былі падрыхтаваны дзве амерыканскія, адна англійская і адна канадская арміі пад агульным камандаваннем генерала **Д. Эйзенхаўэра**.


Высадка англа-амерыканскіх войскаў у Нармандыі. 6 чэрвеня 1944 г.

У ноч на **6 чэрвеня 1944 г.** самалёты саюзнікаў нанеслі масіраваны ўдар па нямецкіх пазіцыях на французскім беразе праліва Ла-Манш у правінцыі *Нармандыя*. У гэты час праз праліў ужо ішло амаль 7 тыс. суднаў. Пачалася буйнейшая ў гісторыі войнаў дэсантная *аперацыя «Оверлорд»* («Уладар»). Вынікам яе стаў захоп саюзнікамі вялікага плацдарма і паспяховае наступленне супраць нямецкіх войскаў.



Правообладатель Народная асвета

Французскія войскі, якія дэсантаваліся на поўдні, і англа-амерыканскія войскі з поўначы, якія высадзіліся ў Нармандыі, разгарнулі наступленне на Парыж. У жніўні 1944 г. яны разам з паўстаўшымі парыжанамі вызвалілі сталіцу Францыі, а пазней і Брусель — сталіцу Бельгіі. Войскі саюзнікаў перайшлі граніцу Германіі. Аднак у *снежні 1944 г.* вермахт пачаў ваенную аперацыю ў *Ардэнах*, прарваў фронт і прасунуўся ў заходнім напрамку на 100 км. Становішча саюзнікаў выратавала наступленне савецкіх войскаў, якое пачалося (раней назначанай даты) 12 студзеня 1945 г. Гэта дало магчымасць англа-амерыканскім арміям стабілізаваць становішча на фронце і ў сакавіку — красавіку 1945 г. акружыць буйную групоўку нямецкіх войск у Руры.

У 1944 — пачатку 1945 г. адбыліся значныя падзеі на Ціхаакіянскім тэатры ваенных дзеянняў. Амерыканскія войскі, разграміўшы японцаў у некалькіх бітвах, занялі Маршалавы і Марыянскія астравы, пачалі вызваляць Інданезію і Філіпіны. Асабліва катастрафічнымі для Японіі сталі паражэнне яе флоту каля *вострава Лейтэ* (Філіпіны) у *кастрычніку 1944 г.* і баі за *востраў Акінава вясной 1945 г.* У бітве за Акінаву масавыя атакі праводзілі японскія лётчыкі-смяротнікі (камікадзе). Яны патапілі больш за 30 амерыканскіх суднаў, пры гэтым загінула больш чым 5 тыс. маракоў. Да ліпеня 1945 г. японцы фанатычна абаранялі востраў. Яны панеслі значныя страты — 110 тыс. чалавек забітымі.

Набліжэнне канца вайны патрабавала новай сустрэчы кіраўнікоў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі. У **лютым 1945 г.** у *Ялце (Крым)* адбылася канферэнцыя на вышэйшым узроўні з удзелам І. Сталіна, Ф. Рузвельта і У. Чэрчыля. Саюзнікі дамовіліся аб каардынацыі сваіх ваенных дзеянняў на завяршальным этапе вайны. Былі прыняты рашэнні аб пасляваеннай дэмілітарызацыі Германіі. Прадугледжвалася ліквідацыя яе ўзброеных сіл і ваеннай прамысловасці. Было вырашана забараніць нацысцкую партыю і пакараць ваенных злачынцаў. Для ажыццяўлення гэтых планаў намячалася акупацыя Германіі трыма дзяржавамі (пазней была выдзелена зона акупацыі і для Францыі). Мяжой паміж савецкай і заходнімі зонамі акупацыі павінна была стаць лінія сустрэчы саюзных войскаў. Для пакрыцця нанесеных саюзнікам страт падчас вайны Германіі належала выплаціць рэпарацыі.

Вострыя дыскусіі на Крымскай (Ялцінскай) канферэнцыі разгарнуліся па пытанні аб Польшчы. У канчатковым выніку была вызначана яе ўсходняя граніца, прычым Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна заставаліся ў складзе СССР. На поўначы і захадзе Польшча атрымала «значнае прырашчэнне» тэрыторыі за кошт Германіі. Урад Польшчы ствараўся на аснове камуністычнага Часовага ўрада, які размяшчаўся ў Любліне. У яго склад рэкамендавалася ўключыць дэмакратычных дзеячаў, якія знаходзіліся ў эміграцыі і ў самой Польшчы.

**Завяршэнне разгрому Германіі. 16 красавіка 1945 г.** войскі 1-га Беларускага і 1-га Украінскага франтоў пад кіраўніцтвам Г. К. Жукава і І. С. Конева пачалі на-



Правообладатель Народная асвета

ступленне на Берлін. Англа-амерыканскія арміі прасоўваліся з захаду. *25 красавіка* на рацэ Эльбе каля г. Торгаў адбылася гістарычная сустрэча амерыканскіх і савецкіх войскаў. Сталіца Германіі аказалася ў акружэнні Чырвонай Арміі. Але і тады гітлераўцы працягвалі ўпарта супраціўляцца. У сувязі з вялікімі чалавечымі стратамі ў нямецкія войскі сталі прызываць падлеткаў і старых.

*30 красавіка* пачаўся штурм рэйхстага. У гэты ж дзень А. Гітлер скончыў жыццё самагубствам. *2 мая* гарнізон Берліна капітуляваў. У ноч з **8** на **9 мая** ў прыгарадзе Берліна Карлсорсце прадстаўнікі нямецкага галоўнакамандавання падпісалі Акт аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі. Ад імя саюзнікаў яго прынялі маршал




Разгром фашысцкай Германіі (1944—1945 гг.)



Правообладатель Народная асвета



Падпісанне Акта аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі. 8 мая 1945 г.



Парад Перамогі ў Маскве. 24 чэрвеня 1945 г.

Г. К. Жукаў і ваеначальнікі Вялікабрытаніі, ЗША і Францыі. 9 мая ў Маскве адбыўся салют у гонар Дня Перамогі.

Апошняй аперацыяй вайны ў Еўропе стала вызваленне Прагі. *9 мая 1945 г.* танкавыя злучэнні Чырвонай Арміі прыйшлі на дапамогу паўстаўшым у горадзе антыфашыстам і вызвалілі сталіцу Чэхаславакіі. Вайна ў Еўропе закончылася. 24 чэрвеня 1945 г. на Чырвонай плошчы ў Маскве прайшоў Парад Перамогі. Да падножжа Маўзалея былі кінуты 200 сцягоў разгромленых часцей вермахта.

**Паражэнне Японіі.** Пасля капітуляцыі Германіі Японія яшчэ працягвала вайну супраць ЗША, Вялікабрытаніі і Кітая. Таму саюзнікі былі зацікаўлены, каб у вайну ўступіў і СССР. На Крымскай (Ялцінскай) канферэнцыі савецкі бок абяцаў зрабіць гэта не пазней трох месяцаў пасля разгрому Германіі. Выконваючы дамоўленасць, СССР афіцыйна заявіў, што з 9 жніўня 1945 г. будзе лічыць сябе ў стане вайны з Японіяй. Галоўнай мэтай Савецкі Саюз ставіў разгром японскай Квантунскай арміі, сканцэнтраванай у Маньчжурыі. Галоўнае камандаванне савецкімі войскамі на Далёкім Усходзе ўзначаліў А. М. Васілеўскі. Нягледзячы на ўпартае супраціўленне, Квантунская армія была разбіта.



К. Этлі, Г. Трумэн, І. Сталін (злева направа) у час Патсдамскай канферэнцыі. Ліпень — жнівень 1945 г.

*6 і 9 жніўня 1945 г.* ЗША, праследуючы не столькі ваенна-стратэгічныя, колькі палітычныя мэты, скінулі атамныя бомбы на японскія гарады Хірасіма і Нагасакі. Загінула больш за 100 тыс. чала-



Правообладатель Народная асвета




Маньчжурская наступальная аперацыя (9 жніўня — 2 верасня 1945 г.)

век. 14 жніўня Японія заявіла аб капітуляцыі. Афіцыйны Акт аб безагаворачнай капітуляцыі Японіі быў падпісаны **2 верасня 1945 г**. на борце амерыканскага лінкора «Місуры» ў Такійскай бухце. Другая сусветная вайна закончылася.

**Патсдамская канферэнцыя. У ліпені — жніўні 1945 г**. у *Патсдаме* адбылася канферэнцыя кіраўнікоў перамогшых краін — І. В. Сталіна, Г. Трумэна, У. Чэрчыля (у ходзе канферэнцыі яго змяніў прыйшоўшы да ўлады К. Этлі). Па галоўным пытанні — германскім — былі падцверджаны рашэнні Крымскай (Ялцінскай) канферэнцыі. Уся тэрыторыя Германіі і Берлін былі падзелены на чатыры зоны акупацыі. Рэпарацыі з Германіі было вырашана атрымліваць прамысловым абсталяваннем, сыравінай, караблямі і інш. У адносінах да Германіі саюзнікі дамовіліся праводзіць палітыку *дэнацыфікацыі, дэмакратызацыі, дэкартэлізацыі* і *дэмілітарызацыі*.

Канчаткова было вырашана пытанне аб Польшчы. Да яе тэрыторыі далучалася частка Усходняй Прусіі і землі па рэках Одэр і Нейсэ. Другая частка Усходняй Прусіі



Правообладатель Народная асвета




Важнейшыя тэрытарыяльныя змяненні ў Еўропе паводле пагадненняў 1945 г.

з горадам Кёнігсбергам (з 1946 г. — Калінінград) увайшла ў склад СССР. Нямецкае насельніцтва, якое пражывала на перадаваемых Польшчы тэрыторыях, перасялялася ў Германію.

Канферэнцыя стварыла *Міжнародны ваенны трыбунал* з юрыстаў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі для правядзення суда над нацысцкімі ваеннымі злачынцамі. Ён пачаў сваю работу восенню 1945 г. у *Нюрнбергу* і працягваўся амаль год. Трыбунал канстатаваў найцяжэйшыя злачынствы нацыстаў супраць чалавечнасці і асудзіў іх. 12 фашысцкіх кіраўнікоў былі прыгавораны да смяротнага пакарання, 7 — да доўгатэрміновага або пажыццёвага турэмнага зняволення. У Японіі таксама адбыўся суд над ваеннымі злачынцамі — *Такійскі міжнародны трыбунал.*

Напярэдадні Патсдамскай канферэнцыі ў *Сан-Францыска* (ЗША) завяршыла сваю работу канферэнцыя 50 дзяржаў, якія ваявалі супраць Германіі і яе саюзнікаў. Яна прыняла рашэнне аб стварэнні **Арганізацыі Аб'яднаных Нацый** (ААН) і адобрыла яе Статут (26 чэрвеня), які ўступіў у сілу **24 кастрычніка 1945 г.** Гэты дзень па рашэнні Генеральнай Асамблеі ААН з'яўляецца Днём Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. У Статуце ААН гаварылася, што арганізацыя створана з мэтай «абараніць будучыя пакаленні ад жахаў вайны». Для выканання гэтай задачы члены ААН абавязваліся вырашаць усе спрэчкі мірным шляхам. Разам з дэлегацыяй СССР у заснаванні ААН удзельнічалі дэлегацыі Беларусі і Украіны.



На Нюрнбергскім працэсе. 1945—1946 гг.

**Цана і значэнне перамогі.** Другая сусветная вайна закончылася. Яна забра-



Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

ла жыцці больш чым у 54 млн чалавек, 35 млн чалавек засталіся інвалідамі. Менавіта цаной непапраўняльных людскіх страт, скалечаных чалавечых лёсаў і велізарных матэрыяльных затрат СССР і іншыя дзяржавы антыгітлераўскай кааліцыі выйшлі пераможцамі ў гэтай страшнай вайне. Краіны з рэакцыйнымі і фашысцкімі рэжымамі пацярпелі паражэнне. У гэтых дзяржавах пачаўся доўгі працэс пераасэнсавання трагічнага вопыту, духоўнага самаачышчэння, адраджэння дэмакратычных каштоўнасцей.



Падпісанне Статута ААН на канферэнцыі ў Сан-Францыска. Чэрвень 1945 г.

Вырашальную ролю ў барацьбе з фашызмам адыграў Савецкі Саюз. Галоўнай крыніцай перамогі народаў, якія падвергліся агрэсіі, быў патрыятызм людзей, іх гатоўнасць ахвяраваць многім дзеля абароны сваёй Радзімы. У СССР за перамогу аддалі жыццё больш за 27 млн чалавек. Савецкія людзі перамаглі ў Вялікай Айчыннай вайне, таму што змагаліся за сваю зямлю, за свае сем'і, за свае ідэалы. Кіруючая роля ў барацьбе з фашызмам належала камуністычнай партыі.

**Размеркаванне дывізій фашысцкай Германіі і яе еўрапейскіх саюзнікаў па франтах Другой сусветнай вайны**

| Франты | Дата | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 22 чэрвеня 1941 г. | Лістапад 1942 г. | Студзень 1944 г. | Чэрвень 1944 г. | Студзень 1944 г. |
| Савецка-германскі | 190 | 266 | 245 | 239,5 | 195,5 |
| Іншыя | 9 | 12,5 | 21 | 85 | 107 |

З першага дня вайны народы СССР падняліся на барацьбу з фашысцкай Германіяй, праяўляючы незвычайны гераізм і самаадданасць. Больш за 11 тыс. воінаў атрымалі званне Героя Савецкага Саюза. Тройчы гэтага звання былі ўдастоены лётчыкі *І. Кажадуб*, які збіў 62 варожыя самалёты, і *А. Пакрышкін,* які збіў 59 самалётаў.

Сапраўдным праяўленнем савецкага патрыятызму сталі партызанскі і падпольны рух, самаадданая праца ў тыле. Паспяховыя дзеянні Чырвонай Арміі і партызан былі абумоўлены не толькі масавым гераізмам і самаахвярнасцю савецкіх людзей. Атрыманая перамога з'явілася вынікам савецкага вайсковага майстэрства, якое аказалася вышэйшым за германскае. Падчас вайны праявілі свае таленты такія выдатныя савецкія военачальнікі, як А. М. Васілеўскі, К. К. Ракасоўскі, І. С. Конеў і



Правообладатель Народная асвета

інш. Адным з найвыдатнейшых палкаводцаў стаў адзіны чатырохразовы Герой Савецкага Саюза Г. К. Жукаў.

1. Калі быў адкрыты другі фронт у Еўропе? Як гэта паўплывала на ход ваенных дзеянняў?
2. Калі была праведзена Берлінская аперацыя? Якія былі яе вынікі?
3. Калі і чаму Савецкі Саюз уступіў у вайну супраць Японіі? Калі быў падпісаны Акт аб безагаворачнай капітуляцыі Японіі?
4. З якой мэтай ЗША правялі атамную бамбардзіроўку японскіх гарадоў Хірасіма і Нагасакі?
5. З якой мэтай і калі былі праведзены Крымская (Ялцінская) і Патсдамская канферэнцыі?
6. Што з'явілася крыніцамі перамогі СССР і краін антыгітлераўскай кааліцыі ў вайне супраць Германіі, Японіі і іх саюзнікаў? Якія асноўныя вынікі Другой сусветнай вайны? Якую ролю ў разгроме агрэсіўнага блока дзяржаў адыграў Савецкі Саюз?

## ГІСТАРЫЧНЫ ПАРТРЭТ



**Дуайт Дэйвід Эйзенхаўэр** (1890—1969), дзяржаўны і ваенны дзеяч ЗША. Генерал арміі (1944). У гады Другой сусветнай вайны з лістапада 1942 па кастрычнік 1943 г. камандаваў сіламі саюзнікаў пры наступленні ў Паўночнай Афрыцы, Сіцыліі і Італіі. З 1943 г. — вярхоўны галоўнакамандуючы экспедыцыйнымі войскамі саюзнікаў у Заходняй Еўропе; кіраваў высадкай англа-амерыканскіх войскаў на ўзбярэжжа Паўночна-Заходняй Францыі ў Нармандыі, якая азначала адкрыццё другога фронту ў Еўропе. Быў узнагароджаны ордэнамі многіх краін, у тым ліку савецкім ордэнам «Перамога» (1945). У 1953—1961 гг. — 34-ы прэзідэнт ЗША ад рэспубліканскай партыі.



**Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі** (1896—1968), савецкі военачальнік, Маршал Савецкага Саюза, маршал Польшчы, двойчы Герой Савецкага Саюза. Удзельнічаў у Першай сусветнай і Грамадзянскай войнах. У 1937—1940 гг. знаходзіўся пад следствам у НКУС. У гады Вялікай Айчыннай вайны камандаваў мехкорпусам, арміяй, франтамі. Вызначыўся ў Смаленскай, Маскоўскай, Сталінградскай, Курскай бітвах, у Беларускай, Усходне-Прускай, Берлінскай аперацыях. Камандаваў Парадам Перамогі на Чырвонай плошчы ў Маскве. У 1949—1956 гг. быў міністрам нацыянальнай абароны Польскай Народнай Рэспублікі. Напісаў мемуары «Салдацкі абавязак» (1968).



Правообладатель Народная асвета

## УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ

1. Якія знешнепалітычныя мэты ставілі вядучыя дзяржавы свету напярэдадні Другой сусветнай вайны? Запоўніце табліцу.

| | Германія, Італія, Японія | Вялікабрытанія, Францыя, ЗША | Савецкі Саюз |
|---|---|---|---|
| Асноўныя мэты знешняй палітыкі | | | |
| Сфера знешнепалітычных інтарэсаў | | | |

2. Ахарактарызуйце Другую сусветную вайну па плане:
а) храналагічныя рамкі, працягласць;
б) асноўныя краіны, якія супрацьстаялі ў вайне;
в) агульная колькасць краін, якія прынялі ўдзел у вайне;
г) колькасць людзей, якія загінулі падчас вайны.

Зрабіце вывад аб асаблівасцях Другой сусветнай вайны, улічваючы спосабы вядзення вайны і яе цану для чалавецтва. Як вы лічыце, якія з вынікаў і ўрокаў вайны з'яўляюцца найбольш важнымі?

3. Дайце кароткую характарыстыку асноўных перыядаў Другой сусветнай вайны:

| Перыяд | Кароткая характарыстыка |
|---|---|
| 1 верасня 1939 — 21 чэрвеня 1941 г. | |
| 22 чэрвеня 1941 — 18 лістапада 1942 г. | |
| 19 лістапада 1942 — 31 снежня 1943 г. | |
| 1 студзеня 1944 — 9 мая 1945 г. | |
| 9 мая — 2 верасня 1945 г. | |

4. Назавіце асноўныя ваенныя аперацыі ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Якія вынікі яны мелі? Хто з военачальнікаў у іх вызначыўся?

5. Вылучыце асноўныя этапы складвання антыгітлераўскай кааліцыі. Вызначыце ўклад саюзнікаў СССР па антыгітлераўскай кааліцыі ў разгром агрэсіўнага блока дзяржаў.

6. Якія міжнародныя канферэнцыі з удзелам кіраўнікоў дзяржаў, удзельнікаў антыгітлераўскай кааліцыі, былі праведзены ў гады Другой сусветнай вайны? Якія



Правообладатель Народная асвета

асноўныя пытанні на іх вырашаліся? Як былі вырашаны тэрытарыяльныя пытанні?

7. Ахарактарызуйце барацьбу супраць захопнікаў на акупіраваных тэрыторыях Заходняй Еўропы і Савецкага Саюза. Якія адметныя рысы яна мела ў Заходняй Еўропе і ў СССР? Дакажыце, што барацьба з акупацыйным рэжымам з'явілася адным з фактараў агульнай перамогі над ворагам.

8. Чаму на Нюрнбергскім працэсе дзеянні нацыстаў на акупіраваных тэрыторыях былі прызнаны злачынствам супраць чалавечнасці?

9. З якой мэтай была створана ААН? Чаму ўзнікла неабходнасць яе стварэння? Чаму Беларусь і Украіна сталі аднымі з заснавальнікаў гэтай арганізацыі, нягледзячы на тое, што яны ўваходзілі ў склад СССР?

10. Прывядзіце прыклады палкаводчага таленту савецкіх военачальнікаў, прыклады гераізму і мужнасці, праяўленыя воінамі, партызанамі і падпольшчыкамі, працаўнікамі тылу ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Храналагічная табліца

| | |
|---|---|
| 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г. | Узброенае паўстанне бальшавікоў у Петраградзе |
| 6 студзеня 1918 г. | Разгон бальшавікамі Устаноўчага сходу |
| 3 сакавіка 1918 г. | Заключэнне Брэсцкага мірнага дагавора паміж Савецкай Расіяй і Германіяй |
| Ліпень 1918 г. | Прыняцце Канстытуцыі РСФСР |
| 3 лістапада 1918 — 1 мая 1919 г. | Лістападаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя ў Германіі |
| 11 лістапада 1918 г. | Падпісанне перамір'я паміж Германіяй і краінамі Антанты. Заканчэнне Першай сусветнай вайны |
| 14 лістапада 1918 г. | Утварэнне Чахаславацкай Рэспублікі |
| Снежань 1918 г. | Абвяшчэнне Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 26 студзеня 1929 г. — Каралеўства Югаславія) |
| 1918—1922 гг. | Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя ў Расіі |
| 18 студзеня 1919 — 21 студзеня 1920 г. | Парыжская мірная канферэнцыя |
| 21 сакавіка — 1 жніўня 1919 г. | Венгерская савецкая рэспубліка |
| 13 красавіка — 1 мая 1919 г. | Баварская савецкая рэспубліка |
| 13 красавіка 1919 г. | Расстрэл мітынгу пратэсту супраць палітыкі каланіяльнага ўрада ў Індыі («Амрытсарская бойня»). Пачатак нацыянальна-вызваленчага руху |
| 28 чэрвеня 1919 г. | Падпісанне Версальскага мірнага дагавора з Германіяй |
| 31 ліпеня 1919 г. | Прыняцце Веймарскай канстытуцыі |
| Жнівень 1919 — Студзень 1933 г. | Веймарская рэспубліка ў Германіі |
| 1919—1923 гг. | Нацыянальная рэвалюцыя ў Турцыі |
| 1919—1943 гг. | Дзейнасць Камуністычнага Інтэрнацыянала (Камінтэрна) |
| 1920—1921 гг. | Савецка-польская вайна |
| 1920 г. | Усталяванне аўтарытарнага рэжыму ў Венгрыі |



Правообладатель Народная асвета

| | |
|---|---|
| Сакавік 1921 г. | Увядзенне новай эканамічнай палітыкі (нэпа) у Савецкай Расіі |
| Лістапад 1921 — Люты 1922 г. | Вашынгтонская канферэнцыя |
| 10 красавіка — 19 мая 1922 г. | Генуэзская канферэнцыя. Падпісанне Рапальскага дагавора паміж Германіяй і Савецкай Расіяй (16 красавіка) |
| Кастрычнік 1922 г. | «Паход на Рым». Прыход да ўлады фашыстаў у Італіі |
| 30 снежня 1922 г. | Утварэнне СССР |
| 1923 г. | Рурскі крызіс |
| Лета 1923 г. | Усталяванне аўтарытарнага рэжыму ў Балгарыі |
| 1925—1927 гг. | Нацыянальная рэвалюцыя ў Кітаі |
| 5—16 кастрычніка 1925 г. | Лакарнская канферэнцыя |
| Май 1926 г. | Усталяванне дыктатуры Ю. Пілсудскага ў Польшчы |
| 1926 г. | Уступленне Германіі ў Лігу Нацый (да 14 кастрычніка 1933 г.) |
| 1926—1928 гг. | Паўночны паход Нацыянальна-рэвалюцыйнай арміі Кітая |
| Жнівень 1928 г. | Падпісанне пакта Брыяна — Келага |
| 6 студзеня 1929 г. | Дзяржаўны пераварот у Каралеўстве сербаў, харватаў і славенцаў |
| 12 сакавіка — 6 красавіка 1930 г. | Барацьба з саляной манаполіяй Вялікабрытаніі ў Індыі (Саляны паход) |
| 1929—1933 гг. | Сусветны эканамічны крызіс |
| Верасень 1931 г. | Нападзенне Японіі на Кітай |
| 7 лістапада 1931 г. | Абвяшчэнне Кітайскай Савецкай Рэспублікі (КСР) |
| Лістапад 1932 г. | Выбранне Ф. Д. Рузвельта прэзідэнтам ЗША |
| 30 студзеня 1933 г. | Прызначэнне А. Гітлера рэйхсканцлерам Германіі |
| 27 сакавіка 1933 г. | Выхад Японіі з Лігі Нацый |
| 18 верасня 1934 г. | Уступленне СССР у Лігу Нацый (да 14 снежня 1939 г.) |
| 26 студзеня1934 г. | Заключэнне польска-германскага дагавора аб ненападзенні |
| Май 1935 г. | Падпісанне савецка-французскага і савецка-чэхаславацкага дагавораў аб саюзе і ўзаемнай дапамозе |
| Кастрычнік 1935 г. | Нападзенне Італіі на Абісінію (Эфіопію) |



Правообладатель Народная асвета

| | |
|---|---|
| Ліпень 1936 — сакавік 1939 г. | Грамадзянская вайна ў Іспаніі |
| Люты 1936 г. | Перамога Народнага фронту на выбарах у картэсы Іспаніі |
| Сакавік 1936 г. | Акупацыя германскімі войскамі Рэйнскай дэмілітарызаванай зоны |
| Вясна 1936 г. | Перамога Народнага фронту на парламенцкіх выбарах у Францыі |
| 25 лістапада 1936 г. | Падпісанне «Антыкамінтэрнаўскага пакта» паміж Германіяй і Японіяй |
| 11 снежня 1937 г. | Выхад Італіі з Лігі Нацый |
| 1937—1945 гг. | Акупацыя Кітая Японіяй |
| Сакавік 1938 г. | Аншлюс (далучэнне) Аўстрыі да Германіі |
| 29—30 верасня 1938 г. | Мюнхенская канферэнцыя Германіі, Італіі, Вялікабрытаніі і Францыі |
| 23 жніўня 1939 г. | Падпісанне савецка-германскага пакта аб ненападзенні |
| 1 верасня 1939 г. | Нападзенне Германіі на Польшчу. Пачатак Другой сусветнай вайны |
| 30 лістапада 1939 — 12 сакавіка 1940 г. | Савецка-фінляндская вайна |
| 27 верасня 1940 г. | Падпісанне Траістага пакта паміж Японіяй, Германіяй і Італіяй |
| 22 чэрвеня 1941 г. | Нападзенне Германіі на СССР. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны |
| 14 жніўня 1941 г. | Падпісанне Атлантычнай хартыі |
| 8 верасня 1941 — 27 студзеня 1944 г. | Блакада Ленінграда (прарвана 18 студзеня 1943 г.) |
| 30 верасня 1941 — 20 красавіка 1942 г. | Маскоўская бітва |
| 7 снежня 1941 г. | Нападзенне Японіі на амерыканскую ваенна-марскую базу Пёрл-Харбар. Уступленне ЗША ў Другую сусветную вайну |
| 1 студзеня 1942 г. | Падпісанне Дэкларацыі Аб'яднаных Нацый |
| 4—6 чэрвеня 1942 г. | Перамога флоту ЗША над ударным злучэннем флоту Японіі каля атола Мідуэй |
| 17 ліпеня 1942 — 2 лютага 1943 г. | Сталінградская бітва |
| Кастрычнік — лістапад 1942 г. | Бітва пры Эль-Аламейне (Егіпет) |



Правообладатель Народная асвета

| | |
|---|---|
| 5 ліпеня — 23 жніўня 1943 г. | Курская бітва |
| 8 верасня 1943 г. | Падпісанне Італіяй перамір'я з англа-амерыканскім камандаваннем |
| 28 лістапада — 1 снежня 1943 г. | Тэгеранская канферэнцыя |
| 6 чэрвеня 1944 г. | Высадка англа-амерыканскіх войскаў у Нармандыі (Паўночная Францыя). Адкрыццё другога фронту |
| 4—11 лютага 1945 г. | Крымская (Ялцінская) канферэнцыя |
| 16 красавіка — 2 мая 1945 г. | Берлінская наступальная аперацыя |
| 8 мая 1945 г. | Падпісанне Акта аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі. Завяршэнне Вялікай Айчыннай вайны |
| 26 чэрвеня 1945 г. | Стварэнне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН) |
| 17 ліпеня — 2 жніўня 1945 г. | Патсдамская канферэнцыя |
| 2 верасня 1945 г. | Падпісанне Акта аб безагаворачнай капітуляцыі Японіі. Завяршэнне Другой сусветнай вайны |
| 20 лістапада 1945 — 1 кастрычніка 1946 г. | Міжнародны судовы працэс над галоўнымі нацысцкімі злачынцамі ў г. Нюрнбергу (Германія) |
| 3 мая 1946 г. — 12 лістапада 1948 г. | Міжнародны ваенны трыбунал для Далёкага Усходу ў г. Токіа (Японія) |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

**Акупацыя** — часовы захоп войскамі адной дзяржавы тэрыторыі другой дзяржавы (або яе часткі ) з усталяваннем уласных законаў і адміністрацыі.

**Анексія** — гвалтоўнае далучэнне, захоп адной дзяржавай усёй або часткі тэрыторыі іншай дзяржавы.

**Антыгітлераўская кааліцыя** — саюз дзяржаў, якія змагаліся ў гады Другой сусветнай вайны супраць фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў. К канцу вайны антыгітлераўская кааліцыя налічвала больш за 50 дзяржаў.

**«Антыкамінтэрнаўскі пакт»** — дагавор, заключаны 25 лістапада 1936 г. паміж Германіяй і Японіяй з мэтай супрацоўніцтва ў барацьбе супраць Камінтэрна. 6 лістапада 1937 г. да дагавора далучылася Італія.

**Аншлюс** — гвалтоўнае далучэнне Аўстрыі да Германіі ў сакавіку 1938 г.

**Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН)** — міжнародная арганізацыя, створаная ў 1945 г. на аснове добраахвотнага аб'яднання суверэнных дзяржаў у мэтах падтрымання міру і бяспекі, а таксама развіцця мірнага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі.

**Аўтаномія** — самастойнае ажыццяўленне дзяржаўнай улады ці шырокае ўнутранае самакіраванне, якое прадастаўляецца асобнай тэрыторыі або народу, які кампактна пражывае ў межах дзяржавы.

**Аўтарытарны палітычны рэжым** — рэжым, пры якім улада сканцэнтравана ў руках аднаго чалавека або групы асоб. Яго характэрнымі прыметамі з'яўляюцца поўная або частковая адсутнасць дэмакратычных свабод грамадзян, абмежаванне дзейнасці палітычных партый і арганізацый, падаўленне палітычнай апазіцыі, адсутнасць падзелу ўлад на заканадаўчую, выканаўчую і судовую.

**Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін** — сукупнасць дагавораў і пагадненняў, заключаных па выніках Першай сусветнай вайны на канферэнцыях у Версалі (1919—1920) і Вашынгтоне (1921—1922). Версальска-Вашынгтонская сістэма была створана як сродак для падтрымання міру і стабільнасці ў міжнародных адносінах. У той жа час яна прадугледжвала пануючае становішча ў сусветнай палітыцы дзяржаў — пераможцаў у Першай сусветнай вайне. Гэта таіла ў сабе сур'ёзныя супярэчнасці і стала адной з прычын Другой сусветнай вайны.

**Вялікая Айчынная вайна** — вайна савецкага народа з фашысцкай Германіяй і яе саюзнікамі (22 июня 1941 — 9 мая 1945 г.), састаўная частка Другой сусветнай вайны. Закончылася поўным разгромам краін фашысцкага блока.

**Генацыд** — вынішчэнне асобных груп насельніцтва па расавых, нацыянальных або рэлігійных прыметах.

**«Дзіўная вайна»** — пачатковы перыяд Другой сусветнай вайны з верасня 1939 да красавіка 1940 г., калі ўрады Францыі і Вялікабрытаніі, нягледзячы на аб'-



Правообладатель Народная асвета

яву імі 3 верасня 1939 г. вайны фашысцкай Германіі, не вялі актыўных дзеянняў на Заходнім фронце.

**Дэмілітарызацыя** — ліквідацыя ваенных умацаванняў і збудаванняў на пэўнай тэрыторыі, а таксама забарона трымаць на гэтай тэрыторыі ваенныя базы і войскі.

**Індустрыялізацыя** — працэс стварэння буйной машыннай вытворчасці і на гэтай аснове пераход ад аграрнага да індустрыяльнага грамадства.

**Інтэрвенцыя** — гвалтоўнае ўмяшанне аднаго або некалькіх дзяржаў ва ўнутраныя справы другой дзяржавы; можа быць ваеннай, эканамічнай, дыпламатычнай, ідэалагічнай.

**Камуністычны Інтэрнацыянал (Камінтэрн)** — міжнароднае аб'яднанне камуністычных партый розных краін, створанае па ініцыятыве У. І. Леніна для ажыццяўлення ідэі сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі. Існаваў у 1919—1943 гг.

**Калабарацыянізм** — добраахвотнае ваеннае, палітычнае і эканамічнае супрацоўніцтва грамадзян дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі з акупацыйнымі ўладамі Германіі, Італіі і Японіі ў гады Другой сусветнай вайны.

**Калектывізацыя** — пераўтварэнне дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектыўныя гаспадаркі (калгасы) у СССР у канцы 1920-х — пачатку 1930-х гг.

**Кантрыбуцыя** — пасляваенныя прымусовыя плацяжы, што спаганяюцца з пераможанай дзяржавы дзяржавай-пераможцай.

**Капітуляцыя** — спыненне ўзброенага супраціўлення, здача ўзброеных сіл пераможцу на прадыктаваных ім умовах. Безагаворачная капітуляцыя звычайна падпісваецца пры поўным разгроме ўзброеных сіл.

**Картэль** — форма манапалістычнага аб'яднання. У адрозненне ад іншых форм манаполій (сіндыкаты, трэсты, канцэрны) кожнае прадпрыемства, якое ўвайшло ў картэль, захоўвае фінансавую і вытворчую самастойнасць. Аб'ектамі пагаднення могуць быць: цэнаўтварэнне, сферы ўплыву, умовы продажу, рэгуляванне аб'ёмаў вытворчасці, узгадненне ўмоў збыту прадукцыі, наём рабочых. Дзейнічае, як правіла, у рамках адной галіны.

**Ленд-ліз** — сістэма, па якой ЗША ў перыяд Другой сусветнай вайны пастаўлялі ўзбраенне, боепрыпасы, прадукты харчавання і іншыя матэрыяльныя рэсурсы саюзнікам па антыгітлераўскай кааліцыі на ўмовах доўгатэрміновага крэдыту або арэнды.

**Ліга Нацый** — міжнародная арганізацыя, якая існавала ў 1919—1939 гг. з мэтай падтрымання міру і бяспекі, развіцця супрацоўніцтва паміж народамі.

**Мадэрнізм** — перыяд у развіцці культуры канца XIX — сярэдзіны XX ст., які аб'яднаў шэраг адносна самастойных напрамкаў (экспрэсіянізм, кубізм, футурызм, дадаізм, сюррэалізм, абстракцыянізм, поп-арт і інш.) і характарызуецца імкненнем зацвердзіць новыя нетрадыцыйныя пачаткі ў мастацтве і бесперапынным абнаўленнем мастацкіх форм.



Правообладатель Народная асвета

**Мандатная сістэма кіравання калоніямі** — сістэма, пры якой былыя ўладанні Германіі і Турцыі пасля Першай сусветнай вайны былі перададзены Лігай Нацый некаторым краінам-пераможцам з правам кіравання на аснове асобых паўнамоцтваў (мандата).

**Народны фронт** — форма аб'яднання шырокіх народных мас, якая склалася ў 1930-я гг. у Еўропе ў ходзе барацьбы супраць фашызму і вайны, за нацыянальную незалежнасць і дэмакратычныя правы.

**Новая эканамічная палітыка (нэп)** — палітыка, якая праводзілася ў Савецкай Расіі (пазней СССР) з 1921 да пачатку 1930-х гг. з мэтай аднаўлення эканомікі і наступнага пераходу да сацыялізму. Змяніла палітыку «ваеннага камунізму». Уключала замену харчразвёрсткі харчпадаткам, выкарыстанне элементаў рынкавай эканомікі, розных форм уласнасці. Хутка прывяла да аднаўлення эканомікі краіны.

**«Новы курс»** — палітыка выхаду з сусветнага эканамічнага крызісу (1929—1933), якая праводзілася прэзідэнтам ЗША Ф. Д. Рузвельтам у 1933—1938 гг. У яе аснову былі пакладзены актыўнае ўмяшальніцтва дзяржавы ў эканамічныя і фінансавыя працэсы, мерапрыемствы ў сацыяльнай сферы, накіраваныя на дапамогу беспрацоўным і малазабяспечаным грамадзянам.

**Палітыка «ваеннага камунізму»** — палітыка, якая ажыццяўлялася ў Савецкай Расіі ў гады Грамадзянскай вайны. Прадугледжвала адмену прыватнага гандлю, абмежаванне таварна-грашовых адносін, увядзенне харчразвёрсткі, нацыяналізацыю прамысловасці, мілітарызацыю эканомікі.

**Палітыка «супакойвання» агрэсара** — палітыка, якая праводзілася ўрадамі Вялікабрытаніі і Францыі ў адносінах да фашысцкай Германіі напярэдадні Другой сусветнай вайны і прадугледжвала ўступкі Германіі і іншым фашысцкім дзяржавам у абмен на захаванне міру.

**Рух Супраціўлення** — нацыянальна-вызваленчы, антыфашысцкі рух супраць германскіх, італьянскіх, японскіх акупантаў і іх саюзнікаў падчас Другой сусветнай вайны. Набыло вялікі размах у Югаславіі, Францыі, Італіі, Польшчы, Чэхаславакіі, Грэцыі, Кітаі, Албаніі і іншых краінах.

**Рэпарацыі** — пакрыццё пераможанай дзяржавай страт, прычыненых дзяржаве, якая падверглася нападзенню.

**Сац'яграха** (санскр., літаральна — упартасць у ісціне) — форма негвалтоўнай барацьбы, якая была распрацавана і выкарыстоўвалася М. К. Гандзі ў нацыянальна-вызваленчым руху Індыі (1918—1947). Уключала масавыя мітынгі, дэманстрацыі, спыненне работы, байкот англійскіх установаў і каланіяльнай адміністрацыі, адмову ад выплаты падаткаў і інш.

**Сепаратны мір** — мірны дагавор або перамір'е, заключаныя з праціўнікам аднной з дзяржаў, што ўваходзілі ў кааліцыю краін, якія вялі вайну, без ведама або згоды сваіх саюзнікаў.



Правообладатель Народная асвета

**Сістэма калектыўнай бяспекі** — сістэма дагавораў, якія гарантуюць захаванне міжнароднага міру, у тым ліку аказанне дапамогі дзяржавам, што падвергліся агрэсіі.

**Таталітарны палітычны рэжым** — палітычны рэжым, пры якім ажыццяўляецца поўны (татальны) кантроль дзяржавы над усімі сферамі жыцця грамадства, забаронены дэмакратычныя арганізацыі, фактычна ліквідаваны канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян, а таксама палітычная апазіцыя.

**Траісты пакт** — міжнародны дагавор, заключаны 27 верасеня 1940 г. паміж Германіяй, Італіяй і Японіяй тэрмінам на 10 гадоў. Завяршыў фарміраванне агрэсіўнага блока дзяржаў.

**Фашызм** — дыктатура, накіраваная на падаўленне ўсіх дэмакратычных свабод і прагрэсіўных грамадскіх рухаў, абапіраецца на прамое насілле, расізм, культ правадыра. Для фашызму характэрны таталітарны палітычны рэжым, усеагульны кантроль над асобай, чалавеканенавісніцтва, мілітарызацыя грамадства.

**Федэрацыя** — форма дзяржаўнага ўладкавання, пры якой дзяржава складаецца з адміністрацыйных адзінак (штатаў, зямель, саюзных рэспублік і інш.), якія маюць уласныя канстытуцыі і органы кіравання; пры гэтым захоўваюцца адзіныя цэнтральныя (федэральныя) органы ўлады, законы, армія, грошы, грамадзянства і інш.

**Фундаменталізм ісламскі** — погляды і ідэі, звязаныя з перанясеннем у сённяшні дзень асноўных (фундаментальных) прынцыпаў ісламу часоў Мухамеда і першых халіфаў.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Спіс рэкамендуемай літаратуры


**Раздзел I. Краіны Еўропы і ЗША ў 1918—1939 гг.**

*Ватлин А. Ю.* Коминтерн: идеи, решения, люди. М., 2009.
*Галкин Л.* А. Германский фашизм. М., 1989.
*Дамс Х. Г.* Франсиско Франко. Ростов-на-Дону, 1999.
*Кольцов М. Е.* Испания в огне. В 2 т. М., 1987.
*Листер Э.* Наша война (Из истории национально-революционной войны испанского народа 1936—1939 гг.). Мемуары. М., 1969.
*Мельников Д. Е., Черная Л. Б.* Преступник номер 1. Нацистский режим и его фюрер. М., 1991.
*Таннер В.* Зимняя война. М., 2003.
*Хемингуэй Э.* По ком звонит колокол // Хемингуэй Э. Собрание сочинений: В 4 т. Т. 2. М, 1968.
*Хибберт К.* Бенито Муссолини: Биография. Ростов-на-Дону, 1998.
*Черная Л.* Коричневые диктаторы. М., 1992. Ростов-на-Дону, 1999.
*Эррио Э.* Из прошлого: Между двумя войнами. 1914—1936. М., 1958.
*Яковлев Н. Н.* Франклин Рузвельт. Человек и политик. Новое прочтение. М., 1981.

**Раздзел II. Гісторыя Савецкай дзяржавы: 1917—1939 гг.**

Белое движение. Исторические портреты: Л. Г. Корнилов, А. И. Деникин, П. Н. Врангель... М., 2006.
*Байдуков Г. Ф.* Чкалов. М., 1986.
*Буденный С. М.* Пройденный путь. Книга первая. М., 1958; Книга вторая: М., 1965; Книга третья: М., 1973.
*Вильямс А. Р.* Путешествие в революцию. Россия в огне Гражданской войны. 1917—1918. М., 2006.
*Волкогонов Д. А.* Семь вождей. Галерея лидеров СССР. В 2 книгах. Кн. 1. М., 1999.
*Гинзбург Е.* Крутой маршрут. М., 1990.
Историки спорят: Тринадцать бесед. М., 1988.
*Кара-Мурза С. Г.* Гражданская война (1918—1921). Урок для XXI века. М., 2003.
*Космач Г. А., Космач Е. Н.* Трагедия кумиров революции. Минск, 1994.
Октябрь 1917: величайшее событие века или социальная катастрофа? М., 1991.
От первого лица: Сб. / Сост. И.А. Анфертьев. М., 1990.
*Солженицын А. И.* Архипелаг ГУЛАГ, 1918—1956: Опыт худож. исследования: В 3 т. М., 1990.
*Эренбург И. Г.* Люди, годы, жизнь. В 3 т. М., 2005.

**Раздзел III. Краіны Усходу і Лацінскай Амерыкі паміж сусветнымі войнамі**

*Браун О.* Китайские записки (1932—1939). М., 1974.
*Воронцов В. Б.* Судьба китайского Бонапарта. М., 1989.
*Ганди М.* Моя жизнь. М., 1969
*Горев А. В.* Махатма Ганди. М., 1989.
*Жевахов А.* Ататюрк. М., 2008.
*Мазуров И. В.* Японский фашизм. М., 1996.
*Намбудирипад Е. М.* Мировоззрение М. Ганди и гандизм. М., 1960.
*Строганов А. И.* Латинская Америка. Страницы истории XX века. М., 2004.
*Тихвинский С. Л.* Путь Китая к объединению и независимости. М., 1996.
*Шахинлер М.* Кемализм: зарождение, влияние, актуальность. М., 1998.




Правообладатель Народная асвета

**Раздзел IV. Другая сусветная вайна. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа**


*Амброз С.* Эйзенхауэр. Солдат и президент. М., 1993.
*Баграмян И. Х.* Так шли мы к победе. М., 1977.
Божественный ветер. Сб. М., 2005.
*Брэдли О. Н.* Записки солдата. М., 1957.
*Быков М. Ю.* Асы Великой Отечественной. Самые результативные летчики 1941—1945 гг. М., 2007.
Великая Отечественная. Командармы. Военный биографический словарь. М., 2005.
Вторая мировая война в воспоминаниях У. Черчилля, Ш. де Голля, К. Хэлла, У. Леги, Д. Эйзенхауэра / Сост. Е. Я. Трояновская. М., 1990.
*Гареев М. А.* Неоднозначные страницы войны. М., 1995.
*Горбатов А. В.* Годы и войны. М., 1989.
Два конвоя: PQ-17 и PQ-18: Сб. М., 2004.
Движение Сопротивления в Западной Европе. 1939—1945 гг. М., 1990.
*Де Жоффр Ф.* Нормандия — Неман. Воспоминания военного летчика. М., 1960.
*Жуков Г. К.* Воспоминания и размышления: В 3 т. М., 1995.
*Кузнецов Н. Г.* Накануне. Курсом к победе. М., 1991.
*Манштейн Э.* Утерянные победы. М.; СПб, 1999.
*Некрич А.М.* 1941, 22 июня. М., 1995.
*Полторак А. И.* Нюрнбергский эпилог. М., 1965.
*Пономарев А. Н.* Советские авиационные конструкторы. М., 1990.
*Райнер Д.* Битва за Атлантику. Эскорты кораблей британских ВМС. М., 2004.
*Рокоссовский К. К.* Солдатский долг. М., 1997.
*Самсонов А. М.* Москва, 1941 год: от трагедии поражений — к Великой победе. М., 1991.
*Стеттиниус Э.* Ленд-лиз — оружие победы. М., 2000.
*Тимофеев А. В.* Покрышкин. М., 2005.
*Треппер Л.* Большая игра: Воспоминания советского разведчика. М., 1990.
*Хастингс М.* Операция «Оверлорд». Как был открыт второй фронт. М., 1989.


Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Вучэбнае выданне

**Космач** Генадзь Аркадзьевіч
**Кошалеў** Уладзімір Сяргеевіч
**Краснова** Марына Аляксееўна

**Сусветная гісторыя**
**Навейшага часу**
**1918—1945 гг.**

Вучэбны дапаможнік для 10 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна.* Рэдактар *В. В. Занъ.* Мастак *А. С. Хацееў.* Мастацкі рэдактар *А. А. Валатовіч*. Тэхнічны рэдактар *Г. А. Дудко*. Карэктары *К. І. Даніленка, В. С. Казіцкая, В. С. Бабеня, Г. В. Алешка.*

Падпісана ў друк 07.09.2012. Фармат 70 × 90 $^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 15,8. Ул.-выд. арк. 15. Тыраж 17 544 экз. Заказ .

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494083 ад 03.02.2009. Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
ЛП № 02330/0150496 ад 11.03.2009. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

______________________________________________________________________

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Вучэбны год | Імя і прозвішча навучэнца | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета